М.А. Ткачоў

ЗАМКІ І ЛЮДЗІ

Мінск
«Навука і тэхніка»
1991

pawet.net

ББК 63.3(2Б)
Т 48

В средние века Белоруссию называли «страной замков». Через каждые 20—30 км стояли укрепленные города и местечки, под защиту которых в годину тревоги собиралось окрестное население. В каждом феодальном городе и местечке существовали тогда арсеналы, были воинские ополчения. Истории военного дела частновладельческих поселений Белоруссии XIV—XVIII вв. и посвящена книга.

Рассчитана на всех интересующихся белорусской историей.

Навуковы рэдактар
доктар гістарычных навук
Г. В. ШТЫХАЎ

Рэцэнзенты:
кандыдаты гістарычных навук
Л. У. Дучыц, Г. А. Кахановскі

Ткачоў М. А.

Т 48 Замкі і людзі / Пад рэд. Г. В. Штыхава.— Мн.: Навука і тэхніка, 1991.— 184 с.: іл.

ISBN 5-343-00880-1.

Ткачев М. А. Замки и люди.

У сярэднія вякі Беларусь называлі «краінай замкаў». Праз кожныя 20—30 км стаялі ўмацаваныя гарады і мястэчкі, пад абарону якіх у гадзіну трывогі збіралася навакольнае насельніцтва. У кожным феадальным горадзе і мястэчку існавалі тады арсеналы, былі воінскія апалчэнні. Гісторыі ваеннай справы прыватнаўладальніцкіх паселішчаў Беларусі XIV—XVIII стст. і прысвечана кніга.

Разлічана на ўсіх, хто цікавіцца беларускай гісторыяй.

0503020903—166
Т————————24—91 **ББК 63.3(2Б)**
М 316(03)—91

ISBN 5-343-00880-1

© М. А. Ткачоў, 1991

Пакутнікам беларускай гістарычнай навукі — Усеваладу Ігнатоўскаму і Мікалаю Улашчыку прысвячаю

АЎТАР

Уводзіны

Прыватнаўладальніцкія феадальныя замкі, гарады і мястэчкі — значная сацыяльна-эканамічная і палітычная з'ява ў гісторыі Беларусі. Падобна прыватнаўладальніцкім гарадам іншых рэгіёнаў Еўропы — Венгрыі, Румыніі, Чэхаславакіі, Югаславіі, Польшчы, Літвы, Расіі і Украіны, беларускія гарады і мястэчкі XV—XVIII стст. з'яўляліся адміністрацыйнымі, палітычнымі, эканамічнымі і культурнымі цэнтрамі магнацкіх латыфундый, асноўнымі цэнтрамі рамёстваў і гандлю. Яны былі неад'емным арганічным кампанентам усяго феадальнага грамадства Беларусі. Акрамя таго, гэтыя паселішчы адыгрывалі важную ролю ў абароне краю ад знешняй пагрозы. Разам з гаспадарскімі гарадамі ўмацаваныя ўласніцкія паселішчы з іх замкамі фактычна з'яўляліся своеасаблівым дадатковым унутраным сродкам абароны дзяржавы. Яны былі апорай ваеннай моцы магнатаў, цэнтрамі сепаратызму і базамі для вядзення міжусобіц. Гэтыя ўмацаваныя паселішчы лічыліся сховішчам для мясцовага насельніцтва ва ўмовах частых і разбуральных войнаў XVI—XVIII стст. Няспынная ваенная пагроза прымусіла гараджан і жыхароў сельскай акругі выпрацаваць жыццястойкі механізм абароны, які грунтаваўся на ўсеагульнай вайсковай павіннасці і абавязковым удзеле ў ваеннаабарончым будаўніцтве. Гэта ў пэўнай ступені гарантавала надзею, праўда, часта вельмі прывідную, на магчымасць выжыць у частых і знішчальных войнах сярэднявечча.

Моц прыватнаўладальніцкіх замкаў і гарадоў часта знаходзілася ў прамой залежнасці ад іх прыгранічнага месцазнаходжання, эканамічнага стану, колькасці насельніцтва і зацікаўленасці магнатаў у будаўніцтве ўмацаванняў. Частыя ваенныя ліхалецці не пакідалі гараджанам другога выйсця, акрамя ўзвядзення ўмацаванняў уласнымі сіламі і сродкамі. Часцей за ўсё і для магната не было іншага выбару, бо ён быў зацікаўлены ў захаванні і абароне свайго ўладання. Таксама ўлічвалася і патэнцыяльнасць класавых канфліктаў у тагачасным грамадстве. Уладальнікі паселішчаў імкнуліся іх нейтралізаваць рознымі спосабамі, у тым ліку з дапамогай размешчаных у замках наёмных гарнізонаў, якія былі арыентаваны на падаўленне сацыяльных выступленняў працоўных.

Аб'ектыўнае супадзенне інтарэсаў мяшчан і ўладальнікаў паселішчаў ішло апошнім на карысць. Яно садзейнічала стварэнню магутнейшых сучасных фартыфікацый, якія станавіліся цэнтрамі абароны вялікіх

pawet.net

рэгіёнаў. Важна адзначыць, што ваенна-будаўнічыя павіннасці валасцей, якія існавалі яшчэ з часоў Полацкай зямлі, Кіеўскай Русі, захаваліся і працягвалі дзейнічаць у XIV—XVIII стст. У пытаннях абароны горад і воласць і надалей заставаліся непарушным цэлым. Ваенна-будаўнічая «даўніна» няўхільна захоўвалася на працягу стагоддзяў.

Уладальніцкія замкі, гарады і мястэчкі былі даволі «рухомым» элементам уладанняў. Яны часта пераходзілі з рук у рукі ў выніку куплі-продажу, матрыманіяльных сувязей альбо запаветаў-тэстаментаў. Адны

Карта рэгіёна даследавання

роды магнатаў валодалі імі на працягу соцень гадоў, другія даволі хутка іх траціліся, саступіўшы больш заможным феадалам. Напрыклад, Хадкевічы, якія ў XVI ст. называліся «графамі на Мышы, Шклове, Быхаве і Глуску», у XVII ст. амаль усе свае гарады страцілі па розных прычынах. Другія, як, напрыклад, Сапегі, наадварот, пастаянна з веку ў век, пашыралі свае ўладанні. Існавалі гарады, мястэчкі і замкі, у якіх было адразу некалькі ўладальнікаў (Глуск, Друцк, Глыбокае і інш.).

Пры аналізе гісторыі ўмацаваных прыватнаўладальніцкіх паселішчаў Беларусі як культурна-гістарычнай і сацыяльна-эканамічнай з'явы неабходна зазначыць, што не заўсёды магчыма дастаткова поўна ахарактарызаваць ваенны бок іх жыцця: зніклі пад сучаснай забудовай старажытныя ўмацаванні, адсутнічаюць неабходныя пісьмовыя сведчан-

ні альбо вельмі нязначна асвятляюцца гэтыя пытанні. Але там, дзе крыніцы захаваліся, раскрываецца цікавая карціна гісторыі ваеннай справы ў гарадах сярэдневяковай Беларусі, якая дазваляе аналізаваць і параўноўваць узровень ваенна-тэхнічных ведаў мясцовага насельніцтва з бліжэйшымі і дальнімі еўрапейскімі суседзямі.

Значная інфармацыя пра арганізацыю абароны ўладальніцкіх паселішчаў дазваляе зрабіць вывад, што неўмацаваных гарадоў і мястэчкаў у сярэднія вякі, асабліва ў XVI—першай палове XVIII ст., не існавала. Прымітыўныя агароджы з уязнымі брамамі ці перашкодамі ў выглядзе «кабылін» мелі нават буйныя вёскі. Такой была спецыфіка сярэдневяковага быцця. Яна патрабавала ад людзей таго часу пастаяннай і пільнай увагі да пытанняў асабістай і грамадскай бяспекі і абароны.

Мэтай дадзенай працы якраз і з'яўляецца падрабязнае вывучэнне прынцыпаў арганізацыі структуры абароны сярэдневяковых прыватнаўладальніцкіх замкаў і гарадскіх паселішчаў Беларусі XIV—XVII стст. Для гэтага неабходна прааналізаваць узровень ваеннага дойлідства таго часу, вывучыць ваенна-тэхнічныя аспекты абароны, традыцыі ваеннай абароны і іх сувязь з заканадаўчымі актамі краіны, выявіць узаемазвязанасць лёсу гарадоў і вёсак у пытаннях ваеннаабарончай справы, структуру гарадскіх апалчэнняў міліцыйнага тыпу і многае іншае.

Праблемай абароны беларускіх прыватнаўладальніцкіх гарадоў цікавіліся дарэвалюцыйныя айчынныя і даваенныя польскія даследчыкі. Асаблівую цікавасць выклікалі Слуцк, Нясвіж, Шклоў, Быхаў і некаторыя іншыя гарады. Ім прысвечаны рознага характару публікацыі, якія раскрылі асобныя аспекты кіравання гарадскім апалчэннем, яго структуру, прынцыпы камплектавання вайсковых атрадаў [1].

Дзеянні гарадскога апалчэння сярэдневяковага Нясвіжа ў перыяд войнаў часткова асвятляліся гісторыкамі Е. Катлубаем і Б. Таўрагіньскім [2]. Эпізоды з ваеннай гісторыі Друі, Глыбокага і Іказні маюцца ў работах О. Хадэмана [3]. Гарадскія ўмацаванні заходнебеларускіх гарадоў і мястэчкаў цікавілі В. Равеньску. Аднак яна памылкова лічыла, што фартыфікацыя мелася толькі ў Нясвіжы, Клецку, Дзісне, Любчы і Слоніме [4].

У пасляваенны час абарончым збудаванням Любчы прысвяціў свае артыкулы польскі гісторык Ст. Александровіч [5], Нясвіжскаму замку і ўмацаванням горада Нясвіжа — Ф. Маркоўскі і А. Грушэцкі [6].

Найбольш грунтоўна пытанні абароны прыватнаўладальніцкіх гарадоў XVI—XVIII стст. вывучаў А. П. Грыцкевіч. У сваіх артыкулах і манаграфіях аўтар найбольшую ўвагу надаваў Слуцку і Нясвіжу. Ён глыбока прааналізаваў структуру іх абароны і арганізацыю гарадскога апалчэння [7]. Таксама было дадзена кароткае апісанне некаторых замкаў. Асноўная ўвага ў манаграфіях А. П. Грыцкевіча адводзілася сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі прыватнаўладальніцкіх гарадоў. Іх ваенную гісторыю аўтар закрануў бегла і сцісла, галоўным чынам для таго, каб параўнаць іх з Нясвіжам і Слуцкам. Даследчык выкарыстаў шматлікія архіўныя матэрыялы, большасць якіх упершыню ўведзена ў навуковы ўжытак.

Праблемам абароны прыватнаўладальніцкіх гарадоў і замкаў Заходняй Беларусі прысвечаны раздзелы манаграфій аўтара гэтай працы [8]. Аднак у дачыненні да гарадоў больш падрабязна разгледжаны пытанні ваеннай гісторыі Нясвіжа, Слуцка, на ўсходзе Беларусі — толькі Быхава.

Калі ўлічыць, што ў другой палове XVI—XVIII ст. на тэрыторыі

Беларусі налічана 27 прыватнаўладальніцкіх гарадоў і некалькі дзесяткаў мястэчкаў, становіцца зразумелым, што ў цэлым праблема іх ваеннай гісторыі ўсё яшчэ патрабуе паглыбленага вывучэння.

Праца заснавана на комплексе разнастайных крыніц, сярод якіх пераважаюць архіўныя дакументы са сховішчаў краіны, а таксама Рэспублікі Польшчы, якія раней не публікаваліся.

Таксама выкарыстаны апублікаваныя крыніцы, картаграфічныя і геральдычныя матэрыялы. Важнае месца займаюць вынікі аўтарскіх археалагічных даследаванняў.

Пісьмовыя крыніцы можна падзяліць на некалькі груп. Да першай групы крыніц аднесены апублікаваныя дакументы і матэрыялы, сабраныя ў шматтомных зборніках, якія выдала Віленская археаграфічная камісія [9]. Да іх прымыкае група беларуска-літоўскіх і польскіх летапісаў і хронік, а таксама «Тамы законаў», якія змяшчаюць заканадаўчыя акты Вялікага княства Літоўскага і сеймаў Рэчы Паспалітай.

Асаблівую цікавасць выклікаюць дзяржаўныя акты пра ільготы для прыватнаўладальніцкіх гарадоў у сувязі з іх разбурэннямі ў ходзе войнаў [10]. Выкарыстаны таксама іншыя крыніцы.

Другую групу крыніц складаюць архіўныя дакументы. У асноўным гэта матэрыялы магнацкіх архіваў. Сярод іх выдзяляюцца фонд Радзівілаў у Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве БССР (ЦДГА БССР, ф. 694) і Галоўным архіве старажытных актаў г. Варшавы (ГАСА г. Варшавы, архіў Радзівілаў, аддзел 7 — ваенныя дакументы, аддзел 25 — інвентары Радзівілаўскіх уладанняў). Значная колькасць інвентароў прыватнаўладальніцкіх гарадоў і мястэчкаў сабрана ў фондзе мікрафільмаў ЦДГА БССР (ф. КМФ-5). Там жа (ф. 1825) захоўваюцца дакументы Слуцкага магістрата.

Асобныя матэрыялы па гісторыі Слуцка і Шклова XVII—XVIII стст. з бібліятэкі Чартарыйскіх у Кракаве ўдзячнаму аўтару дабразычліва перадалі ў свой час М. М. Улашчык і А. П. Грыцкевіч.

Значныя калекцыі сярэдневяковых пісьмовых крыніц ёсць у ЦДГА Літоўскай Рэспублікі (фонд «Старажытныя акты»), рукапісным аддзеле бібліятэкі АН Літоўскай Рэспублікі і бібліятэкі Віленскага дзяржаўнага універсітэта. Яны даюць падрабязную інфармацыю пра ўзбраенне і структуру ўмацаванняў Друцка, Дубоўны, Слуцка, Быхава, а таксама Невеля і Себежа, якія раней уваходзілі ў склад Віцебскага ваяводства і належалі Радзівілам. Вялікія групы дакументаў па ваеннай гісторыі ўладальніцкіх гарадоў засяроджаны ў рукапісным аддзеле Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі імя Салтыкова-Шчадрына ў Ленінградзе (ф. 293, руска-польскія акты: фонд П. П. Дуброўскага, Польская калекцыя аўтографаў), архіве Ленінградскага аддзялення Інстытута гісторыі АН СССР (справа 114), калекцыі дакументаў у рукапісным аддзеле бібліятэкі АН СССР у Ленінградзе (ф. 266 — альбомы з асабістай бібліятэкі Пятра I).

Дакументы перыяду руска-польскай вайны сярэдзіны XVII ст. маюцца таксама ў Цэнтральным дзяржаўным архіве старажытных актаў СССР у Маскве (ф. 79 — Пасольскі прыказ. Справы польскія; ф. 137 — Баярскія і перапісныя кнігі; ф. 389 — Літоўская Метрыка і інш.).

Ва ўсіх гэтых сховішчах, а таксама ў Цэнтральным дзяржаўным ваенна-гістарычным архіве СССР у Маскве і Цэнтральным дзяржаўным архіве Ваенна-Марскога Флоту СССР у Ленінградзе знаходзяцца картаграфічныя зборы і планы многіх прыватнаўладальніцкіх гарадоў Беларусі, якія выкарыстаны ў манаграфіі.

Усе названыя архіўныя крыніцы па характару змешчаных у іх матэ-

рыялаў складаюцца з інвентароў прыватнаўладальніцкіх гарадоў і замкаў, дакументаў па рамяству і рамесных цэхах, дакументаў па гандлю, куплі-продажу і падзелу ўладанняў, магістрацка-актавых кніг, прывілеяў і грамат на самакіраванне, выданых цэнтральнай уладай і магнатамі, картаграфічных і іканаграфічных дакументаў і матэрыялаў па гісторыі ваеннай справы на Беларусі.

Колькасць архіўных матэрыялаў па гарадах і іх інфарматыўнасць розная. Больш за ўсё маецца дакументаў па Слуцку, Нясвіжы, Быхаву, Копысі, Давыд-Гарадку, Невелю і Себежу. Па іншых гарадах ёсць паасобныя дакументы, якія маюць фрагментарны характар. Аднак архіўныя крыніцы, дапоўненыя археалагічнымі і іканаграфічнымі матэрыяламі, дазваляюць раскрыць асноўныя аспекты праблемы гісторыі ваеннай справы ў сярэдневяковых прыватнаўладальніцкіх гарадах Беларусі.

1
глава

Прыватнаўладальніцкія гарады Радзівілаў і арганізацыя іх абароны

Прыватнаўладальніцкія гарады Беларусі ў XV—XVIII стст., як і падобныя да іх гарады іншых рэгіёнаў Еўропы, мелі ў большасці развітую сістэму фартыфікацыі. Ва ўмацаваных цэнтрах латыфундый магнаты бачылі надзейную абарону палітычнай, ваеннай і эканамічнай улады сваіх родаў. Адначасова гэтыя цытадэлі абаранялі магнатаў і іх гарады ад непрыяцельскіх войскаў, нападаў атрадаў варожых магнатаў-суседзяў і антыфеадальных выступленняў народных мас.

Як правіла, прыватнаўладальніцкія гарады мелі цэлы комплекс абарончых збудаванняў, звязаных да таго ж з умацаваннямі ўладальніцкага замка. Карыстаючыся фартыфікацыяй гарадоў, плошавая кампазіцыя якіх склалася яшчэ ў эпоху Кіеўскай Русі, магнаты мадэрнізавалі яе ў адпаведнасці з навейшымі патрабаваннямі ваеннай навукі да стратэгіі і тактыкі абароны, разлічанай на працяглую асаду і на агонь тагачаснай артылерыі.

Увядзенне ў гарадах нормаў магдэбургскага права надало старой

арганізацыі гарадскога апалчэння большую стройнасць і мабільнасць, бо ў пытаннях абароны свайго горада правы і абавязкі мяшчан былі больш канкрэтызаваныя і дэталізаваныя. У гэтым плане інтарэсы магнатаў і мяшчан супадалі, паколькі перапоўненая войнамі эпоха сярэднявечча абыходзілася са слабымі гарадамі без літасці, не раз сціраючы іх з твару зямлі.

У адрозненне ад большасці гаспадарскіх гарадоў прыватнаўладальніцкія гарады ўжо з сярэдзіны XVI ст. пачалі практыкаваць будаўніцтва бастыённых умацаванняў, карыстаючыся ўсімі вядомымі на той час у Еўропе сістэмамі фартыфікацыі. Гэтыя ўмацаванні былі самымі рознымі — ад найбольш складаных да самых простых. Усё залежала ад фінансавых магчымасцей феадалаў. Мацуючы і абараняючы свае рэзідэнцыі і гарады, магнаты Беларусі ставілі мяшчан у залежнасць ад сваёй палітыкі ў пытаннях абароны, трымаючы ў сваіх руках механізмы кіраўніцтва гарадскім апалчэннем. Дзякуючы гэтаму яны мелі магчымасць стрымліваць і нават падаўляць антыфеадальныя выступленні сваіх уладальніцкіх гарадоў, нейтралізаваць тыя сілы, якія маглі быць аб'ектыўным саюзнікам паўстаўшых сялян.

Найбольшую магутнасць у гэты час мелі гарады — цэнтры латыфундый буйнейшых беларускіх магнатаў Радзівілаў, Сапегаў, Ільінічаў, Глябовічаў і іншых, якія валодалі Нясвіжам, Слуцкам, Давыд-Гарадком, Шкловам, Быхавам, Гарамі, Мірам і іншымі гарадамі.

1. ГАРАДЫ РАДЗІВІЛАЎ У ЦЭНТРАЛЬНАЙ І ПАЎДНЁВАЙ БЕЛАРУСІ

Радзівілы былі магутнейшым магнацкім родам на Беларусі, Украіне і ў Літве. Яго прадстаўнікі ў XV—XVIII стст. займалі вышэйшыя дзяржаўныя, адміністрацыйныя і ваенныя пасады ў Вялікім княстве Літоўскім, у XVIII—XX стст. уваходзілі ў склад арыстакратыі Польшчы, Расіі, Прусіі і Аўстра-Венгрыі. Магнаты былі жорсткімі эксплуататарамі беларускага, украінскага і польскага народаў. Яны валодалі велізарнымі зямельнымі надзеламі, дзесяткамі мястэчкаў і гарадоў. Гэта дазваляла Радзівілам займаць першае месца сярод магнацкіх родаў Вялікага княства Літоўскага па эканамічнаму і палітычнаму становішчу. У XVI—XVIII стст. яны мелі вялікае ўласнае войска са шляхты і ваеннаслужылых людзей-зямян, выбранцаў і баяраў. Цэнтрамі іх латыфундый у Беларусі лічыліся Нясвіж і Слуцк, якія ў XVI—XVIII стст. выдзяляліся сваімі ўмацаваннямі. Акрамя таго, Радзівілам належалі Койданава, Давыд-Гарадок, Копысь, Мір, Клецк і іншыя гарады.

Нясвіж

Комплекс фартыфікацыі сярэдневяковага Нясвіжа складаўся з умацаванняў феадальнага замка, перабудаванага ў канцы XVI ст. з традыцыйнага драўлянага ў бастыённы, і бастыённых умацаванняў горада, таксама ўзведзеных у XVI—XVII стст. Першапачаткова Нясвіж не меў уласнай лініі фартыфікацыі. У выпадку ваеннай небяспекі яго жыхары хаваліся ў драўляным княжацкім замку. Гэтым замкам валодалі ў XV—XVI стст. Неміровічы, Мантыгірты, Кішкі. З 1513 г. замак трапляе ў валоданне Радзівілаў [1]. У 1583 г. М. Радзівіл арганізаваў перабудову драўлянага замка. У гэтай перабудове ўдзельнічаў італьянскі архітэктар Джавані Марыя Бернардоні. Перабудаваны замак меў у плане фор-

му чатырохвугольніка памерамі 170×110 м. Ён быў абведзены высокім земляным валам з бастыёнамі на вуглах. Пазней, у XVII ст., на бастыёнах збудавалі вежы. Дадаткова замак бараніўся ровам з вадою. Вада паступала з двух штучных ставоў — Паненскага і Піянерскага. Гэтая сістэма грунтавалася на водах р. Вушы. Бастыённыя ўмацаванні замка былі абмураваны каменем, бруствер таксама быў каменны. У сутарэнні меліся чатыры патаемныя хады да вады. Перад знешнім абарончым ровам, па яго краю, ішоў земляны насып з ячэйкамі для стралкоў, якія абаранялі перадполле замка. Пад'ёмны мост-узвод перад брамаю замка меў сістэму дадатковых умацаванняў. Яны садзейнічалі абароне моста і брамы, якія былі найбольш слабымі звёнамі ў сістэме абароны.



Нясвіж. Гравюра Т. Макоўскага. Пачатак XVII ст.

Бастыённы комплекс быў створаны ў адпаведнасці з традыцыямі новаітальянскай фартыфікацыі і на той час амаль што гарантаваў непрыступнасць Нясвіжскага замка [2].

У 1586 г. князь М. Радзівіл абавязаў жыхароў Нясвіжа збудаваць вакол горада новыя ўмацаванні і ў тым ліку дзве каменныя брамы ў абарончай лініі горада, «абы место замкнёно было». Праз адну браму можна было выйсці на Мір, праз другую — на Слуцк. Князь асабіста сачыў за ходам гэтых работ і таму сам пазначыў, дзе ставіць гэтыя брамы і якіх памераў яны павінны быць. Нясвіж, атрымаўшы магдэбургскае права («право Саское магдебургское»), на фартыфікацыйныя работы выдзяляў грошы са сваіх прыбыткаў. За гэта Радзівіл вызваліў мяшчан «от жнивных толок», аднак абавязаў іх кожны год «с каждого пляца оседлого насыпать по пруту (4,87 м.— *М. Т.*) земляной насыпи вала». Грамадскія ваеннаабарончыя работы здзяйсняліся агулам усімі мяшчанамі. Акрамя таго, у адпаведнасці з артыкуламі магдэбургскага права ў Нясвіжы была арганізавана вартаўнічая служба і служба барацьбы з пажарамі. Існавала таксама гарадское апалчэнне [3].

27 верасня 1592 г. са згоды ўсіх жыхароў Нясвіжскі магістрат прыняў спецыяльную «Ухвалу места Несвижского», у якой дэкларавалiся асноўныя абавязкі гараджан па абароне свайго горада. Згодна «Ухвалы», гараджане маглі быць вызваленымі ад абавязку выконваць «валовую работу» з тою ўмоваю, што будуць уносіць у бюджэт магістрата штогодна па 30 «грошаў літоўскіх» з кожнага пляца. На гэтыя грошы наймаліся спецыялісты — валмейсцеры, землякопы-капачы, муляры, іншыя

работнікі, якія даглядалі гарадскія ўмацаванні. Толькі ў тым выпадку, калі ўзнікала неабходнасць перанесці гарадскі паркан на новую абарончую лінію альбо калі прарывала ў воднай сістэме грэблю (дамбу), усе жыхары абавязаны былі з'яўляцца «як на гвалт». Пад час збору падаткаў беднякам і ўбогім давалася ільгота: яны плацілі падатак у растэрміноўку.

Кожны ўладальнік дома абавязваўся мець ручніцу, порах і кулі, а таксама з'яўляцца на пункт збору апалчэння па сігналу гарадскога «бубна». Асобы, якія не прыбылі зброі, спачатку штрафаваліся на адну капу грошай, а ў далейшым выраслася, ці можа такі чалавек жыць у горадзе. Гараджане, якія спазняліся на збор гарадскога апалчэння, плацілі ў бюджэт магістрата штраф у 12 грошаў [4].

Усе жыхары горада, што набудавалі дамы на зямлі горада як у Ста-

Нясвіжскі замак. Мал. І. Пешкі. XVIII ст.

Нясвіж. Мал. XIX ст.

рым, так і ў Новым, зарэчным «месце», мелі вартаўнічыя і ваенныя абавязкі. Выключэннем не былі яўрэі, якія жылі ў горадзе.

Гараджане ўдзельнічалі ў ваенных «паказах» і вучэннях — «муштрах». Кожны год усе дарослыя мужчыны ўдзельнічалі ў спаборніцтве стралкоў на прыз «караля курка». Гэтыя спаборніцтвы праводзіліся ва ўрачыстых абставінах у «шыхгаўзе» — пэўным месцы для стральбы за манастыром бенедыктынак. У лік першай чацвёркі стралкоў, як правіла, уваходзілі князь, яго жонка, губернатар Нясвіжскага замка і войт.

Нясвіжскі замак. Мал. XIX ст.

Князь і яго жонка маглі перадаць права першага стрэлу любой асобе.

Пасля першай чацвёркі стралялі члены магістрата і ўсе жыхары горада, якія мелі пры сабе зброю. Калі куля трапляла ў сярэдзіну мішэні, удалага стралка абвяшчалі на цэлы год «каралём курка». У гарадской ратушы яму ўрачыста надносілі аксамітны пояс са срэбнымі пласцінкамі. Імя пераможцы запісвалася ў магістрацкую кнігу, яго вызвалялі ад пэўных падаткаў і дазвалялі вольна «выкурыць» пэўную колькасць піва і брагі. «Кароль» на год прызначаўся наглядчыкам у «шыхгаўзе». Ён павінен быў за свой кошт набыць срэбную пласціну вагою ў 1 лот (крыху больш за 11 грамаў), на якой было выгравіравана яго імя, і прымацаваць яе на поясе. Калі перамагаў сам князь, яго жонка альбо губернатар, яны саступалі тытул «караля» любому жыхару Нясвіжа [5].

Да канца XVI ст. гарадскія ўмацаванні ў асноўным былі ўзведзены. Гравюра нясвіжскага картографа Тамаша Макоўскага, зробленая каля 1600 г., выяўляе Нясвіж, аснову абароны якога складаў высокі земляны вал. Ён меў выгляд пяцівугольніка. Сем бастыёнаў ахоплівалі горад з усіх бакоў. У горад можна было трапіць праз пяць брам — Слуцкую, Клецкую, Віленскую, Мірскую і Замкавую. Гарадскую фартыфікацыю абкружаў роў з вадою, злучаны з р. Вушаю. Перад кожнай брамай быў пад'ёмны мост. Не апошняе месца ў абароне горада займалі чатыры каменныя кляштары — бенедыктынскі, бернардзінскі і дамініканскі з комплексамі пабудоў, якія былі ўзведзены ў тактычна важных і выгадных месцах. Яны закрывалі прамы шлях да замка і былі сур'ёзнай пера-

шкодай для працiўніка. У XVII ст. дзеля ўмацавання подступаў да замка на левым беразе Вушы дадаткова пабудавалі вялікі бастыён з арылонамі і поўнай абмуроўкай, так званы тэт-дэ-пон — умацаванне, якое прыкрывае падыходы да моста [6].

Цікава, што абарончы роў з вадою вакол горада меў яшчэ і чыста гаспадарчую функцыю: ён быў зарыблены і лічыўся рыбным гадавальнікам. Аднак мяшчанам забаранялася лавіць тут рыбу. Па загаду князя за ровам пільна сачылі замкавы паручнік альбо цэйхварт, якія мелі права адбіраць у гараджан сеткі [7].

У XVII ст. гарадскія ўмацаванні будаваліся ў выпадку неабходнасці

Нясвіжскі замак. Натурны здымак В. Ждановіча

і перыядычна рамантаваліся. У асобе галоўнага будаўніка («будовничего»), які адначасова быў бурмістрам, магістрат заключаў пагадненне з брыгадамі будаўнікоў — «капачамі» (землякопамі), мулярамі, «цесляміі-дойлидами», якія павінны былі выканаць пэўную работу. За гэта плацілі грашыма, выдзяляўся задатак для падрыхтоўкі работ. Так, згодна з дагаворам ад 29 ліпеня 1652 г. «будовничего» бурмістра Яна Гановіча з «достославным мастером-муляром Якубам Безменном и четырьмя товарищами», у Нясвіжы пачалі будаваць дзве каменныя сцяны. Адна з іх ішла па валу ўздоўж ракі, другая — упоперак яе, ад грэблі, якая вяла да замка. Акрамя таго, рамантавалася Капыльская брама, дзе патрэбна было атынкаваць ніз, паправіць аркі брамы, вугал, які падмыла вада сажалкі, пабяліць усе пабудовы. Майстар павінен быў сам наклапаціцца пра падручных, падрыхтаваць будаўнічыя матэрыялы і выканаць усе работы з улікам рамонту адкосаў каменных сцен за чатыры

тыдні жніўня месяца. Уся работа ацэньвалася ў 20 коп грошаў, пры гэтым задатак у 6 коп выдаваўся адразу. Калі кантракт быў падпісаны, бурмістр, дзеля таго каб муляры «... весялей водле той стены ходили», выдзеліў ім на частаванне тры злотых і купіў на два злотых пятнаццаць грошаў піва і гарэлкі [8].

Звесткі пра будаўнічыя работы 1652 г. паказваюць, што каменныя сцены ў гэты час узводзіліся на ўсход і поўнач ад горада. З поўдня і захаду яны былі ўзведзены раней. Іх згадвае кароль Уладзіслаў IV у прывілеі, які быў выданы мяшчанам Нясвіжа 2 сакавіка 1633 г., як «...узведзеныя высока і грунтоўна сцены-муры Нясвіжа, дагледжаныя і забяспечаныя абарончымі ўмацаваннямі» [9].



План першага паверха Нясвіжскага замка



Нясвіжскі замак летам. Фота В. Ждановіча

Збудаванне гарадской фартыфікацыі Нясвіжа не было хуткім і адначасовым працэсам. Будоўля працягвалася многія гады. Гэты факт сведчыць пра эканамічныя магчымасці гараджан, на якіх ускладаліся непасільныя падаткі, і магчымасці магнатаў Радзівілаў, што змаглі на працягу 1584—1598 гг. не толькі збудаваць першакласны замак, але і закласці два касцёлы, два кляштары і вялікі калегіум для 200 манахаў.

У час руска-польскай вайны 1654—1667 гг. Нясвіж два разы — у 1654 і 1659 гг.— быў узяты штурмам, а яго ўмацаванні пашкоджаны. Аднак утрымаць горад царскія ваяводы не змаглі. Таксама беспаспяховымі былі аблогі замка. У 1660 г. ваявода Хаванскі даносіў цару, што вымушаны зноў пасылаць да Нясвіжа ваяводу С. Змеева, якому «... велел город осадить и промысел над Несвижем чинить сколько милосердный бог помощи подаст». Хаванскі пісаў, што вылазкі з горада ратных людзей — конных і пешых — наносяць яго людзям вялікую «шкоду», асаб-

ліва фуражырам, якія прыязджалі з-пад Ляхавіч на пошукі «хлебных запасов и конских кормов» [10]. Такім чынам, узяць Нясвіж у 1660 г. не ўдалося, але яго разбурэнне было даволі значным. Сейм Рэчы Паспалітай, улічыўшы папярэднія частыя «інкурсіі», а таксама той факт, што ў час апошняй асады горад быў зруйнаваны, дазволіў «мяшчанам, якія захавалі вернасць нам (каралю.— *М. Т.*) і Рэчы Паспалітай і ўзнагароджваючы іх сумленнасць», не плаціць падаткі (акрамя чопавага і мытнага) на працягу чатырох гадоў [11].

Палац і гадзіннікавая вежа ў Нясвіжскім замку. Фота В. Ждановіча

Прывілей караля Міхала Вішнявецкага ад 29 кастрычніка 1669 г. сведчыць пра ўзнаўленне ўмацаванняў горада, якія будуюцца зноў ад самага падмурка. Каб заахвоціць мяшчан, кароль часова вызваліў іх ад пэўных падаткаў: «... звычайнага, старога, новага і чопавага» [12]. Аднак справы даведзенага да галечы Нясвіжа ішлі блага. Князь Радзівіл бачыў гэта і, пажадаўшы давесці да ладу сваё родавае гняздо, пачаў сам «немалым коштам фартыфікаваць Нясвіж». Відаць, не без яго старання ў 1670 г. Варшаўскі сейм Рэчы Паспалітай зноў вызваліў мяшчан Нясвіжа на 20 гадоў ад выплаты мытных збораў і мыта старога і новага [13].

Горад не змог узнавіць поўнасцю свае ўмацаванні да пачатку Паўночнай вайны. Гэта прымусіла магістрат і ўсё «поспольство» з-за ненадзейнасці гарадской фартыфікацыі прасіць Радзівіла, каб ён дазволіў ім у выпадку неабходнасці хавацца за сценамі замка [14]. У сакавіку 1706 г. шведскі падпалкоўнік Траўтфэттар узяў Нясвіж штурмам. Праўда, у маі таго ж года шведскае войска пасля працяглай аблогі і штурмаў авалодала таксама замкам, разбурыўшы яго і ўзарваўшы бастыёны. Пры аблозе горада шведы тым не менш так і не здолелі зламаць супра-

ціўленне абаронцаў, якія заселі ў сценах езуіцкага калегіума і ў суседніх каменных пабудовах [15].

Пасля Паўночнай вайны ўмацаванні замка і горада ўзнавілі. Радзівілы і каралі Рэчы Паспалітай добра разумелі стратэгічную важнасць і значэнне Нясвіжа для Верхняга Панямоння і цэнтра Беларусі. З поўначы і захаду на подступах да горада ўзвялі дадатковыя бастыённыя ўмацаванні, якія правым краем упіраліся ў штучнае вадасховішча. Узноўлены замак, не страціўшы абароннага значэння, тым не менш зай-

Лесвіца ганка ў замку. Фота В. Ждановіча

Замкавая збраёўня

меў яўна рэпрэзентатыўныя абрысы. Тут па-ранейшаму было многа агнястрэльнай зброі. Так, у 1765 г. у ім налічвалася 36 гармат, галоўным чынам мясцовай адліўкі, сотні мушкетаў, карабінаў, «янычарак», пісталетаў і іншай зброі [16]. Гарнізон замка, на чале якога звычайна былі замежныя афіцэры, у сваёй службе ўсё больш арыентаваўся на падаўленне феадальных выступленняў прыгнечанага насельніцтва. Гэта асабліва відаць з прысягі капітана К. Бойсана, каменданта Нясвіжскага замка з 1760 г., у якой ён клянецца князю М. Радзівілу і яго сынам служыць «... верна, паслухмяна, ахвотна і бязгрэшна,... сваім здароўем і крывёю, як у гарнізоне, так і на полі брані, у баталіях ці штурмах і ва ўсіх ваенных патрэбах мужна і адважна адпор даваць, замак, мне даверапы, ні над якой прычынаю ў час рэвалюцый ці спакоя нікому... не здаваць, але ў ім да апошняга... бараніцца» [17].

Звестак пра васнную арганізацыю мяшчан Нясвіжа за XVIII ст. няма. Па аналогіі з іншымі ўладальніцкімі гарадамі Радзівілаў яна за-



Балконная крата ў замку. Фота В. Ждановіча

Камін у палацы Радзівілаў. Фота В. Ждановіча

Італьянскі даспех «Пярун вайны» пачатку XVII ст. са збраёўні Радзівілаў

Шлемы-штурмакі XVII ст.



Пласцінкава-кольчаты даспех XVI ст. Знаходка на балоце каля Нясвіжа



Тыпы зброі з Нясвіжскай збраёўні XVII ст.



Стрэльбы і пісталеты з калекцыі Радзівілаў



Нясвіжскія гарматы XVII—XVIII стст.

Нясвіжская гармата «Гідра». 1599 г.



Гармата «Папугай». 1600 г. Нясвіж



Гармата «Вінаград». 1600 г. Нясвіж



Нясвіж. План-схема ўмацаванняў горада і замка: 1 — замак; 2 — горад; 3 — Слуцкая брама; 4 — Клецкая брама; 5 — Віленская брама; 6 — Мірская брама; 7 — Замкавая брама

хавалася і дзейнічала па старых канонах да моманту далучэння зямель Беларусі да Расіі. У 1792 г. Нясвіжскі замак здаўся «российским войскам по заложении первых батарей». Таксама без цяжкасцей быў узяты і горад. Як адзначалі рускія афіцэры, яго ўмацаванні былі ў благім стане: «Ныне город окружающий земляной вал весьма ненадежен». Аднак стратэгічнае значэнне Нясвіжа «на вершине реки Неман» улічвалася. Таксама ўлічваліся і вартасці замкавай фартыфікацыі: «... замок может учинить изрядное сопротивление, ежели оный защищаться будет довольным числом храбрых воинов» [18].

Аднак у далейшым магутнасць гарадской фартыфікацыі страціла сваё значэнне.

Слуцк

Да канца XVIII ст. умацаванні Слуцка лічыліся наймацнейшымі ва ўсім Вялікім княстве Літоўскім.

Слуцк узнік у XI ст.[19] Ён раскінуўся па абодва берагі р. Случ. У хуткім часе ён ператварыўся ў паселішча з магутнай сістэмай гарадской абароны. Ужо ў 1409 г. упамінаецца Верхні замак з драўлянымі сценамі і вежамі [20]. Ён размяшчаўся ля сутокі ручая Бычок і Случы. Абарончы роў з вадою аддзяляў умацаваны дзядзінец — Верхні замак ад Ніжняга замка і гарадскога пасада, які хутка разрастаўся пад сценамі цытадэлі. У 1444 г. Слуцку было дадзена магдэбургскае права, што спрыяла яго хуткаму эканамічнаму развіццю.

Гісторыя сярэдневяковага Слуцка значна адрозніваецца ад гісторыі другіх уладальніцкіх гарадоў Беларусі. Пасля ажыццяўлення ў пачатку XVI ст. цэнтралізатарскай палітыкі вялікіх князёў і ліквідацыі ў дзяржаве ўдзельнай сістэмы ён да 1791 г. заставаўся цэнтрам адзінага ў Вялікім княстве Літоўскім удзельнага Слуцкага княства. З 1395 па 1612 г. ім валодалі князі Алелькавічы, затым яно перайшло да Радзівілаў [21]. Ужо ў 1442 г. Слуцк апынуўся ў паласе дзеянняў мяцежнага князя Свідрыгайлы.

На пачатку XVI ст. горад неаднаразова станавіўся аб'ектам нападаў крымскіх татараў. Летам 1502 г. слуцкае апалчэнне двойчы адбівала іх напады, спачатку разбіўшы адзін з татарскіх загонаў на р. Вушы, за Бабруйскам, затым у жніўні вытрымала аблогу іх шасцітысячнага войска. У 1503 г. татарскі трохтысячны атрад быў адкінуты ад Слуцка за Прыпяць і разбіты каля Давыд-Гарадка [22]. У сярэдзіне жніўня 1505 г. войска крымскага царэвіча Біці-Гірэя зноў апынулася пад сценамі горада. Яго жыхары, атрымаўшы звесткі пра паход татараў, добра пад-



План умацаванняў Слуцка. Пачатак XIX ст.

рыхтаваліся да абароны. Яны адбілі некалькі штурмаў. Татары рабілі падкопы, спрабавалі ўзарваць умацаванні і падпаліць горад, але жыхары мужна абаранялiся. Як адзначалася ў Іпацьеўскім летапісу, «и хотяху Татаре взяти Слуцк и не могоша, биша бо их из града крепко» [23].

У 1506 г. перакопскія царэвічы Біці-Гірэй і Бурнаш зноў з дваццацітысячным войскам аблажылі горад, абарону якога ўзначаліла ўдовая княгіня Анастасія. Татары не раз хадзілі на штурм, «подметы чынечи и огонь подкладаючи», аднак вымушаны былі адступіць, панёсшы вялікія страты. Затым іх разграмілі пад Клецкам [24].

У 1508 г. непадалёку ад Слуцка адзін з загонаў татараў зноў быў разбіты. У апошні раз набег крымскіх татараў зафіксаваны ў 1521 г. Акрамя таго, двойчы горад без поспеху брала ў аблогу войска мяцежнага М. Глінскага, якое чаргавала штурмы са спробамі запаліць умацаванні з дапамогаю прымётаў. Аднак абаронцы ўмела адбівалі праціўніка як з бланкаў, так і частымі вылазкамі [25].

Да канца XVI ст. Слуцк ператварыўся ў вялікі горад з развітымі рамяством і гандлем. Ён меў надзейную сістэму абароны.

Магутныя ўмацаванні меліся ў старажытнай частцы горада, так званым Старым Слуцку, дзе размяшчаўся Верхні (Горны) і Ніжні (Дольны) замкі з іх фартыфікацыйнымі комплексамі. Кварталы старога горада таксама былі абнесены магутным земляным валам з бастыёнамі, якія з'явіліся тут у апошняй чвэрці XVI ст.

Другая частка горада ляжала на левым беразе р. Случы і ўжо ў



«Арган». XVII ст.

XVI ст. называлася Новым Слуцкам ці Новым месцам. Яна таксама мела лінію бастыённых умацаванняў з абарончым ровам, у якую ўключаўся Новы замак, збудаваны яшчэ ў часы князёў Алелькавічаў. Кальцо ўмацаванняў вакол Старога і Новага Слуцка перарывалася толькі водамі р. Случы, якія запаўнялі роў перад земляным валам.

Па-за ўмацаваннямі знаходзіліся два неўмацаваныя прадмесці — з паўночнага ўсходу Востраў і з поўдня — Трайчаны, якія сфарміраваліся каля Траецкага манастыра [26].

Маскоўскі дзяк Трыфан Карабейнікаў, які ў 1593 г. праязджаў праз Слуцк, зафіксаваў тут «около городка острог на городовое дело,... а у града в воротах и у острогу,— заўважыў назіральны падарожнік,— стоят воротники и стрельцы с ружьями (ручницами), а в острог иноземца не сказав, не пустят» [27].

У горадзе мелася значная колькасць агнястрэльнай зброі. Большая яго частка ў 1595 г. трапіла да казакоў атрада Севярына Налівайкі, які захапіў горад восенню і вывез адсюль з сабою 12 лепшых гармат, 80 гакаўніц, 700 рушніц. Акрамя таго, С. Налівайка загадаў сабраць для яго 5000 коп грошаў літоўскіх [28], г. зн. каля 384 кг срэбра.

З 1612 г. Слуцк перайшоў ва ўласнасць Радзівілаў, якія валодалі ім з невялікім перапынкам (1695—1744 гг.) да пачатку XIX ст. У першай палове Слуцк меў комплекс першакласных умацаванняў. У спалучэнні з узброенымі фарміраваннямі гараджан і моцным гарнізонам з абучаных наёмнікаў (венграў, немцаў, палякаў і шведаў) і выбранцаў (салдат-

пехацінцаў, набраных з сяляк, «вольных людзей», дробнай шляхты, якія атрымалі за сваю службу зямлю) ён набыў сабе славу «непрыступнага бастыёна».

Інвентарныя апісанні Слуцка XVII—XVIII стст. дазваляюць уявіць і апісаць структуру гарадскіх умацаванняў таго часу. Сярэдневяковы Горны, альбо Верхні, замак займаў круглае ў плане ўзвышэнне — «капец» плошчаю каля 1,5 га. Ён быў абкружаны і абараняўся водамі р. Случы і ручая Бычок, якія напаўнялі вадзяны абарончы роў. Траплялі на тэрыторыю замка па мосце праз высокую чатырох'ярусную браму, на якой знаходзіліся гарматы. Драўляныя ўмацаванні Верхняга замка — сцены і вежы — стаялі на магутным земляным вале. Яны ўзвышаліся не толькі над горадам, але і над усёй ваколіцай, што дазваляла паспяхова адбіваць атакі праціўніка. Яшчэ ў 1791 г. у замкавай вежы — браме былі ўстаноўлены тры гарматы.

Дольны (Ніжні) замак аддзяляўся ад Верхняга абарончым ровам з вадою і меў форму няправільнага шматвугольніка, умацаванага валам і драўлянымі абарончымі збудаваннямі. Характэрна, што абодва замкі ніколі не мелі бастыённых збудаванняў, захоўвалі старую структуру і традыцыйныя мясцовыя дрэва-земляныя абарончыя канструкцыі. Дзякуючы грэблям на Случы і Бычку абодва замкі абмываліся вадою і ў комплексе выступалі як сур'ёзныя перашкоды на шляху праціўніка.

Абарончая лінія Старога Слуцка мела від магутнага земляного вала, які дугою ахопліваў старую частку горада з усходу, поўначы і захаду і ўпіраўся сваімі канцамі ў Случ. Тут мелася 12 бастыёнаў рознай канфігурацыі і памераў. Перад земляным насыпам знаходзіўся вадзяны роў. Трапіць у Слуцк можна было праз тры брамы, «вымурованные в валу»,— Астроўскую, Ільінскую (пазней Віленскую) і Капыльскую. Дакументы дазваляюць устанавіць, што гарадскі вал дасягаў у аснаванні шырыні не менш за 26,6 м, вышыні — прыкладна 8 м. Брамы Капыльская, Ільінская былі аднолькавых памераў у аснаванні — 25,6×36,6 м. Астроўская брама ў два разы меншая — 9,15×15,25 м. Доступ у вароты ішоў па пад'ёмных мастах, якія былі перакінуты праз вадзяны роў. На іх можна было трапіць праз дадатковыя прадмостныя ўмацаванні [29].

Цэнтрам абароны левабярэжнага Слуцка — Новага месца з канца XVI ст. лічыўся Новы замак. У плане ён меў форму квадрата з чатырма бастыёнамі і адным равелінам. На бастыёнах і курцінах стаялі драўляныя вежы [30]. Наяўнасць такіх вежаў, не характэрная для заходнееўрапейскай бастыённай фартыфікацыі, з'яўляецца, мяркуючы па ўсяму, асаблівасцю мясцовага ваеннага дойлідства. Новы замак абкружаў шырокі вадзяны роў, злучаны з р. Случчу патаемным шлюзам. У цытадэль было даволі складана прайсці: трэба было пераадолець мост і ўваходную браму, якія размяшчаліся перад галоўным уваходам у Новы замак. Затым па мосце праз вадзяны роў траплялі ў замкавую браму. Яна размяшчалася ў тоўшчы вала, была двухпавярховай і мела вароты з двума палотнішчамі, збітымі з дубовых дошак [31].

Кварталы Новага месца абкружалі ярападобныя па канфігурацыі вал і роў, якія сваімі канцамі сыходзілі да Случы. Тут мелася сем бастыёнаў і адна ўязная брама Новамейская, зробленая з дрэва. Памеры яе невядомыя. Перад валам знаходзіўся значны вадзяны роў, праз які перакінулі пад'ёмны мост. Па ім траплялі ў браму.

Агульная даўжыня гарадскіх умацаванняў Слуцка дасягала ў канцы XVIII ст. тры вярсты трыста сажэняў, г. зн. каля 3 км 840 м [32].

Як і іншыя гарады Беларусі, Слуцк меў значнае мяшчанскае апал-

чэнне. Яно было самым буйным у параўнанні з іншымі ўладальніцкімі гарадамі і складалася з чатырох палкоў, якія фарміраваліся па месцы жыхарства. Найбольш шматлікімі лічыліся полк слуцкага войта і полк Яна Стрэльніковіча. У 1655 г. у іх налічвалася 10 соцень з 18, якія былі набраныя з жыхароў Старога горада. Полк, сфарміраваны з жыхароў Новага месца, у колькасных адносінах раўняўся палку Астроўскаму. Жыхары Трайчанскага прадмесця складалі шостую сотню палка слуцкага войта. У асобныя сотні былі аб'яднаны сацыяльна неспакойныя элементы горада — «лёзные люди». У 1655 г. пад ружжом налічвалася 1800 чалавек гараджан, у 1681 г. у трох слуцкіх палках — 1095 чалавек. Чацвёрты—Астроўскі — полк ліквідавалі пасля сацыяльнага спусташэння прадмесця Востраў у 50-х гадах XVII ст. у час руска-польскай вайны.

Палкі падзяляліся на сотні і дзесяткі. Меўся свой камандны склад у асобах палкоўніка, сотнікаў, падсотнікаў, дзесятнікаў. Усіх іх прызначаў магістрат. Цэхавыя ваенныя арганізацыі слуцкіх рамеснікаў доўгі час уключаліся ў склад соцень, але ў сярэдзіне XVIII ст. яны ўжо вылучыліся з соценнай арганізацыі [33].

Усе апалчэнцы Слуцка абавязаны былі мець розную зброю — халодную і агнястрэльную: ручніцы, мушкеты, пісталеты, шаблі, бердышы, палашы, рагаціны, вілы. Уладальнікі агнястрэльнай зброі стаялі ўперамешку з тымі, у каго яе не было. Апошнія павінны былі ў выпадку трывогі прынесці на вал пяць камянёў памерам з кулак [34].

Узброены шляхціц

Мяшчане Слуцка доўга хадзілі ўзброенымі нават у мірны час. Аднак пасля руска-польскай вайны была ўведзена забарона насіць зброю ў мірны час, асабліва агнястрэльную. Рэскрыптам 1661 г. князь Багуслаў Радзівіл прапанаваў захоўваць мушкеты, амуніцыю і баявыя прыпасы ў спецыяльным гарадскім цэйхгаўзе. Пры гэтым гарантавалася, што зброя мяшчан не будзе выкарыстана на патрэбы гарнізона замка. Статуты рамесных цэхаў таксама забаранялі прыходзіць са зброяй на цэхавыя сходкі. Гэта запісаў у 1661 г. статут слуцкага цэха кушняроў, а ў 1664 г.— статуты цэхаў панчошнікаў, рымараў, сядзельнікаў, саф'яннікаў, слесараў, кавалёў, ткачоў і інш. [35]

Гарадскім уладам Слуцка Радзівіл прадпісаў рэгулярна праводзіць

заняткі па стральбе, ваенныя вучэнні, парады. Для «муштры», ваенных вучэнняў, заняткаў па стральбе адводзіліся асобнае месца і час. Важнай формай захавання ваеннай дысцыпліны ў мірны час з'яўляліся «попісы» членаў гарадскіх апалчэнняў. На плошчы перад Новым замкам мужчынскае насельніцтва павінна было пастроіцца па палках, сотнях і дзесятках абавязкова пры спраўнай зброі і неабходнай амуніцыі. Уладальнік няспраўнай зброі, згодна статуту 1621 г., плаціў штраф у чатыры капы грошаў. «Попісы» ў Слуцку праводзіліся звычайна ў снежні на працягу трох дзён у прысутнасці старасты, каменданта замка і войта. У ваенны час на «попіс» павінны былі з'явіцца не толькі мясцовыя жыхары, але і прыезджыя людзі са сваімі слугамі незалежна ад іх падданства, нацыі і веры [36].

У складзе гарадскога апалчэння з 1621 г. да сярэдзіны XVII ст. меўся атрад кавалерыі, які складаўся з заможных гараджан — купцоў, цэхмістраў і сотнікаў.

Генеральныя «попісы» звычайна завяршаліся стралковымі спаборніцтвамі, якія заахвочвалі ўладальнікі Слуцка. Трое лепшых стралкоў у якасці ўзнагароды на адзін год да чарговага «попіса» вызваляліся ад чынша і ўсіх гарадскіх павіннасцей, акрамя абарончай. Таксама практыкаваліся штомесячныя спаборніцтвы па стральбе для ўсіх жадаючых. Уладальнік горада са сваёй казны выдзяляў тры прэміі: за першае месца — мушкет, за другое — шаблю, за трэцяе — дзіду. З 60-х гадоў XVII ст. па распараджэнню Б. Радзівіла мяшчанам і гарадской моладзі дазвалялася з пачатку лета кожную нядзелю і па святах пасля абеда страляць у цэль. Пераможцы таксама ўзнагароджваліся падарункамі. Крамнікам-гандлярам порахам забаранялася прадаваць яго даражэй чым 2 грошы за фунт для тых, хто набываў яго для трэніровачнай стральбы [37].

Акрамя гарадскога апалчэння ў Слуцку меліся атрады так званых «гарадскіх выбранцаў». Яны набіраліся добраахвотна з мяшчан, якія неслі пастаянную ваенную службу, але не кідалі сваіх заняткаў рамяством альбо гандлем. Гэта асобае воінскае фарміраванне не ўваходзіла ў склад гарнізона магістрацкіх войскаў, а было падначалена магістрату. Сярод гарадскіх выбранцаў налічваліся людзі розных прафесій, у тым ліку прадстаўнікі гарадской беднаты — «лёзныя» і «падсуседзі», якія не мелі ўласных дамоў. У адрозненне ад астатніх гараджан выбранцы рэгулярна муштраваліся пад кіраўніцтвам прафесійнага ваеннага ручніка. Колькасць такіх салдатаў у Слуцку ў другой палове XVII ст. дасягала 100—130 чалавек. Яны былі ўзброеныя галоўным чынам мушкетамі [38].

Гарадское апалчэнне Слуцка выступала пад агульным сцягам — харугваю магістрата, аднак свае сцягі і пранарцы меў кожны полк, сотня і, напэўна, дзесятак. Таксама былі трубачы і барабаншчыкі [39].

Рамесная вытворчасць у горадзе ў XVII ст. дасягнула такога ўзроўню, што ў Слуцку выраблялі практычна ўсе віды халоднай і агнястрэльнай зброі. Тут працавала «людвісарня», дзе адлівалі гарматы, мелася парахавая майстэрня. Ва ўсе часы ў горадзе знаходзілася вялікая колькасць зброі. Так, у 1620 г. мелася 26 гармат, 130 гакаўніц, 83 ручніцы, не лічачы 150 ручніц, якія былі раздадзены выбранцам і атраду пяхоты, у 1661 г.— 40 розных гармат калібрам ад 3/4 фунта да 14 фунтаў, больш за 530 стрэльбаў і мушкетаў і 760 адзінак халоднай зброі. У 1746 г. у Слуцку было 66 гармат, у 1760 г.— 29 медных і 25 жалезных гармат, 12 марцір, 100 адзінак ручной агнястрэльнай зброі. Па сведчаннях 1767 г.,

ужо налічвалася 103 гарматы, у тым ліку шмыгаўніцы, марціры, чатыры дванаццаціствольныя «арганы» і іншая зброя. Нават у 1793 г. яшчэ мелася 28 медных гармат (з іх 9 навальных), 16 гакаўніц навальных, 4000 ядраў і 1430 артылерыйскіх зарадаў, 477 карабінаў і 19 000 набояў да стрэльбаў, многа волава, розная халодная зброя, ваенная амуніцыя [40].

Слуцк належаў да ліку гарадоў, у якіх дзейнічалі цвёрдыя правілы правядзення ваенна-фартыфікацыйных будаўнічых і рамонтных работ. Для гэтага збіралі спецыяльны грашовы падатак і прыцягвалі ўсё насельніцтва. Работы, як правіла, пачыналіся ў пачатку мая і працягваліся да позняй восені. Магістрат клапаціўся пра іх падрыхтоўку, папярэдне канцэнтраваў неабходную колькасць грошай, стварaў запас піламатэрыялаў, тачкі, лапаты. Ваенна-будаўнічыя работы ў горадзе ўзначальваў валмайстар. За ходам работ сачыла асобая будаўнічая камісія магістрата з трох чалавек. Практычна гэта быў кампетэнтны орган па архітэктурнаму і будаўнічаму нагляду, які сачыў за тым, як прытрымліваліся графіка пры будаўніцтве ўмацаванняў, мастоў, грэбляў, за якасцю будаўніцтва («каб месту шкоды не было»), за правільным выдаткаваннем сродкаў. Адным з пытанняў, якое знаходзілася пад наглядам камісіі, было супрацьпажарнае інспектаванне жыллёвых пабудоў — кузняў, лазняў і «броварaў». Узначальваў камісію галоўны будаўнік — «будаўнічы», які выбіраўся на год.

Спачатку ўсё гарадское насельніцтва прымала ўдзел у будаўнічa-рамонтных работах на гарадскіх умацаваннях. Затым гараджане атрымалі права адкупіцца, унёсшы ў магістрат тры злотых замест асабістай работы на валах на працягу тыдня. За грошы на валах працавалі групы пастаянных землякопаў — «капачоў», цесляроў — «цеслей». Яны мелі штотыднёвую плату: майстар — 4 злотых, цясляр — 3 злотых, «капачы» — 2 злотых. Кіраваў усім у 60—70-х гадах XVII ст. «валмістр Іван», які штомесяц атрымліваў платы па 6 злотых [41]. За агульным станам умацаванняў валмайстру дапамагалі сачыць два «дазорцы» — адзін у Старым, другі ў Новым горадзе. Яны абавязаны былі не менш аднаго раза ў тыдзень абыходзіць і аглядаць валы, больверкі і брамы, дакладваць «будаўнічаму», апошні — губернатару горада пра неабходнасць праводзіць дзе-небудзь рамонтныя работы. Таксама мелася асобая ахова, якая сачыла, каб гарадская скаціна, асабліва свінні, не пасвілася на валах [42].

Сваю частку ваенна-будаўнічых работ выконвала замкавая воласць. У прыватнасці, пад яе наглядам знаходзіўся рамонт моста праз ручай Бычок, які вёў ад рынка ў Ніжні замак, свая доля земляных валоў з парканам на іх у выглядзе гародняў. І горад, і воласць строга трымаліся «старины», выконваючы сваю частку фартыфікацыйных работ. Парушэнні не дапускаліся. Толькі ў 1655 г. гараджане па просьбе каменданта Слуцка згадзіліся адрамантаваць мост за воласць, але адразу запатрабавалі ад каменданта распіску аб тым, што робяць гэта ў выглядзе выключэння, з улікам таго што воласць даведзена да галечы ў час вайны, і надалей іх не будуць абавязваць рамантаваць мост [43].

Дагляд і рамонт умацаванняў у Слуцку вяліся практычна круглы год. Адны работы змяняліся другімі. Прадбачыўшы якія-небудзь работы, жыхары часта загадзя рыхтавалі будаўнічыя матэрыялы альбо да марозаў капалі ровікі на вале, каб можна было ставіць палісад і зімою. Паколькі вадзяныя равы з'яўляліся сур'ёзнай перашкодай на шляху праціўніка, за іх станам сачылі нават зімою, вызвалялі ад лёду значную частку прасторы. Як толькі пачыналася пара ледаставу, магістрат штодзённа выдзяляў людзей, якія «лёд секлі каля Новай фартэцыі» і ў розных месцах каля Старога і Новага горада. За працу плацілі кожны тыдзень. Пры гэтым улічваліся ставы, зробленыя на Случы. Акрамя таго, рэгулярна прызначалася група работнікаў, якія «снег з валу скідалі» [44].

Паступова самі жыхары, аб'яднаныя ў сотні, усё радзей прымалі непасрэдны ўдзел у ваенна-фартыфікацыйных работах, пераважна замест гэтага ўносілі грошы, за якія магістрат наймаў кваліфікаваных «цесляў-дойлідаў», «капачэй», «муралёў» і іншых будаўнікоў. Акрамя іх «на вал» пасылалі ўсіх парушальнікаў законаў унутрыгарадскога і ўнутрыцэхавага жыцця. Так, у 1666 г. рамеснікі-«партачы» і тыя, хто не выканаў у тэрмін заказы альбо рамонты якіх-небудзь рэчаў (абутку, адзення і г. д.), караліся «валовай работай» на час адтэрміноўкі выканання заказу. Той рамеснік, які браў задатак і не выканаў заказ альбо падсунуў заказчыку чужы тавар, караўся месячнай работай «на вале». Караліся і другія парушальнікі цэхавых рамесных статутаў, аб'яднаныя тэрмінам «свавольныя рамеснікі». «На вал» пасылалі вазіць тачкамі зямлю злодзеяў, віна якіх была даказана, а таксама мяшчан, што не маглі выплаціць «падымнае».

Скасаванне доўгу ішло за кошт штодзённага заробку, паколькі штрафнікам плацілі ўдзень па 12 грошаў. Часта да «гарадавой работы» прыцягвалі не толькі «лёзных» людзей, якіх у Слуцку было нямала, але і здольных да працы жабракоў. Для гэтага па ўзгадненню са «старастам калецкім» рабілі агляды, выдавалі калекам асобыя знакі — «цэшкі», вызваляючы ўбогіх ад працы, а астатніх, як мужчын так і жанчын, пасылалі «на вал». Магістрат загадаў строга караць жанчын лёгкіх паводзін — «непачцівых жанчын, распуст», якія канцэнтраваліся ў корчмах. Такіх загадана было браць над арышт і пасылаць на самыя брудныя работы — чэрпаць твань з абарончых равоў, чысціць вуліцы і інш. [45]

Сіла і магутнасць горада таго часу базаваліся не толькі на яго ўмацаваннях і ўзброеным мяшчанстве. Не меншае значэнне мела забяспечанасць гараджан на выпадак асады правіянтам і вадою. Водазабеспячэнне ў Слуцку вырашалася лёгка: р. Случ падзяляла горад папалам, запаўняла да таго ж вадзяныя абарончыя равы. Аснову правіянту складала зерне. Хлеб збіралі ў асобым складзе — гарадскім «правіянтхаўзе». Кожная сям'я прапарцыянальна колькасці членаў здавала сюды штогод пэўную колькасць карцоў зерня. Акрамя таго, мяшчане мелі таксама запас хлеба дома. Ведалі гарадскім хлебасховішчам, сачылі за станам зерня, прасушваючы і праветрываючы яго, два прызначаных магістратам «правіянтмейсцеры». Вясной запасы хлеба аднаўляліся: стары хлеб прадавалі і куплялі новы на выручаныя грошы.

Рэгулярна правяралася колькасць зерня з недатыкальнага запасу ў мяшчан. Кожны карэц зерня, якога не хапала да прызначанай колькасці, абкладаўся штрафам, які ў 1666 г. дасягнуў аднаго злотага. Пры адсутнасці наяўнага хлеба дазвалялася рабіць грашовыя запасы, узгадняючы суму з рыначнай цаной хлеба. Ва ўмовах ваеннай пагрозы ўся «жыўнасць» залічвалася па разраду «амуніцый». Па ўсіх брамах пільна сачылі, каб з горада не вывозіліся не толькі порах, волава, сера і салетра, але таксама зерне, саланіна і іншыя прадукты харчавання [46].

Нормай запасу правіянту на аднаго чалавека лічыўся запас, які дазваляў вытрымаць асаду працягласцю ў год. Толькі на такіх умовах прымалі ў Слуцк шляхту з чэляддзю, мяшчан з іншых гарадоў, магчыма, сяляк, якія беглі ад вайны. Тых, хто не меў неабходнай колькасці правіянту, з горада выганялі. Выключэнне складалі «людзі ўбогія» — калекі, адзінокія старыя і іншыя, якія знаходзіліся на ўтрыманні гарадской абшчыны [47]. У пачатку аблогі хлеб «з правіянтхаўза» раздаваўся жыхарам згодна рэестра. Частку хлеба выдавалі гарадскім пекарам, якія прадавалі спечаны хлеб толькі мясцовым жыхарам. Магістрат строга

кантраляваў вагу спечаных хлебабулачных вырабаў чатырох гатункаў, якая вагалася ад 1 фунта 22 залатнікоў да 9 фунтаў 4 залатнікоў. Пры гэтым гатовы хлеб прадаваўся па цэнах, якія строга рэгуляваліся і знаходзіліся ў прамой залежнасці ад цэн на хлебным рынку. Калі адзін слуцкі карэц жыта (101 л ці 253,2 кг.— *М. Т.*) каштаваў 1 злоты 15 грошаў, то цана і вага печанага хлеба выглядала наступным чынам: 1 1/1 гроша каштаваў бохан хлеба вагою 4 футы 28 залатнікоў, 3 (тры) грошы — 9 фунтаў 25 залатнікоў, 6 грошаў — 19 фунтаў 18 залатнікоў, 12 грошаў — 39 фунтаў 4 залатнікі.

Калі рынкавая цана на зерне падымалася да 10 злотых за адзін слуцкі карэц, грашова-вагавая карціна выглядала інакш: 1 1/2 гроша каштавала булка вагою 1 фунт 22 залатнікі, 3 грошы — 3 фунты 12 залатнікоў, 6 грошаў — 6 фунтаў 24 залатнікі, 12 грошаў — 13 фунтаў 16 залатнікоў [48].

У XVIII ст. прынцып нарыхтоўкі хлеба на выпадак вайны змяніўся. Нарыхтоўкай сталі распараджацца рамесныя цэхі. Так, у маі 1705 г. слуцкі кушнерскі цэх нарыхтаваў 105 карцоў жыта, скураны — 80 і яшчэ павінны быў купіць 20 [49].

У поўнай адпаведнасці з нормамі магдэбургскага права захоўвалася ў Слуцку супрацьпажарная бяспека. У сярэдневяковым горадзе добра ведалі, што такое спусташальны пажар. Магістрат Слуцка ў XVII ст. прыняў і здзейсніў шэраг пастаноў, накіраваных на ўзмацненне супрацьпажарнай бяспекі, асабліва ва ўмовах ваеннага часу. У магістраце меліся выбарныя пасады двух ці трох «стражнікаў ад агня», якія мелі пад сваім наглядам пэўныя ўчасткі горада — уласна «места», падзамак, Новае месца. Ім былі падпарадкаваны спецыяльныя памочнікі — «коміннікі» — трубачысты, якія сачылі за станам комінаў у дамах гараджан, брамах, кузнях і саладоўнях. Калі ўладальнікі печаў не слухаліся «коміньніка», ён паведамляў аб гэтым «стражніку агня». Апошні прымаў адпаведныя меры супраць парушальніка. Справа канчалася галоўным чынам штрафам і тым, што вінаваты вымушаны быў падпарадкавацца. Акрамя таго, у час, спрыяльны для пажараў, на горадзе хадзілі «клікуны», якія напаміналі гараджанам пра неабходнасць перасцерагацца ад пажару. Кожны гаспадар абавязаны быў трымаць у двары вялікую бочку з вадою. Кожны дзесятак абавязваўся мець драбіну, зробленую такім чынам, што на кожнай перакладзіне мог стаяць чалавек. Драбіны захоўваліся ля вуглавых дамоў і вешаліся на сцяну так, каб іх можна было хутка зняць. Кожныя два дзесяткі мелі бусак, які захоўваў дзесятнік. У выпадку пажару было забаронена з'яўляцца на пажар з пустымі рукамі. Прыбягалі з бусаком, сякерай альбо з вядром. Пажар тушыць абавязаны былі ўсе. Тых, хто ўхіляўся ад барацьбы з агнём, маглі пагнаць на пажар сілаю альбо бізуном. Выключэннем былі пажары ў час аблогі, калі мужчыны, што знаходзіліся на абарончым вале, не мелі права пакідаць свае месцы. Гэта не датычылася толькі сотні, на тэрыторыі якой узнікаў пажар. У час аблогі пажар тушыць абавязаны былі жанчыны.

Калі пажар пачынаўся з-за недагляду ўладальнікаў дамоў, яны караліся штрафам у 10 коп грошаў альбо шасцімесячным зняволеннем у астрозе. Наўмысных падпальшчыкаў, згодна артыкулаў магдэбургскага права, каралі жудаснай смерцю — палілі іх жыўцом.

Кожную нядзелю магістрат праводзіў агляд супрацьпажарнага інвентару — бочак з вадою, бусакоў — «гакаў», драбін, вёдраў, вяровак, канатаў і інш. Частку інвентару набывалі і майстравалі за кошт магістрата.

Па чарзе кожны мяшчанскі полк і рота выдзялялі дазорную варту, якая пастаянна дзяжурыла на званіцах цэркваў Спаскай, Уваскрасенскай, Юр'еўскай, Раждзественскай і на яўрэйскай школе. Кожную гадзіну ў вячэрні і начны час, як толькі пачынаў адбіваць замкавы гадзіннік, пажарныя дазорцы абавязаны былі адазвацца гукам труб ці пішчалак. Раз на год праводзіўся генеральны агляд пажарнага інвентару [50].

Мяшчан заклікалі да асцярожнага абыходжання з агнём. Уладальнікам крам забаранялася насіць агонь па вуліцы пад пагрозай кары. Гандлярам порахам забаранялася мець у краме больш за тры фунты пораху. Як і ў іншых гарадах Беларусі, у Слуцку закрываліся гарадскія лазні, тушыўся агонь у печках, кузнях, саладоўнях, у іншых месцах па сігналу спецыяльнага звона. На захадзе сонца брамнік Капыльскай брамы званіў праз кожную чвэрць гадзіны і жыхары гасілі агонь у дзесяць гадзін вечара. Аднак тым, хто займаўся рамяством, дазвалялася карыстацца святлом каганцоў і свечак. У корчмах гаспадары абавязаны былі тушыць святло і выпраўляць наведвальнікаў. Калі ў якога-небудзь карчмара пасля сігналу яны заставаліся, то ўладальнік плаціў штраф па аднаму злотаму за чалавека, а п'яніц адпраўлялі начаваць у астрог і назаўтра цэлы дзень прымушалі працаваць на вале альбо на грэблі [51].

У сувязі з вайною ў горадзе прымаліся меры па барацьбе з нябачным праціўнікам — эпідэмічнымі захворваннямі, якія былі спрадвечнымі спадарожнікамі працяглых войнаў. Так, у жніўні 1655 г. па ўсіх брамах Слуцка былі пастаўлены спецыяльныя вартаўнікі. Яны мелі задачу не пускаць у горад чужых людзей, а ў мясцовых жыхароў, што вярталіся ў горад, дазнацца ў прысутнасці каменданта, куды яны ездзілі і праз якія мясцовасці ехалі. Калі выяўлялася, што шлях пралягаў праз заражаныя эпідэміяй мясцовасці, такіх людзей у горад не пускалі. Ахоўныя эпідэміялагічныя кардоны былі ў Слуцку яшчэ ў 1660 г. Тады забаранялася пускаць у горад мяшчан, якія адсутнічалі ў горадзе 10 тыдняў, у кожным асобным выпадку праводзілася дазнанне пра шляхі, якімі чалавек дабіраўся да Слуцка. Няма сумнення, што магістрат быў добра дасведчаны пра месцы, у якіх лютавалі эпідэміі. Дзякуючы прынятым мерам у Слуцку заразныя хваробы не выяўляліся на працягу ўсёй рускапольскай вайны 1654—1667 гг. [52]

Са студзеня 1654 г. у горадзе дзейнічаў асобы статут, які рэгуляваў правілы паводзін узброенага мяшчанства ў час трывог і аблог: па першаму ж загаду неабходна было мець напагатове ў сваім доме зброю, порах і кулі; ні ў адзін звон ніхто не меў права званіць пад страхам смерці; біць у гарадскія бубны і збірацца ў групы без дазволу губернатара забаранялася, а калі была якая-небудзь трывога, ніводзін мешчанін не меў права выходзіць з дома са зброяй, пакуль не стрэліць з Вышняга замка гармата, у гэты ж час павінны былі ўдарыць у мясцовыя бубны, кожны мешчанін станавіўся да свайго сотніка (калі абставіны не крытычныя, сотнікі з людзьмі павінны з'явіцца да палкоўніка), калі была тэрміновая неабходнасць, кожная сотня бегла на валы ў прызначанае месца; калі якая трывога здаралася ноччу, мяшчане павінны былі весці сябе таксама, як і днём, а свечы альбо святло выстаўляліся ў вокнах; у час штурму ні гукам, ні крыкам, ні словам давалі адпор праціўніку, а толькі мужным змаганнем, да таго ж у гэтым быў сэнс яшчэ і таму, што афіцэры маглі камандаваць, мяркуючы па абставінах, і трэба было без крыку і канфузіі альбо трывогі рабіць тое, што пры крыках зроблена быць не можа; забаранялася страляць у непрыяцеля, давалі яму падступіцца на блізкі стрэл: тыя, хто пры гакоўніцах стаяў, абавязаны былі

ўсе рэчы мець напагатове і ўсё, што патрабуецца, каб потым ніякімі адгаворкамі не прыкрывацца; каб на валах стаялі ўперамежку тыя, у каго ручная халодная зброя і агнястрэльная, а хто ручной зброі не меў, павінен быў прынесці з сабой на вал пяць камянёў памерамі з кулак; забаранялася ў час пажарнай трывогі пакідаць сваё месца і бегчы да агню без дазволу, хіба толькі той сотні, на «кватэры» якой гарэла; агонь павінны былі тушыць жанчыны вёдрамі з вадой [53].

Добра адладжаная сістэма абароны Слуцка неаднаразова ўздзейнічала на ход ваенных дзеянняў XVII—XVIII стст. Так, у жніўні 1648 г. двухтысячны атрад украінскіх казакоў і беларускіх сялян не змог узяць у час аблогі і штурмаў гарадскіх умацаванняў. Паўстанцы нанеслі вялікія страты, а пазней ля в. Пагост былі разгромлены [54].

З 2 на 6 верасня 1655 г. горад без поспеху трымала ў аблозе дваццацітысячнае войска рускага ваяводы А. Н. Трубяцкога. З 27 па 30 верасня аблога паўтарылася, прычым да ваяводы падыйшло падмацаванне ў пяць тысяч казакоў на чале з І. Н. Залатарэнкам. Аднак горад узяць не ўдалося. А. Н. Трубяцкі адступіў, спаліўшы прадмесце Слуцка і навакольныя сёлы [55]. У ходзе вайны 1654—1667 гг. горад ні разу не быў узяты войскамі праціўніка.

Аднак сіла ўзброенага мяшчанства, асабліва бяднейшая яго частка, пагражала небяспекай сацыяльнага выбуху. Яна магла павярнуць зброю і супраць заможнай праслойкі гараджан і супраць уладальніка горада. Пра гэта сведчаць хваляванні, якія здарыліся ў 1661 г. і былі выкліканы тым, што князь увёў новы падатак з гандлёвага абароту. У 1699 г. адбыліся хваляванні супраць рабаўніцтва і гвалту гарадской вярхушкі. Абодва выступленні падавіў гарнізон княжацкага замка. У 1700 г. у Слуцку зноў адбыліся хваляванні, з-за якіх прыйшлося прысласць сюды тры эскадроны драгунаў [56]. У падобных сітуацыях зыход справы вырашаўся і залежаў ад надзейнасці наёмнага гарнізона, які звычайна ўзначальвалі нямецкія афіцэры. Не выпадкова, паступаючы на пасаду каменданта Слуцка, адзін з іх маёр немец Якуб Берд прыносіў прысягу, у якой ён абяцаў не толькі процістаяць «непрыяцелю князя (Міхаіла Казіміра Радзівіла.— *М. Т.*) здароўем і крывёю ў гарнізоне ці ў полі ў баталіях і штурмах, ва ўсіх ваенных патрэбах, дзе, куды і ў каторыя буду камандзіраван», але таксама кляўся імем Бога не здаваць ні па якой прычыне давераную яму слуцкую фартэцыю і цытадэль «пад час рэвалюцый» [57].

У студзені 1705 г. узброеныя фарміраванні мяшчан даказалі сваю баяздольнасць у сутычцы з драгунамі генерала Сяніцкага, якія паспрабавалі запатрабаваць з гараджан 13 тыс. злотых на выплату ўтрымання. У ходзе двухгадзіннага бою гараджане забілі каля паўтара дзесятка салдат, многіх паранілі і прымусілі драгунаў рэцірацца з горада. Каб разняць удзельнікаў сутычкі, камендант цытадэлі вымушаны быў накіраваць 6 рот салдат слуцкага гарнізона [58].

Разам з тым неабходна адзначыць, што ў цэлым ваенна-фартыфікацыйны патэнцыял сярэдневяковага Слуцка быў вялікім. Гэта рэальна адзначалася і яго ўладальнікам Радзівілам і ўрадам Рэчы Паспалітай. У крытычныя моманты гісторыі — паўстанняў 1648—1653 гг., рускапольскай вайны 1654—1667 гг.— ім удалося выкарыстаць магутнасць і непрыступнасць Слуцка ў сваіх інтарэсах. Не выпадкова сеймы Рэчы Паспалітай надалі гораду ў 1649, 1653, 1655 і 1677 гг. так званыя «ліберцыі» — вызваленні мяшчан ад розных дзяржаўных падаткаў, падкрэслівалі заслугі Багуслава Радзівіла, які ўтрымліваў за свой кошт у замку каля 1000 драгунаў, рэйтараў і вянгерскай пяхоты на працягу ўсёй ру-

ска-польскай вайны [59]. «Непрыступны бастыён Літвы» (так называлі тады Слуцк) трапіў пад пратэкцыю вышэйшых уладаў Вялікага княства Літоўскага і Польшчы, якія забаранілі ў 1658—1660 гг. пастой войскаў і вызвалілі горад ад усякіх паборaў на карысць каралеўскіх войскаў і нават забаранілі размяшчаць паблізу вайсковыя часці, каб не ствараць гараджанам харчовыя цяжкасці [60]. Праўда, у 1662 г. Б. Радзівіл, згодна рашэнню сенацкай камісіі, атрымаў грашовую «сатысфакцыю» за тое, што ўтрымліваў за свой кошт 1000 салдат. Яму заплацілі каля 555 тыс. злотых і абяцалі пазней выплаціць яшчэ 152 тыс. злотых [61]. Такім чынам, багацце, якім валодаў Б. Радзівіл, было велізарным.

На працягу XVIII ст. Слуцк заставаўся магутным умацаваннем, не раз прыцягваў да сябе сілы розных груповак магнатаў, якія змагаліся паміж сабою [62]. У 1780 г. рускія афіцэры, якія складалі тапаграфічнае апісанне Слуцка, адзначылі непашкоджаны стан яго ўмацаванняў, у тым ліку ўсіх чатырох брам горада [63]. Аднак, апынуўшыся ў глыбіні Расійскай імперыі, умацаванні Слуцка страцілі сваё першапачатковае значэнне і паступова прыйшлі ў заняпад.

Мір

Паселішча Мір, вядомае з 1395 г. [64], размяшчаецца на высокім беразе р. Міранкі. У сярэднія вякі праз яго праходзілі важныя гандлёвыя шляхі на Вільню, Менск, Слонім, Наваградак. Гэта садзейнічала фарміраванню і эканамічнаму развіццю мястэчка, якое атрымала ў пачатку XVI ст. уласную лінію ўмацаванняў [65]. На супрацьлеглым беразе ракі тады ж быў узведзены адзін з самых магутных на Беларусі каменных пяцівежавы замак князя Юрыя Ільініча — дворнага маршалка і ваяводы Берасцейскага [66]. Мірскі замак узнік на месцы паселішча, якое існавала тут раней, у XV ст., і загінула на пачатку XVI ст. у выніку моцнага па-

Мірскі замак. Літаграфія XIX ст.

жару [67]. Верагодна, гэта сляды «двора Мирского», які апошні раз упамінаўся каля 1506 г. у Мстрыцы Вялікага княства Літоўскага і які потым змяніла каменная цытадэль з яе комплексам абарончых і гаспадарчых пабудоў замкавага двара [68]. Раён Міра быў у зоне набегаў крымскіх татараў, таму ёсць усе падставы звязваць гэты пажар ці з ужо вядомым рэйдам у 1506 г. пад Наваградак, Ліду, Слуцк і Менск, ці з загонамі 1503—1505 гг. [69]

Адначасова з пабудовай замка з'явіліся ў Міры і гарадскія ўмаца-

Замак у Міры. Мал. Н. Орды. XIX ст.

ванні ў выглядзе земляного вала з драўляным «парканом» і чатырма драўлянымі, пазней каменнымі ўязнымі брамамі: Віленскай, Менскай, Замкавай і Слонімскай [70].

Пасля 1568 г. Мір перайшоў у валоданне Радзівілаў, сваякоў Ільінічаў. У 1579 г. князь Мікалай Радзівіл даў гораду прывілей, у якім былі запісаны таксама павіннасці гараджан. У ім гаварылася, што князь, клапоцячыся аб міранах «яко о добрых людях и верных подданых наших, ... к расширению и оздобе того места», лічыў, што яны «повинны на гвалт до гребли от шкоды гвалтовной на займованне воды бегчы, коловроты, мосты, плоты водлуг потребы оправлять» [71]. Пазней гэтыя павіннасці неаднаразова былі пацверджаны і кожны раз гаварылася пра рамонт збудаванняў, звязаных з грэбляй, пад'ёмнымі механізмамі і мастамі. І гэта не выпадкова, таму што, як і ў іншых невялікіх гарадах і мястэчках Беларусі, у Міры сістэма абароны ў многім базавалася на максімальным скарыстанні абарончых якасцей рэльефа і водных перашкод, якія ствараліся звычайна штучна. Паўночная частка ўмацаванняў горада мела сур'ёзную водную перашкоду, якую ўтварала грэбля млына, а ніжэй — дамба, дзе ўзровень вады рэгуляваўся. На іх можна было трапіць праз Замкавую і Менскую брамы. Ёсць падставы думаць, што згаданыя ў дакументах «коловроты» і «мосты» маюць непасрэднае дачыненне ў першую чаргу да гэтых брам. Яны, верагодна, мелі пад'ёмныя часты-«ўзводы», якія падымаліся і апускаліся з дапамогай неабходных механізмаў пад'ёма — «коловротов». У Віленскай і Слонімскай

брамах такія масты таксама маглі быць, бо перад валам, у якім яны былі ўладкаваны, меўся абарончы роў. Рэшткі земляных валоў і равоў захаваліся ў некаторых месцах да цяперашняга часу.

Магчыма, у канцы XVI ст. у Міры, як і ў суседнім Нясвіжы, драўляныя брамы горада пачалі замяняць на каменныя. Для гэтага тут меліся не толькі сродкі, якія спаганяліся з насельніцтва, але і майстры. Адзін з іх «муляр» Мартын Забароўскі, які ў розныя гады мураваў мірскія і нясвіжскія абарончыя пабудовы, згадваецца ў граматах князя М. Радзі-



Мірскі замак у XVII ст. Рэканструкцыя Я. Куліка

віла ад 19 красавіка 1594 г. Князь загадаў свайму мірскаму намесніку Андрэю Скарульскаму даплаціць за гэтыя работы 45 коп грошаў літоўскіх «... из провентов мирских» [72]. У тыя часы гэта была значная сума грошай, якая да таго ж пэўна паказвае на вялікі аб'ём выкананых работ.

Далейшы рост паселішча прывёў да ўзнікнення «Нового места» — гарадскіх кварталаў, якія размяшчаліся на Менскім выездзе ў правабярэжнай частцы горада. «Новамейскія валокі» называюцца ў інвентары Міра пад 1647 г. [73] Цікава, што ў той час разам з Менскай, Віленскай і Замкавай брамамі ўпамінаецца «брама Аюцэвіцкая», але не згадваецца Слонімская брама. Відаць, што гэта адна і тая ж брама, паколькі ў інвентарах другой паловы XVII ст. называецца толькі Слонімская брама [74].

У перыяд руска-польскай вайны ў канцы жніўня—пачатку верасня 1655 г. войскі рускага ваяводы А. Н. Трубяцкога і ўкраінскага палкоўніка І. Н. Залатарэнкі ўзялі ў Панямонні шэраг гарадоў, у тым ліку Мір. У данясенні цару паведамлялася, што войскі, «... идучи к Слониму город Мир и иные городки и места, и села, и деревни по разным дорогам, и хлеб, сена, и всякие конские корма выжгли и людей побивали и в полон имали, и совсем разоряли без остатку» [75].

Уступленне ў вайну ў чэрвені 1655 г. Швецыі, каралю якой Карлу X прысягнуў гетман Януш Радзівіл, здрадзіўшы польскаму каралю Яну Казіміру, прывяло ў канчатковым выніку да з'яўлення шведаў на Беларусі ў валоданнях Радзівілаў. У тым жа годзе яны надоўга аблажылі Мір, які ад гэтага моцна пацярпеў. Гэта аблога закранула гарадскія ўмацаванні і замак, дзе на той час ужо мелася знешняя лінія абароны ў выглядзе бастыённых умацаванняў [76]. Як сведчаць дакументы 60—80-х гадоў XVII ст., на ўзбраенні гараджан была самая разнастайная зброя: гакаўніцы («в простой осаде»), мушкеты, кнотавыя асаджаныя самапа-



Мірскі замак. Мал. Я. Драздовіча

Вежы Мірскага замка. Мал. Я. Драздовіча

лы, дзіды, бердышы, булавы, «оббитые железом», і нават гарматы. Частка зброі ў 1660 г. была перададзена ў Нясвіж — 20 гакаўніц, 22 кнотавых мушкеты, 4 самапалы, 22 мушкетных ствалы і 17 кнотавых замкоў [77].

Адсутнасць дэталёвых інвентароў Міра не дазваляе гаварыць пра характар яго ўмацаванняў і іх параметраў. Аднак каменныя брамы «места» пастаянна называюцца ў інвентарах канца XVII—XVIII ст., а



План замка (паводле А. Я. Міцяніна і аўтара)



Рэшткі барбакана-перадбрам'я замка. Раскопкі аўтара

павіннасці мяшчан заставаліся нязменнымі і ў XVIII ст.: «мосты, парканы водлуг давнего звычаю оправляти и новые ставить повинны, а на греблю на гвалты выходить» [78].

Кіраўніцтва па ўзнаўленню ўмацаванняў у Міры, як і прыгляд за фартыфікацыяй замка, ажыццяўляў гараднічы. Пад яго кіраўніцтвам

Мірскі замак. Натурны здымак В. Ждановіча

у 80-х гадах XVII ст. працавала група цесляроў: Гарута, «мастер цесляpскій, цесли Мікалай, Юрка, Чурскій, Лаврын Стяпура, Дударчык». Усім ім была ўстаноўлена памесячная плата па 3 злотых [79].

Брыгада муляраў складалася з чатырох майстроў і чатырох памоч-



Вежа-брама замка

Вуглавая вежа

Мірскі замак. Унутраны інтэр'ер вежы

нікаў. Старшы майстра Мартын меў у месяц зарплаты 4 злотых 15 грошаў, майстры Хабар і Станіслаў — па 3 злотых 15 грошаў, майстра Пятрок, відаць, самы малады, па 3 злотых. Памочнікі — «Дудка, Фёдар, Горбач, Сашка» штомесяц мелі па 2 злотых. Работы вяліся сезонна, у асноўным з мая па верасень. У 1686—1689 гг. гараднічым у Міры быў Міхал Шульц. Сярод матэрыялаў для крыцця дахаў, якія выкарыстоўваліся ў Міры, побач з традыцыйнымі гонтам і дашчатай чарапіцай — «даховкой» называюцца «королевская даховка», якую прывозілі з в. Карпава Лука,



Мястэчка Мір і Мірскі замак. План-схема размяшчэння ўмацаванняў

«хатняя даховка» і «бляха»— жэсць. Апошняй была пакрыта адна з вежаў замка [80].

У XVIII ст. Мір двойчы трапляў у зону ваенных дзеянняў: у 1706 г. у час Паўночнай вайны яго спустошылі шведы, якія спалілі Мірскі замак, і ў 1794 г. у час паўстання Т. Касцюшкі, калі яго атрад у Міры аблажылі рускія войскі А. В. Суворава і таксама разбурылі замак. Адноўлены, ён зноўку быў узарваны французамі ў 1812 г. [81] Гарадскія ўмацаванні спынілі сваё існаванне ў канцы XVIII ст. Гарадскі вал і Віленская брама ў апошні раз згадваюцца ў 1794 г. [82]

Давыд-Гарадок

Гарадзішча Замкавая гара ў Давыд-Гарадку было дзядзінцам старажытнага паселішча, пазней цэнтрам абароны сярэдневяковага «места», якое размешчана на высокім правым беразе р. Гарыні. Яно займае асобны ўзгорак, які з захаду агінае Гарынь, з паўднёвага боку — невялікая

р. Няпраўда (яна ж Няволя, Чартарыя), з усходу прымыкае балоцістая нізінная лугавіна. З поўначы вузкі і даволі глыбокі, але нешырокі, каля 10—15 м роў, які цяпер заплыў, аддзяляе Замкавую гару ад карэннага берага. У розныя гады помнік вывучалі археолагі Р. Якімовіч, П. А. Рапапорт і П. Ф. Лысенка, які адносіць дату ўзнікнення горада на пачатак XII ст. [83]

З-за асаблівых, чыста палескіх умоў свайго існавання схаваны сярод пушчаў і балот Давыд-Гарадок нават у перыяды свайго найбольшага



Давыд-Гарадок. План

росквіту ў якасці феадальна-ўладальніцкага горада не меў уласна гарадской лініі ўмацаванняў. Яна поўнасцю базавалася на магутнасці замка, які атрымаў у спадчыну ад старажытнага дзядзінца яго прыродныя і штучныя абаронныя якасці, значна ўдасканаленыя ў сярэднія вякі. Замкавая гара ўзвышалася на 3—5 м над чэрвеньскім урэзам вады ў Гарыні і мела пляцоўку круглявай формы дыяметрам 100—110 м. Уся яна была абкружана магутным земляным валам, насыпаным з рачнога пяску. Унутры насыпу знаходзіліся драўляныя субструкцыі, якія ступеньчата размяшчаліся ў насыпу. Гэта падтрымлівала пэўную заданую круцізну схілаў вала, асабліва знешняга. Вышыня такіх сасновых сцен — эскарпаў унутры вала дасягала 1 м [84]. Сапраўдная вышыня абарончага вала і яго параметры ў XV—XVIII стст. невядомыя. Уцалелыя часткі былога вала дасягаюць вышыні каля 2 м і шырыні ў аснове да 10 м.

З канца XIV ст. Давыд-Гарадок увайшоў у склад Вялікага княства Літоўскага. Ён быў вялікакняжацкім валоданнем, але часта перадаваўся на ўтрыманне розных людзей. Так, з 1456 па 1499 г. ім валодаў збеглы рускі князь Іван Васілевіч Яраславіч, праўнук Уладзіміра Андрэевіча Серпухаўскага. Затым да 1523 г. Давыд-Гарадок знаходзіўся ў валодан-

ні яго сына Фёдара Іванавіча Яраславіча. Ад яго горад дастаўся каралеве Боне, ад яе 20 мая 1558 г. перайшоў у рукі князёў Радзівілаў, якія валодалі ім да канца XVIII ст. [85]

Гісторыя ўмацаванняў Давыд-Гарадка XVII—XVIII стст. узнаўляецца паводле 15 падрабязных інвентароў горада і воласці. Яны не толькі дакладна раскрываюць структуру абарончых умацаванняў замка, але і паказваюць ваенна-будаўнічыя павіннасці мяшчан і сялян воласці ў розныя гады.

Старажытнейшы з вядомых інвентароў дае ўяўленне пра ўмацаванні замка, апісаныя 23 мая 1605 г., калі Давыд-Гарадок належаў князю Ольбрыхту Радзівілу. Аднак, ведаючы тэрміны старэння драўляных пабудоў (12—15 гадоў), інвентар фактычна раскрывае структуру абарончых збудаванняў, узведзеных у 90-я гады XVI ст. Згодна інвентару, вакол замка стаяў паркан «дужа злы часткова», які меў выгляд гародняў, пакрытых старымі драніцамі. Згадваецца ўчастак «стаячага паркану», г. зн. частакол. З боку ўезда ў паркане знаходзілася «вежа з брамаю», якую нядаўна ўзвялі замест ранейшай. Яна яшчэ не мела даху [86]. Акрамя традыцыйнай вежы-брамы ў паркане стаялі старыя і гнілыя «башты», пяць «вежак», таксама старых і разбураных. Ідучы ў замак «с двора», неабходна было перайсці «мост немалы», які падводзіў да выязных варотаў з пад'ёмным мостам на ланцугах. Зайшоўшы на тэрыторыю замкавага панадворку, злева рэвізоры зафіксавалі дзевяць гародняў «без дзвярэй», якія моцна апалі і пагнілі. Далей называюцца дзве вежы — адна мела ўваход з гародняў ля яе, другая згніла і была адбудавана толькі да паловы. Дакумент адзначае, што будаваць гэта павінна была шляхта — «зямяне яго міласці князя», але, як відаць з апісання, шляхта ігнаравала свае павіннасці [87].

Сярод «стрэльбы замковай» інвентар называе чатыры бронзавыя гарматы на колах, скаваных у ложах, пяць жалезных спраўных гармат, якія мелі клінавыя затворы, і дзве жалезныя марціркі. Таксама налічвалася 20 гакаўніц, 7 губчастых рушніц, драўляныя і скураныя парахаўніцы (50 штук). Мелася 3 капы 38 штук жалезных ядраў і 8 з палавінаю коп каменных ядраў. Кулі рушнічныя і гакаўнічныя, зробленыя з волава, захоўваліся ў спецыяльнай «акаванай шуфлядзе». У простай белай скрыні ляжалі два жалезныя ланцугі пад'ёмнага моста па 180 і 240 «агніў» кожная. Захоўваўся тут і порах, які рабілі замкавыя пушкары. Яны абавязаны былі кожны год змайстраваць і аддаць у замак восем губчастых рушніц. Для работы з порахам карысталіся скуранымі вёдрамі [88].

Залежныя сяляне Гарадзецкай і Палескай валасцей па два тыдні вясною і восенню пастаўлялі для рамонту замкавых умацаванняў лес, папраўлялі замчышча, працавалі «что прикажут с топором». У горадзе ў гэты год налічвалася 222 дымы [89]. Пра павіннасці гараджан інвентар не паведамляе.

Гэтыя павіннасці, як, дарэчы, і павіннасці пушкароў, называе інвентар Давыд-Гарадка за 1631 г. Тады мяшчане будавалі і даглядалі ў акрузе масты праз раку, у тым ліку вялікі мост, які вёў «з места ў замак». У гэтым ім дапамагалі сяляне валасцей. Гараджане будавалі і даглядалі ў лініі замкавых умацаванняў 55 сажняў паркану і «башты пры сваім прасле». Акрамя таго, з боку горада мяшчане абавязаны былі ўмацаваць падэшву замкавай гары — «капца», каб яго не падмывала вада. Гэта рабілася з дапамогаю паляў і сухога галля.

Цікава, што рачулка, якая ўпадала справа ў Гарынь, называлася Чартарыя. У гэтай назве народ адлюстроўваў нораў яе неспакойных вод,

якія падрывалі, «як чорт», замкавую гару і прыносілі дадатковыя клопаты. Яе супакоілі з дапамогай запруды, якая не толькі затрымлівала ваду, ствараючы своеасаблівы стаў — возера, але і пачала прыносіць падвойную карысць: па-першае, у месцы спуску вады на лодках змайстравалі вадзяны млын, якім карыстаўся ўвесь горад, па-другое, падпёртая плацінаю вада, перш чым трапіць у Гарынь, абкружала замак з поўдня і поўначы, абышоўшы яго, цякла пад горад і стварала такім чынам дадатковую перашкоду, якую на шляху ў замак цяжка было пераадолець. Няўрымслівасць гэтай ракі, якая цяпер напалову перасохла, па сведчанню інвентару, вымушала мяшчан выходзіць на рамонт грэблі «як на гвалт» і мацаваць яе палямі, сухім галлём і гноем «кожны год столькі разоў, колькі таго неабходнасць укажа» [90].

Гэты ж інвентар фіксуе павіннасці замкавых пушкароў: штогод даваць у замак як плату за свае вольнасці па тры губчастыя ручніцы «добрай работы», па 24 фунты пораху, за што ім замкавая адміністрацыя плаціла грашыма — па 3 капы 20 грошаў. Да таго ж пушкары даглядалі і рамантавалі замкавую зброю, ядры, кулі, розную амуніцыю, акоўвалі, але не выраблялі гарматныя колы. Яны таксама бясплатна выконвалі ўсю кавальскую работу ў замку і на млынах з жалеза, якое выдавалі ім у замку [91].

Цікава, што замкавы цясляр-«цесля» Фама Бізаловіч, які даглядаў усе замкавыя пабудовы, у тым ліку гародні, вежы і брамы «на страве замковай», адначасова сумяшчаў і пасаду замкавага гараднічага. За сваю працу Ф. Бізаловіч меў кожны год па 5 коп грошаў [92].

У перыяд вызваленчай вайны беларускага народа сярэдзіны XVII ст. супраць феадальна-прыгонніцкага і нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту Давыд-Гарадок у 1648—1649 гг. ператварыўся ў галоўную базу паўстанцаў Пінскага павета. У атрад паўстанцаў колькасцю ў некалькі тысяч чалавек уваходзілі мяшчане і навакольныя сяляне і нават дробная давыдгарадоцкая шляхта, узбросныя стрэльбамі, шаблямі і рагацінамі. Яны грамілі магнацкія і шляхецкія маёнткі, палілі фінансавыя і юрыдычныя дакументы. Пасля разгрому паўстання судом было вырашана, каб «усіх, хто аказаўся вінаватым (звязаных з рэбельянтамі), сваволных бунтаўшчыкоў як зямян, ... так і іх пасольства з места названага Давыд-Гарадок і з усіх валасцей 18 асоб казніць смерцю адпаведна заслуг іх... і ўчынкаў іх, г. зн. адных на кол паўзбівана, другіх пасцінана, а трэціх — парасстраляна» [93].

Наступны інвентар Давыд-Гарадка, які быў складзены ў 1653 г. напярэдадні руска-польскай вайны, дае некаторыя ўдакладненні пра павіннасці мяшчан і валашчан, а таксама іншых жыхароў, «прыслухаючых» замку. З дакументаў вынікае, што замкавыя пушкары валодалі надзеламі па дзве валокі зямлі. Дадатковай павіннасцю стаў абавязак дапамагаць мытнікам, дзе будзе загадана, спаганяць паборы і глядзець, каб купцы не аб'ехалі мытніцы другімі дарогамі [94]. Такім самым надзелам валодаў новы замкавы «цесля» Павел Буяк, які атрымаў за службу «дарочны юргель» ад князя Радзівіла. На ім ляжала адказнасць за рамонт замкавых жыллёвых і гаспадарчых пабудоў, вежаў, замкавых гародняў усюды, «дзе таго патрэба ўкажа, на замкавай страве будаваць». Аднак пасада гараднічага яму ўжо, напэўна, не належала [95]. Захавалі былыя павіннасці і мяшчане: «паркан каля замка мяшчане прутоў сваіх, г. зн. сажняў 55, і башты пры сваім рэзе з дрэва павінны будаваць і напраўляць, калі што сапсуецца». Захаваўся абавязак даглядаць масты, грэблю на р. Чартарыі і «ладзяны млын». Надзейна падпёртая запрудай

гэтая рака ўсё часцей пачынае называцца ў дакументах «рэчка Няволя», што гаворыць само за сябе. З апісання бачна, што млын на лодках знаходзіўся ля паўночнай падэшвы замкавай гары «пад местам», відавочна, трохі ніжэй маста, які звязваў горад і замак [96].

Замкавая воласць (вёскі Вялікія Арлы, Ляды, Харомскае, Альшаны, Вялемічы, Малешава, Бярозкі) сумесна з гараджанамі забяспечвала «стражу парканную і маставую», несла павіннасці «з валамі, коньмі і з чым загадаюць». Частка сялян аддаленай Палескай воласці (вёскі Дроздзін, Блезава, Гліннае, Беразая) хадзіла «... на работу замковую, разам з іншымі сёламі... З тых чатырох вёсак, па чарзе 15 чалавек, пачаўшы з Правадной нядзелі пасля Вялікай ночы рускай аж да Запустаў Піліпавых рускіх на кожным тыдні з'яўляліся з сякерамі, пеша». Акрамя таго, кожную вясну гэтыя вёскі давалі па 1 капе драніц [97].

Частка вёсак Палескай вобласці (Старое Сяло, Пераходзічы, Перабродцзе) замак «не рапаравала», а расціла і здавала хлеб, мёд, абслугоўвала млыны і рудню, бо замку пастаянна патрэбна было жалеза [98].

Інвентары за 1653, 1665 і іншыя гады паказваюць, што акрамя моста праз р. Няволю, які быў размешчаны з поўначы і звязваў замак з «местам», быў яшчэ адзін мост, які падводзіў да замкавага паркана з поўдня [99]. На гэта ж, напэўна, паказвае і разрыў паміж валамі, які да цяперашняга часу існуе на гарадзішчы.

У час руска-польскай вайны ў Давыд-Гарадку меўся моцны атрад войска, у складзе якога было 400 чалавек коннай шляхты і 300 чалавек узброеных мяшчан. У пачатку верасня 1655 г. горад аблажыў атрад рускіх войскаў на чале са стольнікам Д. А. Валконскім. Рускія прыйшлі сюды з Кіева на рачных караблях з мэтай заняць раёны Беларускага Палесся. У выніку бітвы Давыд-Гарадок быў узяты рускімі, якія затым пакінулі яго і пайшлі на Слонім [100]. У цэлым у перыяд вайны горад хоць і апынуўся далёка ад галоўнага тэатра ваенных дзеянняў, але пацярпеў моцна. Гэта зафіксавана ў інвентару Давыд-Гарадка за 1665 і 1670 гг. Мяшчане ўзнаўлялі ўмацаванні замка сумесна з сялянамі вёсак замкавай воласці (вёскі Арлы, Ляды, Гуры, Хутарская, Харомская). Палеская воласць пасылала па чарзе па 10 чалавек пачаўшы ад «Праводнай нядзелі... і да Піліпавых запустаў рускіх», прычым з кожнай валокі зямлі яны абавязаныя былі даваць па «1 капе драніц на замак». Гэта ў суме павінна было саставіць 182,2 капы [101]. Інвентары 1670 і 1675 гг. паведамляюць пра існаванне ў Давыд-Гарадку двух замкаў — «Горнага» і «Дольнага». Першы — «Горны» быў абнесены высокім валам, абкружаны вадою, але на яго тэрыторыі стаяў толькі «дом кухонны», астатняе ўсё было знішчана ў час вайны. Другі — «Дольны замак» (ён жа «падзамча») меў парканавую агароджу. Агульная даўжыня лініі ўмацаванняў абодвух замкаў раўнялася 20 шнурам (г. зн. 980 м.— *М. Т.*), з якіх на Верхні прыпадала 9 шнуроў і 1 прут (каля 466 м.— *М. Т.*), на Ніжні — 10 шнуроў і 9 прутоў (каля 534 м.— *М. Т.*). У лініі ўмацаванняў называюцца таксама «вывады», што трэба вызначыць альбо як патаемныя выхады за межы ўмацаванняў, альбо як бастыёны [102].

Будаўніцтва і рамонт абарончых умацаванняў ажыццяўляліся, як і раней, мясцовым насельніцтвам «водлуг давнего звычаю». Аднак інвентар 1670 г. паведамляе пра некаторыя новыя катэгорыі насельніцтва і новыя воласці, якія мелі свае «кватэры» ўмацаванняў, а таксама канкрэтна называе, колькі і якая вёска абавязана пабудаваць паркана. Усе 980 м фартыфікацыі падзяляліся на пяць частак. Першую частку ўзводзілі мяшчане, другую — замкавая воласць, трэцюю — Палеская во-

ласць, чацвёртую — Манькаўская воласць, якая раней не ўдзельнічала ў будаўніцтве, пятую частку — «водлуг стародавнего звычаю шляхта і зямяне прысуду тамашнега панова будаваць і старое направіць городні тыя абавязаны, пры тым і башты ставіць». Інвентары 1670 і 1675 гг. уяўляюць цікавасць таксама тым, што ўтрымліваюць «Уставу месту Давыд-Гарадоцкаму». Гэты дакумент рэгламентаваў павіннасці насельніцтва: «яўрэі разам з мяшчанамі павінны выконваць розныя павіннасці і паркан каля замку на доле (г. зн. Ніжні замак.— *М. Т.*), мяшчане разам з яўрэямі на кватэры сваёй ад ракі Няволі пачаўшы да брамы Ніжняй з канца моста аж до вербавага броварчыка мераю 5 палявых шнуроў (г. зн. 245 м.— *М. Т.*) і прытым башты з дрэва напраўляць і будаваць, калі што папсуецца, павінны вал, грэблі... стаў супроць места ад вады, каб не падмывала, талакою коллем і хворастам тарасаваць» [103].

Па інвентару 1670 г., замкавыя пушкары — «Солтаны і Данкі» мелі кожны год па 18 коп грошаў, даглядалі зброю і амуніцыю, выконвалі ўсю кавальскую работу ў замку і павінны былі «з вольнасцей сваіх кожны год аддаваць да скарбу замкавага ручніц добрай работы альбо мушкетаў 3, пораху 24 фунты». У інвентары 1675 г. сума платы пушкарам іншая — па 4 капы 18 грошаў [104]. У 1670 г. 18 коп плацілі ўсім пушкарам.

Між тым у арсенале замка ў 1670 г. мелася ўсяго «80 прысланых гакаўніц, 4 харугвы», а гарматы не памінаюцца наогул. Відаць, іх вывезлі ў якасці трафеяў рускія салдаты ў 1655 г. У 1675 г. тут мелася 60 дзідаў і 60 коп (г. зн. 3600 штук.— *М. Т.*) стрэл для лукаў. Напэўна, тут, у Давыд-Гарадку, рабілі лукі, паколькі вуліца Лучнікоўская пастаянна згадваецца ва ўсіх інвентарах. Акрамя таго, у замку захоўваліся сцягі зямян — шляхты, мясцовых соцень і мяшчан: «харугва конная кітайчатая чорная з чырвоным і двума канцамі; чатыры харугвы палатняныя пешых воінаў». Таксама было невядома, як сюды патрапіла «чорная кітайчатая харугва замку Клецкага» [105].

Інвентары паведамляюць, як размяркоўвалася ваенна-будаўнічая павіннасць сярод вёсак замкавых валасцей. Вядома, што 245 м умацаванняў узводзілі мяшчане. Астатак быў размеркаваны наступным чынам:

Замкавая воласць	Палеская воласць
в. Арлы — 12 сажняў (23,4 м)	в. Блезава — 9 сажняў (17,55 м)
в. Лыдцы — 15 сажняў (29,25 м)	в. Глінная — 9 сажняў (17,55 м)
в. Харомская — 15 сажняў (29,25 м)	в. Беразна — 9 сажняў (17,55 м)
в. Тры Валокі — 10 сажняў (19,5 м)	в. Дроздын — 9 сажняў (17,55 м)
в. Кугорск — 18 сажняў (35,1 м)	в. Старое — 9 сажняў (17,55 м)
в. Альшыня — 12 сажняў (23,4 м у 1670 г.), 20 сажняў (39 м у 1675 г.)	в. Пераходзічы — 9 сажняў (17,55 м)
в. Вялемічы — 18 сажняў (35,1 м)	в. Пераброд — 8 сажняў (15,60 м)
в. Малешава — 5 сажняў (9,75 м)	
в. Бярозкі — 15 сажняў (29,25 м)	
Усяго 120 сажняў (134 м) у 1670 г. 128 сажняў (149,6 м) у 1675 г.	62 сажні (120,9 м)

Такім чынам, з улікам даных за 1670 г. з 500 сажняў даўжыні лініі ўмацаванняў на Манькаўскую воласць і шляхту-зямян заставалася 193 сажні, г. зн. болей за 376 м [106].

Сітуацыйна планіроўка замкаў у 1675 г. выглядала наступным чынам: вакол іх разрастаўся горад, які меў дзве праваслаўныя царквы і

адзін касцёл. З «места» можна было трапіць у Ніжні замак па мосце з парэнчамі, які быў перакінуты праз роў. Уваход на мост запіраўся варотамі. Адсюль зноў па новым мосце на палях праз рэчку Чартарыю траплялі ў «Горні замак». Уваход ішоў праз новую напалову ўзведзеную дубовую браму. Пасярод замкавага двара знаходзілася студня з дубовым зрубам. Абодва замкі былі абкружаны новым дубовым парканам [107].

У 1681 г. і пазней мост у Верхні замак узвялі «на ізбіцах-зрубах».

З 1670 па 1693 г. у інвентарах Давыд-Гарадка сустракаюцца прозвішчы адных і тых жа пушкароў — Солтанаў і Данкоў, а з 1693 г. упамінаюцца толькі Солтаны. Відаць, тут, як і ў многіх іншых беларускіх прыватнаўласніцкіх гарадах, гэтая прафесія была спадчыннай [108].

Усе наступныя інвентары Давыд-Гарадзецкага замка да 1760 г. даюць уяўленне паступовага запусцення і разбурэння замкаў, якія з цягам часу ператварыліся з мясцовага цэнтра абароны ў месца рэзідэнцыі ўпраўляючых-адміністратараў гэтага перыферыйнага валодання Радзівілаў. Праўда, да 1702 г. інвентары пастаянна называюць ваенна-будаўнічыя павіннасці мясцовага насельніцтва, але, відаць, Паўночная вайна канчаткова зняла іх з парадку дня. Усё радзей згадваецца рэчка Няволя, у інвентары за 1702 г. упершыню сустракаецца сучасная назва рэчкі Чартарыі—Няволі — «рэчка Няпраўда» [109].

З 1702 г. пастаянна адзначаецца «каля таго замку канал з вадою цякучаю». Усё радзей сустракаецца інфармацыя пра вежы, але пра паркан, што стаяў «на валу кругом», усё яшчэ гаворыцца на працягу першай чвэрці XVIII ст. Заўважана ўмацаванне ўязной вежы — брамы замка. У 1728—1734 гг. пастаянна адзначаецца замкавая «вялікая брама з залкай наверсе». Па баках брамы стаялі дзве фланкіруючыя вежы [110]. Затым яе змяніла звычайная драўляная брама з двума кардыгардамі і тарцічнымі варотамі з няхітрай сістэмай запораў. Яны адчынялі і запіралі доступ на замкавы панадворак, дзе ў акружэнні гаспадарчых пабудоў стаяў палац адміністратараў. Гэта фіксуе ў апошні раз інвентар Давыд-Гарадка за 1793 г. [111]

Койданава

Радзівілам у сярэднія вякі належала таксама і Койданава. Тады гэта было мястэчка, цяпер на яго месцы стаіць горад, які называецца Дзяржынскам.

Гэтае паселішча існавала ўжо ў перыяд Кіеўскай Русі ў XI—XIII стст. Пэўныя, часам легендарныя звесткі дазваляюць зрабіць вывад, што менавіта ў гэтым месцы альбо каля яго ў 1249 ці 1272 г. разбілі татарскага хана Балаклая [112]. Па іншых звестках, гэтае паселішча раней мела назву «Крутагор'е», а пасля таго, як у яго ваколіцах разбілі загон татараў, якіх вёў хан Кайдан (Койдан), узнікла новая назва паселішча — «Койданава» [113].

Рэшткі гарадзішча, дзе знойдзены матэрыялы культуры штрыхаванай керамікі, а таксама эпохі Кіеўскай Русі і XIV—XVII стст., знаходзяцца на паўночнай ускраіне сучаснага Дзяржынска. Яно носіць назву «Крутагор'е» («Акопішча», «Гаштольдава гара»), размешчана на правым беразе невялікай р. Няцечы. Гарадзішча мае круглявую форму, памерам 80×60 м [114].

З XIV ст. Койданава ўваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага і лічылася валоданнем вялікага князя, якое давалася розным асобам ва ўтрыманне. Каля 1445 г. кароль Казімір даў яго Міхаілу Жыгімонтавічу.

У 1483 г. яно знаходзілася ў валоданні князя В. М. Вярэйскага, з 1505 г.— князёў Гаштольдаў. З 1539 г. Койданава — цэнтр гаспадарскага старостваа, з 1550 па 1831 г.— цэнтр Радзівілаўскага графства [115].

Восенню 1502 г. і вясною 1503 г. ў выніку набегаў крымскіх татараў Койданава і яго ваколіцы былі спалены. Відаць, паселішча не пазбегла ваеннага пажару і ў 1506 г., калі войскі рускіх князёў Шамякіна, Адоеўскага, Трубяцкога і Варатынскага аблажылі Менск і дзейнічалі ў ваколіцах горада, а таксама восенню 1534 г., калі маскоўскія ваяводы «агнём і мечам» дайшлі да Барысава, Менска, Маладзечна і далей да Вільні [116].



Койданава. План пачатку XIX ст.



Замак у Койданаве. Фота пачатку XX ст.

У той час у Койданаве меўся драўляны замак, абкружаны вадзяным ровам, злучаным з р. Няцечай. Створаная на рацэ сістэма ставоў у XVI—XVIII стст. адыгрывала ролю дадатковай перашкоды, якая прыкрывала горад і замак ад нападу. Акрамя таго, вада, паднятая запрудаю, заліваля кальцавы абарончы роў замка.

У першай палове XVI ст. драўляны замак змянілі каменным дзевяцівежавым замкам. У плане круглыя вежы мелі дыяметр каля 10 м, таўшчыню каменна-цагляных сценаў да 1,5 м. У іх былі прарэзаны байніцы. Вежы крыліся шатравымі стрэхамі і іх некалькі разоў перабудоўвалі. Аднак у 30-я гады XX ст. яны яшчэ існавалі на вышыню двух ярусаў бою. Пад абаронаю гэтых вежаў і каменных сцен, якія іх злучалі, каля сярэдзіны XVI ст. на сродкі князя Мікалая Рудога Радзівіла, апантанага кальвініста,



План умацаванняў у Койданаве

быў збудаваны каменны кальвінісцкі збор. У плане ён меў форму прамавугольнай трохнефнай залы, якая канчалася гранёнай апсідай. У канцы пабудовы знаходзілася магутная чатырохкантовая вежа, якая паступова пераходзіла ў васьмярык. Уваход у замак запіраўся традыцыйнай брамаю, якую вянчаў герб Радзівілаў [117].

У часы руска-польскай вайны з 1648 па 1667 г. Койданава некалькі разоў было спалена, асабліва спустошана ў 1655 г. Тым не менш у хуткім часе пасля заканчэння руска-польскай вайны ўмацаванні горада былі адноўлены. Так, у інвентары 1669 г. у Койданаве ўпамінаюцца гарадскія Менская і Слуцкая брамы. Хутчэй за ўсё мелася яшчэ адна брама, якая выводзіла на Віленскі шлях [118].

Адсутнасць архіўных матэрыялаў не дазваляе вызначыць, якія гэта былі збудаванні. Аднак іх канструкцыі былі падобныя на ўмацаванні іншых беларускіх гарадоў.

Каменныя пабудовы замка і кальвінісцкі сабор існавалі да 40-х гадоў XX ст.

Клецк

Цэнтрам абароны сярэдневяковага Клецка быў дзядзінец летапіснага горада Клечаска (1128 г.), які мясціўся на прыродным узвышшы левага берага р. Лані. Плошча замчышча ў плане мае абрыс круга дыяметрам 80 м. Яна абкружана валам вышынёй 1,3—1,5 м. Прарэзка вала, праведзеная восенню 1981 г. аўтарам, паказала, што асноўны насып вала ўзвялі ў XI ст. з пяску і жвіру і ў далейшым падсыпалі не менш за пяць разоў. Аднак ядро сярэдневяковых умацаванняў замка складаў насып старажытнага вала шырынёй у аснове да 8 м і вышынёй 2,5—3,0 м. Пляцоўка замчышча ўзвышалася над далінаю р. Лані на 8—10 м. Яна аддзялялася ад астатняга плато абарончым ровам, які меў шырыню да 35 м і

глыбіню 6—7,5 м. Воды ракі, паднятыя запрудаю, наваднялі яго і прыкрывалі подступы да замка. Сюды можна было трапіць праз мост, перакінуты да замкавай брамы. Прарэзка вала выявіла ў двух падсыпках рэшткі драўляных першапачатковых канструкцый, ад якіх захавалася толькі парахня. Каменных сцен і вежаў замак, зыходзячы з даследаванняў, ніколі не меў.

З XVII ст. Клецк знаходзіўся ў складзе Вялікага княства Літоўскага і быў часткай вялікакняжацкага дамена. Ён часта перадаваўся ва ўтры-



План Клецкага замчышча

манне розных асоб. З 1456 па 1523 г. ім валодаў збеглы рускі князь Іван Васілевіч Яраславіч, праўнук Уладзіміра Андрэевіча Серпухаўскага, а затым яго сын Фёдар Іванавіч Яраславіч. З 1523 па 1558 г. ён быў у валоданні каралевы Боны, ад якой 20 мая 1558 г. горад перайшоў да Радзівілаў. Яны валодалі Клецкам да канца XVIII ст. [119]

У 1503 г. горад узялі крымскія татары, якія «жегше город Клецк». Верагодна, гэта ж паўтарылася ў 1506 г., калі татары «пришедши до Клецка, стали там кошем». Вядома, што тады іх ушчэнт разбілі ў раёне Краснага Става беларуска-літоўскія палкі, якія вызвалілі 40 тысяч палонных мірных жыхароў [120].

Як і большасць прыватнаўладальніцкіх гарадоў Радзівілаў, Клецк быў умацаваным горадам. Ён меў не толькі замак, але і лінію гарадскіх умацаванняў, якія ахоплівалі тэрыторыю старажытнага навакольнага горада. І замак, і горад абараняліся земляным валам, умацаваннямі. На гравюры Г. Макоўскага, якая падае выяву Клецка канца XVI ст., добра відаць дзве чатырох'ярусныя драўляныя вежы з байніцамі, сцены-гародні, зверху накрытыя стрэшкамі. Горад меў сваю артылерыю. Інвентар

1575 г. называе «пушкаря Клецкого», які меў у Сапотвінскім войтаўстве адну валоку зямлі, Пятра-шабельніка, кавалёў і іншых рамеснікаў. У канцы XVI ст. у Клецкім замку было ўжо трое пушкароў [121]. Ад гарадскіх умацаванняў таго часу захаваліся рэшткі вала, рова, якія значна знівеліраваны гарадской забудовай у раёне сучаснай вул. Школьнай. Вал дасягае вышыні 1—1,5 м, роў — глыбіні да 3,3 м [122].

Аднак у апошняй чвэрці XVI ст. горад значна вырас і выйшаў за межы гарадскіх умацаванняў у паўночна-ўсходнім кірунку. З'явіўся «Новы



Прарэзка вала Клецкага замка

рынак». Ён упамінаецца ў інвентары 1575 г. Гэта значыць, што цэнтр гарадскога жыцця змяніў сваё месца. Да новага цэнтра працягнуліся новыя вуліцы. Адна з іх у інвентары называецца як «улица от Нового рынка» [123]. Ва ўсякім выпадку ў час паўстання С. Налівайкі ў 1595 г. пад абарону ўмацаванняў Клецка збягалася шляхта Навагародскага ваяводства [124]. Інвентар Клецка 1626 г. дае звесткі пра «Высокі» і «Дольны» замкі. У Высокі замак можна было трапіць па мосце, тады ўжо вельмі старым, праз старую браму. Вакол замка ішлі драўляныя сцены, на двары размяшчаліся гаспадарчыя пабудовы і цэйхгаўз. У ім жалезныя гарматы, 70 гакаўніц, 22 рушніцы, 65 коп ядраў каменных, жалезных і з волава, а таксама порах і іншая амуніцыя [125].

У Дольным замку было 10 вежаў і дзве брамы. Адну з іх называлі «Доўгая». Згадваецца таксама студня, з якой ваду падымалі вядром на ланцугу. Сярод мяшчанскіх павіннасцей інвентар называе рамонт грэблі, розныя «гвалты», у тым ліку ваенныя, да чаго яны «павінны быць гатовыя ўсе са зброяй, неабходнай для вайны». Вайсковую павіннасць адбывалі і служылыя татары чатырох вёсак — Арда, Малыя Бежычы, Асмолава, Янава, якія выстаўлялі з кожных трох валок аднаго каня. У 1628 г. татары выстаўлялі 14 коней. Сяляне навакольных вёсак «прыслухалі» замку тры дні ў тыдзень «з чым загадаюць», даючы дойлідаў, капачоў і вартаўнікоў. Ваенную службу ў выпадку «гвалтовной потребы» здаўна неслі і клецкія баяры [126].

Аднак Верхнім і Дольным замкамі сістэма ўмацаванняў Клецка не абмяжоўвалася. Інвентар 1628 г. сведчыць, што і прыгарады ўжо мелі

pawet.net

сваю лінію фартыфікацыі. Як гэта было прынята на Беларусі, гарадскія абарончыя ўмацаванні ў Клецку дзяліліся на часткі — «кватэры» паміж мяшчанамі, былі замацаваныя за імі, імі ж рамантаваліся і даглядаліся. Згодна інвентару 1628 г., «мяшчане-хрысціяне і падданыя юрыдыкі ксяндза-плябана 2 часткі паркану і таксама 2 брамы выставіць і забудаваць павінны былі», а яўрэі горада абавязаны былі выставіць і ў далейшым папраўляць сваю частку паркана і паставіць дзве брамы. Замкавыя ўмацаванні ўзводзіла толькі воласць: «А каля самога замка паркан

Клецк. Гравюра Т. Макоўскага. Пачатак XVII ст.

выставіць воласць павінна водлуг інвентара генеральнага Клецкага княства — кожная вёска сваю порцыю забудуе». Ваенна-будаўнічую талаку прадпісвалася праводзіць да жніва. Лічылася, што з кожнага дыму ўсе мужчыны павінны былі адпрацаваць па чатыры дні кожны. Выключэнне рабілася для некаторых «лібертаваных яўрэяў», а таксама «ўбогіх» мяшчан. Замест чатырох дзён адпрацоўкі з «убогіх» мяшчан бралі па 16 грошаў, з «лібертаваных яўрэяў»— па 160 грошаў. Тыя, хто меў агароды, працавалі дадаткова па два дні. У мэтах супрацьпажарнай бяспекі прадпісвалася мець каля кожнага дома кадку з вадою і пажарныя бусакі. Кожны гараджанін у сваю чаргу нёс начную варту па гораду. Парушальнікі караліся штрафам у адну капу грошаў [127].

Усё мужчынскае насельніцтва Клецка было ваеннаабавязаным, аб'ядноўвалася ў дзесяткі і сотні пры абароне горада ў ваенны час. Аднак невялікі горад меў нязначнае апалчэнне, якое не магло супрацьстаяць рэгулярнаму войску з прафесійных салдат. Руска-польская вайна даказвала гэта не раз, у тым ліку і на прыкладзе Клецка. У канцы жніўня 1654 г. у перыяд ваенных дзеянняў у Цэнтральнай Беларусі царскія войскі вялі наступленне на Цімкавічы—Клецк. Пра ход падзей ваявода А. Н. Трубяцкі даносіў цару: «Посылал я, холоп твой Алешка, к гораду

Клецку стольника Григория Михайлова сына Измайлова, а с ним свойго полку с товарищем своих полков голов с сотнями и рейтарские роты. И как, государь, они... пришли к городу Клецку, из Клецка, государь, городские люди против твоих государевых ратных людей вышли на вылоску за посад. И милостью Божьею... твои государевы ратные люди тех клецких сидельцев многих побили и в город Клецк въехали, и клецкие, государь, шляхта и мещане из города из посаду побежали за пруд через мост к городу к Ляховичам, и твои государевы люди в Клецку, в городе и на посаде литовских людей побили всех, а которые побежали через мост и за теми литовскими людьми государевы ратные люди гоняли больше 5 верст и в языцех поймали, а взято... на том бою в языцех шляхты и мещан 42 человека». Горад быў спалены, а «... людей... высекли и совсем разорили без остатку» [128].

Цяжкі ўдар, нанесены гораду вайною, адчуваўся на працягу многіх пасляваенных гадоў. Пра ўмацаванні горада інвентар 1671 г. нават не ўспамінае. Знік Дольны замак. У верхнім замку мелася толькі ўязная брама з пад'ёмным мостам перад ёй і агароджа з плах. Большую частку замкавага двара займаў агарод. Там жа стаяў цэйхгаўз, у якім знаходзіліся чатыры малыя бронзавыя і дзве жалезныя гарматы, 70 гакаўніц, 20 ручніц, запас жалезных, каменных ядраў і ядраў з волава лікам 59,5 коп, шрот з волава для гакаўніц, два штурмакі, іншая ваенная амуніцыя [129].

Не акрыяўшы яшчэ ад разрушэнняў руска-польскай вайны, Клецк зноў быў знішчаны ўшчэнт новай Паўночнай вайной, калі шведы цалкам яго знішчылі ў 1706 г. Інвентары горада 1713, 1714, 1760 і 1782 гг. называюць толькі «вялікі акоп з ровам». На тым месцы, дзе раней быў замак, за нізкім штыкетам стаяў дом клецкага адміністратара. У інвентарах яшчэ згадваюцца абавязкі гараджан на выпадак пажару: мець кадку з вадою, драбіну на даху, жалезныя крукі і пажарныя помпы [130]. Умацаванні замка і горада з 1706 г. больш не ўзнаўляліся.

Любча

Паселішча Любча (Любч, Любеч), цяпер гарадскі пасёлак Гродзенскай вобласці, вядома з XIII ст., калі яно было аддадзена наваградскім князем Міндоўгам кіеўскаму баярыну Андрэю Васілевічу Кіяну, які знайшоў прыстанішча ў Наваградку ад татарскага нашэсця. Пры Гедыміне Любча ўжо была вялікакняжацкім валоданнем. У 1499 г. вялікі князь Аляксандр дараваў «двор Любча» падскарбію Хведару Храптовічу [131]. Верагодна, тады паселішча ўжо мела статус «мястэчка». Ва ўсякім выпадку ў шэрагу дакументаў 1517—1528 гг. яно называецца так. Некаторыя даследчыкі лічаць, што ў канцы XV ст. Любча была «местом» [132]. У 1528 г. яго набыў віленскі ваявода Гаштольд, у 1547 г.— Ян Кішка, які заснаваў тут друкарню. Верагодна, ў 1581 г. было ім распачата будаўніцтва каменнага замка. Менавіта такая дата выразана на сцяжку старажытнага флюгера — «ветраніка», які знайшлі мясцовыя краязнаўцы. Герб Кішкі прысутнічае на ім [133]. Ужо ў 1588 г. быў састаўлены першы інвентар Любчы і Любчанскага замка [134]. Вядома, што ў 1590 г. Любча атрымала магдэбургскае права, мела свой герб у выглядзе срэбнай падковы з трыма залатымі крыжамі і дзвюма срэбнымі рыбамі — ласосямі ў блакітным полі. Згодна з гістарычнымі крыніцамі XVII ст., быў і іншы герб Любчы — выява двух вежаў на сцяне [135].

У XVII ст. яна належала Радзівілам. Любчанскі замак узнік на краю мястэчка, на ўчастку высокага левага берага Нёмана памерамі, блізкі-

мі да квадрата 85×85 м. З трох бакоў замчышча абкружаў абарончы роў шырынёй да 30 м і глыбінёй 7—8 м (з захаду і поўдня) і да 10 м з усходу, з чацвёртага боку замак прыкрываўся Нёманам.

З паўднёвага захаду і паўднёвага ўсходу замчышча захаваліся дзве магутныя мураваныя вежы. Першая была варотнаю. Яна мела выгляд магутнага куба, які на вышыні каля 8 м пераходзіць у васьмікантовую прызму. Аснова вежы — квадрат памерам 9,8×9,8 м. Вежа мела чатыры ярусы бою. На першым і трэцім ярусах было па восем байніц для стрэль-



Любча. Мал. з карты XVII ст.

баў, на другім — 12. Пад страхою вежы ў кожнай з васьмі сцен знаходзілася па дзве мушкетных байніцы. Па сваёй аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі гэтая вежа вельмі падобная да вежаў Мірскага, Навагрудскага і Віцебскага замкаў [136]. Змешаная готыка-рэнесансная муроўка дазваляе надзейна датаваць вежу другой паловай XVI ст. Знаходка ж старажытнага флюгера вежы дае цяпер канкрэтную дату — 1581 г.

Падмурак вежы з вялікіх валуноў і бітай цэглы на ваніне запушчаны ў дол на 3 м. Знутры памяшкання знаходзілася вязніца. Першапачаткова гэтая вежа, відаць, была адзінай каменнай вежай у драўляным замку. Згодна інвентару ад 2 ліпеня 1601 г., варотная вежа Любчанскага замка мела наверсе «светлицу» і сховішча для «стрельбы», «баню», пакрытую

Любчанскі замак. З мал. XVIII ст.

«железом белым», а таксама «звон на зегар завешаны». Злева ад вежы стаяла кухня, зруб з чэсанага дрэва і далей, над Нёманам, другая «башта троха недамураваная». Вокны ў ёй былі закрачаныя, месцамі ўжо выламаныя, дзверы таксама пазніманыя. На ўсім памяшканні адбітак запусцення, выкліканага спыненнем будаўнічых работ. З апісання відаць, што вежу вывелі толькі на вышыню двух паверхаў. Была яна васьмівугольнай [137].

Далей, па краю замкавага ўзвышша, стаялі розныя жыллёвыя і гас-

Любчанскі замак. Давасінны здымак

падарчыя пабудовы: вялікі дом на склепе высокім мураваным, клець, другі склеп меншага памеру, хата сталовая з некалькімі каморамі і святліцамі, дзе меліся кафляныя печы, «каморка патрэбная», туалет, падклет з чатырма вярхамі, піўніца. На чацвёртай дзялянцы знаходзілася вуглавая паўднёва-ўсходняя каменная вежа. У аснове вежы закладзены квадрат 8,9×8,9 м. Яна была трох'яруснай. На першым паверсе мелася чатыры байніцы для стрэльбаў, на другім — чатыры гарматныя, на трэцім — 12 байніц для стрэльбаў. Цокальны паверх вежы ў 1601 г. займала «піўніца» з драўлянымі дзвярыма на завесах і жалезнай кратай. Паверх, які знаходзіўся вышэй, тады выконваў ролю склепа. Ён закрываўся абабітымі жалезам дзвярыма. Вокны былі закрытыя жалезнымі кратамі. На ўчастку ад гэтай вежы і да ўязной брамы стаяў «дом на падклеце», тры «гмахі» і «дварэц», дзе жылі ўраднікі, а побач — замкавы бровар [138]. Згодна інвентароў і графічных матэрыялаў XVI ст., у Любчанскім замку было чатыры вежы, кожную з якіх упрыгожвалі флюгеры з гербамі Радзівілаў.

Мястэчка Любча таксама было абаронена парканам, мела ўязныя вароты «прускага муру», г. зн. фахверкавай канструкцыі з дрэва і цэглы, якія стаялі ля ўезду з боку Наваградка і Сенніцы [139].

У 1655 г. Любчу ўзялі казакі І. Залатарэнкі, яна моцна пацярпела. Па апісаннях замка за 1813 г., у ім мелася толькі дзве вежы. Замак злучаўся двума мастамі з мястэчкам і замкавым фальваркам, размешчаным на ўсход ад замка [140].

Вежа-брама Любчанскага замка

Баявая вежа Любчанскага замка



Флюгер-вятранік з вежы Любчанскага замка

Свержань

Вядомы два паселішчы — Стары Свержань і Новы Свержань. Старажытнейшым ёсць усе падставы лічыць Стары Свержань. Ён упамінаецца ў 1428 г. Стаяў Стары Свержань, зыходзячы з назвы, на невялікай рэчцы Свержанцы, левым прытоку Нёмана, які цяпер зусім высах. Назва паселішча паходзіць ад слова «свержань» («стверженъ»), што азначае цвёрдае месца ля ракі ў адрозненне ад плыткіх, занадта вільготных месцаў [141].

Старажытнейшая частка Старога Свержня знаходзіцца ў паўночнай

частцы аднайменнай вёскі ў Стаўбцоўскім раёне. Яна займае ўзвышэнне авальнай формы памерам 100×90 м, цяпер прыпаднятае над ваколіцай на 2,0—2,5 м, над рэчышчам перасохлай Свержанкі — на 6—8 м. У цэнтры пляцоўкі стаіць драўляны храм, абкружаны сцяной з валуноў [142].

Яшчэ на пачатку XVI ст., не пазней 1513 г., тут была толькі вёска пад назваю «Свержно», якая належала Івашку Літавору Храптовічу. Яно ўпамінаецца ў грамаце Сігізмунда Аўгуста, які пацвердзіў прывілей на Свержна, дадзены «за заслугі» І. Л. Храптовічу каралямі Казімірам і Аляксандрам [143].

У хуткім часе пасля гэтага тут будуецца замак. Вёскай і замкам на частках валодалі дочкі І. Л. Храптовіча — Ганна і Соф'я. Першая была замужам за Юрыем Осцікам, другая — за Мікалаем Уралеўскім. У 1568 г. жонка Юрыя Осціка прадала сваю частку Свержаньскага замка з дваром, фальваркам, мястэчкам і вёскамі за 3000 коп грошаў літоўскіх Астафію Валовічу, той у 1578 г.— Мікалаю Радзівілу. Мікалай Радзівіл яшчэ раней, у 1577 г., валодаў «половиной замка и места Свержаньского». У 1595 г. усе Свержаньскія валоданні належалі Радзівілам [144]. Магчыма, той жа М. Радзівіл заклаў Новы Свержань. Прычынай стварэння новага паселішча, відаць, было тое, што Стары Свержань знаходзіўся ў значным аддаленні ад Нёмана. Малаводная і несуднаходная рэчка Свержанка не мела гаспадарчага значэння. У гэты час Радзівілы арганізавалі актыўны сплаў леса і рознай сельгаспадарчай сыравіны са сваіх валоданняў па Нёману ў Кралявец (Кёнігсберг). Для гэтага трэба было мець добрую прыстань са складскімі памяшканнямі і суднабудаўнічую верф. Усё гэта з'явілася ў 90-х гадах XVI ст. у пабудаваным мястэчку Новы Свержань, які размяшчаўся на левым беразе Нёмана, вышэй Старога Свержаня ў 2—3 км. Іменна ад гэтага месца Нёман быў суднаходным. Ля ўпадзення ў Нёман яго левага прытока Жацераўкі быў закладзены драўляны замак. Яго пляцоўка 100×100 м узнімалася над запруджанай р. Жацераўкай на 5—6 м. Кругавы вал і роў з паўночна-ўсходняга боку часткова захаваліся да цяперашняга часу. Да замка прымыкаў каменны Петрапаўлаўскі касцёл канца XVI ст., драўляная Успенская царква і рынкавая плошча. На беразе Нёмана стаялі склады і верф, дзе будаваліся шматгрузныя судны — стругі і віціны [145].

Паступова замак у Свержані страціў сваю ролю і не аднаўляўся. Навасвержаньскі замак быў узяты рускімі войскамі ў час руска-польскай вайны, але пазней быў адноўлены і ператварыўся у гаспадарчы двор свержаньскіх валоданняў Радзівілаў.

2. УЛАДАЛЬНІЦКІЯ ПАСЕЛІШЧЫ РАДЗІВІЛАЎ У ПАДНЯПРОЎІ, ПАДЗВІННІ І ПАНЯМОННІ

Копысь

Комплекс умацаванняў горада Копысі XVI—XVIII стст. атрымаў у спадчыну фартыфікацыю дзядзінца летапіснай Копысі (1095 г.), уключаючы таксама зноў створаную лінію абароны «места». Яно разраслося ў познім сярэдневеччы ўздоўж левага берага Дняпра. Ваенна-адміністрацыйным цэнтрам горада лічыўся замак, які стаяў на ўзвышанай частцы берага. Першапачатковае мысавае гарадзішча было, напэўна, акруглым, плошчай каля 0,5 га, яго паўночны край трохі выступаў. Уваход знаходзіўся з усходняга боку. У выніку ваенна-будаўнічых работ канфігура-

цыя ўмацаванняў першапачатковага гарадзішча значна змянілася. Зараз перыметр вала раўняецца 370 м, памеры ўнутранай пляцоўкі 80×
×60 м [146]. Перыметр гарадскіх умацаванняў, якія ў плане мелі выгляд выгнутага на ўсход прамавугольніка, раўняўся крыху больш за 1 км. Цікавай і значнай дэталлю планіровачнай структуры ўмацаванняў Копысі з'яўляюцца дзве невялікія ракі — Страшаўка і Сморкаўка. Яны працякалі па тэрыторыі горада з паўночнага ўсходу і ўсходу на захад, агінаючы замак з двух бакоў і ўпадаючы ў Днепр. У XIV—XVIII стст. воды гэтых



План Копыскага замчышча

рэк працавалі на абарону горада. Дзякуючы сістэме запруд на подступах да гарадскіх умацаванняў з усходу і паўночнага ўсходу ўзніклі штучныя вадаёмы. Яны запаўнялі вадою абарончыя равы знешняй лініі ўмацаванняў. Далей, прайшоўшы пад валам, што дазваляе меркаваць пра наяўнасць якой-небудзь асобай палевай канструкцыі, паўзверх якой праходзіў земляны насып, гэтыя рэкі злучаліся ля замка. Тут вусце р. Сморкаўкі было перакрыта дамбай, а воды абедзвюх рэк, падпёртыя плацінаю млына, стварылі штучнае вадасховішча. Яно абараняла непасрэдныя подступы да замка з поўдня, усходу і паўночнага ўсходу. Праезд у замак ішоў па запрудзе млына, якая падводзіла да пад'ёмнага моста перад замкавай брамай.

Прарэзкай вала на замку зафіксаваны два адметна выяўленыя будаўнічыя этапы. Першапачатковы вал быў насыпаны з дробнага пяску з

гумусіраванымі праслойкамі, што, напэўна, сведчыць пра існаванне ранней не ўмацаванага паселішча. Старажытнейшы вал вышынёй да 5 м узвялі ў другой палавіне XI — пачатку XII ст. Затым вал некалькі расшырылі і павялічылі ў вышыню яшчэ на 2 м. На думку Э. М. Загарульскага, гэта рэканструкцыя датуецца XVI — першай паловай XVII ст. [147] Інвентар Копысі зафіксаваў яе больш дакладна — 1668 г. [148]

З другой палавіны XIV ст., з моманту ўключэння Копысі ў Вялікае княства Літоўскае, горад, размешчаны на скрыжаванні важных шляхоў, якія ішлі па вадзе і па сушы, часта трапляў у сферу ваенных дзеянняў. У 1535 г. войска рускага ваяводы Шуйскага выпаліла ўсё навакольле Копысі і іншых гарадоў Беларускага Падняпроўя [149]. У 1562 г. у час Лівонскай вайны яго і іншыя гарады Усходняй Беларусі «опановали» рускія войскі «за тое же помочь давали Инфлянтам». Затым у 1580 г. «...Москва, то есть Серебреный з немалым войском... Копысу... велми выпустошили», аднак горад зноў быў заняты войскам Вялікага княства Літоўскага [150]. Бясследна не прайшлі для горада руска-польская вайна сярэдзіны XVII ст. і Паўночная вайна.

Да пачатку XVI ст. Копысь быў вялікакняжацкім валоданнем, затым ім валодалі князі Астрожскія, а з 1594 г.— Радзівілы. У 1695—1744 гг. горадам валодалі прынцэсы Нейбургскія, затым зноў Радзівілы [151].

Копысь меў умацаванні, якія адпавядалі рангу гадлёва-рамеснага горада з насельніцтвам каля 2000 чалавек. Ужо А. Гваньіні адзначаў тут у трэцяй чвэртцы XVI ст. радавы «замак і места» [152]. Рамонт умацаванняў рабіла гарадское і навакольнае насельніцтва, у тым ліку і новазаснаванага мястэчка Барань. Усё мясцовае насельніцтва — мяшчане, сяляне, зямяне-шляхта, баяры панцырныя і путныя павінны былі ў ваенны час з'яўляцца для абароны радзівілаўскай Копысі, а ў мірны час адбываць «старажоўшчыну» ў замку ці на гарадскіх умацаваннях. У 1587 г. у сяле Барань па загаду князя Мікалая Радзівіла была арганізавана майстэрня — «кульня» па вытворчасці ядраў і куль для гармат і гакаўніц. Работнікі-«кульнікі» атрымалі па адной валоцы зямлі. За гэта яны былі абавязаны здабываць руду, выраблять драўняны вугаль, варыць жалеза і адліваць ядры — «кулі». Напачатку гэта былі Ходар Бяляк і Панцялей Абрамовіч, якіх «осадили на выробене куль» 14 кастрычніка 1597 г. на ўмове: «кожды рок да замку Копского давать куль железных великих до дела... Биржанские... десять; кули для дел тых, которые на замку Копыском, кону одну (60 штук.— *М. Т.*), а до гаковниц куль копа одна и пять десять». Акрамя таго, «кульники» были абавязаны хадзіць «до оправы замку Копыского и парканов мейских ровно с другими подданымі волости Копыской» [153]. Праз год, у кастрычніку 1598 г., для вырабу «куль до дел и гаковниц» былі прыцягнуты яшчэ 12 чалавек сялян з вёскі Барань: Клім Хрулавіч, Нікіпар Панцялей, Андрэй Ульчонак, Жора Мішоніч, Саўка Хруловіч, Іван Дзінка, Юрка Зямля, Раман Хруловіч, Івашка Іона, Аўсей Цярэнцьеў і Якаў Калошаніч [154]. Стварэнне буйной майстэрні мела мэту забяспечыць ядрамі і кулямі не толькі Копысь, але і радзівілаўскі замак Біржы (цяпер г. Біржай у Літве). Згодна распараджэнню адміністратара Копыскага Замка, павіннасці баранскіх кульнікаў былі наступныя: «...На кожны рок давать до замку Копысского з кожной волоки куль железных великих до дел Биржанских по 15, над тыми меншых так же до дел Биржанских по 25, до дел Копыских по 30, до гаковниц Копыских куль по копе». Акрамя таго, кульнікі былі абавязаны разам з воласцю прымаць удзел у рамонце і доглядзе Капыскага замка, умацаванняў горада і «перекопов», даваць грошы «на вы-

праву выбранцев», «жита на пушкаров замковых» і стацыю на выпадак прыезда ў Копысь Радзівілаў [155].

На тэрыторыі воласці толькі кульнікам дазвалялася каваць руду, выпальваць вугаль і плавіць руду. Аднак ім ставілася ўмова: пад пагрозаю страты вугалю і руды абавязкова закопваць усе ямы, паколькі з-за такога віду самавольных дзеянняў сялян воласці і так «все леса опустошены и внивеч... обернуты есть». Сяляне былі папярэджаны, што, калі іх зловяць на здабычы руды, на парубцы лесу ці выпальванні вугалю, у іх усё будзе адабрана і накладзены штраф — «вины рубель грошей» [156].

Дакументы 1597—1599 гг. строга вызначаюць ваенна-будаўнічую павіннасць сялян воласці — «замок Копыский як и острог мескій направовати». Некалькі інакш выглядалі абавязкі баяр, якія валодалі, як правіла, надзелам з 5 валок зямлі: «...подчас войны и кожной потребы Его милости Князя и на кожную потребу замку Копысского конь 1 по-козацку ставити, также з листы ездити и по тыдню в замку Копыским мешкати повинны будут, стерегучи в нем меж собой чергами, водлуг описанья той повинности у инвентару головным». Акрамя таго, яны павінны былі «работу альбо направу замку, на их приходячую, отправлять» [157].

Адзін з дакументаў 1599 г. сведчыць пра ўмовы землекарыстання і і павіннасці копыскіх пушкароў. Гэта відаць з прывілея пушкару Сямёну Івановічу, якому пры правядзенні валочнай памеры «при месцы Копыским» у вёсцы Завеі выдзелілі 6 валок зямлі «водлуг порадку разданя инвентару описанного». За гэта пушкар «... верно и цнотливе ЕМК, пану своймў в замке Копыском служити мает повинность свою пушкарскую, будучи готовы до каждой потребы пушкарской замковой. К тому армата, якая есть и напотом будет на замку Копыском, за каждой потребой его, поровнавшися з иншими пушкарами замковыми, што на него припадёт, хендожыть и направлять тое, што реместву належать будет, до которой направы той арматы врадник копыски железа мает давать. До того ж з волок своих 20 фунтов ручничного и 40 фунтов дельного и гаковничего пороху до эконома ЕМК копыского отдавать мусить на каждый рок часу певного при сведках» [158].

Інвентар Копысі 1651 г., у якім было тады 450 дымоў, дае наступнае ўяўленне пра абарончыя пабудовы горада і замка. У замку мелася дзве брамы — адна вялікая, праз якую ўязджалі з боку «места», і другая, якая стаяла над Дняпром. Яна была вежападобнай канструкцыі, моцна нахілілася («опавшая») і патрабавала рэстаўрацыі. Пэўную ролю ў абароне замка іграў, магчыма, вялікі двухпавярховы дом «розным маляваннем помалёванный» і абведзены кругом галерэяй верхняга бою — бланкаваннем. Усе гэтыя пабудовы былі абстаўлены частаколам, які патрабаваў рамонту. Гэты інвентар фіксуе таксама гарадскія ўмацаванні з боку Дняпра і з другіх бакоў, а таксама гарадскія брамы: Шклоўскую, Гарадзецкую, Горскую, Аршанскую. Яны адкрывалі дарогу адпаведна ў Шклоў, Гарадзец, Горы і Оршу. Вядома, што драўніну для будаўніцтва замка бралі ў бліжэйшым лесе засценка Лазараўскага, але для гарадскіх умацаванняў мяшчане не мелі права там «... и розги рушить под виною на ўряд 10 коп грошей». Яны павінны былі дастаўляць неабходныя будаўнічыя матэрыялы з далёкіх лясоў [159].

Да пачатку руска-польскай вайны 1654—1667 гг. абарончыя ўмацаванні замка і Копысі так і не былі прыведзены ў належны стан. Мясцовае насельніцтва, якое было распрапагандавана манахамі і святарамі Куцеінскага манастыра, 13 мая 1654 г. здало дрэнна ўмацаваны горад войску ваяводы Замятні Лявонцьева. У сваім данясенні цару ён пове-

дамляў: «... пришёл с твоими людьми в Копысь и копысские люди, попы и мещане, и уездные многие люди встретили меня за городом с образами и били челом тебе, великому государю» [160]. Сярод тых, хто сустракаў, называюцца «копысский войт и сотники». Данясенне ваяводы А. Н. Трубяцкога ўдакладняе падзеі, якія адбываліся тут: «...когда... солдаты... пошли на литовского гетмана на Радзивилла к Копыси, и из Копыси города попы и городские всяких чинов люди и шляхта, и мещане встретили их с образы и с хлеба и государю добили челом и город Копыс здали...» [161]

У ходзе ваенных дзеянняў 13 снежня 1655 г. да горада падступіла войска Вялікага княства Літоўскага. Гэта прымусіла рускі гарнізон (100 чалавек стральцоў), не чакаючы загаду, пакінуць Копысь. У ім застаўся толькі стольнік Ф. Малыгін і прыказны пісар, якія забаяліся царскага гневу. Гараджане ў сваю чаргу, хаця і баяліся гневу ўладальніка Копысі гетмана Радзівіла, тройчы адмаўляліся ўпусціць у горад яго войска. Потым да горада падышоў сам Радзівіл з гетманам Гансеўскім і паслаў гараджанам «лист с великою грозою», патрабуючы, каб яны горад здалі, што пасля ваганняў і было зроблена. Ф. Малыгіна забралі ў палон і вывезлі спачатку ў Магілёў, затым у Польшчу. Ён, напэўна, валодаў вялікімі чалавечымі якасцямі, бо жыхары Копысі напісалі Радзівілу ліст і папрасілі яго вярнуць Малыгіна ў Копысь, пагражаючы ў іншым выпадку спаліць горад і пайсці ў Расію. Цікава адзначыць, што Радзівіл быў вымушаны гэтую просьбу задаволіць [162].

Пазней, у ходзе ваенных дзеянняў, Копысь зноў трапіў у рукі рускіх войск. Захаваліся дакументы, якія зафіксавалі загад цара вывесці «лучших людей» з горада, які абязлюдзеў. Але тут яшчэ заставалася «... всех копыских мещан посадских людей со 100 человек з женами и с детьми». Аднак затым паступіў загад цара ваяводзе Г. Г. Пушкіну «из Копыси жилецких и всяких людей со всеми их животы и наряд, и зелье и свинцу, и всякие пушечные запасы вывести в Шклов, а в Копыси... город и острог и за городом дворец и лавки, и амбары... все сжечь» [163].

Верагодна, нешта не дазволіла выканаць гэты загад, і рускае войска вымушана было адступіць ад Копысі, не паспеўшы спаліць горад. У кастрычніку 1661 г. рускае войска зноў аблажыла Копысь, дзе сярод ацалелых мяшчан яўна была «руская» партыя, якая пераслала ваяводзе Даўгарукаму ліст з умовамі здачы горада. Пасланы сюды з войскам стольнік Н. Талачанаў павінен быў «... копыских сидельцев сговаривать и стращать и из пушек стрелять гранатами и огненными ядрами, чтобы город добыть без крови», без прыступу. Аднак салдаты на кастрычніцкім золку без загада пайшлі на штурм горада, прымяніўшы пры гэтым ручныя гранаты. Штурм быў адбіты, прычым рускія «людей потеряли многих», а палкоўніка Н. Фанзалена «зашибли с города каменем в голову». Сярод умацаванняў называецца «наугольная башня», якая стаяла на беразе Дняпра [164].

Горад, відаць, так і не ўзялі. Паступова ваенная сітуацыя, якая складвалася не на карысць Расіі, адвяла полымя вайны на ўсход ад Копысі. Яго інвентар, складзены 10 студзеня 1661 г., дае ўяўленне пра горад, на якім яшчэ добра відаць адбітак нядаўніх ваенных падзей. Патрабавалі рамонту сцены гарадскіх умацаванняў, брамы горада. З іх называюцца толькі дзве — Шклоўская і Аршанская і зрубы, якія стаялі на вале замка. Яны не мелі стрэхаў, былі ў благім стане. З-за спусташэнняў у 1662 г. Копысь не мог выдаць «стацыю» на пяхоту. Вайна знішчыла жыццё на 136 гарадскіх пляцах [165]. Барон А. Мейерберг, які ехаў у верасні 1661 г. праз Копысь, тым не менш адзначаў, што горад быў абнесены драўлянай

сцяною з вежамі і што яго абараняў драўляны замак, які стаяў пасярэдзіне высокага пагорка [166]. Вядома, што ў 1663 г. гарадскі паркан быў прыведзены ў спраўнасць, а Горскую браму поўнасцю абнавілі.

Між тым у 1666 г. ваенныя дзеянні паміж Рускай дзяржавай і Рэччу Паспалітай аднавіліся. Летам царскія войскі зноў занялі Копысь і выйшлі адтуль толькі ў сувязі з падпісаннем Андрусаўскага перамір'я ў студзені 1667 г. [167]

У 1668 г. у Копысі пачаліся вялікія работы па рэканструкцыі ўмацаванняў замка і запруды млына, дзякуючы якой замкавы «капец вада наўкола аблівала». Замак быў умацаваны земляным валам і чатырма бальверкамі. Прычым у 1668 г. тры з іх былі ўжо гатовыя, а чацвёрты заканчвалі будаваць. Калі раней у замку было дзве брамы і дзве брамкі-форткі, зараз пакінулі толькі адну ўязную браму, перад якой размяшчаўся пад'ёмны мост і вадзяны млын. Вада стаўка адыгрывала значную ролю ў абароне подступаў да замка. Але вясною 1668 г. веснавая паводка, асабліва воды р. Страшаўкі, імгненна сарвала млынавы «спуст» і яго выраішылі перанесці на другое месца. Пасярэдзіне замкавага двара знаходзілася студня з пад'ёмным колам і вядром, акаваным жалезам. Інвентар 1668 г. адзначае, што ўсё «место» Копысь знаходзілася «в паркане и на избицах». Сюды можна было ўехаць праз Аршанскую, Горскую, Шклоўскую і Крупніцкую (раней Гарадзецкую) брамы. Акрамя таго, былі яшчэ тры «фортки»— брамкі, з якіх дзве адчыняліся выхад да Дняпра, адна — у поле. Горад паступова пачаў адбудоўвацца. Узніклі «слабоды» на Заваллі, «пад парканам», на прадмесці і за брамай Аршанскай [168].

У 1670 г. працягваліся работы па перабудове ўмацаванняў замка. На той час тут мелася 4 гарматы, 22 жалезныя гакаўніцы, 4 мушкеты, запас пораху, волава, ядраў, куль, знаходзілася харугва-сцяг з гербам і ініцыяламі князя Багуслава Радзівіла на малінавым шоўку. Горад абкружаў паркан. Інвентар гэтага года дакладна фіксуе ваенна-будаўнічыя павіннасці мяшчан: «... паркан около места водлуг давних звычаев с волостью будовать и направлять». Гэта ж абавязаны былі рабіць жыхары мястэчка Барані, а таксама ўсё насельніцтва воласці. Праўда, у дакументах адзначаецца, што з ўлікам тагачаснага неўраджаю, спусташэння і ўбоства валашчанаў, многія з якіх разбрыліся, яны да той пары, пакуль не стануць заможнымі, вызваляліся ад узвядзення новых замкавых, млынавых і карчомных забудоў, а таксама гародняў, якія прыпадалі на воласць. Аднак яны абавязаны былі рамантаваць і паднаўляць усе старыя збудаванні і выходзіць «як на гвалт» на рамонт сарваных вадою млынавых запрудаў. З дакументаў відаць, што кожнае сяло (Ярэмбкавічы, Вусце, Болбасы, Хімінічы) напраўляла пастаянную колькасць замацаваных за ім гародняў паркана «яко здавна бывало» [169].

Інвентар Копысі, складзены 18 кастрычніка 1684 г., калі горад належаў маркграфіні Брандэнбургскай Людвіцы Караліне Радзівіл, паказвае ўмацаванні горада («паркан и избицы») моцна «надруйнованымн». Яны патрабавалі рамонту, як і земляныя валы замкавай фартыфікацыі. Такі агульны стан лініі гарадскіх умацаванняў сведчыць, напэўна, пра тое, што да гэтага гараджане і сяляне воласці ўсё яшчэ не акрыялі ад згубных вынікаў вайны і не маглі ўзнавіць лінію абароны. Інвентар яшчэ цікавы тым, што паведамляе пра агульную даўжыню гарадскога паркана, якая раўнялася 3370 літоўскім локцям, г. зн. 2190,3 м. У 1690 г. дакументы фіксуюць ужо толькі дзве брамы. Магілёўскія магістрацкія людзі, прыехаўшыя сюды па справах, «на варту выдали у Копысцю ў двух брамах осьмаков тры». Арсенал замка налічваў тры цэлых палявых

гарматы, 17 даўжэўшых і пяць «коротших» гакаўніц, запас ядраў, пораха, волава, кнаты, рознай амуніцыі [170].

Жыхары Копысі яшчэ не акрыялі ад вайны сярэдзіны XVII ст., а на парозе ўжо стаяла новая вайна — Паўночная. Адступаючы на поўдзень, рускія войскі ў 1707 г. поўнасцю спалілі горад, гарадскія і замкавыя ўмацаванні і забралі ўсю зброю гарадскога арсенала, у тым ліку ўсе гарматы. Інвентары 1707 і 1713 гг. даюць уяўленне пра абрабаваны і разбураны горад і яго ваколіцы. Адзначалася, што зямля — гарадскія і сельскія валокі — пустуюць і зарастаюць лесам. Тым не менш усе жыхары «места» і воласці ў 1713 г. былі зноў мабілізаваны на збудаванне «паркана і ізбіц новых, паколькі каля горада цяпер цалкам нічога няма», бо «і паркан, вал, ізбіцы каля места... ўсё Масквою зруйнавана і апала» [171]. Перш за ўсё пачалі аднаўляць Аршанскую і Шклоўскую брамы. Астатнія ў дакументах нават не ўпамінаюцца. Акрамя гакаўніц і бердышоў у арсенале згадваецца 26 крамянёвых мушкетаў — для таго часу навейшая зброя. Аднак аднаўленне горада зацягвалася. Сяляне Копыскай воласці не маглі справіцца з ваенна-будаўнічымі работамі ў замку, паколькі быў «галодны час і на хлеб цяжкі». Вадзяны роў вакол замка заплыў прынесеным з палёў пяском і яго з цяжкасцю ачышчалі. Цікава, што інвентары таго часу сярод фартыфікацыйных работ, праведзеных рускімі войскамі ў час Паўночнай вайны, называюць толькі пастаноўку штыкета на земляным вале, бастыёны якога, як вядома, былі ўзведзены намнога раней, у 1688 г. Штыкет ставілі тады, акрамя сялян Капыскай воласці, жыхары многіх іншых навакольных валасцей, якія вывозілі дрэва з бліжэйшых лясоў. Пазней, у 1707 г., вакол Копысі некалькі дзесяткаў палкоў рускіх войскаў сумесна з сялянамі Аршанскага павета і Магілёўскай эканоміі ўзводзілі бастыённыя ўмацаванні. Гэтым рабілася спроба сарваць у ваколіцах горада пераправу шведскіх войскаў праз абмялелае Дняпро [172]. Назва «Пятроўскі вал» адносіцца да гэтых умацаванняў.

У 1717 г. на гарадскім вале стаяў частакол — «астрог». Дакумент адзначае, што старыя ўмацаванні — «паркан і ізбіцы»— цалкам адсутнічаюць і іх трэба нанова будаваць. Усё гэта ўдалося ўзнавіць толькі ў 1724 г. [173]

Наступныя 12 інвентароў Копысі за 1726—1773 гг. даюць удакладненні планіроўкі горада і паведамляюць пра элементы ўмацаванняў горада і замка. Яны перыядычна паднаўляліся, перабудоўваліся, у цэлым не змяніўшы сваю структуру да моманту ўключэння горада, як і ўсёй Усходняй Беларусі, у састаў Расійскай імперыі. Так, замак захаваў чатыры бастыёны, рэгулярна змяняючы драўляныя сцены — палісад. Замкавая ўязная драўляная брама мела двайныя вароты з магутнымі запорамі. Другі паверх займала зала, вакол якой была зроблена кругавая галерэя верхняга бою. Памяшканне другога паверха выкарыстоўвалі то для захавання ручной агнястрэльнай зброі, то выконвала ролю замкавай бажніцы, дзе спраўлялі «святую імшу», то служыла лямусам. Памяшканне асвятлялася чатырма вокнамі. Вежа была крытая гонтам. Яе завяршаў флюгер — «ветранік» з белай бляхі ў выглядзе арла [174].

З варотаў горада пастаянна згадваюцца тры брамы — Аршанская, Шклоўская і Крупніцкая. Горскую больш, відаць, не аднаўлялі. Аршанская і Шклоўская брамы былі, згодна апісанняў, аднолькавай канструкцыі, двух'ярусныя, драўляныя, з двума варотамі, якія адмыкаліся на два бакі. Яны мелі па дзве каморкі. Адна, якую апальвалі, «іздобка» служыла жытлом для вартаўнікоў. Брамы, крытыя гонтам, мелі наверсе «ветранікі» Уваход з боку поля ў іх ішоў праз пад'ёмныя масты, перакінутыя

праз вадзяны абарончы роў. Усе брамы захаваліся да 1773 г. і ўзводзіліся з брусоў [175]. У лініі гарадскіх умацаванняў меліся «форты»— брамкі, якія выводзілі ў поле і да Дняпра.

Ваенна-будаўнічая і пажарная павіннасці мяшчан і воласці фігуруюць ва ўсіх інвентарах Копысі да 1773 г.

Невель

Дакладны час узнікнення Невеля невядомы, аднак летапісы згадваюць мясцовую акругу ўжо ў XII ст. як тэрыторыю Полацкай зямлі. З пачатку XV ст. Невельшчына была ў складзе Вялікага княства Літоўскага. Напэўна, тады ж, пры Вітаўце, і ўзнікла ўмацаванае паселішча пры ўпадзенні р. Еменкі (Емены) у воз. Невель. У 1562 г. Невелем пасля крывавай бітвы авалодалі войскі Івана Грознага, якія знаходзіліся тут да 1580 г. За гэтыя гады замак быў умацаваны, у насып вала ўвялі канструкцыю з брусоў. З боку горада выкапалі роў, па вале паставілі драўляныя зрубы, запоўненыя зямлёй і прыкрытыя дзірваном. У 1582 г. войскі полацкага ваяводы М. Дарагастайскага «...Невель замок през подане примушанае трибом военным» узялі. Ваяводы Баброў, Колычаў і Бібікаў здаліся разам з гарнізонам і ўсёй зброяй. Адной з прычын капітуляцыі стала адсутнасць пораху [176]. Аднак у тым жа 1582 г., згодна мірнаму дагавору, Невель адышоў да Рускай дзяржавы. Пры яго перадачы было праведзена «списание стрельбы». З яго відаць, што тады ў замку знаходзіліся чатыры медныя гарматы па 1 1/2 сажня даўжынёю, прывезеныя з Полацка. Ядры да іх былі калібрам «з гусиное яйцо» і «менш яйца гусиного». Мелася таксама чатыры гарматы рускія аналагічнага



План Невельскіх умацаванняў: 1 — замак; 2 — горад

калібру, «4 делец невеликих, куля до них с курачье яйцо», а таксама 102 гакаўніцы [177].

Дакументы 1619 г. сведчаць, што Невель тады ўваходзіў у склад Вялікага княства Літоўскага. Згодна інвентару, які быў складзены ў гэтым годзе, горад і замак абкружаў новы астрог. Частку горада і замак абаранялі воды ракі і возера, з боку поля з двух бакоў меўся вялікі роў, подступы да якога бараніліся коллем і востраколам. Перад ровам стаялі «загарадкі — кабыліны». У замку налічвалася восем вежаў, чатыры брамы. У замкавым арсенале знаходзілася разнастайная зброя — 12 аркебузаў, 24 гакаўніцы, вялікая колькасць куль і ядраў, у тым ліку каменных, 13 бронзавых і жалезных гармат, расстаўленых па вежах, порах і волава [178].

У 1623 г. кароль Сігізмунд III дараваў Невелю магдэбургскае права, пячатку і герб з выявай Давыда, які з мячом стаіць над забітым Галіафам.

Інвентар 1629 г. утрымлівае значныя ўдакладненні па фартыфікацыі замка, горада. Ён паведамляе пра вельмі глыбокі роў, які аддзяляў замак ад «места». Праз яго быў перакінуты пад'ёмны мост, што падводзіў да трох'яруснай брамы. Тут размяшчаўся механізм пад'ёмнага моста. Справа ад брамы, на вале, уздоўж абарончага рова ў кірунку да р. Еменка ішоў «паркан ... на ізбіцах насыпаны, ... драніцамі накрыты». На вуглу над ракой узвышалася двух'ярусная вежа, зрубленая ў адну сцяну. Улева ад яе стаяла прасла штыкета, завостранага «на іглу», і яшчэ адна такая ж вежа. Наступнае прасла штыкета падводзіла да брамы Воднай, якая адкрывала доступ да р. Еменкі. Над вадою ўзвышаліся яшчэ дзве дзяляпкі астрога з вежамі ў два ярусы, якія падводзілі да рова, і воз. Невель. Убок уязной брамы ішоў «паркан на ізбіцах... крыты драніцамі».

У арсенале замка значыліся літыя і каваныя гарматы, штурмакі, кароткія шмыгаўніцы і доўгія гакаўніцы, драбавікі, разнастайныя ядры, кулі, порах, свінец. На замкавым дварэ стаялі дварэ мясцовых казакоў, гайдукоў, шляхты і чатырох пушкароў. Тры гарматы меліся ў мяшчан. Адносна ўмацаванняў горада адзначалася, што «астрог, які быў каля места, увесь сгніў» [179].

У 1633 г. Невель апынуўся ў руках рускіх войскаў. Выходзячы на вылазкі, яны з цяжкасцю адбівалі адчайныя прыступы войскаў Вялікага княства Літоўскага. Аднак у 1634 г. яны страцілі горад [180].

Інвентар 1636 г. паказвае замак і ўмацаванні горада ў стадыі абнаўлення. Сцены ўзводзіліся ў выглядзе гародняў, засыпаных зямлёй. Вакол Невеля выкапалі глыбокі роў. Пасярод лініі астрога пачалі ўзводзіць уязную браму, названую Мікольскай ад назвы царквы св. Міколы, якая знаходзілася побач. Доступ да яе праходзіў праз роў па пад'ёмнаму мосту. З напольнага боку будавалася таксама драўляная вежа. Інвентар зафіксаваў павіннасці па абароне жыхароў горада і воласці. Мяшчане абавязваліся штогод пастаўляць для рамонту гарадскіх умацаванняў па два бервяны і адной чэсанай дошцы, за чым уважліва сачыў урад замка і горада. Мужчыны мелі зброю і кожны квартал на працягу года станавіліся на попіс перад гарадской і замкавай адміністрацыяй. Сяляне Мікольскай і Паноўскай валасцей з кожнай службы зімой пастаўлялі ў замак для рамонту і будаўніцтва фартыфікацыі па два брусы і адной чэсанай дошцы даўжынёй у 4 сажні, а для «арматы» загатоўвалі дубовыя бярвенні, якія, відаць, ішлі на выраб артылерыйскіх станкоў і колаў [181].

У 1649 г. кароль Ян Казімір перадаў Невель і ўсё староства ў пажыц-

цёвае валоданне гетману Вялікага княства Літоўскага Я. Радзівілу [182].

У 40-я гады XVII ст. вакол усяго Невеля меліся ўмацаванні, але да пачатку руска-польскай вайны 1654—1667 гг. яны ўжо былі спарахнелыя і развальваліся. Іх слабасць перад магутнай арміяй рускага ваяводы В. П. Шарамецьева, які разгарнуў наступленне на паўночны ўсход Беларусі, прывяла да таго, што горад, абкружаны яго войскамі 31 мая, назаўтра, 1 чэрвеня, здаўся «нимало не боронясь». У данясенні цару ў чэрвені 1654 г. ваяводы В. П. Шарамецьеў і Ж. Кондыраў пісалі пра тое, «что... июня в день 1... невельские сидельцы воевода Ян Кормановский и товарищи пришол з знаменами в обоз к ним, боярину и воеводам и... государю добили челом и город Невель здали» [183].

Восенню 1655 г. ваявода Г. Хамутоў, які праводзіў агляд умацаванняў горада, замка і арсенала, у адпісцы цару паведамляў наступнае: «Невель — литовского поставленья, Большой и Малый Городок, по старой описи в ниских тарасах ставлен, стоячих тынов бревен лес сосновый и еловый, и при Литве, государь, в Большом городе и в Малом городке бревенье подгнило и послонялось в городе и за городом местами повзволялось и на остроге мосты около стен погнили и обрушились, ... и башни по городу погнили и кровли обрушились и наряду... от порчи не уберечь, и лестницы на башни и на острог все погнили. И за острогом Большого города ров, у старом раз'езжане потолочина посыпалося и опала и частокол и паркан везде унизу погнили и повывалилися, а большой ... мост через Еменец реку от посаду в город в Никольские ворота, где и старый преж сего мост бывал, и как твои, государь, слуги под Невель пришли, и тот мост литовские люди сожгли, а ездят... и ходят в город не в у Проезжие ворота в башне, а через мельничную заплату». Ваявода паведамляў таксама, што прыйшлося адрамантаваць мост і ў іншых праезжых варотах, у тым ліку пад'ёмны мост у замак («Малый городок»). Асобна адзначалася, што «крепостей на Невеле в городе по стене в малом городке нет, все погнило, послонилось и во многих местах осыпалося» [184]. З гэтай жа адпіскі відаць, што гараджане ў сувязі з ваеннай небяспекай пакінулі горад да прыходу рускіх войскаў: «Никаких жилецких людей нет, только, государь, в пушкарех и дворянех пушкарских и воротниках с братьи и племянников слуг всяких старых невельских жильцов 30 человек, да в пушкарех и в воротниках литовских 6 человек, а шляхты... 44 человека, да казаков и посадских людей и детей 32 человека — все литовские люди». Відаць, на гэтай прычыне рамонт умацаванняў і мастоў вялі сяляне бліжніх валасцей і зарэчнага пасада: «... Невельского уезда сотенные люди лес положили и с твоего указу мост в проезжие ворота сотенных и посадских людей делать заставил». У сувязі з непрыгоднасцю старых умацаванняў цар загадаў у ліпені 1656 г. «невельскими жилецкими уездными людьми» ўстроіць у Невелі новы астрог [185]. У гэтым была пільная патрэба, тым больш што пасля здрады ў 1655 г. жыхароў суседняй Азярышчынскай воласці ненадзейным стала і насельніцтва Невельскай воласці. Царскія ваяводы даносілі Аляксею Міхайлавічу: «С того числа, как тебе, государь, изменили Озеришские литовские люди, и на Невле... Невельские литовские люди — шляхта и мещане и жилецкие всякие люди с пригородми ... от русских людей отстанвают и... в тех невельских литовских людех начинает быть шатость». 16 студзеня 1655 г. ваявода М. Сумарокаў паведаміў цару і В. П. Шарамецьеву, што пасля з'яўлення пад Азярышчамі конных людзей праціўніка на Невелі выяўлена «у посадских людей и волостных мужиков шатость большая, ... что де невляне, посацкие люди и волостные мужики хотят... государю изме-

нить, только бы де литовские люди к Невелю пришли и русских людей хотят де посечь так же как и в Озерищах»[186]. Аднак ваенныя поспехі рускай арміі на многіх напрамках ваенных дзеянняў знялі гэтую небяспеку і стабілізавалі абстаноўку. На некаторы час ваенныя дзеянні наогул перамясціліся далёка на захад і паўднёвы захад ад Невеля, дзе стаяў невялікі рускі гарнізон і рота ў 44 чалавекі невельскай шляхты на чале з ротмістрам Б. Камаром і паручнікам С. Ясімонтам[187]. Аднак у канцы 50-х гадоў вайна павярнула назад. Пачаліся інтэнсіўныя работы па рэканструкцыі і збудаванні новай фартыфікацыі горада. Ваенна-будаўнічая павіннасць лягла цяжарам на плечы абрабаванага і збяднелага гарадскога і асабліва сельскага насельніцтва. Работы не спыняліся нават у зімовы час. Ваявода М. Бешанцаў у снежні 1661 г. паведамляў цару: «... И на Невле, по нетихим вестям дворцовые всех волостей крестьяне расписаны по городу по башням и по стенам и около Малого городу на устье реки Емены опол ополивают всегда днем и ночью на городе и на ополе, а иные многие шляхетских поместий крестьяне около большого города ров большой доделывают, ров копают и частокол и рогатки около рву ставят и всякие крепости делают»[188].

Невельская шляхта ў чалабітнай цару ў студзені 1661 г. скардзілася, што «... их крестьянишка разорены от твоих неприятелей от листовских людей и от твоих ратных людей во все годы: хлеб потравлен и животина вся пограблена и побита, да мы же сами со крестьянишками своими делали город Невель весь новый и ныне по сухому месту копали ров, глубиною 3 сажни, а шириною внизу 1 1/2 сажни, а вверху 3 1/2 сажни, а около частокол ставили и рогатки около всего города делали ж». Гэты ж дакумент паведамляе пра абавязкі шляхецкіх сялян па непасрэднай абароне горада: «Крестьянишка расписаны для осадного времени по городу, по стене и по ополе для подкрепленья городовые поделки, лес возят и камень, и колья безпрестанно, домишек своих не знают а иные... разбрелись врознь»[189].

У канцы жніўня 1661 г. М. Бешанцаў паведаміў цару, што ў Невелі з напольнага боку, ад вусця р. Емены выкапаны вялікі сухі роў даўжынёй 290 вялікіх касых сажняў. Абодва яго адкосы былі выкладзены драўлянымі прыслонамі, а на схіле пад сцяною горада набіты частакол. Паколькі работы раней выконваліся «по первозимью, ... того городского рву во многих местах ров осыпался ... и прислон отвалился 10 сажней. А доделать того рву, что в недоделке ... и что осыпался, некем». Акрамя работ непасрэдна навокал горада ўмацоўваўся і замак. Тут, на вале, паставілі тарасы, насыпаныя зямлёю, зрабілі галерэю верхняга бою і страху. «Мерою того прясло от стены до стены, от наугольной башни до башни ж наугольной 88 сажней больших косых». Аднак былі і дзялянкі сцен, якія разбураліся: «и тех стен... тарасы отгнили и земля насыпанная осыпается, и кровля драницы осыпалася»[190].

Пасля паражэння ў кастрычніку 1661 г. войскаў ваяводы І. А. Хаванскага пад Кушлікамі іх рэшткі адышлі ў Невель. Цар загадаў ваяводзе Пляшчэеву «на Невле от прихода польских и литовских людей жить с великим береженьем, а городовые и острожные крепости худые рухомые места, которым без поделки быть нельзя, поделать служилыми и жилецкими людьми». У горад у аблогу тэрмінова звозілася навакольнае насельніцтва «с женишками и детишками», а ўсёй воласцю прывозіліся запасы хлеба, «конские кормы, сено, солома».

Таксама наказвалася «по городу и по острогу, и по воротам, по башням, и по стенам днем и ночью сторожи держать крепкие»[191].

Па Андрусаўскаму перамір'ю ў студзені 1667 г. Невель адышоў да Рускай дзяржавы, але ў 1678 г. горад вярнулі Вялікаму княству Літоўскаму, ён зноўку стаў уладальніцкім горадам князёў Радзівілаў. Невель увайшоў у склад так званых «нейбургскіх уладанняў» дачкі Багуслава Радзівіла — Людвікі Караліны, жонкі пфальцграфа Нейбургскага і Рэйнскага. З 1744 г. горадам валодалі Радзівілы нясвіжскай лініі [192].

За перыяд з 1681 па 1749 г. захавалася дзевяць падрабязных інвентароў Невеля і замка. Яны малююць дэталёвую карціну сітуацыйнага размяшчэння гарадскіх і замкавых умацаванняў, а таксама даюць каштоўную інфармацыю пра размеркаванні ваенна-будаўнічых павіннасцей сярод насельніцтва горада і валасцей, звесткі пра арсенал замка, узбраенні гараджан і рэестравых служылых невельскіх казакоў.

Як відаць з інвентару 1681 г., уваход у Невельскі замак ішоў па мосце праз абарончы роў, які аддзяляў яго ад горада, і далей у замкавую ўязную браму. Гэта была сямігранная двух'ярусная драўляная пабудова з двайнымі варотамі і сістэмай жалезных засавак. Знутры размяшчаліся дзве лесвіцы, па якіх падымаліся наверх. З боку замкавага двара ўшчыльную да брамы і астрогу стаяла «кардыгарда» для аховы. Прама насупраць уваходнай брамы, праз замкавы падворак, стаяла вадзяная брама, якая адкрывала шлях да возера. Замак абкружаў вал з драўлянным астрогам і вежамі. Колькасць іх не называецца [193].

У той жа час сам горад з трох бакоў абараняўся сасновым парканам зрубнай канструкцыі і часткова зроблены «ў шулу». Наверсе яго, на нахіленых бэльках, ляжалі спецыяльныя бярвенні («каткі»), якія скочваліся за паркан пры наступленні праціўніка. З чацвёртага боку, звернутага да замка, умацаванні мелі выгляд «ізбіцаў». Горад і замак падзяляў замкавы роў. Уся лінія гарадской фартыфікацыі была здаўна падзелена на пэўныя дзялянкі — «кватэры», замацаваныя за мяшчанамі і сялянамі валасцей. Характэрна, што рамонт умацаванняў праводзіўся не толькі новым дрэвам, але і старым, старыя будынкі «перасыпаліся». Лічылася за правіла, што «каму якія брамы і бакшты прыпадуць, то яны самі ж павінны будуць іх будаваць, накрываць і належным чынам даглядаць» [194].

Лінія абароны Невеля будавалася наступным чынам: пачынаючы з поўдня, ад рова і першай замкавай вежы над р. Еменкай ішоў прамы адрэзак сцен даўжынёй у 23 пруты, які ўпіраўся ў Мікольскую браму (Мікольскія вароты, яны ж Луцкія). Гэтая драўляная брама была шасцівугольнай у плане пры даўжыні кожнага з шасці бакоў у 2 футы (1 прут — 3,66 м), г. зн. 7,32 м. Уезд у яе ішоў збоку моста праз р. Еменку праз падвойныя вароты са складанай сістэмай засавак. Да брамы прымыкала «кардыгарда» для вартаўнікоў. Мелася ўваходная брамка. Ад Мікольскай брамы па прамой лініі прасла сцяны даўжынёй у 18 прутоў (65,98 м) падводзіла да Спаскай брамы. З боку поля ў яе ўязджалі па нізкім месце, перакінутым праз абарончы роў. Сама брама ў плане была чатырохвугольнай памерам 2×2 пруты (7,32×7,32 м). Затым ішоў адрэзак умацаванняў даўжынёй у 22 пруты (80,52 м) з вежаю «бычком» і даходзіў да вялікай чатырохвугольнай вежы Валкоўні. У наступны адрэзак умацаванняў даўжынёй у 30 прутоў (109,8 м) уваходзілі вежа «бычок» і вялікая вежа Глінка. Трэці адрэзак умацаванняў паміж Спаскай і Ягораўскай брамамі дасягаў працягласці 50 прутоў (213 м). Тут стаялі два «бычкі». Згодна апісанню, Ягораўская брама была ў плане чатырохвугольнай пры даўжыні сцяны ў $1^1/_2$ пруты (6,78 м). Перад ёй таксама знаходзіліся абарончы роў і мост. Двайныя вароты на бегунах,

абабітыя жалезнымі палосамі, мелі засаўкі складанай канструкцыі. З боку поля ўздоўж паркана ішоў абарончы роў, месцамі моцна забалочаны. У сухое лета яго асушвалі, аднак веснавыя разводдзі і восеньская бездараж пастаянна прыводзілі яго да забалочвання.

Ад Ягораўскай брамы на поўдзень ішоў адрэзак гарадскіх умацаванняў даўжынёй у 36 прутоў (131,76 м). Ён заключаў у сябе, акрамя паркана, «баштачку-бычок» і невялікія вароты — «фортку», якія выводзілі з горада да возера.

Апошні адрэзак абароны над ровам, які падзяляў замак і горад, складаўся з «ізбіц», якія на вышыні былі роўныя з замкавымі сценамі. Даўжыня гэтага адрэзка раўнялася 48 прутам (175,68 м). Працягласць горада па прамой паміж крайнімі кропкамі — вежай Глінкай і замкавай брамай вымяраліся 76 прутамі (276,16 м).

Чатыры гарматы, якія меліся ў горадзе (дзве бронзавыя і дзве жалезныя), размяшчаліся ў Луцкай (тры гарматы) і Спаскай брамах. Назвы брамам давалі галоўным чынам ад назвы цэркваў, якія стаялі побач,— Спаскай, Ягораўскай і Нікольскай. Двайную назву мела Нікольская брама. Яе называлі таксама Луцкай, паколькі яна выводзіла на дарогу ў Вялікія Лукі [195].

Інвентар 1681 г. паведамляе пра павіннасці мяшчан Невеля і падданых сялян усіх войтаўстваў. Разам з іншымі павіннасцямі мяшчане павінны былі для направы і выстаўлення новых парканаў дастаўляць па два бервяны і па адной чэсанай дошцы такога памеру, які будзе панярэдне вызначаны замкавай адміністрацыяй. Усё гэта неабходна было пад асобым навесам складваць, кожны год браць квіт аб выкананні гэтай работы. Але не ўсе мяшчане мелі коней, таму тыя, у каго коней не было, павінны былі лес секчы зімою, а вясною сплаўляць яго па вадзе, звязаўшы плыты. Гараджане, акрамя фартыфікацыйных работ, павінны былі адбываць варту ў гарадскіх брамах і мець неабходную халодную і агнястрэльную зброю. За гэтым уважліва сачылі сотнікі і дзесятнікі, якія ў выпадку недагляду самі неслі пакаранне. Усе мяшчане неслі супрацьпажарную ахову. Магістрат сачыў, каб у кожным доме з вясны і да пачатку халадоў у спецыяльных кадках і бочках была вада. Кожны домаўладальнік павінны быў мець на сваім доме драбіну не ніжэй за вышыню страхі дома. Пры праверцы супрацьпажарнага стану дамоў квартэрмістр мог накладваць штраф у 5 копаў грошаў, а бяднейшых саджаць у астрог, што звычайна зводзілася да выкарыстання іх на фартыфікацыйных работах. Гараджане масцілі вуліцы, будавалі масты праз абарончы роў за Луцкай і Спаскай брамамі пад пагрозаю штрафу ў 2 злотых. Асабліва гэта адносілася да мяшчан прадмесцяў.

Магістрацкая сістэма кіравання горадам прадугледжвала пэўную структуру ваеннай арганізацыі гараджан. Як гэта было ва ўсіх магдэбургскіх гарадах Беларусі, жыхары Невеля таксама мелі агнястрэльную зброю (ручніцы, мушкеты), уваходзілі ў сваю баявую дзесятку, у пэўную сотню, меліся камандзіры — дзесятнікі і сотнікі. Раз у квартал за горадам на асобным месцы, каля царквы Св. Юрыя, праводзіўся «попіс» гараджан і праверка іх зброі, зафіксаванай у рэестры [196]. Сведчанняў пра праверачныя заняткі па стральбе ў дакуменце няма, аднак па аналогіі з іншымі гарадамі можна дапусціць, што яны праводзіліся ў час аглядаў.

Як і мяшчане, жыхары валасцей абавязаны былі кожную зіму з кожнай службы даставіць у замак два бервяны і адну чэсаную дошку даўжынёй у 3 сажні. Ім жа даручаны былі дагляд і рамонт двух мастоў

перад Ягор'еўскай і Замкавай брамамі пад віною штрафа ў 2 злотых са службы.

У 1681 г. у Невелі налічвалася 314 мяшчанскіх дамоў, 53 казацкіх і баярскіх [197].

Інвентар Невеля 1688 г., састаўлены ў сакавіку — красавіку, дае сведкі пра горад пасля моцнага пажару, які здарыўся восенню 1687 г. У адну ноч былі знішчаны многія ўчасткі абарончых сцен, некаторыя вежы горада і замка. Усё гэта мяшчанам і валашчанам давялося аднаўляць зноўку. Інвентар утрымлівае некаторыя ўдакладняючыя дэталі па замкавай і гарадской фартыфікацыі і ўзбраенні ў вежах і брамах. Так, у замкавай браме знаходзіліся дзве гарматы — бронзавая даўжынёй $5^1/_2$ пядзі і жалезная ў 10 пядзяў. У Луцкай браме памяшчаліся дзве жалезныя гарматы па 8 пядзяў даўжынёй і 13 гакаўніц. У вежы Валкоўні знаходзіліся жалезная гармата ў 4 пядзі даўжынёй і гармата «вялікая» па другім наверсе. У Ягораўскай браме наверсе стаяла вялікая жалезная гармата даўжынёй у 11 пядзяў. Сцены замка ў той час мелі выгляд чатырохвугольных зрубаў — «ізбіц» з баявым ходам — «вуліцай» наверсе і страхою з дранкі. Усяго ў замку мелася шэсць вежаў, з іх дзве былі вежамі-брамамі. Працягласць лініі замкавых умацаванняў раўнялася 907 1/2 локця, або 409,5 м. З іх 201 локаць, або 130,6 м, узводзілі мяшчане Невеля, астатняе — дзевяць войтаўстваў воласці. Лінія гарадскіх умацаванняў працягнулася на 1349 1/2 локця, або на 875 з невялікім метраў. З іх мяшчане будавалі 195 м, 860 м будавалі войтаўствы. Як відаць, уся фартыфікацыйная лінія горада і замка дасягала больш за 1284,5 м. Гараджане майстравалі больш за 325 м умацаванняў. Сярод войтаўстваў павіннасць была размеркавана наступным чынам: войтаўства Запліскае — 538 1/2 локця (каля 350 м), Заеванскае — 426 локцяў (каля 277 м), Камшанскае — 105 локцяў (68,25 м), Сяруцкае — 75 локцяў (48,75 м), Парэцкае — 124 локці (80,60 м), Заверацеьскае — 75 локцяў (48,75 м), Пупавіцкае — 75 1/2 локця (49 м), Манастырскае — 150 локцяў (97,5 м), Тапароўскае — 187 локцяў (121,55 м) [198].

Параўнанне апісанняў умацаванняў у інвентары 1681 і 1688 гг. паказвае, што ўсе абарончыя збудаванні, якія згарэлі, былі адноўлены на ранейшых месцах «у старую меру». Толькі Замкавую браму перабудавалі меншых памераў. Раней даўжыня кожнай з шасці яе сцен раўнялася 2 прутам, у 1688 г. яе шэсць бакоў былі даўжынёй па 1 пруту і 1 1/2 локця, г. зн. 5,84 м. Павіннасць мяшчан і сялян у інвентарах ідэнтычная. Разам з тым інвентар 1688 г. паказвае абавязкі невельскіх рэестравых і «лістоўных» казакоў, якіх налічвалася 56 дымоў. Рэестравыя казакі валодалі зямельнымі надзеламі ад 1 1/2 да 4—6 валокаў зямлі «водлуг давних звычаев и повинностей». Выплачваючы па 3 1/2 злотых з кожнай валокі зямлі, яны павінны былі таксама па загаду адміністратара Невельскага замка з'явіцца ў замак на кані «па-казацку» ўзброеныя і, калі будзе загад, абараняць замак або валоданні, якія належаць Невелю. Адзін раз на год у замку або на «пляцу папісовым» яны станавіліся перад адміністратарам, маючы «каня добрага, пару пісталетаў, дзіду і самі асобамі сваімі», папаўняючы «склад» боепрыпасаў у цэйхгаўзе. «Лістоўныя» плацілі з кожнай валокі па 10 злотых. Але ў лік гэтай аплаты, як паведамляе дакумент, яны павінны былі здзейсніць «за 70 міль тры дарогі ў год..., лічачы адну дарогу даўжынёй да Слуцка або да Вільні. Зімой такая дарога ацэньвалася па 10, летам — па 6 злотых. Калі ў гэтыя дарогі яны не ездзяць, тады з іх бярэцца па 10 злотых» [199].

Не ўсе казакі жылі ў Невелі, але тыя, што жылі, былі вольныя ад усіх гарадскіх павіннасцей.

Інвентар Невеля, складзены ў чэрвені — ліпені 1694 г., фіксуе значную разбуранасць замка. У гэты час ён быў абведзены штакетам, а «ізбіцы» ўсе разваліліся. Вежы наогул «гадзіліся на дровы». У большменш прыгодным стане знаходзіліся дзве брамы. Умацаванні горада былі больш спраўнымі. Тут па-ранейшаму функцыяніравалі Луцкая, Нікольская, Спаская, Ягораўская брамы-вароты, адна фортка да возера, дзве вялікія вежы — Валкоўня і Глінка і чатыры вежы «бычкі». З боку возера ўсё гэта абкружаў абарончы роў. У гэты час у горадзе мелася восем розначаліберных гармат, некалькі гакаўніц, жалезныя і каменныя ядры, порах, салетра і волава захоўваліся ў цэйхгаўзе [200].

Такое ўяўленне даюць інвентары 1700 і 1712 гг., складзеныя ў гады Паўночнай вайны. У горадзе заўважана змяншэнне колькасці насельніцтва, якога ў 1700 г. налічвалася 394 дымы, у 1712 г.— толькі 270 [201]. У Невелі ў 1705 г. пабыў Петр I з рускімі войскамі.

Да 1731 г. Невель, які з Себежам складаў адзінае Радзівілаўскае графства, у некаторай ступені акрыяў ад вайны. Ён меў выгляд значнага горада, які займеў прыгарады, што размяшчаліся за Луцкай, Спаскай і Ягораўскай брамамі ў той час. У ім налічвалася 403 дымы. Агульныя міжнародныя абставіны, якія ў пэўнай ступені спрасцілі сітуацыю на граніцы паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй, далейшае развіццё ваеннай навукі і асабліва развіццё артылерыйскай справы наклалі свой адбітак на знешнія абрысы горада і яго фартыфікацыю. Яна па-ранейшаму захоўвалася, узводзілася і даглядалася горадам і воласцю. Аднак гэта было хутчэй данінай традыцыі, чым перашкодай для рэгулярных войскаў патэнцыяльнага ваеннага праціўніка.

Толькі супраць магчымых сялянскіх выступленняў умацаванні горада ўсё яшчэ ўяўлялі пэўную перашкоду. Але і гэтая перашкода ўжо адрознівалася ад падобных збудаванняў мінулага стагоддзя. Зрубленыя сцены замяняліся вастраколам і палісадам. У лініі гарадскіх умацаванняў засталося чатыры вежы, прычым толькі дзве з іх былі зноўку пабудаванымі. Сярод узбраення згадваюцца дзве вялікія жалезныя гарматы, адна бронзавая і дзве жалезныя сярэдняга калібра, дзве марціры, 13 гакаўніц, 47 розных стрэльбаў, ядры, кулі, карцечныя набоі і іншая амуніцыя. Як і раней, фігуруюць павіннасці гараджан — ваенна-будаўнічыя, вартавая і штоквартальны попіс са зброяй. Сярод казакоў згадваюцца толькі 9 чалавек «лістоўных», якія валодалі надзеламі ад 1/8 да 1 1/2 валокі [202].

Сітуацыя ў Невелі, зафіксаваная ў інвентары 1731 г., захоўвалася з нязначнымі зменамі да сярэдзіны XVIII ст. Гэта падцвярджана інвентарамі 1748 і 1749 гг.[203] Напярэдадні далучэння горада да Расіі ў 1772 г. тут былі Луцкая, Спаская, Ягораўская брамы [204]. У далейшым ніякіх сведчанняў пра ўмацаванні горада ў крыніцах больш не сустракаецца.

Себеж

Гісторыя парубежнага горада Себежа XV—XVIII стст. звязана са шматлікімі войнамі паміж Маскоўскай дзяржавай і Вялікім княствам Літоўскім, Рускім і Жамойцкім, якія рэдка заціхалі на гэтым парубежжы толькі ў перыяд нядоўгіх перамір'яў. Паўднёвы прыгарад Пскова, вядомы з 1427 г. па «Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай» як «Сибеж замок», ужо тады адчуў магутнасць войскаў вялікага князя Вітаўта, які

ішоў да Пскова і здаўся яму. Пасля здачы Пскова Вітаўт пакінуў на Пскоўшчыне ў замках і прыгарадах гарнізоны, падначаліўшы гэты край сваёй уладзе[205]. Першае пісьмовае сведчанне пра Себеж-крэпасць паказвае, што гэта ўмацаванне, безумоўна, існавала задоўга да 1427 г., гэта значыць у XIV ст., магчыма, і ў XIII стагоддзі.

У 1535 г. войскі рускага ваяводы князя В. Шуйскага ўступілі ў межы Усходняй Беларусі, а ў Себежы «яко на своей земле, замок Себеж зарубили и всеми потребами способили». Кіраваў будаўніцтвам італьянец Пятрок Малой. Спробы нейтралізаваць Себеж пабудовай супраціўнага яму замка з-за фінансавых цяжкасцей Вялікага княства Літоўскага засталіся няздзейсненымі[206]. Себежскі замак атрымаў назву Іван-Горад на Себежы. Ён меў працягласць драўляна-земляных умацаванняў у 170 сажняў, быў слабым, але яго «крепости самородные» і ўдалыя дзеянні гарнізона дазволілі паспяхова вытрымаць у лютым 1536 г. аблогу дваццацітысячнага войску намесніка Няміры. Двойчы, у 1560 і 1562 гг., замак поўнасцю выгараў і аднаўляўся. Ён то пераходзіў у рукі Маскоўскай дзяржавы (1570, 1582 гг.), то зноў уключаўся ў склад Вялікага княства Літоўскага[207].

Планіроўка Себежа і яго ўмацаванняў XVI—XVIII стст. добра рэканструіруецца на падставе шэрагу інвентароў за розныя гады, якія захаваліся ў архівах Масквы, Мінска, Вільні, Варшавы. У самым раннім вядомым апісанні Себежа ў Пісцовай кнізе за 1585—1587 гг. падрабязнага апісання ўмацаванняў няма, бо яны былі моцна разбураныя. Пісцы ў Верхнім горадзе са збудаванняў называюць толькі «анбар», а пад ім склеп для захавання зелля, свінца, ядраў і «всякого пушечного запаса».

Сярод 322 мясцовых жыхароў-мужчын мелася 82 стральцы, 137 пешых і конных казакоў, 31 пушкар, 15 варотнікаў. Дакументы называюць у лініі гарадскіх умацаванняў шэсць варотаў: Летнія, Успенскія, Мысавыя, Сабуравы, Апарыны, Кляменцеўскія. У 1619 г. інвентар ужо складзены сумесна маскоўскім дваранінам С. Д. Якаўлевым і віцебскім войскім Юрыем Сівіцкім у момант перадачы Себежа Вялікаму княству Літоўскаму. Тут «Себежский кром» называецца ў дакуменце «Высокім замкам». Згодна дакумента, ён меў магутныя драўляныя сцены-гародні, рубленыя ў тры сцяны і абмазаныя глінай. У замку ў лініі абароны стаялі тры шмат'ярусныя вежы і вароты — «брама», якая адкрывала спуск у горад. На тэрыторыі замка знаходзілася царква св. Мікалая, пяць хлебных свірнаў, сталовая хата, цэйхгаўз. Па вежах стаялі 15 бронзавых гарматаў на колах, адна гармата-шмыгаўніца, 21 гакаўніца. Меўся значны запас пораху і разнастайных ядраў як жалезных, так і каменных, пакрытых волавам. У цэйхгаўзе ляжалі гарматныя колы і восі, формы для адліўкі ядраў і куль, мушкетныя ствалы і інш.

Колішні вакольны горад Себеж завецца ў дакуменце Ніжнім замкам. Яго абарончыя сцены былі зрублены таўшчынёй у чатыры бервяны, мелі баявыя галерэі з байніцамі («бланкованьем»), змайстраваныя на гароднях («ізбіцах»). Яны ўшчыльную падступалі да ўмацаванняў Верхняга замка, злучаючыся з імі на крутым схіле. Ніжні замак абаранялі таксама восем вежаў, у іх ліку чатыры вежы — брамы. З іх толькі адна брама мае назву «Летняя». Астатнія назваў у інвентары не маюць. У позніх дакументах усе яны называліся аднолькава — «брамы Вадзяные», г. зн. яны адкрывалі жыхарам горада доступ да вады воз. Себеж. Пазней адна з брам называлася «Курпіна брама». Перад Летняй брамай меўся пад'ёмны мост. Вакол усяго Ніжняга замка па беразе возера



План Себежскіх умацаванняў: 1 — замак; 2 — горад

былі ўбіты драўляныя палі, якія перагарадзілі вольны доступ да сцен Ніжняга замка [208]. У інвентары называюцца дзевяць вуліц горада: Апарынская, Астрожная, Красная, Гандлёвая, Зароўе, Сяргееўская, Клiменцьеўская, Мысаўская, Азяроўская, «На зароўі», а таксама шэсць цэркваў — Троіцы, Мікалая, Прачыстай, Ільі, Пятніцы, Раства і манастыр св. Мікалая. Аднак усе дамы і цэрквы ў сувязі з перадачай горада Вялікаму княству Літоўскаму былі пустымі і абрабаванымі. Адбітак спарахнеласці і запусцення ляжаў на гарадскіх умацаваннях. Жыхары горада не згадваюцца, яны зусім пакінулі Себеж. Як відаць з інвентару 1619 г., пры Себежскім замку раней неслі службу 30 конных казакоў, якія валодалі падданымі і зямлёй у бліжэйшай акрузе, 20 пушкароў, якія падзяляліся на тры катэгорыі: старшых, якім плацілі ў год па 6 рублёў і па 20 чвэрцяў хлеба, сярэдніх, якія мелі па 5 рублёў і 15 чвэрцяў хлеба ў год. Мелася таксама 10 брамнікаў і 2 кавалі. Ім плацілі столькі ж, колькі і старшым пушкарам. Усім дазвалялася вольна і неабмежавана лавіць рыбу ў возеры [209].

Інвентар Себежа, складзены праз 10 гадоў, у 1629 г. малюе Верхні замак, у якім гародні ўжо саступілі месца частаколу — «паркану». Дзве старыя вежы зусім згнілі, дзве другія стаялі ненакрытыя. Уязная замкавая брама мела два паверхі. Арсенал замка заставаўся без змяненняў. Структура абароны горада выглядала наступным чынам: паркан, восем вежаў, чатыры брамы. Пры гэтым назву «ўязная Летняя брама» замянілі на «брама ўязная Полацкая». Яшчэ адна брама стала называцца «брама Мысавая». Згадвалася «Вялікая Полацкая вуліца» і вуліца Замкавая. З гэтага інвентару відаць, што горад у момант далучэння да Вялікага княства Літоўскага з мэтай прыцягнуць новых жыхароў атрымаў ільготы і вызваленне ад выплаты розных падаткаў тэрмінам на 10 гадоў. У 1623 г. Себеж атрымаў магдэбургскае права і, напэўна, уласны герб.

У горадзе было пачата будаўніцтва касцёла, плябані, школы і гарадской лазні. З шасці цэркваў горада пяць былі ў запусценні і толькі ў адной, Прачысценскай, вялася служба і меўся поп [210]. У Себежы з'явілася прышлае насельніцтва, якое прывабіла дзесяцігадовая «слабода». Сярод іх інвентаром называюцца замкавыя рамеснікі, себежская шляхта і себежскія казакі, якія пабудавалі свае двары ля ўязной Полацкай брамы і ўздоўж паркана. Таксама меўся замкавы гарнізон на чале з капітанам Г. Медунецкім. Аналіз імёнаў і прозвішчаў гарадскога насельніцтва Себежа, а таксама себежскіх казакоў гэтага часу выяўляе пераважна беларускую антрапанімію і дае падставу лічыць, што ў горадзе ў нацыянальных адносінах адбылася поўная змена насельніцтва — яно стала беларускім, рознага веравызнання, але з уніяцкім элементам, які пастаянна ўзмацняўся. У той жа час сельскае насельніцтва Себежскай і Краснагорскай валасцей заставалася вялікарускім, хаця паміж імі інтэнсіўна ўмацоўваліся паселішчы новапасаджанай беларускай шляхты і казакоў. Падданыя сяляне неслі абавязкі па рамонту і догляду Себежскага замка, адпрацоўваючы з кожнай службы штогод два тыдні конна або пешшу ў залежнасці ад неабходнасці. Прычым адзін тыдзень талакою («тыдзень гвалту») на рамонце ўмацавання, другі тыдзень павінны былі вартаваць замак. Акрамя таго, «на направу замка Себежскага з сялянскай службы даваліся ў замак 5 вазоў дроў, 2 бервяны або 1 брус даўжынёю ў 4 сажані» [211].

У 1641 г. гэта павіннасць некалькі змянілася, калі сяляне пастаўлялі з кожнай службы па два брусы і дзве цясіны даўжынёй па 4 сажні, а

таксама па адной кадзі для вады з мэтай проціпажарнай бяспекі. Таксама захавалася павіннасць старажоўства.

Да гэтага часу Себеж разросся і ўмацаваўся. Акрамя шляхецкіх і казацкіх у горадзе мелася 39 мяшчанскіх пляцоў. Ранейшая структура ўмацаванняў захоўвалася як у замку, так і ў самім горадзе — «месте». У арсенале горада адбыліся змены. Дакументы фіксуюць пяць бронзавых гармат на колах, тры жалезныя гарматы, пяць марцір, 13 гакаўніц, адну шмыгаўніцу і іншую зброю [212].

Паводле інвентароў першай паловы XVII ст., Себежскі край уяўляецца месцам усё яшчэ дрымучых няходжаных лясоў, напаўжаных самых разнастайных звяроў, на якіх кожнаму было дазволена паляваць пры выкананні пэўных умоў: «Звера любога малога і вялікага вольна кожнаму біць дазваляецца. А хто звера заб'е вялікага і не прызнаецца, той віны заплаціць 10 коп. а за меньшага — 5 коп»,— сведчыць інвентар 1641 г. Цікава, што паляваць дазвалялася не толькі на лася, аленя, сарну, мядзведзяў, ваўкоў і баброў, але і на зубра пры ўмове, што будзе аддадзена «на замак Себежскі паўшкуры і чвэрць мяса» [213].

У пачатку руска-польскай вайны сярэдзіны XVII ст., летам 1654 г., Себеж быў заняты рускімі войскамі. Захавалася данясенне ваяводы Сцяпана Бухвостава цару пра ўмацаванні горада гэтага часу. Працягласць умацаванняў вакольнага горада раўнялася 704 сажням. Яго вал узвышаўся над водамі возера на 9 сажняў. «Кромская сцяна» (умацаванне замка) мела працягласць 78 сажняў і ўзвышалася над горадам на 16 сажняў. У шырыню пляцоўка замка дасягала толькі 17 сажняў, у той час як шырыня вакольнага горада «от стены до стены» раўнялася 130 сажням, а ў даўжыню «от Летних ворот до Крому 190 саженей, а все на гору». Акрамя гэтай брамы ў навакольным горадзе згадваюцца яшчэ тры брамы, якія называліся аднолькава — «Водянымі» [214].

Перад Летняй брамай працякала невялікая р. Серабранка шырынёй 6 сажняў. Па сутнасці, гэта быў канал, які ператвараў паўвостраў з размешчаным на ім горадам у востраў. Мост на палях падводзіў да галоўнай Летняй (Полацкай) брамы. З прыступнага боку на падыходах да мосту і брамы ўздоўж усёй рэчкі дадаткова быў «установлен чеснок дубовый».

Спробы ваяводы С. Бухвостава пачаць зімою 1655 г. будаваць у Себежы новы астрог скончыліся няўдачай. Ваенныя дзеянні, адсутнасць на месцы патрэбных майстроў, немагчымасць нарыхтаваць і прывезці 21 тысячу бярвенняў, неабходных «на острожное дело», прывялі ў сакавіку 1655 г. да замены ваяводы С. Бухвостава І. Няплюевым, які меў царскую грамату з указаннем весці будаўнічыя работы «себежскими уездными людьми». Маючы толькі 6650 бярвенняў, І. Няплюеў пасля нарады са старастам Івашкам Дзежкіным «с товарищи» вырашыў будаваць малы астрог «по старой стене, где наперед сего городская стена была». Прычым работы пачаліся з рамонту астрога ля Летняй брамы [215]. Затым быў дагледжан замак. Тут паправілі ўязныя вароты, узвялі дзве вежы з абламамі, сцены на ўсяму «старому городищу», пабудавалі склады [216].

Ваенныя дзеянні ў акрузе Себежа не вяліся да вясны 1661 г., калі ваенная ўдача адвярнулася ад царскіх войскаў. Іх адступленні і паражэнні прывялі да таго, што себежскія мяшчане і шляхта, папярэдне знёсшыся з палкоўнікам войска Вялікага княства Літоўскага Міхайлам Пацам, 20 красавіка «... изутра рано... город отперли и М. Паца с войском в город вступили». Як пісаў цару ваявода І. А. Хаванскі, ратныя

людзі, якія «...былі в Себеже те де побежали к воротам и стали биться, и мещане де, прибежав, твоих ратных людей, которые были в Себеже, побили и в город Себеж литовских людей впустили» [217].

Сейм Рэчы Паспалітай у тым жа 1661 г. за гэтыя дзеянні амністіраваў жыхароў Себежа за здраду ў 1654 г. і ў якасці заахвочвання вызваліў горад на чатыры гады ад уплаты ўсіх падаткаў, пацвердзіўшы ўсе раней дадзеныя яму вольнасці [218].

Па Андрусаўскаму перамір'ю, Себеж да 1678 г. часова адышоў да Расіі, а затым вярнуўся ў склад Вялікага княства Літоўскага. Горад перайшоў у рукі Радзівілаў. Інвентарныя апісанні Себежа 80—90-х гадоў XVII ст. даюць новую цікавую гістарычную інфармацыю пра жыццё гараджан, іх павіннасці, планіроўку і забудову паселішча, а таксама пра абарончыя збудаванні гэтага часу.

Разбуральная і знішчальная руска-польская вайна 1654—1667 гг. у асноўным абышла Себеж. Пасля яе заканчэння горад зноў стаў разрастацца і прыводзіцца ў належны стан. Тут з'явіліся новыя грамадскія збудаванні, умацаванні замка і горада.

Як паказваюць дакументы, усе лініі ўмацаванняў горада былі раздзелены на асобныя дзялянкі, так званыя «кватэры», якія рамантавала або будавала пэўная катэгорыя насельніцтва Себежа, Себежскай і Краснагародскай валасцей. Так, умацаванні замка працягласцю 97 прутоў, г. зн. 472 м, узводзілі толькі сельскія жыхары Заазёрскага (14 прутоў), Парэцкага ці Дзямідаўскага (40 прутоў), Моцерскага (12 прутоў), Раждественскага (31 прут) войтаўстваў [219].

Працягласць ліній умацаванняў горада раўнялася 238 прутам, або 1160 м. Яна была разбіта на тры «кватэры». Першую даўжынёй у 30 прутоў (каля 145 м) даглядалі казакі, якія мелі свае дамы ў Себежы. Шляхта са сваіх гарадскіх «пляцов» узводзіла 26 прутоў умацаванняў (125,5 м). Найбольшая дзялянка прыходзілася на мяшчан, якія даглядалі 182 пруты, або 899 м, умацаванняў. У перыяд ваеннай небяспекі кожны быў абавязаны абараняць сваю «кватэру» [220].

Жыхары «места і воласці» мелі дакладна распрацаваную «ўставу» павіннасцей. Акрамя разнастайных падаткаў і натуральных паставак, яны выконвалі гарадавыя або замкавыя работы. Так, мяшчане з кожнага дома, валашчане з кожнай службы «для направы і выстаўлення новых парканаў» абавязаны былі даваць па два бервяны і па адной чэсанай дошцы такога памеру, які будзе ўказаны адміністрацыяй замка. Іх складвалі на замкавым двары пад паветкай, прычым кожны гараджанін павінен быў атрымаць адпаведны дакумент — «квіт» аб выкананні павіннасці. Уладальнікі коней прывозілі будаўнічыя матэрыялы па зімоваму шляху. Тыя, у каго коней не было, нарыхтоўвалі лес зімой, а вясной звязвалі яго ў плыты і сплаўлялі па рэках да Себежа [221].

У гарадскіх брамах узброеныя мяшчане абавязваліся несці па чарзе варту ўначы і ўдзень. У дадатак мяшчане рамантавалі масты перад горадам, дастаўлялі лес, ламачча, каменні на дамбу. У ваенных адносінах усе дарослыя мужчыны былі аб'яднаны ў сотні і абавязаны абараняць у адведзеных месцах на ўмацаваннях са зброяй у руках. У мэтах праверкі і падрыхтоўкі гараджан да вядзення бою і ўмення валодаць зброяй раз у тры месяцы праводзіўся агульнагарадскі «попіс». Наяўная зброя запісвалася ў магістрацкі рэестр і пазней старанна звяралася [222].

Своеасаблівую катэгорыю ваеннаслужылага насельніцтва горада складалі себежскія казакі. Валодаючы значнымі надзеламі зямлі (як правіла, 4 валокі ў радавых, да 12 — у ротмістраў, што складала болей

за 152 га), раскіданымі па тэрыторыі Себежскай і Краснагародскай валасцей, яны ў мірны час адыгрывалі ролю пагранічнай варты. Акрамя сваіх двароў на сяле, себежскія казакі былі абавязаны мець таксама «пляцы» ў горадзе, на вуліцы Краснай, якая пазней называлася Казацкай. На кожным пляцы стаялі жылыя і гаспадарчыя пабудовы, за якімі прыглядваў у адсутнасць гаспадароў асобны наёмны работнік. У выпадку ваеннай небяспекі ён павінен быў з мушкетам займаць месца на гарадскіх умацаваннях. Кожная казацкая сям'я абавязвалася мець у сваім доме запасы харчавання на чалавека на паўгода аблогі. Самі казакі ў выпадку аблогі абаранялі замкавыя ўмацаванні. Як і мяшчане, раз у тры месяцы яны праводзілі на замкавым двары перад адміністратарам свой казацкі «попіс». Сам казак або яго прадстаўнік павінен быў мець «добрага каня казацкага, дзіду, пару пісталетаў і бандалет на поясе». Улічваючы парубежнае месцажыхарства, казакі абавязваліся быць на замку да таго часу, пакуль адміністратар замка не аддасць патрэбнага загада [223].

Сярэднявечны Себеж быў горадам выключна драўляным. Таму магістрат горада строга патрабаваў ад жыхароў прытрымлівацца правілаў супрацьпажарнай бяспекі. На працягу вясны і лета каля кожнага дома ў асобным месцы ў бочках і чанах стаяла вада. На кожным доме, як правіла, была пажарная драбіна вышынёй не ніжэй за страху дома. Вада мелася і ў замку. Пажарную рэвізію рэгулярна праводзіў упаўнаважаны магістратам бурмістр, які пра непарадкі даносіў у замак. Адміністрацыя накладвала штраф у 5 копаў грошаў на заможных мяшчан, а «ўбогіх» садзіла ў астрог [224].

Да канца XVII ст. Себеж утрымліваў свае абарончыя ўмацаванні ў здавальняючым стане. Спраўнымі былі і ўмацаванні замка, якія складаліся з двух'яруснай брамы і паркана, гарадскіх умацаванняў. Пастаянна расла колькасць жыхароў. У канцы XVII ст. у горадзе налічвалася 300 дамоў. Былі пабудаваны касцёл, які стаяў на Замкавай гары, уніяцкая царква Дзевы Марыі на рынку, праваслаўная Раждественская царква. Дакументы называюць вуліцы Вялікую (ад Летняй брамы), рынак, Казацкую або Красную, Замкавую, Прабойную або Гандлёвую, якая ішла ад царквы Раства да возера, Папярэчную, Шляхецкую. Себеж у гэты час належаў княгіні Людвіцы Караліне Радзівіл, маркграфіні Брандэнбургскай [225].

Паўночная вайна нанесла Себежу вельмі цяжкі ўдар. Горад быў спустошаны, абязлюдзеў. Згодна даных інвентару 1717 г., калі Себежам валодаў сваяк Радзівілаў пфальцграф Рэйнскі, замак знаходзіўся ў руінах ужо некалькі гадоў. Яго ўмацаванні развaліліся. Ацалеў толькі частакол па абодва бакі ад двух'ярусных апаўшых брам ды каля абозні стаяла некалькі дзесяткаў завостраных бярвенняў плота.

З гарадскіх драўляных умацаванняў існавала ўязная Летняя брама. У п. 6 «Павіннасцей места Себежа» адзначалася, што «запушчанасць места адбылася ў апошнія неспакойныя гады, калі нават простай агароджы вакол паселішча не было, таму што ў гэтыя гады ні з воднага дыма і пляца не было вывезена ні бярвенняў, ні дошак, хаця гэта запісана ў прывілеі горада. Але цяпер, упусціўшы столькі гадоў, пад страхам пакарання загадваем, каб хутчэй у бліжэйшыя 3 гады, навазіўшы неабходнага лесу, горад навечна апарканілі і абгарадзілі належным чынам, места дагледзелі і аздобілі». У п. 8 «Павіннасцей...» гаварылася: «Праз 3 гады, калі ўсё будзе ўмацавана... неабходна папраўляць парканы кожную зіму, з кожнага пляца па 2 падыходзячых бервяна і 1 дош-

цы вывозіць і ўсюды вакол горада напраўляць і загараджваць праломы». Зноў, як і раней, устанаўліваўся абавязак для ўсіх грамадзян несці варту ў брамах і па горадзе па чарзе і быць паслухмянымі ў пытаннях абароны. Напаміналася пра неабходнасць кожнаму мужчыне мець належную зброю, падрыхтаваную для абароны горада, а таксама пра аднаўленне абавязку з'яўляцца кожныя тры месяцы са зброяй на «поніс перад урадам замкавым і гарадскім» [226].

«Генеральныя павіннасці валасцям» 1717 г. таксама ўзнавілі ранейшыя абавязкі сяляк на гарадавой рабоце ў Себежы «на выстаўленне ў замку і месце Себежскім новых парканаў водлуг здаўна адмераных кватэр» [227].

Таксама былі адноўлены старыя павіннасці і для себежскіх казакоў, якія аб'ядналіся ў асобую Себежскую харугву. Праўда, іх колькасць зменшылася да 16 дымоў, але зямельныя надзелы ў некаторых выраслі ў два разы, да 8 валокаў. Ротмістр Абрыцкі валодаў 14 валокамі, г. зн. больш за 294 га. Характэрна, што служба казакоў усё больш акцэнтавалася на абароне багацця ў і валоданняў гаспадара Себежа — князя Радзівіла [228]. Відаць, у сацыяльным плане ў акрузе было неспакойна.

Да 1755 г. горад аднавіў умацаванні, была пабудавана гарадская ратуша, адрамантаваны замак, дзе з'явіліся новыя вароты і астрог, а таксама гаспадарчыя і адміністрацыйныя пабудовы. Сярод вуліц Себежа сустракаюцца некалькі новых: Рыбацкая, Зімовая, Падлазная, Чорыкава. У горадзе налічваўся 131 дым. Упершыню ў інвентары 1755 г. ёсць звесткі пра з'яўленне за брамай Летняй прадмесця, на якім налічвалася 9 дымоў. Праз некалькі гадоў тут з'явілася прадмесце «Новае места» [229].

У 1762 г. у выніку пажару ўвесь Себеж, за выключэннем прадмесця «За брамай» і Новага месца, «выгараў на карню». Жыхарам была адменена гарадская павіннасць, але іх абавязалі дастаўляць лес на будаўніцтва ратушы. Аднаўленне горада зацягнулася. Змяненне ваенна-палітычных абставін на мяжы паміж Вялікім княствам Літоўскім і Расіяй напярэдадні падзелу Рэчы Паспалітай прымусіла магістрат горада адмовіцца ад будаўніцтва гарадскіх умацаванняў. Аднак па новай «Уставе павіннасцей» мяшчан абавязвалі аднаўляць ратушу і сумесна з Себежскай і Краснагародскай валасцямі рамантаваць і даглядаць увесь комплекс замкавых пабудоў. Праўда, парадны ўезд горада — Летняя брама — усё яшчэ існавала. Гэта зафіксавана ў Себежа ў 1769 г. за тры гады да далучэння горада да Расійскай імперыі [230]. Пасля 1772 г. неабходнасць у Себежскім замку канчаткова адпала і ён скончыў сваё існаванне.



2
глава

Структура і арганізацыя абароны паселішчаў ва ўладаннях Сапегаў

Магнацкі род Сапегаў, як і род Радзівілаў, лічыўся адным з багацейшых на Беларусі. У XV—XVIII стст. Сапегі, патомкі полацкіх баяр, займалі вышэйшыя дзяржаўна-адміністрацыйныя і ваенныя пасады ў Вялікім княстве Літоўскім. Яны валодалі Старым Быхавам, Дуброўнай, Ляхавічамі, Вялікімі Гарамі, Друяй і шэрагам іншых гарадоў, а таксама велізарнымі зямельнымі надзеламі ў Беларусі, Літве і на Украіне. Жорсткія прыгнятальнікі працоўнага насельніцтва князі Сапегі ў 80—90-я гады XVII ст. нават спрабавалі ўтварыць самастойную дзяржаву са сваёй дынастыяй. Гэта прывяло да стварэння канфедэрацыі беларускай і літоўскай шляхты супраць іх і паражэння Сапегаў у бітве пад Алькенікамі ў 1700 г.

Многія гарады, якімі валодалі Сапегі, былі ўмацаваны ў адпаведнасці з патрабаваннямі перадавой ваеннай думкі свайго часу і не раз вытрымлівалі працяглыя аблогі ў ходзе ваенных падзеяў XVI—XVIII стст.

1. ГАРАДЫ ПАДНЯПРОЎЯ

Стары Быхаў

У пісьмовых крыніцах паселішча пад назваю «двор Быхово» ўпершыню згадана ў даравальнай грамаце князя Дзмітра Семяновіча 31 мая 1393 г.[1] Аднак археалагічныя матэрыялы сведчаць пра існаванне тут невялікага паселішча ўжо ў XII—XIII стст.[2] У 1430 г. Быхаў знаходзіўся ў валоданні князя Свідрыгайлы, затым перайшоў у рукі князёў Гаштольдаў. Пасля згасання гэтага роду ў 1542 г. Быхаў, як і Шклоў, аказаўся ў магутных магнатаў Хадкевічаў. Ім горад належаў да 1625 г., затым перайшоў па спадчыне да Сапегаў[3].

У 1590 г. гетман Вялікага княства Літоўскага Ян Хадкевіч атрымаў ад караля грамату на пабудову тут замкавых умацаванняў. Пры Карлу Хадкевічу ў 1610—1619 гг. будаўніцтва было працягнута і завяршылася пры Льву Сапегу. Горад атрымаў магутную бастыённую фартыфікацыю. У першай палове XVII ст. замак і горад уяўлялі сабой адзіны комплекс абарончых збудаванняў, якія мелі форму паўкруга дыяметрам каля 800 м. Яны стаялі на высокім абрывістым беразе Дняпра, які працякаў недалёка ад падножжа замкавай гары і надзейна прыкрываў подступы да замка з усходу. Дадатковай перашкодай на шляху да замка з гэтага боку служылі таксама р. Макранка з сістэмаю запрудаў на ёй. Замак займаў прамавугольную дзялянку памерам 77×100 м. З трох бакоў — поўдня, захаду і поўначы — яго абаранялі глыбокія і шырокія (да 22—27 м) абарончыя равы. Доступ у замак ішоў па пад'ёмным мосце, перакінутым праз заходні роў. Абнесены земляным валам з бастыёнамі замак меў таксама комплекс каменных жылых і гаспадарчых пабудоў. Па вуглах яго стаялі васьмігранныя двух'ярусныя вежы, таўшчыня сцен якіх перавышала 1,1 м. Першы ярус меў сем байніц вышынёй 70 см, пе-



Быхаўскі замак. План першага паверха



Стары Быхаў. План 1781 г. (паводле А. Квітніцкай)

ракрытых паўкруглай аркай шырынёй 73 м. На другім ярусе размяшчалася восем байніц. Вышыня вежаў разам з дахам была болей за 12 м. Яны фланкіравалі сцены казармаў, размешчаных ля ўваходу ў замак.

Кварталы горада, якія абкружылі замак з трох бакоў, таксама былі абнесены магутным земляным валам з 11 бастыёнамі і равелінамі. Знешні вал Быхава дасягаў вышыні 7—8 м, шырыні ў аснове да 30 м. Перад яго крутым знешнім схілам размяшчаўся глыбокі (да 7—8 м) абарончы вадзяны роў шырынёй 50 м. Трапіць у горад і выйсці з яго можна было толькі праз тры каменныя брамы — Падольную (Дольную), якая выводзіла на бераг Дняпра, Магілёўскую — у паўночнай частцы і Рагачоўскую (Новабыхаўскую) — у паўднёвай. Праз абарончы роў перад Магілёўскай і Рагачоўскай брамамі былі перакінуты пад'ёмныя масты. У першай палове XVII ст. адзначалася інтэнсіўнае развіццё Старога Быхава, яго гандлю і рамяства. Вал, які закрываў горад, пачаў стрымліваць яго тэрытарыяльны рост. Таму ў 30-х гадах XVII ст. было вырашана збудаваць за Дняпром насупраць Быхава слабаду, якая атрымала назву Лявонаўка. Навасёлы — мяшчане з гэтай слабады ў 1638 г. былі вызвалены ад аплаты падаткаў і выканання павіннасцей на 14 гадоў. Аднак ваенна-будаўнічыя павіннасці захаваліся. З поўначы подступы да замка перакрываў мураваны касцёл, абнесены каменнымі сценамі з невялікімі вуглавымі вежамі, з паўночнага захаду — інкастэліраваная сінагога. Прамавугольная ў плане, з тоўстымі, амаль двухмятровымі сценамі, круглай вуглавой вежай, круглымі і прамавугольнымі байніцамі ў атыкавай частцы, яна закрывала выхад з прылеглых вуліц і была сур'ёзнай перашкодай на шляху тых, хто наступаў [4].

У 1590 г. «нізавыя казакі» данскога гетмана Мацюшы Федаровіча захапілі «место Быховское, наехавши гвалтовне... для которое причины, земян, бяр, мещан... быховских били и поранили и шкоды им немалые в домах их в месте Быховском починили, маентности побрали». Пры тым у мяшчан забралі 13 ручніц, пулгакаў, тры парахаўніцы, тры шаблі, шэсць сагайдакаў «зо всем», пяць коп'яў, панцыр кольчаты, 50 коней з з сёдламі. З-за нечаканага нападу абарона замка была нядоўгай, але актыўнай. Падстароста аршанскі Андрэй Шавердзіч, які аглядаў драўляныя сцены і браму замка, бачыў «есьмо кули и стрел не мало». Дакумент згадвае пушкара быхаўскага Саўрона і злотніка Марку [5]. Аднак у 1648 г. казакі з Украіны на чале з атаманам Ф. Гаркушам і мясцовыя сяляне ўжо не змаглі ўзяць штурмам ні горад, ні замак.

Кіраса XVII ст.

У разгар руска-польскай вайны сярэдзіны XVII ст. Стары Быхаў увесь час быў жаданым стратэгічным пунктам для абодвух бакоў. Спачатку надоўга і без поспеху са жніўня 1654 г. гэты горад аблажылі казакі з Украіны наказных атаманаў І. і В. Залатарэнкаў. Яны асаджалі горад 11 месяцаў. Быхаў стрымліваў развіццё наступлення ў Падняпроўе («...за пазухою аки змею имеючи» [6]). «А в том Быхове,— пісаў маскоўскаму цару І. Залатарэнка 29 жніўня,— шляхты немало служилых людей и волощане, до того места належачие, заперлися и Вашему Царско-



Мушкецёр XVII ст. Рыс. У. Кіслага

му Величеству поклониться не хотят». Па словах гетмана, яны праяўлялі «гордыню і непокорение дьявольское». Абложаныя не рэагавалі на «прелестные грамоты» І. Залатарэнкі, якія засылалі ў горад ад імя маскоўскага цара. Адной з прычын адмовы горада здацца дакументы называюць боязь «перед Золоторенком» большасці мяшчан, якія сцвярджалі, што «ему не верят». Другая прычына — звесткі пра лёс гамяльчан і мяшчан іншых гарадоў, якія здаліся: «а именно Шклов, Копысь и иные города, и тех городов всяких жилетцких людей неволят, и в полон емлют и до Москвы отвозят, и те де все города иные разорены и опустошены; и быховцы де слыша то, все на том и положили, лутше де им в домех своих хотя помереть, нежели в неволю из воли самим себя отдавать» [7].

І. Залатарэнка прасіў цара «об огненной пушке и об огненных ядрах, чтобы есмя могли тех разорителей веры нашей православныя христианския с городом их зажечь, понеже город деревянный и зело домы большие и частые» [8].

У сярэдзіне снежня пасля дзесяцітыднёвай аблогі горад дэблакіравалі войскі гетмана літоўскага Я. Радзівіла і В. Гансеўскага і ўвайшлі

ў яго, адкінуўшы І. Залатарэнку да Новага Быхава. Толькі ў маі войскі І. Залатарэнкі зноўку пачалі аблогу Старога Быхава. У грамаце да абложаных ад 7 мая 1655 г. ён пісаў: «Па сотнократным упоминанье упоминаю, же бысте се поклонили Его царскому Величеству, а над собою, женами и детьми своими змиловалисе. Бо ведайте о том певне, коли вас достанем през меч, и малого дитяти живити не будем. А в том на мудрый ваш разсудок полецаем о респонсе пильно вашу милость жедаем» [9].

Праз 10 дзён была напісана яшчэ адна падобная грамата, на якую «Старого Быхова всяких чинов люди наказному гетману в том отказали: сдаваться де мы не хотим, а будем де сидеть покамест нашей мочи будет» [10].

Б. Хмяльніцкі, якога раздражнялі няўдачы І. Залатарэнкі, загадаў яму пакінуць ля Быхава заслон з пяхоты, выкапаць каля гарадскіх брам равы, каб стварыць перашкоду для вылазак абложанага гарнізона і «оставить курятник в покое». Казакі І. Залатарэнкі скіраваліся для ваенных дзеянняў у цэнтр Беларусі, а іх месца пад сценамі Старога Быхава заняло войска князя А. Н. Трубяцкога [11]. У чэрвені 1655 г. да быхаўскіх мяшчан з граматаю аб здачы горада звярнуўся сам цар, які абяцаў «всей врожоной шляхте и всему рыцерству, также всем бурмистрам, радцам и лавникам и всем всякого чину градским и уездным людям не чинить разоренья, выдать все жалованье, сохранить за шляхтою права маентности и прочие льготы». Адначасова былі папярэджаны ўсе, хто вырашыць супраціўляцца,— «тех всех предадим мечу» [12]. Угаворы былі падмацаваныя актыўнымі дзеяннямі войска князя А. Н. Трубяцкога, якія працягваліся да 26 ліпеня. Аблажыўшы Быхаў салдацкімі палкамі наглуха, князь «не по одно время» заклікаў быхаўцаў здавацца. У данясенні цару ён пісаў: «И быховцы твоей милостивой грамоты не приняли, и тебе, великому государю, не добили челом, и город не сдали, и из городу на солдатские шанцы вылазки у них были не по один день и ночьми, и с твоими государевыми людьми пеших полков с солдаты и с стрельцы они, быховцы, бились; и твои государевы ратные люди быховцев побивали, и от шанцев в ров отбивали» [13]. Прычыну такога зацятага супраціўлення царскія ваяводы бачылі ў магутнасці замка — «каменного городка», а таксама ў тым, што ў гараджан было «хлебных и жслезных запасов в городе много» [14]. Аднак сваю ролю адыграла і рашэнне польскага караля Яна-Казіміра адзначыць асобай граматай ад 31 мая 1655 г. стойкасць быхаўскіх сядзельцаў. Згодна гэтаму прывілею, жыхары дадзенага валодання К. Л. Сапегі — падканцлера Вялікага княства Літоўскага вызваляліся ад усіх падаткаў на 20 гадоў. Акрамя таго, за кошт каралеўскай казны ў далейшым наймалася 300 чалавек нямецкай пяхоты для абароны Быхава [15].

У пачатку жніўня частка рускіх войск з-пад Быхава пайшла на Слуцк і на Панямонне, але тут заставалася 11 палкоў А. Н. Трубяцкога, якія ўзначальвалі іншаземцы-палкоўнікі Е. Цыклер, Х. Юнкман, Г. Фанстадэн, Л. Марцятус, Я. Рэнарт, А. Гохгард, К. Краферт, Е. Франзбек, А. Гамонт, Г. Куйлін і Л. Р. Лзар'еў. У пачатку кастрычніка сюды зноў вярнуліся казакі І. Залатарэнкі. 7 кастрычніка настойлівая аблога Старога Быхава аднавілася. 8 кастрычніка «быховские сидельцы» ў ноўдзень зрабілі вылазку. У час сутычкі застрэлілі І. Залатарэнку. Паўстанне ў казацкім войску, якое затым узнікла супраць казацкай старшыны, дэмаралізавала запарожскае войска. Яно страціла баяздольнасць, «и так... не могучи... болше держати Быхова в облежению и оный узяти не

могучи, отступили назад на Украину». У канцы года і рускія войскі былі вымушаны практычна зняць аблогу Быхава. Тут застаўся толькі адзін полк з 22 сотняў палкоўніка Нячая, які складаўся ў асноўным з «папісаўшыхся» ў казакі сялян Усходняй Беларусі [16]. Між тым сілы абложаных у Быхаве слабелі. У снежні з Быхава збег палонны рускі салдат, які паведаміў, што «в Быхове конных и пеших людей с 1000 человек... А хлебными запасы у них, быховцев, в городе скудно, и многие бедные люди от того скучают, что де животины у них в городе много». Вялікія страты прыносіў «огненный наряд», які ўсё ж такі прыслалі сюды па просьбе І. Залатарэнкі. Быхаўцы сабраліся здавацца, але, даведаўшыся ад палонных, узятых на вылазцы, што рускія збіраюцца адыходзіць, вырашылі горад не здаваць. «А по городу де у них, быховцев, сторожа крепкая, в день и в ночь стоят беспрестанно все» [17].

Аднак інфармацыя ад беглага рускага паланяніка была недакладнай. 1000 чалавек складала наёмнае войска. Акрамя іх, тут было 18 харугваў мяшчан, што, верагодна, трэба разумець як 18 сотняў, шмат сялян з Быхаўскага павета і да 1000 яўрэяў. У сярэдзіне снежня 1655 г. з хлебам тут было «не скудно» [18]. 500 казакоў, якія знаходзіліся пад Быхавым, сур'ёзнай небяспекі для абложаных не ўяўлялі. Тым больш што 1656 г. практычна прайшоў ва ўмовах руска-польскага перамір'я. Яго ўмовы забаранялі царскім войскам і казакам чыніць «зацепки и наезды» на населеныя пункты, якія да таго не былі заваяванымі, «особливо Быхову». Рускі цар чакаў вырашэння пытання пра яго выбранне на трон Рэчы Паспалітай. У пачатку 1657 г., калі стала зразумела, што гэтая надзея не збудзецца, адносіны паміж Расіяй і Польшчай зноўку абвастрыліся. Рускія войскі, якія дзейнічалі сумесна з казакамі Нячая, узялі Стары Быхаў, гарнізон якога 18 месяцаў знаходзіўся ў аблозе і ўрэшце не змог утрымаць горад. У горадзе размясціліся казакі Нячая [19].

У другой палове 1658 г. І. Нячай здрадзіў рускаму цару і перайшоў на бок польскага караля. У лістападзе ён зрабіў сваёй рэзідэнцыяй добра ўмацаваны Стары Быхаў. Мяшчане горада былі прымушаны зноўку садзіцца ў аблогу. Авантура І. Нячая не выклікала энтузіязму ні ў радавога казацтва, ні ў быхаўскіх мяшчан, якія слухаліся яго «поневоле» і абвяшчалі, што «впредь помогать ему не будут» [20].

Толькі 14 мая 1659 г. да Быхава падыйшлі буйныя сілы рускага ваяводы Змеева, затым Лабанава-Растоўскага. Пачалася аблога, якая цягнулася амаль 7 месяцаў — да 4 снежня і скончылася начным прыступам на горад. Яго поспех у немалой ступені быў забяспечаны тым, што рускія ваяводы здолелі схіліць да здрады каменданта замка немца Шульца, членаў гарадскога магістрата Ільініча і братоў Ранчкоўскіх. «Впавши» ў Быхаўскую фартэцыю, рускае войска «людей всех, в той осаде бывших, высекло». Асабліва пацярпелі палонныя шляхціцы і мяшчане, якіх высеклі «в пень» [21].

У данясенні цару Лабанаў-Растоўскі паведамляў, што «государевы ратные люди город Старый Быхов приступом взяли и изменника Ивашку Нечая и брата его Самошку Выговского, а иных многих в ночное время побили» [22]. У час аблогі і прыступу замак моцна пацярпеў. Узнік пажар, у выніку якога «...в каменное городке... с порохом взорвало палату, а в той ... палате был порох ручной и пушечный и пушечные ядра, ... свинцу 12 свиней... да пушечных ядер больших и малых 1843 ядра да семсот пуль мушкетных, да в том же погребу быховских мещан в кадех меду сырцу сто пуд да сукна и иную рухледь» [23].

У 1660 г. сітуацыя дыяметральна змянілася: у Быхаве ўжо сядзела

ў аблозе войска царскага ваяводы Ф. Абярнібесава. 26 кастрычніка ён паведаміў цару пра цяжкі стан яго войск, якія галадалі і на якіх без перапынку нападалі казакі палкоўніка Мурашкі, што стаялі «близко Быхова у Ворколабова монастыря». Абложаныя мелі тады 18 палкавых пішчаляў і 2 вялікія верхавыя пішчалі [24].

Да канца 1661 г. тут сядзеў у аблозе полк палкоўніка Гохварта, салдаты якога «голод и нужды всякие терпели, и траву, и лебеду, и мокрицу, и лошадиное мясо, и сырые говяжьи кожи, варя ели». І снежня 1661 г. да Быхава падступіла войска Рэчы Паспалітай пад началам Чарнецкага ў складзе 7 тысяч конных і пешых салдат з 11 гарматамі [25]. Праз некаторы час горад быў узяты.

Андрусаўскае перамір'е 1667 г. паклала канец трынаццацігадовай вайне. Як і многія іншыя гарады, Стары Быхаў вельмі моцна ад яе пацярпеў, рэзка зменшылася яго насельніцтва. Польскі кароль у 1669 г. даў Быхаву поўную волю ад усіх падаткаў і мыт тэрмінам на 20 гадоў «па прычыне разбурэння горада ад сукупных казацкіх і маскоўскіх войск». Асобна былі ўлічаны затраты, якія ў першыя пасляваенныя гады гараджане панеслі, рэстаўрыруючы «фартэцыю Быхаўскую і валы каля места». Пагранічнаму гораду з каралеўскай казны выдзяляліся сродкі на наём, абмундзіраванне і ўтрыманне 300 чалавек «пяхоты нямецкай, якія знаходзіліся ў падчыненні каменданта замка» [26].

Такая пільная ўвага каралеўскай улады да Быхава яшчэ раз паказвае яго ролю і стратэгічнае значэнне на руска-польскай мяжы ў канцы XVII ст., а таксама сілу пратэкцыянізму роду Сапегаў, якія былі адной з буйнейшых магнацкіх сем'яў на Беларусі.

Сапегі не толькі клапаціліся пра ўмацаванне гарадской і замкавай фартэцыі свайго ўладання. Яны садзейнічалі развіццю ў горадзе ваенных рамёстваў. Зброя была неабходнай для гараджан. Тут мелася ўласная «людвісарня» — гарматная майстэрня, дзе адлівалі гарматы. Больш таго, у 1695 г. майстры «Юрко» і «Миколай» па запрашэнню адлівалі вялікую гармату ў Магілёве. Вядома, што ў Быхаве, акрамя гармат, адлівалі таксама марціры [27]. Зброя быхаўскіх рамеснікаў і даспехі карысталіся вялікім попытам і за межамі Беларусі. Яны траплялі таксама на замежны рынак. Так, у 1675 г. маскоўскі баярын А. С. Мацвееў набыў у беларускага купца Ісаева «40 копий быховских позолоченных, цена за копье по 40 алтын, 10 обушков быховских позолоченных, цена за обушок по 1,5 рубля, наручий быховских позолоченных с мисюрками 6 пар, пара по 5 рублев, 6 буздыганов быховских же позолоченных, цена за буздыган по 5 рублев, да 4 винтовки быховские ж, позолоченные, цена за винтовку по 5 рублев» [28].

Адзін з нешматлікіх інвентароў Старога Быхава за 1692 г. дае шэраг цікавых звестак пра замак і яго ўзбраенні, прынцыпы, структуры ваеннай арганізацыі гараджан, гарадскія павіннасці жыхароў горада і воласці. Як відаць з дакумента, замак размяшчаўся насупраць рынку. Трапіць у замак можна было па драўляным мосце, перакінутым праз абарончы роў. Мост меў з двух бакоў «парэнчы на балясах точаных». На яго сярэдзіне памяшчаліся пад'ёмныя «краты з дрэва сталярскай работы». Сама мураваная брама таксама мела пад'ёмную крату — герсу, палотнішча двухстворкавых варот «на бегунах», «пешаходную фортку» на завесах, сістэму жалезных засавак. На другім паверсе брамы знаходзіўся «пакой з камінам і печкаю». Завяршалася вежа круглым купалам — «галкай» з флюгерам — «ветранікам» у выглядзе герба Сапегаў. Злева ад брамы знаходзіўся будынак «мураванай кухні». Каля

яе дзве хаты з комінам, справа — каменная казарма, якая складалася з двух памяшканняў. На вусі ўезда стаяў палац, у якім верх займалі «пакоі» і сталовая, знізу змяшчаліся скляпы.

На замкавым двары знаходзілася новазбудаваная «студня» з круглым дахам, крытая гонтам на точаных балясах, знаходзіліся іншыя гаспадарчыя пабудовы [29].

На бастыёнах Быхаўскага замка і на гарадскім вале стаялі 34 гарматы розных калібраў і канструкцый («шратоўніца», палявыя, «моджер», «марціра», шматствольныя «арганкі»), у тым ліку пяць гармат быхаўскай адліўкі. У цэйхгаўзе меўся значны запас пораху (25 1/2 бочкі), волава (3,2 «свінні»), салетра, ядры для адлітых у Быхаве («тутэйшых») гармат і для іншых гармат рознага калібру, картузныя набоі для 3, 4, 6 і 10-фунтовых гармат, гранаты артылерыйскія і ручныя. Апошнія былі жалезныя, драўляныя точаныя і шкляныя. З ручной стралковай зброі і амуніцыі інвентар зафіксаваў больш за 1200 мушкетаў, 8 «арганаў» з мушкетных ствалоў, 38 гакаўніц, 1 старасвецкі аркебуз, 50 пар «блях гусарскіх», косы «проста насажаныя», формы для адліўкі ядраў і гранат, жалезныя пікі, сцягі-харугві, інструментарый для адліўкі гармат і іншыя рэчы [30].

Як сведчыць інвентар, павятовая быхаўская шляхта штогод «папісвалася на св. Міхала водлуг даўняга звычаю», становячыся на «попіс» перад мясцовым губернатарам. Гэта ж рабілі і «паны мяшчане места Старога Быхава... водлуг даўняга звычаю з харугвамі, бубнамі і зброяй».

Усе жыхары «места», згодна даўніх традыцый, займаліся «валавай работай»: пачаўшы з вясны і да замаразкаў «валы і зямлю сыпаць абавязаны былі за дазорам і загадам Яго Міласці пана губернатара». Быхаўская воласць, скончыўшы сеяць яравыя, таксама была абавязана «водлуг даўняй павіннасці сваёй валавую работу выканаць па загаду Е. М. пана губернатара». Восенню яна ж, «з поля сайшоўшы», працягвала работы да замаразкаў [31].

У гады Паўночнай вайны ўладальнік Быхава К. Сапега перайшоў на бок К. Ляшчынскага і Карла XII і трапіў у апалу як караля Аўгуста, так і Пятра I. Горад двойчы быў у аблозе. Пачынаючы з 1701 г. быхаўскі гарнізон на чале з М. Більдзюкевічам і Юрэвічам неаднаразова нападаў на наёмнікаў польскага караля і шляхціцаў, якія яго падтрымлівалі, не баючыся дзеянняў у адказ, таму што Стары Быхаў быў добра дагледжаны людзьмі і артылерыяй. Аўгуст II усё ж такі сабраў сюды значныя сілы сваіх войскаў і шляхецкіх харугваў. Пётр I таксама прыслаў запарожскіх казакоў. Польскае войска ўзначаліў генерал артылерыі Вялікага княства Літоўскага Сініцкі, які напярэдадні забраў 15 гармат з Магілёва. Зыход аблогі вырашылі ў канчатковым выніку голад і «галандка» — вялізная магілёўская гармата-бамбарда, на адзін зарад якой ішло 3 камені пораху (каля 45 кг.— *М. Т.*). Маючы добрага бамбардзіра, Сініцкі «бомбамі будынкі гарадскія моцна ламаў і... дзіравіў». З горада давалі рашучы адпор, аднак з цягам часу зыход аблогі станавіўся ясным.

Пасля шматмесячнай аблогі «рыцарства» горад і яўрэйскі кагал прысягнулі на ганаровых умовах каралю Аўгусту, здалі замак і горад з усімі гарматамі і амуніцыяй. Губернатар обер-лейтэнант Якуб Дэро вымушаны быў аддаць ключы ад горада і замка. Частка наёмнага гарнізона выводзілася ў Магілёў. Яго месца занялі 400 гвардзейцаў караля. Мяшчане захавалі ўсе свае вольнасці і прывілеі [32].

Заняўшы Стары Быхаў і ўсё наваколле, Сініцкі практычна стаў адзі-

наўладным правіцелем Быхаўшчыны, забіраючы ў сваю карысць усе прыбыткі таксама з Магілёўскай каралеўскай эканоміі. Адначасова разам са сваім акружэннем ён рыхтаваў здраду каралю Аўгусту II і выступленне супраць рускіх войск. Перш за ўсё ён загадаў насельніцтву аднавіць быхаўскія ўмацаванні, што было зроблена, па словах храніста, «крывавай людской працай». Затым, дачакаўшыся прыхода ў Быхаў войскаў, якія ўзначальвалі брат Сініцкага падстолій Вялікага княства



Спецыяльныя нажы для ўвінчвання ў калоды

Літоўскага і палкоўнікі Ліндорф і Берлінкурт, генерал падняў мяцеж. Адным з першых яго крокаў было рабаванне рускай армейскай казны, якая дастаўляла салдатам грошы да месца дыслакацыі палкоў. У адказ на гэта тады ж пад Быхаў былі тэрмінова скіраваны некалькі дзесяткаў рускіх палкоў пад камандаваннем генералаў Боўра, Чамберса, Фонвердэна і Валхонскага. У той час, летам 1707 г., Быхаў уяўляў сабой добра ўмацаваную фартэцыю з вялікай колькасцю гармат, пешага і коннага войску. Прыхільнікам Сапегаў і шведскаму каралю мяцежнікі паведамілі, што яны могуць прыходзіць на беларускае Падняпроўе, дзе атрымаюць поўную падтрымку з боку групы Сініцкага. Аднак насельніцтва Быхава, якое выказалася супраць дзеянняў Сініцкага, было прымушана заняць баявыя пазіцыі на лініі абароны горада. Каб перашкодзіць падыход да абарончага пояса горада, гарадскі вал ад падножжа і да верха быў абкладзены вялікімі калодамі, у якія ўвінцілі шмат спецыяльна зробленых нажоў. Такімі перашкодамі былі ўмацаваны месцы, найбольш зручныя для атакі рускіх войскаў [33]. Пачалася бамбардзіроўка горада і асабліва замка з цяжкіх марцір. Аднак доўгачаканая дапамога ад Сапегаў і Карла XII не падыходзіла. Гэта прымусіла Сініцкіх у канчатковым выніку пайсці на перамовы аб капітуляцыі. Горад і замак па ўмовах 13 пунктаў здачы займаліся рускімі войскамі. У замку павінны былі знаходзіцца два каменданты і змешаны гарнізон з рускіх і польскіх войскаў, жыхары горада і воласці атрымалі волю і захаванне сваіх правоў, старэйшыя афіцэры прыносілі прысягу ніколі не служыць супраць «найсвятлейшага цара», а самі Сініцкія павінны былі вольна пакінуць Быхаў. Уся артылерыя заставалася ў замку і на валах. Рускія генералы, якія згадзіліся на гэтыя ўмовы капітуляцыі, ужо мелі загад на арышт Сініцкіх і высылку іх у Сібір. Пасля здачы горада і замка закаваных у кандалы братоў накіравалі ў Сібір. Затым «усю армату

быхаўскую, якой было некалькі дзесяткаў штук, а таксама армату замкавую замка Магілёўскага — 15 штук... Масква, склаўшы ў байданы, адправілі ўніз Дняпром да Кіева»[34]. Па сведчанню інвентару цэйхгаўза, у 1707 г. у Быхаве сваіх гармат было больш за 30, калібрам ад 1 да 100 фунтаў, каля 50 бочак «пораху крычаўскага», пяхотныя і артылерыйскія гранаты, мноства рознай амуніцыі[35].

Пасля ўзяцця Быхава на працягу 7 гадоў з лішкам у ім стаяла некалькі тысяч рускіх салдат. Калі ж прыйшоў загад выходзіць з Быхава,



«Арган». XVII ст.

«Масква ў брамах быхаўскіх мураваных вярхі поўнасцю паразбірала, а пад вывады, якія былі наймацнейшымі, выкапаўшы равы, бочкі з порахам паставіўшы, паўзрывалі, места выпаліць хацелі, але ўбогія мяшчане са слязьмі ледзьве адпрасілісь. І так з тых часоў Быхаўская фартэцыя апала і не рамантавалася...»[36] Аднак сцверджанні магілёўскага храніста пра запусценні быхаўскіх умацаванняў не зусім правільныя. Яны ўсё ж былі адноўлены пасля Паўночнай вайны. Тут па-ранейшаму мелася шматлікае ваеннае апалчэнне гараджан, якое на пачатку XVIII ст. у прыватнаўладальніцкім Быхаве, як і ў іншых гарадах Беларусі, падзялялася на сотні і дзесяткі, кожны мешчанін павінен быў мець мушкет[37].

Быхаўскі замак Сапегаў таксама быў адноўлены і адрамантаваны. Артылерыйскі парк зноўку папоўніўся новымі гарматамі.

Інвентар замка да 1747 г. называе перакінуты праз абарончы роў «новы мост, з брусоў зроблены, з балясамі кругом». Уязная брама была «мураваная, з тоўстымі скляпеннямі, мела двухстворкавыя вароты з тоўстых дубовых дошак з фортаю і складанай сістэмаю жалезных засавак. Злева ў ёй мелася памяшканне кардэргардыі («ізба для жаўнераў»). Справа ў браме размяшчаўся астрог. У арсенале адзначаны 14 гармат на лафетах і без лафетаў, запас пораху, 44 «дзід зямянскіх»[38]. Праз 4 гады, у 1751 г., тут, акрамя 14 гармат, вядомых па інвентару 1747 г., мелася яшчэ 6 шмыгаўніц. Па-ранейшаму працавала людвісар-

ня, якая адлівала новыя і перарабляла старыя гарматы. У момант складання інвентару адзначалася, што адна «гармата разарвана» ў людвісара і адна ў аддзелцы [39]. У 1757 г. у замку знаходзіўся гарнізон у 50 «жаўнераў», а таксама адзін капрал, два яфрэйтары, два барабаншчыкі. Усе яны былі мясцовыя жыхары, набраныя са Старога і Новага Быхава, служылі на ўмовах карыстання зямельнымі надзеламі [40]. З цягам часу ў дакументах знікла назва «Рагачоўская брама». З канца XVII — пачатку XVIII ст. яе пачалі называць «Новабыхаўскай брамай» [41].

Уключэнне Усходняй Беларусі ў 1772 г. у састаў Расійскай імперыі канчаткова пазбавіла Быхаў яго стратэгічнага значэння як крэпасці на Дняпры. Аднак і тады магутнасць быхаўскіх умацаванняў уражала сучаснікаў, якія ў 1780 г. адзначалі: «Старый Быхов построен в 1590 г. по велению короля Сигизмунда и укреплен земляным валом и рвом великим литовским гетманом Сапегою. Над двоими воротами возведены две крепкие каменные башни (напэўна, адноўленыя Магілёўскія і Новабыхаўскія брамы.— *М. Т.*). Город сей никогда взят не был» [42]. На пачатку XX ст. абарончыя валы и равы горада былі прададзены або здадзены ў арэнду мясцовым жыхарам, якія да 1912 г. «амаль усе валы разрылі», а равы засыпалі і занялі пабудовамі, агародамі і садамі. Тады яшчэ былі цэлыя 10 гармат. Чатыры з іх стаялі, прыстаўленыя да сцяны касцёла, шэсць знаходзіліся ў замку ля сцен палаца, дзе размяшчалася ўправа вайсковага начальніка і канвойная каманда [43].

Баявое аплечча кірасіра

Зараз у горадзе ацалелі рэшткі земляных валоў даволі значных памераў (шырынёй у аснове да 25 м і вышынёй 2,5—3,5 м) і абарончыя равы шырынёй да 25 м, якія ператварыліся ў сажалкі.

Новы Быхаў

Новы Быхаў узнік у XVI ст. на высокім правым беразе Дняпра і быў адразу спланаваны і пабудаваны як драўляна-земляны замак прамавугольнай формы памерамі 560×370 м. Па перыметру ён быў абведзен земляным валам і ровам. Перад уязной брамай праз роў меўся пад'ёмны мост. Падобная планіроўка зафіксавана і ў сярэдзіне XVIII ст. У XVI — пачатку XVII ст. горад належаў Хадкевічам, затым перайшоў да Сапегаў [44].

У ходзе руска-польскай вайны 1654 г. Новы Быхаў быў заняты войскамі атамана І. Залатарэнкі, затым некалькі разоў пераходзіў з рук у рукі [45]. Асабліва актыўнай была аблога Новага Быхава ў студзені 1655 г. дванаццацітысячным войскам гетманаў Радзівіла і Гансеўскага. І. Залатарэнка з 6 тыс. казакоў умела абараняўся, праводзіў нечаканыя вылазкі і не дапускаў поўнага акружэння. Аблога працягвалася беспаспяхова да канца студзеня, затым была знята [46].

Вытрымаць аблогу такога шматлікага войска магла толькі моцная, добра ўмацаваная фартэцыя.

Пасля падзей руска-польскай вайны XVII ст. і Паўночнай вайны разбураны Новы Быхаў ператварыўся ў невялікае мястэчка. У цэнтры яго стаяў абгароджаны вастраколам «двор». Уезд сюды ішоў па мосце, перакінутым праз роў, па якім траплялі ў вежу-браму, абгароджаную частаколам. Тэрыторыю «двора» займалі гаспадарчыя і жылыя пабудовы.

Дуброўна

Цэнтрам абароны сярэдневяковай Дуброўны быў комплекс замкавых умацаванняў, размешчаных ля сутокі Дуброўны з Дняпром. Яны займалі ўчастак левага берага Дняпра выцягнутай, амаль прамавугольнай формы, арыентаваны па лініі ўсход—захад, які і зараз мае памеры 125×45 м. Роўная паверхня замчышча, на якой не захаваліся абарончыя валы, узвышаецца над водамі Дняпра на 8—8,5 м.

Дубровенскае замчышча складаецца з дзвюх пляцовак: пляцоўкі самога замка (90×45 м) і пляцоўкі падзамка (35×45 м), апушчанай ніжэй за замкавы двор на 1 м. Паміж імі некалі ішла раздзяляльная сцяна з уязной брамай [47].

Замак меў вельмі зручнае з пункту гледжання абароны размяшчэнне: з поўначы яго абаранялі воды шырокага і глыбокага Дняпра, з поўдня і захаду абмывала р. Дуброўна з прадуманай сістэмай запрудаў. Даволі глыбокі роў і нізіна аддзялялі замак ад самога «места» з яго



План Дубровенскага замка (паводле У. Ф. Ісаенкі)

складаным рэльефам. Да замку падводзіў адзіны шлях, што ішоў па вузкаму насыпу, падобнаму на дамбу, якую з замкавых сцен можна было пастаянна трымаць на прыцэле. Абарончы роў з усходняга боку амаль пастаянна запаўняла вада. Вясной ён злучаў воды Дняпра і Дуброўны, фактычна ператвараючы замак у востраў сярод віруючай вады.

Паселішча ў вусці Дуброўны ўзнікла на мяжы XV—XVI стст. У 1393 г. мясцовыя ваколіцы адзначаны ў дарчай грамаце князя Дзмітрыя Семяновіча як «земля пустая Дубровенская» [48].

У пачатку XVI ст. Дуброўна пачынае згадвацца ў дакументах у сувязі з ваеннымі дзеяннямі паміж Маскоўскай дзяржавай і Вялікім княствам Літоўскім. У красавіку 1514 г. літоўскі падскарбны адправіў з Вільні «воеводе смоленскому пану на его город Дубровну... 3 гаковницы» [49]. Аднак умацаванні «горада» таго часу, напэўна, былі слабыя. 13 жніўня 1514 г. Дуброўну занялі рускія войскі, праўда, ненадоўга, да вядомай Аршанскай бітвы 8 верасня таго ж года. Нямецкі дыпламат і падарожнік С. Герберштэйн, які праязджаў праз Дуброўну ў 1517 г., зафіксаваў і нанёс на сваю «Карту Московии» выявы яго замка ў выглядзе двух'яруснай вежы [50].

У першай чвэрці XVI ст. горадам і замкам валодаў князь Юры Іванавіч Ільініч. З 1570 г. ён належаў князям Глябовічам, у XVII — XVIII стст.— Сапегам.

У 1535 і 1562 гг. дубровенскія ўмацаванні спальваліся войскамі царскіх ваявод, аднак хутка аднаўляліся. Да гэтага абавязвала прыгранічнае становішча і размяшчэнне на важнай дарозе Смаленск—Масква [51]. «Гарадавую работу» выконвалі ў Дуброўне як мяшчане, так і сяляне воласці. У 1580 г. горад зноў занялі рускія войскі, але ўмацаванні яго, відаць, не пацярпелі. Ва ўсякім выпадку яго добры стан адзначаў пасол аўстрыйскага імператара Мікалай Варкач, які праязджаў тут у канцы жніўня 1593 г. Ён пісаў: «Дуброўна — горад і ў гэтым месцы апошні пагранічны замак супроць масквіцян. Горад ляжыць на Дняпры, а па другі бок замка працякае рака Дуброўніца. Гэты замак шырокі ў акружнасці, толькі ўвесь драўляны» [52].

З інвентароў Дуброўны вядомы толькі адзін — «Інвентар Дубровенскага замка, цэйхгаўза і шпіхлераў і ўсяго, што ў гэтым замку выяўлена», складзены 28 мая 1645 г. рэвізорамі Андрыянам Парэнбакам і Якубам Гаецкім. Ён захаваў мноства цікавых і каштоўных звестак пра структуру ўмацаванняў і ўзбраенняў замка таго часу. Як сведчаць дакументы, на шляху ў замак стаяў умацаваны «прыгародак» — падзамак. Сюды траплялі праз «новарэстаўраваную і пакрытую» дахам Старую браму. Падзамак быў абнесены астрогам і акрамя праезджай варотнай вежы меў тры новапабудаваныя вежы. Аднак падрабязнага апісання кожнай з іх у дакуменце няма. Можна толькі дапусціць, што яны былі не меней за два ярусы вышынёй. У дварэ падзамка стаяла некалькі жылых і гаспадарчых пабудоў, кожная з якіх аддзялялася ад суседняй агароджаю з чэсаных слупоў. Асобна стаяў цэйхгаўз. На тэрыторыю ўласна замка траплялі праз спецыяльны праезд. Па перыметру замка раней стаялі сцены-гародні, а з найбольш небяспечнага боку ад р. Дуброўны — дзве вежы. Адна «башта рагавая» стаяла над Дняпром, другая — за домам для гараднічага. У момант, калі складаўся інвентар, замест гародняў замак меў сцены ў выглядзе «астрога». Была яшчэ адна адзіночная «вежа высокая, старая», якая стаяла каля ўезда ў замак. Шлях у замак праходзіў па пад'ёмным мосце, які падымаўся двума жалезнымі ланцугамі [53].

У цэйхгаузе мелася 18 гармат, у тым ліку чатыры серпанціны і тры імянныя бронзавыя гарматы з надпісамі «Каштелян Минский, подскарбий ВКЛ», «Юркги Тышкевич». Было таксама 5 шмыгаўніц, 5 «кіёў» простых жалезных, 6 «кіёў, падобных на вузкія мартыры», 64 гакаўніцы, 68 пяхотных мушкетаў, 37 рушніц, а таксама 39 вялікіх і цяжкіх мушкетаў — «кабыл», з якіх стралялі са спецыяльных падставак — «фаркетаў». Усяго ў Дубровенскім цэйхгаўзе знаходзілася 242 адзінкі агнястрэльнай зброі. Да іх, згодна інвентару, мелася 11 бронзавых двухчастковых формаў для адліўкі вялікіх і малых ядраў і куль, 14 жалезных і 4 каменныя формы, а таксама значны запас боепрыпасаў: 56 коп (г. зн. 3360 шт.— *М. Т.*) рознай велічыні ядраў, 19 фунтаў куль, 122 каменных ядраў і ядраў з волава і аблітых волавам, значны запас шроту — «глоту», 6 1/4 пудоў мушкетнага пораху, 15 пудоў з лішкам пораху гарматнага, болей за 41 пуд салетры, 24 парахавыя ступы, да іх 180 таўкачыкаў, многа парахаўніц, патранташаў. З даспехаў і халоднай зброі дакумент называе 4 старасвецкія шышакі, 229 пяхотных і 5 казацкіх шабляў, апраўленых срэбрам, 16 коп'яў, 113 сякерак, 179 бердышаў без абухоў, «набіўных серабром», 17 з абухамі. Цікавыя звесткі пра абмундзіраванне гарнізонных гайдукоў, для якіх у цэйхгаўзе мелася «жупаноў белых гайдуцкіх 26, жупаноў чырвоных — 170, 7 зялёных, лісою падбітых, 181 блакітная дэлія, падшытая белым «кірам» (дэлія — кароткая свабоднага пакрою шуба без рукавоў, якую апраналі на панцыр; «кір» — тоўстае сукно.— *М. Т.*), 22 шапкі — катанкі белыя, 200 чорных шапак-магерак. Называюцца прапарцы на коп'ях, 11 сцягаў-харугваў, у тым ліку харугвы гараджан і сельскіх жыхароў. Усе яны прымалі ў абавязковым парадку ўдзел у абароне замка. Меліся барабаны — «бубны», сігнальныя трубы і многае іншае. Запас хлеба захоўваўся ў 10 свірнах» [54].

У час руска-польскай вайны XVII ст. Дуброўну ўжо ў чэрвені 1654 г. аблажылі рускія войскі князя Куракіна. У складзе гарнізона замка, акрамя шляхты, мяшчан і сялян воласці, была наёмная «угорская пяхота». Атрад Куракіна не мог узяць горад, абаронцы якога мужна супраціўляліся. 7 жніўня, як паведамляў ваявода цару, «выходили из города Дубровна литовские конные и пешие многие люди з знамёны и з снаряды, и у них с теми литовскими людьми был бой, на том бою государевы ратные люди литовских многих людей побили и в город вогнали, а Дубровенский уезд повоевали, и села и деревни пожгли и полон многий поймали». У тым баі быў паранены акольнічы і ваявода князь В. П. Львоў. Хоць стольніка і ваяводу з ратнымі людзьмі загадана было «за их службу похвалить» і рэкамендавана ўперад ім на літоўскіх людзей... «промышлять сколько милосердный Бог помощи подаст», стала зразумелым, што атраду Куракіна Дуброўну не ўзяць. Яго адклікалі ў Смаленск, накіраваўшы сюды замест войску князя Я. К. Чаркаскага, якому ўказвалася Дуброўну здабываць «зажогом и сговором, всякими обычаи, а приступать не велено» [55]. 13 верасня абложаныя ў замку зноў выходзілі на вылазку, якая з цяжкасцю была адбіта. Пасля гэтага рускае камандаванне прыняло меры для таго, каб гарантаваць бяспеку свайго войску і ўзмацніць яго агнявую магутнасць. Насупраць замка быў зроблены «земляной городок», у якім размясцілася войска. Са Смаленска пад Дуброўну накіравалі «рекой Днепром в судах и на плотах наряд 2 пищали галанские по 1 пуду 15 гривенок ядро, да русского литья пищаль Соловей ядро в 25 гривенок, пищаль Левик — ядро 15 гривенок, с станы и с колесы и с волоками и с конаты, да к тем же

пищалям по 100 ядер, да пушечных запасов 200 пуд, зелья пушечного 5 пуд, зелья ручного, на нарядные мехи 500 аршин холста, на пыжи 10 пуд пеньки, 4 пуда фетилю». Дастаўлены нарад паставілі ў земляным горадзе, адкуль пачалася бамбардзіроўка дубровенскіх умацаванняў [56].

Нягледзячы на тое што ў першыя дні кастрычніка пад Дуброўнай былі сабраны буйныя сілы рускіх войскаў, іх камандаванне ашчаджала сваіх людзей і прымала розныя меры, каб схіліць гарнізон і мяшчан горада здацца без залішняга кровапраліцця. Масіраваная бамбардзіроўка замка пажаданых вынікаў не дала. Пасля гэтага была зроблена спроба актыўнага ідэалагічнага ўздзеяння на жыхароў Дуброўны рознага веравызнання з дапамогай святароў, прывезеных з раней занятых гарадоў Копысі, Шклова і Оршы, а таксама мяшчан і шляхты Копысі і Магілёва. Пад Дуброўну прыбылі арганізатары здачы рускім войскам Копысі копыскі пратапоп Антоні, шляхціц Васіль Лаўрынаў і мешчанін Якаў Багданаў «с товарищи». З Магілёва прыбыў ігумен Куцеінскага манастыра Іоіль Трупэвіч са шматлікаю «братьею», якія раней распрапагандавалі і схілілі да здачы мяшчан Магілёва. Адначасова пад Дуброўну былі накіраваны «шкловские доминикане к римскому духовенству, а от жиды к жидам листы з заруками, чтоб Дубровенские осадные сидельцы государю добили челом и город здали». У самой Дуброўне вёў прапаганду мясцовы пратапоп Дзмітры Палікарпаў, які «дубровенских людей, шляхту и мещан и всяких чинов людей, по многое время уговаривал, чтоб они город сдали без кровопролития» [57]. Дэлегацыю суправаджаў «для обереганья» вайсковы атрад Трафіма Адгібалава «с дворяны и бояре». 5 кастрычніка на перамовы да сцен замка паслалі «Василия Лаврова (Лаўрынава.— *М. Т.*), могилевского мещанина Марка Сидорского. И Дубровенские сидельцы, приняв их к городу, того Василия убили из пищали до смерти, а мещанин Марка побежал. Вечером того же дня дубровенские сидельцы учинили вылазку на пеших людей, которые были под городом в городке» [58]. Але ў гэты час да Дуброўны падыходзілі перадавыя атрады рускага войску князя А. Н. Трубяцкога, якое дапамагло адбіць нападзенне.

Цара раздражняла супраціўленне Дуброўны, якая разам са Старым Быхавам заставалася адзіным горадам на верхнім цячэнні Дняпра, што не дазваляла рускім гарантаваць бяспеку Смаленска і ўсяго левабярэжжа Дняпра. А. Н. Трубяцкой і іншыя ваяводы з войскам, пасланыя да Дуброўны, мелі цвёрдую ўстаноўку і план далейшых дзеянняў, каб «с нашими ратными людьми шли под Дубровну..., и над Дубровной промышляли сколько милосердный бог помощи даст» [59].

Між тым «дубровенские сидельцы», бачачы прыход новых рускіх войскаў, каб засцерагчыся ад нечаканага штурму і здрады, засыпалі вароты зямлёй і падрыхтаваліся да далейшай аблогі, не страціўшы надзею атрымаць дапамогу ад войскаў гетмана Радзівіла. Аднак вера ў гэтую дапамогу з кожным днём слабела, а намеры рускіх войскаў, да якіх 6 кастрычніка падышлі і «на приступ изготовились» асноўныя палкі А. Н. Трубяцкога, не пакідалі сумненняў. Знаходжанне ў абложаным горадзе вялікай колькасці цывільнага насельніцтва, жанчын і дзяцей, цяжкасці з харчаваннем прымусілі кіраваўшага абаронай горада шляхціца Храпавіцкага пачаць перагаворы пра ўмовы здачы. Як пісалі ў адпісцы цару князь Я. К. Чаркаскі і баяры, «октября 11 числа выходили к ним из города Дубровны шляхта Граповецкий с товарищи да мешчане белорусцы 17 человек и говорили, чтоб с ними об городской

сдаче говорили, и они бояре и воевода дубровенцам говорили, чтоб они добили челом государю и город здали, как иные многие польские и литовские люди государю добили челом и города здавали, а на себя большой крови не навели б» [60].

Пагадненне было дасягнута 12 кастрычніка, калі «дубровенские литовские люди добили челом и город здали и ворота отсыпали». Пасля гэтага абложаныя «... с благочестивыми священниками с образами, а шляхта и желдаки, и мещане всяких чинов служилые люди и жилецкие люди... их, бояр и воеводы встретили... за городом с хлебом». Ваяводы, якія ўехалі ў горад, «дубровенских осадных седельцев и наряд, и зелье, и свинец велели переписать» [61]. Лёс дубровенцаў цар вырашыў яшчэ раней у асобным указе Я. К. Чаркаскаму: «как город Дубровна здастца, и... шляхты лучших людей выбрав, прислать к... государю, ... а достальную шляхту велеть посылать на Тулу, а мещан и уездных людей раздать ратным людям семьями, а город Дубровну выжечь». Гэты ўказ Я. К. Чаркаскі выканаў. У царскую стаўку ў Смаленск была адпраўлена палонная шляхта, угорская пяхота, гайдуцкі ротмістр, 30 сем'яў лепшых мяшчан, яўрэі. 17 кастрычніка Дуброўна была спалена, а ўсё палоненае насельніцтва выводзілася ў рускія землі. Прыняццем такіх суровых мер рускі ўрад хацеў пакараць горад, які ўпарта супраціўляўся, каб застрашыць іншыя беларускія гарады. Адначасова задавальняліся інтарэсы рускіх служылых людзей, паколькі ім дазвалялася браць сялян і мяшчан у палон [62].

Між тым далейшы ход ваенных дзеянняў паказаў бяссэнсавасць і паспешлівасць знішчэння ўмацаванняў у Дуброўне. Зімой войскі Рэчы Паспалітай перайшлі ў контрнаступленне і занялі Копысь, Оршу, затым і Дуброўну, умацаваўшыся тут і «отняв», такім чынам, шлях для рускіх на Дняпру. Каб ачысціць гэты шлях, быў сфарміраваны вялікі атрад на чале са стольнікам і ваяводай Ф. Л. Замятняй. Ужо ў красавіку 1655 г. цар накіраваў яго ў Дуброўну з ратнымі людзьмі, каб ён размясціўся «в земляном городе и жил бы еси в Дубровне с великим береженьем и Божьим и нашим делом промышлял неоплошно». Ваяводзе было прадпісана аднавіць умацаванні. Аднак перад тым трэба было выбіць атрад войскаў, якія заселі ў Дубровенскім спаленым горадзе. Адбыўся бой ля млына на Дуброўне і на беразе Дняпра, пасля якога праціўнік адышоў да Куцеінскага манастыра пад Оршу. Рускія ратнікі пачалі спешна ўзводзіць умацаванні. У адпісцы цару Ф. Л. Замятня паведамляў, што «... по твоему указу пришол я... с твоими ратными людьми к Дубровне сделать земляной город и ров около города копал, и острог поставил, и всякие крепости учинил, и к тому городе чертеж послал к тебе. А мерою коло тово города и острога 256 сажень, да к острогу готового государь, острожку к раскату 81 сажень». Пакінуўшы ў Дуброўне полк Ф. Траферта, Ф. Л. Замятня са сваімі людзьмі рушыў з горада [63].

У наступныя гады Дуброўна як бы засталася ў баку ад ваенных падзей. Тут пастаянна знаходзіўся толькі нязначны гарнізон рускіх войскаў у 40 чалавек. Сітуацыя садзейнічала паступоваму аднаўленню жыцця горада. У 1655 г. дубровенскі пратапоп Д. Палікарпаў, пасланы пасля здачы горада па царскаму ўказу ў Магілёў, пісаў адтуль цару, «что здесь он всякую нужду терпел и ныне я... скитаюсь меж двор без приюту разорен в конец». Ён прасіў у цара грамату на пабудаванне ў Дуброўне царквы і аб засяленні горада, каб можна было з чаго «кормиться». Грамата гэтая была выдадзена, аднак справы пратапопа ру-

халіся дрэнна. Яшчэ ў 1661 г. Дуброўна мела сумны выгляд. Аўстрыйскі дыпламат барон А. Мейерберг у сваіх дарожных нататках адзначаў: «... 8 чысла верасня... праехалі па Дняпру... Дуброўну, раней горад Мсціслаўскага ваяводства, а цяпер Віцебскага. Ён узвышаецца на абодвух берагах ракі ў 80 вярстах ад Смаленска, і калісьці меў вялікае мноства збудаванняў, а цяпер бедствамі разбураны з часоў Маскоўскай вайны з велізарнымі стратамі ў маёмасці для яго ўладальніка Георгія Карла Глябовіча» [64].

Ваенныя дзеянні канца вайны зноў «вниveч обернули» адроджаны горад [65].

Праз 11 гадоў пасля падпісання Андрусаўскага перамір'я, у верасні 1678 г., праз Дуброўну праязджаў і адпачываў тут дыпламат Бернгард Таннер, які адзначаў, што горад паступова прыходзіў у сябе пасля вайны [66].

У канцы XVII ст. Дуброўна пераходзіць ад Глябовічаў да Казіміра Сапегі — гетмана польнага Вялікага княства Літоўскага і віленскага ваяводы. Паколькі ў гады Паўночнай вайны Сапегі былі на баку шведаў, Дуброўну разам з замкам занялі і спалілі калмыкі спецыяльнага атрада рускага капітана Салаўёва. Некаторы час горад і навакольныя вёскі былі ўласнасцю паплечніка Пятра I князя А. Д. Меншыкава. Пасля Паўночнай вайны Сапегі зноў сталі ўладальнікамі Дуброўны.

У 1712 г. у Дуброўне замка не было. Тут стаяў толькі «двор», загароджаны новым дубовым штыкетам і часткова папраўлены старым. Мелася ўязная брама, на момант складання інвентару яшчэ не скончаная і не накрытая. Пляцоўку «двара» займалі гаспадарчыя і жылыя пабудовы [67]. Пазней, у 30-я гады XVIII ст., замак усё ж аднавілі і ён праіснаваў да 1772 г.

2. УМАЦАВАНЫЯ ПАСЕЛІШЧЫ САПЕГАЎ У ПАДЗВІННІ, ПАСОЖЖЫ І ІНШЫХ РЭГІЁНАХ БЕЛАРУСІ

Друя

Паселішча Друя вядома на пісьмовых і археалагічных крыніцах з XIV ст. Згадваецца яно ўпершыню ў 1386 г. у «Хроніцы Стрыйкоўскага» ў сувязі з міжусобнай вайной Андрэя Полацкага [68].

Да канца XV ст. Друя належала слугам Полацкага замка. У 1496 г. ёй ужо валодалі князі Масальскія на падставе прывілея на «место», замак і воласць, атрыманага ад вялікага князя Аляксандра. У князёў Масальскіх горад знаходзіўся амаль два стагоддзі. У 1506 г. па даравальнай грамаце вялікага князя Аляксандра Друя з ваколіцамі пераходзіць да Ганны Масальскай з роду Сапегаў. У грамаце князь асобна падкрэсліў, што ён «не вызваляе мяшчан Друйскіх ад направы Полацкага замка і ваеннай службы нашай, па звычаю і практыцы іншых людзей». Неабходна адзначыць, што і сама Друя ў пачатку XVI ст. лічылася значным абарончым горадам у пагранічча [69].

У лютым 1515 г. рускія ваяводы І. Шамін, Ю. Замяцін і Сабураў ваявалі Браслаўшчыну і пасады «в Друи ожгоша». Быў, напэўна, спалены і замак, паколькі дакументы таго часу адзначылі: «а ныне городок на Друи новый». Па некаторых сведчаннях, першапачатковы замак князёў Масальскіх знаходзіўся на левым беразе Друйкі, на тэры-

торыі так званага «Старога места», а пасля падзей 1515 г. быў перанесены на правы бераг Друйкі [70].

Неабходна адзначыць, што з тактычнага пункту гледжання месцараспалажэнне Друі і яе замка было не вельмі ўдалым. Замак не мог заняць выступ ля ўпадзення Друйкі ў Дзвіну, таму што ён быў нізкі, малы і вясной пастаянна заліваўся. Акрамя таго, з усходу над ім узвышалася гара, якая, калі б яе заняў праціўнік, магла быць выкарыстана для ўстаноўкі артылерыі і абстрэлу замка. Пасля 1515 г. было выра-



Друя. План: А — першапачатковы замак; Б — замак XVII ст.; В — крэпасць маскоўскага войска ў сяр. XVII ст.; 1, 2, 3, 9 — касцёлы; 4, 5, 6, 7, 8, 10, 11 — праваслаўныя цэрквы; 12 — палац, 13 — сінагога; 14 — лазня; 15 — рынак; 16 — стары рынак; 17 — турма; 18 — кашары

шана паставіць замак на гэтым узвышэнні, але і тут для ўмацавання было не лепшае месца, бо амаль з усіх бакоў меліся доўгія схілы, зручныя для атак праціўніка, а Дзвіна і Друйка былі аддалены ад замка на значную адлегласць [71]. Тым не менш «Полацкая ревизия» 1552 г. зафіксавала Друйскі «замок спольный» братоў князёў Масальскіх на левым беразе Дзвіны. «Замок оборонный» абкружыла мястэчка, у якім лічылася 112 дымаў і 800 чалавек жыхароў. Князю Юрыю Масальскаму належала насельніцтва 48 дымоў, сярод якога ён меў «одного человека, который ему на замок ручницы и гаковницы оправует». Князь Іван Масальскі валодаў трэцяй часткай «того замку Друя», а таксама 54 дымамі і 5 корчмамі [72].

Каму належала трэцяя частка Друі з 10 дымамі, дакумент не паведамляе, як нічога не гаворыць пра структуру замкавых умацаванняў. Хутчэй за ўсё ў Друі, як і ў многіх іншых дробных гарадах, яны былі ў занядбаным стане. Хоць тут у пачатку Лівонскай вайны і размяшчаўся конны атрад (1561 г.), аднак роля Друйскага замка ў гэтай вайне не высветлена. У «Тетради» 1563 г., якая вызначала межы Полацкага павета, пра яго сказана: «А Друя город еще не поставлен, а город Друя стоит на Двине». У той жа час тут адзначана, што «посад Друйскій стал в Полоцком повете на Полоцкой земле» [73]. Перамірны «лист» паміж бакамі, якія ваявалі, ад 1594 г. у дакументах называе яго ўжо ў ліку замкаў Падзвіння.

У канцы XVI ст., у 1594 г., у дакументах сустракаецца памінанне

аб «опалом замку Друйском», што сведчыць пра стан умацавання таго часу. Аднак А. Гваньіні зазначаў тут у пачатку XVII ст. замак з мястэчкам над Дзвіною і Друяй. «Ад таго замка,— адзначаў ён,— пачынаецца граніца інфляндская»[74].

У XVII ст. Друя змяніла свайго ўладальніка, якім стаў магутны магнат, канцлер Вялікага княства Літоўскага Леў Сапега. Ён купіў Друю ў князя Масальскага за 5 тыс. коп грошаў літоўскіх. 8 сакавіка 1618 г. І. С. Сапега аб'явіў, што ля сутокі р. Друі з Заходняй Дзвіной ён закладвае новы горад Сапежын «у валу і астрозе», які забяспечыць як зброяй, так і іншымі абарончымі сродкамі. Для таго каб збудаванне ўмацаванняў не было занадта цяжкім для жыхароў Сапежына, магнат назаўсёды абавязаў сялян дзвюх сваіх валасцей — Дубровіцкай і Задзвінскай аказваць дапамогу гараджанам. Усе гарадскія прыбыткі ад збору падаткаў магістрату дазвалялася выкарыстоўваць на патрэбы горада, догляд і рамонт «привалка и острога». У сувязі з блізкім размяшчэннем ад мяжы і дзеля большай перасцярогі, каб хто-небудзь пад прыкрыццём гандлёвых спраў не прыехаў тайна з непрыяцельскай зямлі і «не соглядал», кожны, хто прыязджаў у горад, абавязаны быў заявіць пра свае тавары і патрэбы гараднічаму і бурмістру. Свае тавары купцы мусілі складваць у гасцінным двары, які размяшчаўся ў астрозе. Гораду давалася магдэбургскае права (1619 г.) і пячатка з выявай віціны пад разгорнутым ветразем. Тыя, хто жадалі пасяліцца ў новазакладзеным горадзе, атрымлівалі «свабоды» на 20 гадоў. Адной з мэт закладкі Сапежына была абарона мяжы Вялікага княства Літоўскага[75].

Хоць у 1632 г. Друя была занята рускімі войскамі «с пролитием крови жителей, урядников, ротмистров и всей военной добычей», аднак горад у хуткім часе адрадзіўся. Тут дзейнічалі рамесныя цэхі, якія, як і ў іншых магдэбургскіх гарадах, валодалі ўласнай ваеннай амуніцыяй, харугвамі-сцягамі, бубнамі і трубамі. У ваенных адносінах жыхары Друі падзяляліся на тры сотні са сваімі сотнікамі. У горадзе былі свае збройныя майстры — мечнік, людвісар, слесары і іншыя рамеснікі[76].

На пачатку руска-польскай вайны, 27 чэрвеня 1654 г., пасля бою Друя была занята царскімі войскамі князя М. Шарамецьева і С. Стрэшнева, якія «город Друю взяли и литовских людей побили и дворы и костелы пожгли»[77]. Частка жыхароў, «убояся», разбеглася па навакольных лясах. Аднак у 1655 г. дзісненскі ваявода М. Чэлішчаў заклікаў друянаў жыць па-ранейшаму ў сваіх дамах. Тыя вярнуліся.

У ходзе контрнаступлення войск Рэчы Паспалітай у канцы вясны — пачатку лета 1655 г. Друя была занята палкоўнікам Касароўскім. Супраць яго 20 чэрвеня з Полацка накіравалася групіроўка царскіх ратных людзей на чале з ваяводам Д. Якаўлевым. Яна нанесла непрыяцелю паражэнне, узяла палонных, вялікія трафеі і «таборы литовских людей пожгла». Друя зноў моцна пацярпела ад ваенных дзеянняў і служылых людзей Д. Якаўлева. «Нас, сирот твоих,— пісалі друяне цару,— многих посекли и разорили, и обдолжали великими долгами»[78].

Праз некаторы час у сувязі з уступленнем Швецыі ў вайну шведы акупавалі браслаўскі павет, а ў Друю ўвайшоў атрад палкоўніка дэ ла Гарда колькасцю каля 100 чалавек. Даведаўшыся, што горад ужо прысягнуў рускаму цару, шведы абрабавалі горад, яго навакольныя вёскі і пайшлі адсюль. У 1656 г. іх застава размяшчалася ў Сапежынскай слабадзе на тэрыторыі кляштара. Рускія таксама паставілі заставу ў 46 чалавек, баючыся, каб «друяне не разбежались», а таксама швед-

скага пагрому. У тым жа годзе з Друі пад Дзінабург для пабудовы і ўмацавання астрога ў дапамогу рускім войскам былі накіраваны мясцовы пушкар, цясляр і каваль [79].

У 1657 г. у Друі размясціліся 2 тыс. чалавек рускай пяхоты і казакоў пад началам ваяводы Пронскага. Цар загадаў ваяводзе І. С. Ціхменеву «для береженья и от приходу воинских людей острог делать друйскими посацкими и уездными жилецкими всякими людьми». У кастрычніку 1657 г. ваявода ўжо пачаў будаваць у Задруйскай слабадзе на правым беразе Дзвіны «на Полоцкой стороне» драўляны астрог. Аднак цар указаў, што ваявода задумаў узводзіць занадта вялікія ўмацаванні, «велми не по людям, на 600 саженях» даўжыні. Ваяводзе быў пасланы наказ, каб ён, «призвав к себе друянского уезду помещиков, шляхту добрую и друйских бурмистров и мещан лучших людей, помыслил и поговорил», якое месца болей падыходзіць для такога будаўніцтва. Рэкамендавалася «острог делать на 300 саженях». Ужо ўзведзеныя вежы належала перастаўіць на новае месца, але каб «болши того под острог места не занимал». У астрозе ставілі гарматы — друйскую пішчаль з запасам ядраў і свінцу і часова да адсылкі ў Полацк пяць віленскіх і ковенскіх пішчаляў. Цар не выключаў варыянта пераносу пачатага астрога на левы бераг Дзвіны, у горад Друю, калі мясцовыя жыхары — «лутчие люди» вырашылі б, што гэта для абароны будзе выгадней [80]. Але дакументы пазнейшага часу сведчаць, што ўмацаванні ўсё ж узвялі на правым беразе Дзвіны, у Задруі. У жніўні 1661 г. Друя была як бы падзелена на дзве часткі: за Дзвіной, у Задруі, стаялі рускія войскі, якія заселі ў астрозе, а на левым беразе Дзвіны, у самой Друі, знаходзілася войска Рэчы Паспалітай. Яны размяшчаліся ў шанцах і каля моста, які злучаў Друю з Задруяй. Кіраваў ім гетман Пац. Гетман спрабаваў рушыць свае войскі «к Двине против великого государя ратных людей, и великого государя ратные люди из пушек и их мушкетов многую шкоду учинили жмойцкому и литовскому войску», якое, дарэчы, цярпела ад голада і вострай нястачы пораху [81].

Апошні раз Друя вытрымала ваенныя ліхалецці 24 студзеня 1664 г., калі рускія войскі зрабілі рэйд з-пад Люцына «за Двину реку... и Друю и Друйское место высекли и выжгли и хлебные запасы и конские кормы пожгли и языки поймали». Ваявода І. Сумарокаў паведаміў цару, што яго ратныя людзі, «пришед изгоном, Друю высекли и выжгли и Друйские места разорили и многих литовских людей побили и языки поймали» [82].

Зараз сляды сярэдневяковых умацаванняў Друі зніклі пад шчыльнай гарадской забудовай.

Ляхавічы

Ляхавічы зарадзіліся, напэўна, першапачаткова на месцы в. Старыя Ляхавічы, пазней былі перанесены на сучаснае месца. Вядомыя з XV ст., яны лічыліся вялікакняжацкім уладаннем, якое атрымалі ў «держанье» магнаты Гаштольды, Радзівілы, з 1572 па 1621 г. імі валодалі Хадкевічы, ад якіх яны перайшлі да гетмана Вялікага княства Літоўскага Паўла Сапегі [83].

Пры Хадкевічах побач з пасяленнем на левым беразе р. Ведзьмы быў пабудаваны магутны бастыённы замак. Ён лічыўся сярод падобных збудаванняў самым моцным умацаваннем ва ўсёй Рэчы Паспалітай. Ён меў у плане форму чатырохвугольніка з чатырма вялікімі бас-

тыёнамі развітай канфігурацыі, з брустверамі, байніцамі для гармат і стралкоў. Замак меў штучнае абвадненне і фактычна быў астраўным. Умацаванні былі абмураваныя каменем і цэглаю. Памеры замка 175×220 м.

Пад аховаю замка ў XVII ст. вырас горад. Акрамя асноўнага ядра — «места», якое дзялілася на пасады і было абнесена ўмацаваннямі, горад меў у сярэдзіне стагоддзя слабоды. Яны размяшчаліся па-за гарадской фартыфікацыяй [84].

У перыяд антыфеадальнай вайны беларускага і ўкраінскага народаў, з 1648 па 1654 г., Ляхавічы тры разы беспаспяхова асаджалі паўстаўшыя сяляне і казакі. У пачатку руска-польскай вайны царскія войскі на чале з князем Ю. А. Даўгарукім і акольнічым С. А. Ізмайлавым таксама «заходили к городу Ляховичам и посады, и слободы около города Ляхович пожгли и которых... литовских людей застали в посаде и в слободах и тех побили и языков поимали» [85]. У дакуменце нічога не гаворыцца пра ўзяцце замка. Мяркуючы па ўсяму, ён застаўся цэлым. Ускосна на гэта паказвае яго інвентар, складзены камісарамі гетмана Вялікага княства Літоўскага 26 лютага 1658 г. Згодна інвентару, на замкавых «бульверках и кавальерах» размяшчалася 30 гармат рознага калібру — ад 1 да 24 фунтаў, больш за 1500 ствалоў ручной агнястрэльнай зброі, сярод якіх меліся мушкеты, гакаўніцы, «янычаркі», вялікія запасы пораху, ядраў, волава, куляў, шроту і іншай ваеннай амуніцыі [86].

У другі раз аблога Ляхавічаў адбывалася ў сакавіку 1660 г. Войскі І. А. Хаванскага, якія адышлі ад Брэста, аблажылі занава пабудаваныя ўмацаванні горада і замка. 20 і 23 сакавіка ваявода з палкоўніка-



Ляхавіцкі замак. Сітуацыйны план

мі двойчы прапанавалі абложаным здацца: «...велели мы под городом под Ляховичами вытрубить, и посылали полковников и дворян и велели им говорить коменданту и ляховицким сидельцам, чтобы они твоей (царскай.— *М. Т.*) пресветлой милости поискали, город Ляховичи без крови сдали». Аднак камендант і «осадные сидельцы» на змову не пайшлі і «с городовой стены отказали о сдаче города», абвясціўшы, каб «впредь к ним о сдаче города не посылали: сдачи города никому у них не будет». Пасля гэтага пачалася падрыхтоўка да штурму, які адбыўся 26 сакавіка «за полчаса до свету». Прыступ «к городу Ляховичам... был... жестоким обычаем до третьего часу дня». Спачатку абложаныя здолелі збіць са сцен многіх рускіх. «Ратные люди с знаменами были на стене, но затем волею Божиею, а нашим согрешеньем,— паведамляў І. А. Хаванскі цару,— літовские люди, справясь, твоих ратных людей с стены сбили и твои ратные люди от города отошли», згубіўшы 30 забітых і 150 параненых [87].

28 сакавіка збеглы з горада «пакаёвы» каменданта Ляхавічаў Ст. Юдзіцкага С. Вальскі ў росныце паведаміў, што супраць рускіх стаіць 5 харугваў ратных людзей — 2 харугвы угорскай пяхоты, 3 харугвы драгунаў — усяго 450 чалавек, «да шляхта и немцов, и жидов, и мужиков сбежи 3,5 тысячи». Перабежчык таксама сказаў, што ў горадзе 47 гармат калібрам 20—30 фунтаў і ў пуд, хлебных запасаў нарыхтавана на год, мелася дастаткова пораху, з вадой таксама ў горадзе было «гораздо не скудно». Пасля гэтага асаджаўшыя замак рускія войскі падвялі шанцы ўпчыльную да горада і «отняли воду», пачаўшы «готовиться в другие на приступ и заступление». Да цара была паслана просьба «прислать к промыслу огнестрельного мастера и гранаты, потому что в городе Ляховичах теснота большая, дворы все деревянные, и от гранатной стрельбы в городе шкода будет большая».

Мяркуючы па апісанню аблогі і ран рускіх ратных людзей («ранен по правому плечу и по лопатке катком да по правому боку каменем..., ранен гранатом»), горад быў абкружаны звычайнымі драўлянымі сценамі — гароднямі. На іх меліся спецыяльныя прыстасаванні, з якіх пры штурме кацілі бярвенне — «каткі», а таксама размяшчаліся прыпасы камянёў для збівання са штурмавых драбін праціўніка. Для гэтых мэт выкарыстоўваліся і ручныя гранаты.

Людзей у войсках І. А. Хаванскага было недастаткова, таму няўдача прыступу прымусіла цара аддаць ваяводам загад больш на прыступ не хадзіць, «промыслы чинить всякими вымыслы, оприч приступов, чтоб нашим ратным людям в том истери не было».

18 чэрвеня 1660 г. пад Ляхавічамі адбылася бітва, у якой І. А. Хаванскі пацярпеў паражэнне, страціўшы свой абоз і артылерыю, у тым ліку і «огненную пушку», прысланую для аблогі горада.

Сейм Рэчы Паспалітай асобна адзначаў заслугі каменданта Ляхавіч рэчыцкага войска Ст. Юдзіцкага, які патраціў на патрэбы абароны 21 тыс. 400 злотых асабістых грошай. Яго ўладанні Гальдовічы і Дзянісаўшчына паблізу Ляхавічаў, поўнасцю разбураныя, былі вызвалены ад падаткаў на 30 гадоў. «Места» Ляхавічы, яго жыхары і ўся воласць Ляхавіцкая, пацярпеўшыя страшныя разбурэнні ў час аблогаў, за іх вернасць каралю вызваляліся ад падаткаў на 9 гадоў. Дзеля бяспекі горада за кошт скарба Вялікага княства Літоўскага гетману дазвалялася трымаць у замку 200 чалавек пяхоты. У 1678 г. яе давялося сейму пацвердзіць у другі раз [88].

У час Паўночнай вайны, непакоячыся, што шведы возьмуць замак

і выведуць адтуль артылерыю, сейм Рэчы Паспалітай пастанавіў даставіць яе часткова ў Слуцк (19 гармат), часткова размеркаваць сярод войска Вялікага княства Літоўскага [89].

У 1706 г. войскі Пятра I, якія заселі ў замку, адбівалі штурмы шведскіх генералаў Траўтфетэра і Крэйца. У 1709 г. рускія войскі выбілі адсюль гетмана Мазепу.

Пасля гэтай вайны Ляхавічы перайшлі ў валоданне віленскіх біскупаў. У 1775 г. рашэннем сейма Ляхавічы з прычыны вялікага стратэгіч-



Аблога Ляхавіцкага замка. 1661 г.

нага значэння і ролі ў абароне дзяржавы былі адабраны ў біскупа І. Масальскага, а замак перайшоў да дзяржавы [90]. Апынуўшыся ў складзе Расійскай імперыі, Ляхавіцкая фартэцыя страціла сваё ваеннае значэнне. У першай палове XIX ст. замкавыя пабудовы прадалі гандлярам, якія разабралі абмуроўку замкавых умацаванняў і каменныя пабудовы. Цяпер ад Ляхавіцкага замка засталіся толькі сляды земляных валоў і вадзяныя равы, якія заплылі і дасягаюць 15 м шырыні.

Горы (Горы Вялікія)

Каля вёскі Горы (раней Горы Вялікія) Горацкага раёна Магілёўскай вобласці размешчаны рэшткі двух сярэдневяковых умацаванняў. Адно з іх — Гарадзішча («Курганы») знаходзіцца ля зліцця р. Быстранкі (Быстрыца) і р. Карчавахі на высокім атрогу берагавога плато. Гэта гарадзішча мысавага тыпу, якое функцыяніравала ўжо ў эпоху ранняга жалеза. Аднак і пазней, у дамангольскі час і ў XIV—XVI стст., тут працягвалася жыццё. Першапачаткова гарадзішча, якое мела вы-

pawet.net

цягнутую авальную форму (па лініі ўсход—захад), дасягала памераў каля 180×70 м, г. зн. больш за 1,2 га. Вышыня пляцоўкі над далінай ракі перавышала 10 м. Другое ўмацаванне — бастыённы замак, размешчаны на паўднёвы ўсход ад гарадзішча. Гісторыя гэтых двух помнікаў цесна звязана [91].

У старажытнасці на краю гарадзішча ішоў земляны вал, адрэзак якога вышынёй да 3 м цяпер захаваўся толькі з усходняга боку. Невялікі адрэзак вала праглядаецца таксама ў паўднёвай частцы гарадзішча. На астатняй тэрыторыі вал знівеліраваны ці абваліўся. У абрыве ўсходняй часткі кар'ера відаць тры падсыпкі вала і абвугленыя рэшткі драўляных навальных канструкцый, хутчэй за ўсё частакола.

Уезд на гарадзішча знаходзіўся ў яго ўсходняй частцы і ішоў па вузкім дамбападобным насыпе. Перад колішняй брамай і гэтым насыпам быў роў шырынёю 6—7 м. У цэнтральнай частцы пляцоўкі, бліжэй да яе паўночнага краю, захавалася невялікае ўзвышэнне дыяметрам каля 8 м і вышынёй 0,9 м. Маючы аналогіі планавай кампазіцыі ў Тураве, Камянцы, Пінску і іншых месцах, можна зрабіць выснову, што гэта ўзвышэнне старажытнай назіральнай вежы, якая разам з іншымі драўлянымі пачатковымі збудаваннямі магла абараняць паселішча ў час небяспекі, а таксама давала магчымасць весці назіранні на вялікую адлегласць. Падобныя вежы характэрныя для гарадоў і феадальных замкаў на тэрыторыі Беларусі і іншых суседніх земляў [92].

Вынікі раскопак, праведзеных аўтарам, даюць падставу меркаваць пра існаванне тут паселішча гарадскога тыпу, якое ўзнікла ўжо ў XII ст. На карысць гэтага сведчаць і археалагічныя матэрыялы, і плошча ўмацаванага паселішча, якая некалі перавышала 1 га. Даследчыкі адносяць паселішчы з плошчаю звыш 1 га да ліку гарадоў [93].

Відаць, у XII—XIII стст. тут зарадзіўся адзін са старажытных гарадоў Смаленскай зямлі, які быў, напэўна, цэнтрам невялікай акругі і не трапіў на старонкі летапісаў. Нейкія прычыны ўнутранага альбо знешняга характару перашкодзілі яго далейшаму развіццю. Горад, які зарадзіўся, разросся і ўжо пераступіў лінію абарончага рова, стварыў пасад, у XIII ст. згарэў і трансфармаваўся затым пад уздзеяннем абставін у радавы феадальны замак. Ён стаў родавым гняздом мясцовых князёў Горскіх, сваякоў князёў Друцкіх.

Князі Горскія былі добра вядомыя ў XV—XVI стст.[94] На старонках летапісаў Горы згадваюцца ў 1500 г. У «Кроніцы» М. Стрыйкоўскага і «Кроніцы» Быхаўца яны называюцца ў сувязі з паходам войскаў Вялікага княства Літоўскага на дапамогу абложанаму Смаленску. Гэтае войска, дайшоўшы да Гораў, спынілася і «лежало» тут усю восень, бо праціўнік, даведаўшыся пра яго рух ад Оршы, адразу ж адступіў і пайшоў у Маскву [95].

Пісьмовых сведчанняў пра Горы XV—XVI стст. вельмі мала. Горскія князі былі небагатымі феадаламі. Гэта ўскосна пацвярджае «Рэестр попісу 1528 г.», згодна якому два князі Горскія, Фёдар і Іван Дуда выставілі на вайну са сваіх валоданняў 21 воіна-вершніка [96].

Валоданне Горскіх князёў — Горская зямля даволі рана пайшла з іх рук. У 1499 г. ёй ужо валодалі Юрэвічы-Насіловічы. У 1558 г. Горы належалі аднаму з буйнейшых феадалаў Беларусі князю Пятру Багданавічу Храптовічу. У той жа год ён прадаў Горскія валоданні «маршалку господарскому старосте Речицкому и державцы Любошанскому... пану Оникею Горностаю за 200 коп грошей литовские монеты и личбы» [97].

У канцы XVI ст. у жыцці феадальнага горскага замка адбыліся важныя падзеі. Пасля А. Гарнастая ўладальнікам Гораў стаў канцлер Вялікага княства Літоўскага Леў Сапега. Пры ім стары замак быў пакінуты, а яго пляцоўку ператварылі ў могілкі. Але на суседняй больш высокай гары заклалі новы замак з бастыённымі ўмацаваннямі галандскага тыпу. Пад яго абаронай выросла мястэчка, затым і «место» Горы Вялікія, якое ў 1619 г. атрымала ад Л. Сапегі вялікія прывілеі, запісаныя ў асобай «Уставе» [98].

Новы горскі замак размясціўся на гары, ля падножжа якой з усходу і поўначы працякала р. Карчаваха. Вышыня валоў над далінай ракі і зараз перавышае 20 м. Замак абараняўся 7 бастыёнамі, злучанымі паміж сабою валамі-курцінамі рознай даўжыні і вышыні. Паўднёва-ўсходні бок замка, звернуты да «места», ім прыкрытага, меў больш слабы вал (вышынёй да 3 м і шырынёй асновы да 8 м). Гэтая курціна, звернутая да горада, пры даўжыні больш за 210 м не мела ні аднаго прамежкавага бастыёна. Бастыёны размешчаны толькі па яе канцах. Перад ва-



Горскі замак. План

лам, аддзяляючы замак ад «места», ляжаў абарончы роў шырынёй да 15 м і глыбінёй 8—10 м. Праход да курціны, зроблены прыблізна па яе сярэдзіне, ідзе па дамбе, якая з'явілася толькі ў XIX ст.

Старажытны і адзіны ўваход у замак размяшчаўся з паўночнага боку. Відаць, як гэта было ва ўсіх бастыённых замках, у Горах мелася для гэтай мэты спецыяльная двух'ярусная вежа-брама, убудаваная ў тоўшчу земляного вала.

Аналіз планавай кампазіцыі Горскага бастыённага замка паказвае, што гэты старажытны ўваход знаходзіўся пад абаронаю двух бастыёнаў, з якіх фланкіравалі перакрыжаваным агнём усе подступы да яго. Больш таго, дарога да замка праходзіла ля падножжа валоў, пачынаючы ад паўднёвага вуглавога бастыёна, затым ішла па дне рова і знаходзілася ўвесь час пад кантролем абарончаў. Заходні напольны ўчастак замкавых умацаванняў адрозніваецца канцэнтраванай магутнасцю і прадуманасцю агня з бастыёнаў і курцінаў. Глыбіня рова тут дасягае 12 м, шырыня — 15 м. Уніз меўся дадатковы ніжні вал.

Усходні ўчастак абароны замка адрозніваецца памерамі бастыёнаў і магутнасцю абарончага рова. Апошні пры шырыні 15 м дасягае 12 м глыбіні. Вуглавы паўднёва-ўсходні бастыён, акрамя таго, меў дадатковы ніжні бастыён, што значна ўзмацняла ўсходні сектар абароны замка.

Агульны перыметр абароны ўмацаванняў горскага замка складаў больш за 800 м. Аднак нягледзячы на тое што галандская бастыённая сістэма не прадугледжвае наяўнасці на бастыёнах вежаў, на валах высокіх сцен яны на пачатку існавання новага замка, напэўна, меліся. Асобныя даследчыкі гавораць пра існаванне «драўлянага замка з 7 вежамі» [99].

З архіўных звестак пра горскі замак захавалася «Ревизия в замку Горском в цекгавзе армате», зробленая «року 1627 г. месяца мая 13 дня» слугою ваяводы Віленскага і гетмана Вялікага княства Літоўскага Льва Сапегі Кандратам Давыдовічам і прадстаўленая горскаму гараднічаму Фёдару Дабрасельскаму. З гэтага дакумента відаць, што ў замку мелася наступная зброя і амуніцыя: «Дел польных спижовых два, штурмаков железных двадцать девять, гаковниц двадцать пять, шостая зорвана, на колках гаковниц тры, мушкетов «кобыл» семдесят, мнейших мушкетов шестьдесят сем, а осмь зорваныя, шабель гайдуцких девятьдесть и одна, ... емалей девятьдесть и одна, барва каразиевая гайдуцкая лазуровая чырвоным киром спереду подшыта, жупанов девятдесть и девет, а дылей и девятдесть, десятницких дылей чырвоных девять, дарду (дарда — кап'ё.— *М. Т.*) новых десять, при них прапорце шаховане, дардов старых без древок пять, бубен пехотный, а другие бубны гусарские, хоругов казацкая жолтыя китайки, крыж чырвоны, звон новы, бердышов шесть, пил тартиевых чотыры» [100].

Хоць у замку, як гэта вынікае з дакумента, былі ўсяго дзве медныя гарматы, аднак пералічаная ручная агнястрэльная зброя была не толькі самай новай для свайго часу, але і разлічвалася яўна на абарону. Так, «штурмакі» стралялі галоўным чынам шротам альбо сечаным жалезам і лічыліся галоўнай зброяй супраць штурмуючага праціўніка. Гакаўніцы казацкія лёгкія і гакаўніцы цяжкія на колах («на колках») выкарыстоўваліся для знішчэння праціўніка на далёкай адлегласці. Яшчэ больш грознай зброяй былі мушкеты, якія з'явіліся на ўзбраенні ў 1601 г. Яны па калібру былі буйнейшыя за гакаўніцы, мелі большыя зарад і дальнасць (калі патрабавалася) стральбы. Зараджаныя шротам або сечаным жалезам, яны наносілі праціўніку, які наступаў, вялікія страты. Маючы значную вагу, вялікія мушкеты («кобылы») стралялі са спецыяльных падстаўак-фаркетаў» [101].

Колькасць агнястрэльнай зброі ў горскім замку (без гармат) была такая, што ў выпадку аблогі на земляных умацаваннях стралкі размяшчаліся праз кожныя 4 м. Шчыльнасць агня да таго часу была даволі значнай.

Гэты дакумент сведчыць і пра тое, што феадальна-залежнае насельніцтва прыватнаўласніцкіх гарадоў, разбітае на «дзесяткі», абавязвалася абараняць пэўны ўчастак замка, значыць, яго даглядаць і рамантаваць [102]. Больш таго, мяшчанскія і сялянскія фарміраванні нярэдка мабілізоўваліся для ўдзелу ў вайне. Так здарылася, напрыклад, у 1614 г., калі для бою пад Кадзіным (памежжа са Смаленшчынай.— *М. Т.*) чакалася прыбыццё пяхоты — «горян мужиков с пищальми 150 человек» [103].

Згодна звестак 1621 г., Горы Вялікія былі паселішчам у 172 «пляца», з якіх 46 былі пустыя. Сярод гараджан частка была занятая на «послузе замковой»: замкавыя гайдукі, слесар, цесля і іншыя [104]. Да сярэдзіны XVII ст. у горадзе значна павялічылася колькасць жыхароў. У 1683 г. дакументы згадваюць лінію ўласна гарадскіх умацаванняў — «паркан» [105]. Верагодна, ён існаваў значна раней, да 1654 г.

У руска-польскай вайне, якая пачалася летам 1654 г., замак Сапегаў — Горы Вялікія ператварыўся ў месца канцэнтрацыі буйных ваенных атрадаў Вялікага княства Літоўскага. Цару даносілі, што «в Горах ляхи в собранье многие люди, и из Гор выходя, царского величества ратным людям, приезжим станичникам чинят многую шкоду. И тем царского величества боярам и воеводам велено было промышлять жестокими промыслы» [106]. Супраць Гор накіравана групіроўка войск Трубяцкога, пра дзеянні якога пры штурме Мсціслава насельніцтва было без сумнення дасведчана. У гэтых умовах «горяне», начальныя людзі, шляхта і немцы, служылыя і жылецкія людзі зразумелі, што ім «не отсидетце». 29 верасня «из города Гор за 5 верст приехал... города Гор державец полковник Павел Красовский да ротмистр Яржарей с товарыщи государю добили челом и город Горы здали» [107]. Нягледзячы на прысягу цару, частка горскай шляхты і мяшчан была адпраўлена ў Маскву [108].

Пасля пераваротy ў 1659 г. у Мсціславе гарнізон царскіх войскаў у Горах на чале з капітанам Чырыкавым і Ф. Шатнёвым быў абложаны мсціслаўскім палкоўнікам Іванам Рыдарам. Атрад казакоў і шляхты, якім ён кіраваў, «со многими людьми» запасаўся ва ўездзе хлебам. У ходзе бітвы атрад І. Рыдара «из посаду выбили» і прымусілі адысці ад Гор [109].

У 1663 г. «фортеция Горская» згадваецца як вельмі разбураная, але ў дакументах 80-х гадоў XVII ст. ужо ўпамінаюцца замак і гарадскі астрог. Сярод розных павіннасцей мясцовыя жыхары абавязаны былі выконваць работы па рамонту ўмацаванняў і прымаць ўдзел у «абароне той маентнасці» [110].

У апошні раз умацаванні горскага замка спрабаваў выкарыстаць у 1708 г. Карл XII, які, умацаваўшыся тут, чакаў звестак ад Мазепы [111].

Пазней замак страціў сваё ваеннае значэнне. У ім быў змешчаны памешчыцкі маёнтак, які ў 1840 г. стаў базай для Горы-Горацкай земляробчай школы. У 1848 г. на яе аснове ўзнікла першая ў Расійскай імперыі вышэйшая аграномічная ўстанова — Горы-Горацкі земляробчы інстытут.

Іказнь

Паселішча Іказнь, якое знаходзілася на беразе аднайменнага возера ў Браслаўскім раёне, ператварылася ў мястэчка ў XVII ст. Яно вядома з 1499 г., калі яго купіў за 200 коп «грошей широких» браслаўскі староста Я. Сапега. У 1504 г. вялікі князь Аляксандр выдаў яму прывілей на закладку тут «места и замка», што і было зроблена [112].

Ужо ў 1515 г. рускія ваяводы «... под Икажною посады же ожгожа», а ў канцы XVI ст. А. Гваньіні адзначаў тут «места», якое, напэўна, мела свае ўмацаванні: «Іказнь — замак каменны і места драўлянае над ракой такой жа назвы, ад Браслава ў 2 мілях ляжыць» [113]. Аснову абароны ў Іказні складаў замак, размешчаны на востраве на невялікім удаленні ад берага. Ён займаў узвышэнне, якому штучна прыдалі форму прамавугольніка памерам 55×30 м. Замак складаўся з каменнага палаца, сцен, якія абкружалі двор, двух вуглавых вежаў, размешчаных з напольнага боку. Асноўную частку вострава займаў падзамак, які з захаду і паўднёвага захаду абкружаўся земляным валам вышынёй да 2 м. Ля сцен замка размяшчалася штучная сажалка памерам 47×47, злучаная пратокай з возерам.

Абарончыя сцены замка ўзвялі з каменя і цэглы ў тэхніцы паласатай мураўкі. Іх таўшчыня дасягала 2 м. Замак меў каменныя сцены толькі з напольных паўночнага і ўсходняга боку. З захаду праходзіў невысокі гліняны вал з каменнай выбрукоўкай, на якім стаялі драўляныя сцены. З гэтага боку замак прыкрываўся, як форбурсам, падзамкам. Па цэнтры заходняй сцяны знаходзіўся ўезд. Ён праходзіў па драўляным мосце, перакінутым праз штучную сажалку.

Як паказваюць даследаванні, праз некаторы час пасля збудавання



План Іказненскага замка

замак дадаткова ўзмацнілі: у паўднёвым вугле на курганападобным узвышэнні была пастаўлена драўляная вежа. Ва ўсходнім вугле змайстравалі пяцівугольную каменную вежу-рандэль, сцены якой мелі таўшчыню 2 м.

Замак злучаўся з берагам драўляным наплаўным мостам на спецыяльных чаўнах, які ў выпадку небяспекі хутка разбіраўся, а чаўны прытапліваліся. Замак даглядалі сяляне Дубровіцкай і Задзвінскай валасцей, якія належалі Сапегам [114].

У ваенны час для абароны Іказненскага замка Сапегі звычайна наймалі нямецкую альбо угорскую пяхоту. У 1654 г. Іказнь ненадоўга была занята расійскім войскам. Але ў 1655 г. тут ужо знаходзіліся атрады шведаў. Разбурэнне замка прыпадае на перыяд Паўночнай вайны, у якой Сапегі прынялі бок Ст. Ляшчынскага і шведскага караля Карла XII [115].

Высокае

Цэнтрам абароны гандлёва-рамеснага паселішча Высокае (Камянецкі раён Брэсцкай вобласці), які атрымаў у 1494 г. магдэбургскае права, быў бастыённы замак значных памераў. Пабудаваны ў першай палове XVII ст. яго ўладальнікам П. Сапегам, ён умела суадносіў прыродныя «крэпасці», штучнае абвадненне і сістэму бастыёнаў, асабліва магутных з боку ўезда. Рака Пульва, падпёртая запрудай, стварыла

вялікае вадасховішча, якое ператварала замак у астраўное ўмацаванне.

Перад уездам, размешчаным у паўночна-ўсходняй курціне, меўся мост, які ішоў праз сажалку па палях. Ён падводзіў да двухпавярховай уязной прыземістай брамы з трыма двухстворкавымі варотамі. Мураваная пабудова з тоўстымі сценамі была разлічана на вядзенне абстрэлу падыходаў да замка. Тут знаходзіўся пад'ёмны механізм апошняга пралёта моста, які закрываў доступ да варотаў. Акрамя таго, падыход да іх дадаткова фланкіраваўся з двух вуглавых земляных бастыёнаў і курцін, якія змыкаліся з брамай. Знутры курцін меўся падземны ход, які дазваляў незаўважна пераходзіць з бастыёна ў вежу-браму ў час аблогі.

Акрамя гэтых збудаванняў па перыметру абарончага вала размяшчалася яшчэ шэсць невялікіх бастыёнаў.

Замак моцна пацярпеў у час руска-польскай вайны сярэдзіны XVII ст. і Паўночнай вайны, але пазней быў зноў адноўлены і існаваў яшчэ ў першай палове XIX ст.[116]

Гальшаны

Паселішча Гальшаны, вядомае па летапісах з XIII ст., узнікла на высокай самароднай гары над р. Карабель, на паўночным усходзе ад сучаснага мястэчка Гальшаны. Тут стаяў драўляны Гальшанскі замак. Князі Гальшанскія валодалі ім да 1525 г. Потым пасля шлюбу княжны Алены Гальшанскай з Паўлам Сапегам ён перайшоў у валоданне Са-



План гарадзішча каля в. Гальшаны (паводле Я. Г. Звяругі)

легаў. Яны і перанеслі сваю рэзідэнцыю на бераг р. Лусты (Жыганкі), на месца сучасных Гальшанаў.

Цэнтрам абароны мястэчка ў XVI—XVII стст. стаў каменны замак, узведзены ў першай палове XVII ст. Гэтае цудоўнае некалі збудаванне — ілюстрацыя тых значных змен у архітэктуры, якія адбыліся на працягу стагоддзя. Свае кампазіцыяй яно нагадвае Мірскі замак і ўяўляе сабою прамавугольнае (88,6×95,6 м) збудаванне, жылыя карпусы якога з вежамі на вуглах утвараюць, як у Міры, замкнуты квадратны падворак. Аднак тут магутныя замкавыя сцены, характэрныя для абарончага дойлідства XVI ст., ужо саступілі месца фасаду жылога трохнавярховага дома. У замку няма варотнай вежы, вуглавыя сямігранныя вежы сталі меншымі і больш стройнымі. Некаторыя з іх узведзены пазней і злучаны з асноўным аб'ёмам палаца [117]. У іх у асноўным размяшчаліся жылыя і гаспадарчыя памяшканні. Вежы, відаць, яшчэ не страцілі свайго абарончага значэння, аднак абарона Гальшанскага замка перамясцілася на магутныя земляныя валы і вадзяныя равы, якія абкружалі замак і злучаліся з ракой. Праезд у замак размяшчаўся



Гальшанскае гарадзішча. Мал. Я. Драздовіча

Гальшанскі замак. Мал. XIX ст.

на цэнтры адной з пабудоў, фасад якой характарызуецца манументальнай прастатой. Арачны партал быў абрамлены архівольтам.

Сучаснікі лічылі Гальшанскі замак самым прыгожым замкам на Беларусі і Літве. Ён вельмі нагадвае сучасныя яму галандскія замкі Бесенштэйн і Клейдаель пад Антверпенам, хоць ён і адрозніваецца ад іх прапорцыямі, масіўнасцю і дэталямі планіроўкі. Такое падабенства тлумачыцца тым, што Беларусь, уваходзячы ў склад Рэчы Паспалітай, адчувала дастаткова магутнае ўздзеянне галандска-фламандскай архі-



План першага паверха Гальшанскага замка

тэктуры, якое было вынікам ажыўленых культурных і гандлёвых сувязей з краінамі Заходняй Еўропы. З канца XVI ст. і да пачатку XVIII ст. на землях Рэчы Паспалітай рэзідэнцыі магнатаў будаваліся з анфіладнай планіроўкай памяшканняў, з аркаднымі галерэямі і вуглавымі вежамі. Па такому прынцыпу, у прыватнасці, пабудаваны ў канцы XVI — пачатку XVII ст. польскія замкі Баранаў, Красічын, Суха. Архі-

Натурныя здымкі замка

тэктурная кампазіцыя, планіроўка і часткова іх памеры вельмі блізкія і падобныя да архітэктурна-планіровачных элементаў Гальшанскага замка.

Замак у Гальшанах дрэнна захаваўся і гэта не дазваляе дакладна



Гальшанскі замак. Мал. Я. Драздовіча

вызначыць час яго пабудовы і шматлікіх перабудоў. Наперадзе вялікія архітэктурна-даследчыя работы для вырашэння гэтых задач. Не выключана, што асобныя пабудовы могуць быць датаваны канцом XVI ст.[118]



Гальшанскі замак. Рэканструкцыя А. Бубноўскага

У гады Паўночнай вайны замак быў большай часткай разбураны шведамі. Яго знішчэнне завяршыў у 1880 г. апошні яго гаспадар Гарбанёў. Ён узарваў вежы і сцены, а цэглу пусціў на будаўніцтва карчмы. Часткова ацалелі толькі дзве вежы і ўсходняе крыло палаца. Аднак і ў такім выглядзе велічныя руіны аказвалі незабыўнае ўражанне на сучаснікаў [119].

У мястэчку Гальшаны ў другой палове XVI ст. быў пабудаваны францысканскі касцёл, перароблены ў сярэдзіне XVII ст. Гэта бязвежавае трохнефнае збудаванне характарызуецца манументальнасцю і лаканічнасцю формаў, цэласнасцю аб'ёмнага збудавання. Будынак касцёла абкружала каменная агароджа з некалькімі шасцігранымі абарончымі вежамі.

Лепель

Лепель узнік у XII—XIII стст. на востраве аднайменнага вельмі прыгожага возера. Адсюль, напэўна, і яго назва, бо па-стараславянску «лепый, лепо» — прыгожы, прыгожа. Па пісьмовых крыніцах паселішча вядома з 1439 г., калі гэтае вялікакняжацкае ўладанне было перададзена спачатку віцебскаму касцёлу, затым з 1541 г.— віленскай капітуле [120].

У сярэдзіне XVI ст. на востраве стаяў умацаваны замак, а таксама паселішча, якое паступова перабралася на бліжэйшы (паўднёвы) бераг возера, дзе стала развівацца «места». У 1561 г. у перыяд Лівонскай вайны ў замку размяшчаўся гарнізон салдат, якіх узначальваў ротмістр Станіслаў Русецкі. Захавалася расліска, датаваная 3 верасня 1561 г., аб атрыманні ім ад полацкага кашталяна і лепельскага старасты Ю. Зяноўевіча пораху і волава [121].

У 1563 г. рускае войска ўступіла «в место Лепле и в Лепельскую волость костела Виленского плебанее Витебское», спаліла Лепель і ненадоўга замацавалася ў драўляным замку і ў тым жа годзе пакінула яго [122]. Тады ж «место Лепельское село на кгрунте капитулы Виленское... на озеры тым имем названым Лепля, на острове». У 1568 г. кароль даў гораду прывілей і вызваленне на 13 гадоў ад усіх павіннасцей, акрамя работ па ўзвядзенню астрога. У 1580 г. тут ужо было 300 дамоў [123].

Знішчаны пад час штурма войскамі гетмана Радзівіла ў 1563 г., Лепельскі замак паступова зноўку адбудаваўся. У 1566 г. у ім ужо былі ўмацаванні, куды падвозіліся зброя і правіянт [124]. Аднак ход Лівонскай вайны паказаў, што такія ўмацаванні неабходна мадэрнізаваць, і 17 лі-



Лепельскае замчышча

пеня 1568 г. Сігізмунд Аўгуст наказной граматай загадаў полацкаму кашталяну Ю. Зяноўевічу завяршыць узвядзенне Лепельскага замка: «Иж замок наш Лепельский еще не добудован, про то постерегаючи, абы (чаго уховай Боже!), для того от неприятеля в якую небеспечность оный замок не пришол, расказали о некоторых волостях наших людей на работу до того замку послати, а иж для лепшой беспечности обывателей земли Полоцкой, людей и имений их, до того замку прилегших, тым спешней оный замок збудован был, ... велели людем своим к работе того замку помочными быти» [125].

У дабудаваным замку меўся пастаянны гарнізон, які налічваў 100 чалавек пяхоты і 200 коннікаў. А. Гваньіні пісаў, што «Лепле — места і замак дастаткова ўмацаваны, над возерам як бы на востраве пабудован» [126].

Пад абаронаю замка размяшчаўся вялікі порт, адкуль па Заходняй Дзвіне хадзілі караблі ў Рыгу і Полацк, а праз сістэму азёр і адзін волак — у Дняпро да Кіева [127].

У сувязі з продажам Лепеля ў 1586 г. Льву Сапегу, які заклаў горад Новы Лепель на ўсходнім беразе возера, Стары Лепель паступова стаў ператвараца ў вёску, якая і цяпер называецца «Стары Лепель».

Лоеў (Лоева Гара)

Гэтае паселішча ўзнікла ў XI ст. на жывапісным высокім правым беразе Дняпра ля зліцця яго з Сожам [128]. Дняпроўскія стромы і шырокая плынь рэк абараняла яго з поўначы і з усходу, таму мясцовы драўляны замак, які пазней узнік тут, меў штучныя ўмацаванні з поўдня і захаду. Аднак Лоева Гара ў XV—XVI стст. стала тым месцам, дзе татары Перакопскай Арды, якая не раз кіравалася на рабаўніцтва і на палон у паўднёвыя і цэнтральныя раёны Беларусі, перапраўляліся тут праз Дняпро. «Татарскі брод» патрабаваў пастаяннай і пільнай увагі, і варта ўскладзена была перш за ўсё на мясцовы замак, для якога гэтая служба была часта непасільнай. У 1505 г. татарскія загоны Мехмет-



Лоеўскае замчышча. Рэканструкцыя.

Гірэя, якія прарваліся праз Дняпро, спалілі Лоеў. Дакументы зафіксавалі іх разбуральны маршрут у 1538 г. у кірунку «на Лоеву Гару, на Петриковичи и на Слуцко» [129]. Праз год каралеўская грамата абвясціла жыхарам Беларусі, што «... люди великие поганство Татарове идуть у верх Днепра тым шляхом, которым третий год шли, мимо Чернигов и на Лоеву Гору, и оттол бы они мели просто ити в тамошнее панство наше Великое княжество Литовское, сказу и плен подданным нашим чинити» [130].



Лоеўскія ўмацаванні на гравюры XVII ст.

Пасля аднаго з разбурэнняў таго часу магнат Леў Сапега «властным накладом своим замок и место на Лоевой Горе на шляху татарском заложил». Але гэта было фактычна аднаўленне горада і замка, якія існавалі раней. Апісанне ўмацаванняў Лоева не захавалася. Толькі на карце М. Струбіча 1578 г. выяўлена высокая абарончая вежа [131]. Паколькі замчышча не захавалася [132], яго канфігурацыю можна аднавіць паводле надзвычай цікавага дакумента — гравюры сярэдзіны XVII ст. Яна паказвае ход бітвы пад Лоевам летам 1649 г. паміж сялянска-казацкімі атрадамі Гаркушы і Пабадайлы і войскамі Радзівіла [133]. На гравюры відаць, што і замак, і горад былі ўмацаваны дугападобнымі валамі і равамі, якія ўпіраліся ў бераг Дняпра. Зараз толькі рэшткі замкавага рова, моцна засыпанага і забудаванага, рэканструіруюцца ў наступных параметрах: глыбіня болей за 2 м, шырыня болей за 8 м. Першапачаткова, відавочна, як і паўсюдна на Беларусі, умацаванні былі традыцыйнымі — драўляныя вежы і сцены.

Паводле карт XVIII ст., умацаванні існавалі да далучэння Усходняй Беларусі да Расіі.



3
глава

Умацаванні дробных і сярэдніх уладальніцкіх гарадоў і мястэчкаў Беларусі ў XIV–XVIII стст.

Прыватнаўласніцкія паселішчы Беларусі, якія належалі шляхце, царкве і магнацкім родам, эканамічна слабейшым, чым роды Радзівілаў і Сапегаў, таксама мелі свае цэнтры абароны. Яны ў значнай ступені вырашалі праблемы бяспекі мясцовага насельніцтва. Сярод гэтых гарадоў сустракаліся як добра ўмацаваныя, з навейшай бастыённай фартыфікацыяй (Глуск Дубровіцкі, Заслаўе, Шклоў), так і радавыя паселішчы з традыцыйнымі драўляна-земляны мі ўмацаваннямі ў выглядзе драўляных вежаў і сцен-гародняў (Друцк, Стрэшын, Галоўчын, Петрыкаў і інш.). Іх сіла і знешні стан не заўсёды залежалі ад эканамічнай замож-

насці ўладальнікаў альбо колькасці жыхароў. Вялікае значэнне мела і месцазнаходжанне ў адносінах да мяжы дзяржавы.

Гарады, якія размяшчаліся ў цэнтры краіны, былі ўмацаваныя слабей, і ўмацаванняў бастыённага тыпу, як правіла, не ўзводзілі. Іх задавальняла фартыфікацыя старога і традыцыйнага тыпу. Аднак гарадское апалчэнне мелася ў кожным горадзе. Сіла і колькасць апалчэнцаў знаходзіліся ў прамой залежнасці ад эканомікі і колькасці гарадскога насельніцтва.

1. УМАЦАВАНЫЯ ЎЛАДАЛЬНІЦКІЯ ПАСЕЛІШЧЫ БАСЕЙНА БЯРЭЗІНЫ І ПРЫПЯЦІ

Глуск (Дубровіцкі)

Паселішча ў Глуску ўзнікла ў эпоху ранняга жалезнага веку. Яно існавала і ў часы Кіеўскай Русі задоўга да яго пісьмовага ўпамінання [1]. Першапачаткова займаючы ўзвышаную частку правага берага р. Пцічы, яно ў XVI—XVIII стст. трансфармавалася ў «места» з магутным бастыённым замкам.

З XIV ст., з моманту ўключэння ў састаў Вялікага княства Літоўскага, Глуск лічыўся вялікакняжацкім уладаннем, якое часта перадавалася ва ўтрыманне розных асоб. У XV ст. ён належаў князям Гальшанскім, якія мелі тут, верагодна, умацаваны замак [2]. Аднак у 1501 г. глускія «добры» і «двор» Глуск належалі нейкаму князю Рыгору Іванавічу Юрэвічу [3]. Затым ім валодалі князі Дубровецкія і Гальшанскія. З 1551 г. Глуск зноў знаходзіўся ў валоданні караля Сігізмунда Аўгуста, якому яго падаравалі Гальшанскія [4]. У 1561 г. на падставе граматы гэтага караля адбыўся падзел Глуска паміж сёстрамі княгінямі «Кузьминой Иванóвичей (па мужу Жаслаўскай.— *М. Т.*) и Александрой Ивановичей Гольшанскими» (па мужу Палубінскай.— *М. Т.*) і дачкой першай сястры Настассяй Юр'еўнай, якая выходзіла замуж за князя Чартарыйскага. Перад гэтым увесь «замочек... з местом и волостью и теж половица двора Ригова з людми с всеми... достался... княгине Кузьминой Ивановича Жеславской (цешчы І. Ф. Чартарыйскага.— *М. Т.*)» [5].

План-схема глускіх умацаванняў:
1 — замак, 2 — горад

Замак падзялілі папалам: «почавши от узводу замковою по половние вежи уездные у замок, половицу вежи новое, тые две вежи

по половицы замок делять»[6]. Граматай зацвярджаўся сумесны рамонт гародняў, якія стаялі «непокрыты», і сумесна «з абодвух сторон плот поправовати або изнову будовати». Таксама падзялілі замкавую зброю: «стрелбы замковые и пушки и иншые речи ку замку належачие». Горад, у якім цэнтральнай вуліцай лічылася «Великая», у той час таксама меў умацаванні і адны вароты — Слуцкую «браму от уезду Слуцкого»[7]. Другіх брам дакументы не згадваюць.

Праз 10 гадоў адбыўся новы падзел Глуска, у гэты раз паміж князямі Заслаўскімі і іх цёткай княгіняй Чартарыйскай. Грамата 1571 г. цікавая тым, што яна не толькі называе ўязную браму з пад'ёмным мостам, 2 вежы і 17 гародняў, але паведамляе «о фортке» ў сцяне. Яна, відавочна, адкрывала доступ да р. Пцічы. У дакуменце пералічваецца зброя, якая мелася тады ў замку: «дело железное с зелезником, гаковниц три, ручниц две, зброй бляховых две, капалыны два, рогатин две, порохи, селитру, серу — то по половине разделили»[8].

У 1581 г. князі Заслаўскія прадалі Чартарыйскім за 50 тыс. польскіх злотых «половину замку Глусского и места Глусского и половицу сее волости Глуское»[9]. Потым Глускам цалкам завалодалі князі Палубінскія ў сувязі з тым, што 4 ліпеня 1626 г. князь Н. Ю. Чартарыйскі саступіў сваю частку Глуска і воласці за 50 тыс. польскіх злотых маршалку Слонімскаму К. А. Палубінскаму[10].

У канцы XVI — пачатку XVII ст. на месцы старога драўлянага замка ў Глуску пабудавалі новы замак з пяццю бастыёнамі. Яго апаясваў глыбокі і шырокі роў, які злучаўся з р. Пцічу. Насыпаныя з гліны і культурнага слоя валы і бастыёны ўзвышаюцца і зараз на вышыню ад 5 да 7 м над навакольнай тэрыторыяй. Ранеў знутры іх меўся скляпеністы каменна-цагляны ход, па якому маглі перамяшчацца стралкі ў час абстрэлу, канцэнтруючыся на галоўных кірунках атакі. З замку быў зроблены падземны каменны ход да ракі, што вырашала праблему забеспячэння вадой у час аблогі. Уезд у замак ішоў праз пад'ёмны мост — «узвод», які традыцыйна існаваў у Глускім замку. Характэрна, што брама размяшчалася не па цэнтры курціны, звернутай да горада, а бліжэй да правага вуглавога бастыёна. Гэта давала магчымасць фланкіраваць уваход агнём.

У 1648 г. Глуск апынуўся ў гушчы падзей антыфеадальнай барацьбы, якая разгарэлася ў Беларусі і на Украіне. У кастрычніку горад займалі «купы паўстаўшых сялян беларускіх і ўкраінскіх казакаў, якія затым рушылі да Бабруйска»[11].

Глуск моцна пацярпеў у тыя гады, а таксама ў час руска-польскай вайны. Гэта адзначалася сеймам Рэчы Паспалітай у 1655 г. Улічваючы нанесеныя «шкоды» на працягу ўсёй «казацкай вайны» ад войска Рэчы Паспалітай і яго абоза, а таксама новых непрыяцельскіх разбурэнняў, ад якіх Глуск «агнём і мячом датла разбураны», сейм вызваліў яго ад экстраардынарных падаткаў на 10 гадоў. Грошы мяшчане павінны былі выкарыстаць для аднаўлення замкавых пабудоў і дагляду амуніцыі[12]. Паўторна гэта валоданне маршалка Вялікага княства Літоўскага Аляксандра Палубінскага было вызвалена сеймам у 1673 г. на 12 гадоў ад падатку чопавага, рознага рода мыт у Кароне і ў Вялікім княстве Літоўскім, за выключэннем старога мыта, прыбыткі ад якога ішлі каралю. Пры гэтым характэрна, што «лібертацыю» атрымала не проста паселішча, а «парубежны горад, магутны ваенны аплот, закладзены ад казацкай рэбеліі ўкраінскай»[13].

Як сведчаць інвентары канца XVII—XVIII ст., Глускі замак сапраў-

ды быў магутнай і сучаснай фартэцыяй. Згодна інвентару 1692 г., тут меўся пастаянны гарнізон з 21 «жалнера», набраных галоўным чынам з мясцовых жыхароў. Імі камандаваў «генерал Аградзінскі», падхаружы Скідзер, быў барабаншчык, тры пушкары. Прозвішчы апошніх і імёны (Каза-пушкар, Стэфан-пушкар і Абрам Навіцкі — пушкар) таксама гавораць пра іх мясцовае паходжанне. Сярод рамеснікаў лічыліся «кавалі Сямён, Верамей, Іван, муляр Апанас Сяструх, Раман руднік, маляр Якуб, рымар Даніла, Ян Тарасевіч злотнік, катляры Наум, Васька і два Яна, Севярын Тарасевіч злотнік, слесар Піліп, зэгармістр Грышка, столяр Лявон, шабельнік Якуб» [14]. Як бачна, набор рамесных прафесій задавальняў самыя неабходныя ваенныя патрэбы абароны замка.

Сведчанні пра ўмацаванні горада адсутнічаюць, аднак, як і раней, называецца «Слуцкая брама» [15]. Гэта, відавочна, гаворыць на карысць таго, што ў горадзе ва ўсе часы былі толькі адны ўязныя вароты.

У канцы XVII ст.— пачатку XVIII ст. Глуск перайшоў у валоданне Радзівілаў. Згодна інвентару 1708 г., ахова замка перайшла да выбранцаў — наёмных салдат, якія рэкрутаваліся магнатам з вольных людзей, сялян, дробнай шляхты. Яны атрымалі за службу зямельныя надзелы, якія пераходзілі ў спадчыну па мужчынскай лініі. Глускія выбранцы набіраліся часткова з гараджан, часткова з сялян Кольчыцкага войтаўства. Яны не неслі начной варты ў замку і не адпраўляліся «ў пасылку», а з'яўляліся туды ў выпадку яўнай ваеннай небяспекі. Днём яны працавалі па дамах. Сяляне Волашаўскай воласці пасылалі на варту ў замак па чатыры вартаўнікі, сыпалі грэблю перад замкам, вазілі лес і дровы, неабходныя для будаўніцтва, рамонту і абагрэву. Такія работы пачыналіся 2 красавіка і вяліся да канца чэрвеня на працягу 12 тыдняў. Восенню такім жа чынам пачынаючы з 1 верасня і да канца лістапада работы працягваліся. У дадатак да ўсяго сяляне в. Мінкавічы давалі, калі было неабходна, дубовыя дошкі для гарматных колаў, калоды з клёна і дуба для гарматных лафетаў [16]. Гэта магло ісці як для патрэб артылерыі Глускага замка, так і ў размешчаны ва Урэччы пушкарскі двор Радзівілаў. Дакумент называе глускага гараднічага Устарбоўскага, які даглядаў мясцовую фартэцыю. На рамонт замкавых валоў і бастыёнаў, утрыманне гарнізона траціласа 600 злотых. З іх 500 злотых «стацыі» давалі мяшчане [17].

Інвентар 1720 г. апісвае даволі прадуманую абарону падыходу да замкавай брамы. Ад месца праз абарончы вадзяны роў ішоў доўгі мост з парэнчамі. Доступ на яго запірала папярэчная «кабыліна» з пад'ёмным механізмам і двума жалезнымі ланцугамі. Тут жа стаяла будка вартаўніка. Далей на мосце мелася яшчэ адна «кабыліна», якая закрывала праход на прамежкавы пад'ёмны «ўзвод» на двух ланцугах. Ён быў сцягнуты чатырма жалезнымі палосамі і, калі яго падымалі, мацаваўся ў вертыкальным становішчы жалезнымі «шворнамі». За ім стаяла «прамежкавая брамка з 2 форткамі». Перад самай брамай знаходзіўся другі прамежкавы пад'ёмны мост на двух ланцугах. У дакуменце ён называецца «ўзвод стары». Мост меў складаную сістэму пад'ёма. Далей знаходзіўся «другі ўзвод», размешчаны непасрэдна перад брамай. Падняты ланцугамі, ён закрываў палотнішчы варот замка, якія, як належыць фартэцыі, былі акаванымі [18]. Вароты замыкаліся на замок.

У каменнай браме справа и злева размяшчаліся два скляпы з дзвярамі ў выглядзе драўляных кратаў. Справа ад выхаду стаяла пабудова для гарнізона замка, злева — «кардыгарда». У сценах ніжняга паверху брамы і кардэгардыі меліся байніцы, якія дазвалялі весці кругавую

абарону. На другім паверсе было чатыры акны, на трэцім — тры. Вакол паверху ішоў драўляны памост, у якім можна бачыць баявую галерэю. Замкавы падворак займалі розныя гаспадарчыя і службовыя пабудовы, у тым ліку і цэйхгаўз «прускай работы», г. зн. фахверкавай канструкцыі. Таксама мелася «студня» са страхой. У адным са скляпоў памяшчаліся дзверы ў патаемны вылаз, які выводзіў у канец вала і далей за межы замка. Тут жа на двары знаходзіліся выкапаныя сажалкі, у якіх разводзілася рыба. Злева ад брамы стаяў каменны касцёл. Згадваецца яшчэ адна брама — «Водная», якая размяшчалася, відавочна, у адной з курцінаў, звернутых да р. Пцічы. Брама была двухпавярховая. Перад замкам размяшчалася падзамча [19].

Інвентар Глуска за 1724 г. раскрывае структуру ваеннай арганізацыі і павіннасцей гараджан. Усё мужчынскае насельніцтва аб'ядналася ў 4 баявыя сотні на чале з сотнікам. Начальнікам і «радцаю» над імі быў палкоўнік. Кожная сотня падзялялася на 10 дзесяткаў на чале з дзесятнікамі. У выпадку ваеннага становішча па сігналу звона ці бубна ўсё мужчынскае насельніцтва паўставала сумесна з яўрэямі пры поўнай баявой амуніцыі на абарону замка. У кожнага сотніка былі «бубен, харугва, мушкет, а ў палкоўніка — буздыган, шабля і пара добрых пісталетаў». Кожны дзесятак быў не толькі ваеннай, але і пажарнай адзінкай, меў абавязковы жалезны бусак і ручную драўляную помпу [20].

Усе жыхары Глуска, як хрысціяне, так і іудзеі, тры разы на год разам са сваімі старэйшынамі праводзілі, згодна з загадам, агляды — попісы са зброяй. Яны адбываліся каля «Раства гасподня рускага, на Вялікую ноч і на Божае Цела». На свята «Божае Цела» яўрэі давалі па 10 фунтаў пораху для артылерыйскага салюту, а самі ў час руху працэсіі павінны былі сядзець дома, закрыўшы вароты і вокны пад пагрозаю штрафа 5 копаў грошаў.

У абавязкі мяшчан уваходзілі начная варта ў гарадской браме і на рынку, насыпка і рамонт замкавай грэблі і мастоў як у горадзе, так і пад горадам. У 1724 г. горад плаціў 300 злотых на гарнізон і салдат-выбранцаў. Сяляне чатырох вёсак воласці давалі на 1 капе «дранi» з дыма [21].

Гараднічых у Глуску прызначаў Радзівіл. У 1724 г. гэтую пасаду займаў Васіль Лісіца, які меў «свабоду» ад усіх павіннасцей, 1 валоку зямлі і прыбытак у выглядзе «брамных пенязей водлуг даўняга звычаю ад вазоў купецкіх на 1 грошу». На яго ўскладалася адказнасць за ўсе ваенна-гаспадарчыя і будаўнічыя работы ў замку, горадзе і воласці. У мірныя часы Глускі замак ахоўвалі толькі тры чалавекі: адзін капрал і два «жаўнера». Ім плацілі грошы, куплялі вопратку і абутак. Ахоўна-міліцыйныя функцыі ў горадзе і воласці выконвалі 6 салдат, якіх прызначаў гараднічы, ці адміністратары замка [22].

Інвентар 1756 г. утрымлівае шэраг новых дэталяў, якія ўдакладняюць архітэктуру і ўладкаванне замкавых брам таго часу, самога замка і ўмацаванняў горада. Інвентар паведамляе, што мост на подступах да замка меў тады толькі два «ўзводы» на чатырох жалезных «ланцугах». «Мураваная брама», акрамя двухстворкавых варотаў, закрывалася дадаткова «дубовай кратай» (герсай.— *М. Т.*), якая падала зверху. Вянчаў браму купал «з баняй і з харугаўкай (флюгерам.— *М. Т.*) наверсе бляшанай». Дакумент гаворыць ужо не толькі пра Слуцкую браму, але і пра «паркан каля места», якія мяшчане павінны былі ўтрымліваць у належным стане, як і ўмацаванні замка, масты і грэблі. Згадваецца цэйхгаўз са зброяю, але апісання яго няма. Зноўку звяртаецца ўвага

жыхароў на меры супрацьпажарнай бяспекі: неабходна было захоўваць у «важніцы» 12 жалезных бусакоў, мець перад кожным домам у летні час кадушку з вадой, несці ночну дзяжурства. Абавязкам сялян воласці лічылася пастаўка хлеба «на патрэбу замковую» [23].

Глускі замак існаваў да канца XVIII ст., пасля чаго прыйшоў у заняпад.

Петрыкаў (Петрыкавічы)

Хоць паселішча ў Петрыкаве існавала ўжо ў XI ст., горад стаў вядомы ў пісьмовых крыніцах з XV ст. Петрыкаў належаў князям Слуцкім-Алелькавічам, а некаторы час ў XVI ст.— каралеве Боне. Горад знаходзіўся ў зоне дзеянняў крымскіх татар. Не выпадкова пры князю Юрыю Алелькавічу тут быў адбудаван драўляны замак, які ў час руска-літоўскай вайны ў 1535 г. быў спалены войскамі князя Аўчыны-Целяпнёва [24].

Размешчаны на поўдні Беларусі, Петрыкаў у пачатку XVI ст. быў месцам частых збораў войска Вялікага княства Літоўскага, якое супрацьстаяла драпежным загонам крымскіх татар [25].

У 1595—1596 гг. Петрыкаў двойчы займалі паўстанцы С. Налівайкі. У XVII ст., калі горад перайшоў у валоданне магнатаў Хадкевічаў, тут быў узведзены магутны бастыённы замак, акружаны глыбокім прыроднym ровам.

У час антыфеадальнага паўстання 1648—1649 гг. Петрыкаў ператварыўся ў базу паўстанцаў, з якой адпраўлялі боепрыпасы ў суседнія беларускія гарады, у тым ліку ў Мазыр [26].

У час вайны паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай горад, што стаяў на важнай рачной артэрыі, быў абложаны ў лістападзе 1654 г. войскам казацкага палкоўніка І. Залатарэнкі, якое «ломало Петраков». Петрыкаў значыўся ў спісе гарадоў, які пасля зацятай абароны «добил челом русскому царю» [27].

Аднак ужо ў 1655 г. тут зноў стаяў гарнізон Рэчы Паспалітай з навакольнай шляхты і мяшчан. 5 ліпеня 1655 г. да Петрыкава падступіла



Петрыкаўскае замчышча. План

войска кіеўскага палкоўніка П. Яненкі, супраць якога выйшаў на бой мясцовы гарнізон. У ходзе бітвы казакі перамаглі і прымусілі праціўнікаў адступіць да Слуцка, аднак самі не здолелі замацавацца ў горадзе і праз тыдзень адышлі ў Кіеў [28].

У 60-я гады XVII ст. раён Петрыкава быў ахоплены казацка-сялянскім паўстаннем, якое атрымала падтрымку ад рускіх войскаў. У 1664 г. горад знаходзіўся ў руках 800 казакоў палкоўніка Дацко Васілевіча. Летам таго ж года яны пакінулі Петрыкаў, спадзяючыся прарвацца на

Выгляд замчышча ў Петрыкаве з поўдня

Валынь і падняць паўстанне «мужыкоў за Туравам, каля Турава і далей» [29].

Нягледзячы на ўсе падзеі XVII і XVIII стст., Петрыкаўскі замак захаваўся да пачатку XIX ст. Згодна інвентару 1810 г., ён па-ранейшаму меў абарончы роў і драўляны мост праз яго перад двух'яруснай уязной брамай з акруглым купалам і гонтавым дахам. Двайныя палотнішчы дзвярэй зачыняліся на засаўкі і крукі. Гараджане, як і раней, неслі «начную варту», зберагаючы горад ад агню [30].

Тураў

Адзін са старэйшых усходне-славянскіх гарадоў Тураў вядомы па летапісах з 980 г. Ужо ў XI—XIII стст. ён меў складаную і магутную лінію ўмацаванняў, якая складалася з абнесеных земляным валам дзядзінца і акольнага горада. У 1158 г. войска кіеўскага князя Ізяслава Данілавіча і падуладных яму пяці князёў 10 тыдняў трымала ў аблозе ўмацаванні горада і «не успевше ему ничтоже възвратишася в свояси». Пры гэтым летапісец адзначаў, што тураўцы не проста адсядзеліся за сценамі ўмацаванняў, а выходзілі на вылазкі: «и бяхуться крепко выходячи из города» [31].

Абарончая сістэма горада грунтавалася на ўмелым спалучэнні натуральных перашкод са штучнымі ўмацаваннямі, узведзенымі суадносна

з рэльефам мясцовасці і ў спалучэнні з тактыкай абароны таго часу. Гарадзішча стольнага Турава складалася з дзвюх пляцовак, якія займалі мыс, прыўзняты на 5—6 м над забалочанай поймай Прыпяці. Адна пляцоўка памерам 100×90 м баранілася рэчкай Яздой, якая абгінала яго з захаду, поўначы і, напэўна, з усходу. Тут яна зліваласа з водамі р. Струмень, прытока Прыпяці. Памер другой пляцоўкі — 100×90 м. Паміж дзяцінцам і навакольным горадам меўся вадзяны абарончы роў. Ён дасягаў шырыні ад 20 да 25 м, глыбіні каля 5 м і злучаўся некалі



Тураў. План умацаванняў

з водамі Язды і Струменя. Натуральныя перашкоды надзейна гарантавалі бяспеку Турава з захаду, поўначы і ўсходу. З напольнага паўднёва-ўсходняга боку ён абараняўся магутнымі штучнымі збудаваннямі — валам і вадзяным ровам, які дасягаў 5 м глыбіні і 10—12 м шырыні [32].

У XIII ст. у паўднёва-заходняй частцы дзяцінца ўзвялі каменную абарончую вежу дыяметрам каля 10—12 м. Яна існавала да 30-х гадоў XIX ст. і затым была разабрана. Да цяперашняга часу ад яе захавалася ўзвышэнне правільнай круглай формы [33].

У XIV ст. Тураў быў уключаны ў склад Вялікага княства Літоўскага. З XV ст. ён належаў князям Глінскім, з 1507 г.— гетману К. Астрожскаму і яго жонцы — народжанай Слуцкай-Алелькавіч.

Увесь старажытны комплекс умацаванняў дастаўся ў спадчыну Тураву XIV—XVIII стст. Жыхары ў мэтах сваёй абароны выкарыстоўвалі абарончыя збудаванні замка (дзядзінца) і падзамка (былога навакольнага горада).

З пачатку XVI ст. Тураў апынуўся ў зоне набегаў крымскіх татараў. Двойчы, у 1502 і 1521 гг., яны знішчалі горад ўшчэнт. У 1535 г. войскі царскага ваяводы Ф. Аўчыны-Целяпнёва таксама спустошылі Тураўшчыну [34]. Т. Карабейнікаў, які праязджаў праз Тураў у 1593 г., характа-

рызаваў горад наступным чынам: «Город Туров невелик, древяной, с Можайск, стоит межи реки и озера, а река под ним Припять, поменьше Оки реки, а с другую сторону озеро велико, посаду немного, только с Борисов городок» [35].

У 1596 г. горад быў заняты паўстаўшымі казакамі С. Налівайкі. Пазней, у 1648 г., жыхары Турава прынялі ўдзел у антыфеадальнай вайне, але ў 1649 г. з ім жорстка расправілася карная экспедыцыя гетмана Радзівіла, узяўшы горад штурмам.

У 1660—1664 гг. горад не раз быў апорай паўстанцаў і не аднойчы разбураўся [36]. Тым не менш «замок Туровский», апісанняў якога не захавалася, існаваў яшчэ ў першай палове XVIII ст. [37]

Брагін

Брагін — летапісны горад, які ўпамінаецца з 1147 г. Яго дзяцінец, на якім пазней, у XIV—XVII стст., знаходзіўся сярэдневяковы замак, размяшчаўся на правым беразе р. Брагінкі пры ўпадзенні ў яе справа безыменнага ручая. Пясчаны пагорак авальнай формы памерам 110×60 м быў выцягнуты па лініі поўнач—поўдзень. З поўначы яго абараняла балоцістая пойма і воды Брагінкі, з захаду — абарончы роў з ручаём, які працякаў па ім і быў падпёрты плацінай. З поўдня да ўзвышэння ўпрытык падступала балота. Напольны паўднёва-ўсходні бок абараняўся вадзяным ровам. Замкавая гара ля падэшвы была ўмацавана частаколам, які выконваў дваякую функцыю: ён служыў знешняй перашкодай і прадухіляў спаўзанне пясчаных схілаў замчышча. Дарога да паселішча ішла з поўдня па вузкай дамбе, пракладзенай па балоце. З усходу і захаду да горада прымыкала так званае «Загароддзе», дзе, як і на дзяцінцы, знойдзена кераміка XI—XIII стст. [38]



Брагін. Сітуацыйны план: 1 — замак

Брагінскае замчышча, якое цяпер моцна знівеліравана, узвышаецца на 5—6 м над Брагінкай. Некалі яно было вышэйшым. Па краю ішлі земляныя валы шырынёй у аснове да 10 м і вышынёй да 4—5 м. На ім стаялі драўляныя ўмацаванні — сцены-гародні, адна вежа над р. Брагінкай і ўязная вежа-брама з мастом-узводам. Перад уязнымі варотамі меўся перакінуты праз вадзяны роў драўляны мост. У маі 1574 г. Брагін быў «пожалован» князям Вішнявецкім, якія ўтварылі ў замку сваю рэзідэнцыю і прывялі яго ў належны стан. Замак згадваецца ў першай палове XVII ст. неаднаразова. Аднак у 1648 г., калі жыхары Брагіна адчынілі вароты перад войскам палкоўнікаў Б. Хмяльніцкага Нябабай і Хвеськам, горад і замак разбурыла карная экспедыцыя войскаў Рэчы Паспалітай [39]. У дакументах вайны паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай у сярэдзіне XVII ст. Брагінскі замак больш не згадваецца.

Горваль

Паселішча Горваль вядомае па пісьмовых крыніцах з XIV ст., аднак на яго тэрыторыі маюцца два гарадзішчы эпохі Кіеўскай Русі і больш ранняга часу [40]. Да сярэдневяковага замка Горвалю адносіцца гарадзішча на ўсходняй ускраіне сучаснага селішча на правым беразе Беразіны ля спуску да парома. Пляцоўка яго мае прамавугольную форму памерамі 40×20 м, выцягнутую ўздоўж берага ракі па лініі поўнач—поўдзень. З усходу гарадзішча бароніць круты і высокі схіл берага, вышынёй больш за 13 м, з поўначы і поўдня яго прыкрываюць яры, з напольнага заходняга боку выкапаны штучны роў і насыпаны вал.



Горвальскае замчышча

У 1503 г. Горваль у статусе мястэчка згаданы ў мірным пагадненні паміж Маскоўскай дзяржавай і Вялікім княствам Літоўскім. У час вайны ў 1535 г. Горваль быў ушчэнт разбураны рускімі войскамі [41]. Вядома, што з 1528 г. Горваль належаў дзяржаўцу Б. І. Шалуху, затым перайшоў да каралевы Боны, якая «фрымаркам» аддала яго за Ковель князю В. Сангушку [42]. У XVII ст. замкам валодала Віленская капітула. Вера-

года, у першай палове XVII ст. і былі тут збудаваны бастыённыя ўмацаванні [43].

У 1648 г. пад Горвалем паўстанцы — украінскія казакі разбілі войска стражніка Вялікага княства Літоўскага князя Мірскага. Замак заставаўся важным пунктам, які кантраляваў пераправу і шлях на р. Бярэзіне ў Дняпро, што падцвердзіла вайна Расіі з Рэччу Паспалітай у XVII ст. У лістападзе 1654 г. казакі гетмана І. Залатарэнкі вымушаны былі хадзіць на штурм, у выніку чаго «замко Горвалю позжено» [44].

Пазней умацаванні былі адноўлены.

2. УМАЦАВАНЫЯ ФЕАДАЛЬНЫЯ ПАСЕЛІШЧЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Заслаўе

Цэнтрам абароны сярэдневяковага Заслаўя (Мінскі раён) быў адзін з самых ранніх на Беларусі бастыённы замак, пабудаваны князямі Глябовічамі ў сярэдзіне XVI ст. Ён размяшчаўся ў 200 м на поўнач ад горада і займаў высокае ўзвышша, абкружанае шырокім і глыбокім вадзяным ровам. Сістэма запрудаў на р. Княгіньцы фактычна ператварала замак у астраўное ўмацаванне. Замак у плане меў форму прамавугольніка памерам каля 215×190×120×80 м.

Узведзены ў традыцыях стараітальянскай фартыфікацыйнай школы, ён меў бастыёны і курціны, абмураваныя каменем і цэглай. Пасярод курцінаў размяшчаліся дадатковыя ўмацаванні — бастыёны «пьяттаформа». Вал і бастыёны замка насыпаны з пяску, жвіру і гліны з выкарыстаннем фашын. Над нізкімі лугамі, якія абкружалі замак, умацаванні ўзвышаліся на 18—20 м. У мэтах прадухілення спаўзання насыпаў унутр яе дадаткова ўвялі цагляную сцяну таўшчынёй 0,33 м і вышынёй 2,5 м. Знутры меўся падземны скляпеністы ход. На выпадак аблогі на замкавым двары меўся калодзеж, які стаяў над крыніцай [45].

Заслаўе. План сярэдзіны XIX ст.



Заслаўскі замак. Сітуацыйны план

У замку быў адзіны ўваход, размешчаны з паўднёвага боку. Ён ішоў праз варотную вежу, відаць, двух'ярусную. Таўшчыня яе каменных сцен дасягала 2 м. Перад ёю знаходзіўся пад'ёмны мост, перакінуты праз абарончы роў. Подступы да варотаў і моста надзейна фланкіраваліся з

Абарончы вал Заслаўскага замка



Заслаўскі замак. Рэканструкцыя В. Сташчанюка

вуглавога бастыёна, да якога вароты былі прысунуты амаль упрытык, і з прамежкавага бастыёна. Каля варотнай вежы меўся падземны ход вышынёй 13 і шырынёй 0,8 м, зроблены з цэглы. Першапачаткова ён быў прыстасаваны, верагодна, для патаемных вылазак у абарончы роў і выводзіў за межы замка. Выхад замыкаўся металічнымі кратамі. Пазней ход маглі выкарыстаць як вязніцу.

У паўночнай курціне замка знойдзены рэшткі сцен, у якіх праглядваюцца пяты скляпенняў. Верагодна, гэта рэшткі казематаў [46].

Праабражэнская царква, якая стаяла недалёка ад паўднёвай курціны замка ў сярэдзіне XVI ст., у верхняй частцы сцен мела кругавы пояс байніц, пазней закладзеных пры перабудове. Акрамя таго, шэсць ярусаў байніц меліся ў трыццацімятровай вежы храма, якая ўзвышалася над ваколіцамі і служыла выдатным назіральным пунктам [47].

Маладзечна

Цэнтрам абароны Маладзечна, вядомага па пісьмовых крыніцах з 1388 г., быў замак. Яго ўзвялі на правым балоцістым беразе р. Вушы. Будаўнікі ўдала выкарысталі нізкі балоцісты рэльеф і натуральныя ўмацаванні, якія адыгралі значную ролю ў абароне прыватнаўласніцкага замка князёў Заслаўскіх. Пазней Маладзечна належала князям Мсціслаўскім, Сангушкам, Агінскім і інш. [48]

Пры ўзвядзенні маладзечанскіх умацаванняў фартыфікатары спачатку вымасцілі на балоце бярвеннямі ўчастак 120×80 м, падвялі грэблю і насыпалі са жвіру і пяску штучную пляцоўку вышынёй да 4 м. Па краю ўзвялі пясчана-гліняныя валы вышынёй да 3,5 м і шырынёй 11 м. Спачатку тут стаялі драўляныя сцены-гародні і вежы, у тым ліку ўязная брама. У XVII ст. на вуглах замка ўзвялі бастыёны галандскага тыпу, што адпавядала зменам у тактыцы абароны і аблогі. Ля падножжа бастыёнаў для прадухілення апаўзання зямлі мелася агарожа слупавой канструкцыі. Знутры вала, у месцах яго прымыкання да брамы, памуравалі каменныя сценкі, якія арміравалі насыпы [49].



План Маладзечанскага замчышча

Горад падвяргаўся спусташэнню ў канцы XIV ст., у перыяд барацьбы Свідрыгайлы з Жыгімонтам за вялікакняжацкі трон: князь Заслаўскі апынуўся на баку апошняга і паплаціўся. У 1519 г. наўгародска-пскоўскія ратнікі на чале з князем М. Кісліцай былі «под Молодечно» і, напэўна, спалілі яго. Паходы паўтарыліся ў тым жа 1519 г. і ў 1533 г. Сляды пажараў у профілі вала замка і ў культурным пласце пацвярджаюць шматразовыя пажары ўмацаванняў [50].

У 1568 г. пад Маладзечна знаходзілася саракатысячная армія Зыгмунта II Аўгуста, якая мела намеры прадухіліць паход войскаў Івана Грознага.

У 1708 г. моцны рускі ваенны атрад доўга абараняў горад ад групіроўкі войскаў шведскага караля Карла XII [51]. Верагодна, гэта была апошняя бітва, у якой выкарыстоўваліся ўмацаванні мясцовага замка.

У XVII—XVIII стст. у замку знаходзілася рэзідэнцыя князёў Агінскіх, меўся невялікі мураваны храм, які нядаўна знойдзены ў час археалагічных раскопак. Ён меў памеры 11×24 м, распісан фрэскамі, існаваў з XVI па XVIII ст.

Лагойск

Згаданы ўпершыню ў крыніцах пад 1078 г., старажытны Лагойск свае ўмацаванні эпохі Кіеўскай Русі і больш позняга часу памясціў на ўзвышшы астанца, аддзеленым ад плато ярамі з трох бакоў. Чацвёрты яго бок абараняўся высокім схілам, звернутым у бок поймы р. Гайны. Вялізны земляны вал вышынёй 6—8 м і шырынёй да 16—18 м надзейна прыкрываў тэрыторыю плошчай у 1,5 га. Абарона ўзмацнялася глыбокім



План Лагойскага замчышча

(да 4—5 м) і шырокім (да 20 м) ровам. Зачыстка абарончага вала Лагойска паказала, што на працягу многіх стагоддзяў яго неаднаразова падсыпалі [52].

Як цэнтр удзельнага княства Лагойск у XIV ст. увайшоў у склад Вялікага княства Літоўскага. Ён належаў Ягайлу і Вітаўту. Пазней Казімір Ягелончык навечна аддаў яго ў якасці прыватнаўласніцкага горада Чартарыйскім. У 1505 г. горад быў ушчэнт разбураны і спалены татарскай ардой Махмет-Гірэя. Жыхары спрэс загінулі, а сыны князя Сямёна Чартарыйскага трапілі ў палон. У 1517 г. па выхадзе замуж дачкі С. Чартарыйскага за падляшскага ваяводу Васіля Тышкевіча горад становіцца родавым гняздом Тышкевічаў, якія валодалі ім да XIX ст. Толькі ў 1531 г. былі адноўлены ўмацаванні замка. Пад яго абаронаю стаў паступова адраджацца горад. У другой палове XVI ст. сучаснікі зноў адзначалі тут наяўнасць замка і «места» [53]. Яшчэ адно разбурэнне перажыў горад і замак пад час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай у сярэдзіне XVII ст. Разбурэнне ўмацаванняў было завершана шведамі ў час Паўночнай вайны [54].

Магільна

Упершыню Магільна згадваецца ў позніх беларуска-літоўскіх летапісах «Хронике Литовской и Жмойтской» і «Хронике Быховца» пад 1284 г. як месца бітвы паміж войскамі наваградскага князя Рынгольта і саюзным войскам заволжскіх татар, Святаслава Кіеўскага, Льва Уладзімірскага і Дзмітрыя Друцкага. Саюзнікі пацярпелі паражэнне [55]. Пазней, у XIV ст., князь Вітаўт перадаў паселішча Монвідам Дарагастайскім, якія парадніліся ў канцы XV ст. з Радзівіламі. У 1520 г. князёўна Соф'я Радзівіл з дома Монвідаў у сваім тастаменце запісала, што «она добра свои властные материстые... Могильно с Двором Святым пасынку своему Пацу записала» [56]. Гэта быў Станіслаў Пац, які стаў у 1566 г. віцебскім ваяводам. Ён і пабудаваў у сваім валоданні замак, пад абаронай якога знаходзілася ў XVI—XVII стст. «село Могильно, двор Могильно» і «местечко Могильно». Замак узвялі на самым краю правага берага Нёмана. Ён займаў прыпаднятую над лугам чатырохвугольную пляцоўку памерамі 110×65 м, абкружаную валам. Яна аддзялялася ад прызамча глыбокім, да 8 м, ровам. Ва ўсходняй частцы пляцоўкі меўся бастыёнападобны выступ. У замку была ўязная брама з пад'ёмным мостам-«ўзводам» і як мінімум чатыры вуглавыя вежы. Паводле інвентару 1536 г., складзенаму Іванам Івановічам, дваранінам гаспадарскім, тут мелася розная агнястрэльная зброя: гарматы — «серпантины железные, гаковниц в ложах четыры, а на киях пять гаковниц», порах гарматны («фаска неполная»), ручнічны («два фунты») и «салетры пяць фунтов» [57]. У «зброёвне» знаходзілася нямала амуніцыі, сярод



План Магільнянскага замчышча (паводле Л. Калядзінскага)



Воіны Магільняпскага замка. Рэканструкцыя паводле інвентару 1537 г. Рыс. У. Кіслага

якой значацца баявыя нагалоўі («капалынов 24, шеломов 95»), пласцінчатыя даспехі («зброї бляховых на 10 похолков»), 25 кольчатых панцыраў, 10 наручаў, 4 зярцалы, адзін шчыт — «котрыгал черленый старый» і 55 яркіх плашчоў-накідак «барвіц», якія апраналіся паверх даспехаў [58]. Усё гэта паказвае, што жыхары Магільна маглі выставіць супраць праціўніка больш за сотню добра ўзброеных воінаў.

Інвентар-«попис» адзначыў, што «замок Могиленский есть будованья пана Пацова». Значыць, драўляныя абарончыя збудаванні тут узніклі паміж 1520 і 1536 гг. Кіравалі замкам «служебники» пана Паца Мацей і Павел Мілашэвічы. Будаўнічы лес дастаўляўся з бліжэйшай «Могиленской пущи» [59].

На працягу 1599—1602 гг. усе магільнянскія валоданні зноўку перайшлі да Радзівілаў, якія сканцэнтравалі ў сваіх руках фактычна ўсё Верхняе Панямонне [60].

Магільнянскі замак спыніў сваё існаванне і страціў ролю абароннага пункта ў ходзе вайны Расіі з Рэччу Паспалітай у сярэдзіне XVII ст. Пазней у гістарычных дакументах не згадваецца.

Астрашыцкі Гарадок

Рэшткі ўмацаванняў сярэдневяковага Астрашыцкага замка размешчаны на ўсходнім беразе возера Усяж і правым беразе ракі, якая мае тую ж назву. Замак займаў марэнны астанец з пляцоўкаю ў форме чатырохвугольніка памерам 60×55 м. Паверхня замкавага двара ўзвышалася на 18 м над узроўнем возера [61]. Па перыметру пляцоўкі раней,



Замчышча ў Астрашыцкім Гарадку

відаць, ішоў земляны вал, сляды якога зараз можна заўважыць у паўночна-ўсходняй частцы замчышча. З астатніх бакоў ён разбураны абрывамі.

Зручнае і выгаднае з тактычнага боку размяшчэнне паселішча было ацэнена яшчэ ў раннім жалезным веку. Жыццё тут працягвалася ў эпоху Кіеўскай Русі, а ў XIV—XVII стст. стаяў драўляны замак, апісанняў якога не захавалася.

Ракаў

Паселішча, заснавальнікам якога быў нейкі Рак, узнікла ў XIV ст. У 1465 г. кароль Казімір аддаў Ракаў за паслугі літоўскаму магнату Кезгайлу, ад якога на мяжы XV—XVI стст. ён перайшоў да рода Сангушкаў [62]. У XVI ст. Ракаў атрымаў статус мястэчка. Тут узводзіцца драўляны замак, які размяшчаўся на левым беразе р. Іслач. Ён займаў падоўжаны пагорак, што ўзвышаўся на 15—16 м над рэчкай. У плане



Ракаўскае замчышча

пляцоўка нагадвала падкову, якая звужалася ў паўночнай частцы, мела даўжыню з поўначы на поўдзень да 110 м і найбольшую шырыню да 50 м. Паўднёвы край пляцоўкі штучных умацаванняў не меў, астатнюю тэрыторыю абкружаў земляны вал вышынёй 1—5 м з драўлянымі сценамі і вежамі. Ва ўсходняй частцы да цяперашняга часу ў вале захаваліся рэшткі ўвахода. На карце Т. Макоўскага 1613 г. Ракаў паказаны як умацаванае мястэчка. Пазней ім валодалі да 1794 г. Салагубы.

Сёмкаў Гарадок—Саламярэчча

Захаваліся рэшткі сярэдневяковага ўмацавання — замка ў паселішчы Сёмкаў Гарадок (Саламярэчча), былым валоданні князёў Саламярэцкіх. Пляцоўка замчышча прамавугольная ў плане памерам 65×50 м



Сёмкаў Гарадок — Саламярэч. План замчышча

была абкружана земляным валам з драўлянымі сценамі і вежамі. Умацаванне існавала ў эпоху Кіеўскай Русі (X—XIII стст.), а таксама ў XIV—XVI стст. [63]

Лоск

Упершыню горад Лоск згадваецца ў «Списке русских городов дальних и ближних», які датуецца 1387—1406 гг. [64] «Лошеск» гэтага часу займаў марэннае ўзвышэнне выцягнутай авальнай формы памерам 150×60—80 м, якое ўзвышалася над ваколіцамі на 12—14 м. Ад астат-

няга плато замчышча аддзялялася шырокім ровам. За ім у XVI—XVII стст. развівалася мястэчка. Валодалі Лоскам магнаты Кішкі [65].

Лоскі замак XIV—XVIII стст. меў драўляныя ўмацаванні ў выглядзе зрубных сцен-гародняў і баявых вежаў, якія стаялі на кальцавым земляным вале. Згодна інвентару 1621 г., тут мелася 10 трох'ярусных вежаў і двух'ярусная вежа-брама, якая закрывалася варотамі і кратай-герсай. Сцены гародні ў верхняй частцы завяршаліся баявой галерэяй з байніцамі і абламамі, накрытай двухсхільнай гонтавай страхой [66].

На замкавым двары стаялі два двухпавярховыя палацы. Мястэчка ў 1621 г. налічвала 83 двары, было неўмацаваным.

Мыш

Паселішча Мыш да XVI ст. уваходзіла ў склад каралеўскіх валодаанняў, але ў 1568 г. кароль Жыгімонт Аўгуст аддаў Мыш і ваколіцы за васныя заслугі Яну Хадкевічу. Ён пабудаваў замак з магутнымі ўмацаваннямі, узведзенымі на высокім правым карэнным беразе р. Мышанкі. Замак ўзвышаўся над рачной далінай больш чым на 20 м. Пляцоўку памерам 50×50 м абкружаў з трох бакоў земляны вал шырынёй каля 15 м у аснове і вышынёй 3,5—4 м. З чацвёртага боку, звернутага да ракі, земляного вала не было, бо адсюль замак прыкрываўся балоцістымі берагамі Мышанкі і стромым схілам. Тут некалі стаялі толькі драўляныя ўмацаванні.

З усходу, поўдня і захаду перад замкам ляжаў абарончы роў, які месцамі дасягаў пятнаццацімятровай глыбіні і трыццацімятровай шырыні пры круцізне схілаў да 45°. На вуглах у закругленнях валоў стаялі драўляныя вежы, злучаныя прасламі абарончых сцен. У паўднёвым вугле замкавага двара існаваў калодзеж, ад якога захавалася варонка, падобная на паглыбленне [67]. За ровам, з поўдня, размяшчалася паселішча.

Замак знаходзіўся на важным стратэгічным шляху — Варшаўскім гасцінцы, заўсёды звяртаў на сябе ўвагу праціўніка, які баяўся пакідаць у сваім тыле магутную цытадэль. Не здзіўляе, што пад час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай сюды былі накіраваны значныя сілы рускіх войскаў. Летам 1654 г. замак быў імі спалены. Наваградскі ваявода Пётра Вяжэвіч, які ўзначальваў абарону замка, пакінуў яго разам з



Замчышча ў Мышы

часткай войскаў і пайшоў у бок Слоніма. Рэшткі мясцовага гарнізона аблогі не вытрымалі, пра што сведчаць данясенні царскіх ваявод гасудару: «В городе Мыши литовских людей всех били, которых зостали, и языков взяли многих людей. И город Мышь сожгли и совсем разорили без остатку» [68]. З таго часу замак не аднаўляўся.

Камень Харэцкі

Дакументы XVI ст. згадваюць пра замак у Камені Харэцкім, будаўніцтва якога прыходзіцца на 50-я гады гэтага ж стагоддзя. У 1554 г. мясцовыя землі належалі канонікам Віленскага касцёла св. Станіслава. У «листе мужам... волости Каменицкой и старцу... Каменицкому Проню» прэлаты касцёла, спасылаючыся на неаднаразовыя напамінанні, патрабавалі ад мясцовых жыхароў пачаць будаўніцтва замка, які неабходна мець ім самім, «жонам и детям... для особливой обороны и схованью от неприятеля... часу потребного» [69]. Касцёл лічыў, што пачаць «город робити» патрэбна адразу ж, як закончацца асеннія работы па збору ўраджаю («скоро знявшись с поля»). Выдзеліўшы 300 копаў грошаў, прэлаты патрабавалі, каб жыхары «до тое городовое работы пристали зо всим достатком» [70].

Хутчэй за ўсё замак быў пабудаваны перад самай Лівонскай вайной, аднак хутка змяніў гаспадара і перайшоў у валоданне Васіля Цішкевіча — ваяводы Смаленскага, старасты Менскага і Пінскага [71]. У сваім тастаменце-запавеце, датаваным 1570 г., В. Цішкевіч адпісаў свайму сыну Астафію: «... так теж што кольвек в том замочку Каменицком... замковых речей: дел, гаковниц, ручниц, порохов». Іншымі словамі, замак быў перададзены з усёй зброяй, традыцыйнай для таго часу [72]. Замак даглядаўся «врадниками», якія неслі «в замочку Хоренком... сторожу пилную, добрую опатрную, уставичную» [73].

3. УЛАСНІЦКІЯ ЦЭНТРЫ АБАРОНЫ ПАДНЯПРОЎЯ І ПАДЗВІННЯ

Друцк

Умацаванні летапіснага Друцка эпохі Кіеўскай Русі мелі складаную сістэму абароны. Яна складалася з дзядзінца (замка) і навакольнага горада (падзамка), якія функцыяніравалі ў XIV—XVII стст. Замак размяшчаўся на правым беразе р. Друці і меў у плане няправільную чатырохвугольную форму. Яна паўтарала натуральную канфігурацыю ўзвышэння, занятага замкам. Яго пляцоўка памерам 140×80 м на 22 м узвышалася над узроўнем ракі, была амаль гарызантальнай і абмяжоўвалася магутным валам. Ён і зараз дасягае 10 м вышыні, мае перад сабой абарончы роў, які даходзіў у паўднёвай частцы да 12 м, у заходняй — да 6 м глыбіні. Пляцоўку падзамка (170×100 м) паўкруглай формы таксама абкружаў вал вышынёй да 7 м. З напольнага боку ад астатняй часткі берагавога плато яна адрэзана дугападобным ровам [74]. За ім, абдымаючы ўмацаванні з поўначы, захаду і ўсходу, размяшчаўся сярэдневяковы горад, які жыў своеасаблівым жыццём парубежнага паселішча.

Познія беларуска-літоўскія летапісы паведамляюць, што пасля таго, як сын князя Міндоўга Ердзвіл заняў Друцк, горад з XIII ст.

увайшоў у склад Вялікага княства Літоўскага[75]. У 1396 г. у разгар барацьбы за вялікакняжацкі пасад між Свідрыгайлам і Вітаўтам дручане спачатку падтрымлівалі першага. Вітаўт «облег» Друцкі замак і прымусіў «княжат друцких с боярами своими» прынесці яму прысягу[76].

У 1506 г. крымскі хан Махмет-Гірэй, напаўшы на землі Цэнтральнай Беларусі, пусціў загоны пад Вільню, а таксама да Віцебска, Полацка і Друцка і «в Друцку много зла сотворил»[77]. Наваколле апошняга, напэўна, было спалена. Пазней, у 1508 г., калі пачаўся мяцеж М. Глінскага і да горада падышлі маскоўскія ваяводы, «князи друцкия здалися и з городом и крест целовали, что им служити великому князю московскому», упусцілі ў горад рускія войскі ваяводы В. Шамячыча. Аднак у 1509 г. «водлуг перемирья» Друцк зноў быў у складзе Вялікага княства Літоўскага, хаця адзін з князёў — Андрэй Друцкі — прыняў рускае падданства[78]. З тых часоў Друцк па частках належаў шматлікім



Друцк. Замчышча

прадстаўнікам князёў Друцкіх—Горскіх—Любецкіх, Талачынскіх. У 1514 г. горад быў разрабаваны рускімі войскамі. Гэта паўтарылася ў 1524 і 1535 г.[79]

У сувязі з частым упамінаннем у крыніцах XVI ст. тэрміна «друцкія палі» Л. В. Аляксееў выказаў меркаванне, што гэта «трэба разумець так, што крэпасць ужо не існавала» і што пачынаючы з XVI ст. Друцк вядомы, відаць, толькі як геаграфічная назва. Выказана таксама думка, што «горад, відаць, загінуў у час аблогі ад пажару ў канцы XV — пачатку XVI стагоддзя і больш не ўзнаўляўся»[80]. Аднак аналіз гістарычных крыніц паказвае, што такое меркаванне з'яўляецца дачасным, а тэрмін «друцкія палі» мае тлумачэнне. Сам жа Л. В. Аляксееў пераканаўча даказаў, між іншым, што Друцк узнік у гушчы старажытных паселішчаў, якія стаялі на волаку. Праз яго траплялі ў басейн Дняпра з заходняй Дзвіны[81]. Акрамя таго, горад зручна размяшчаўся на перасячэнні важных гандлёвых шляхоў на ўсход (Смаленск, Маскву), на поўнач (Полацк, Віцебск, Пскоў, Ноўгарад), на захад (Менск, Вільня, Кралявец, Варшава), на поўдзень (Чарнігаў, Кіеў). Раўнінная паверхня вакол Друцка[82], улічваючы гушчыню тут курганных могільнікаў, яшчэ ў старажытнасці пазбавілася лясоў, што прывяло да непазбежнага разворвання ўсёй навакольнай тэрыторыі. У канцы XV — пачатку XVI ст. Друцк апынуўся не так на скрыжаванні гандлёвых шляхоў, як на скрыжаванні дарог, якімі сюды прыходзілі частыя і разбуральныя войны.

Да Друцка рознымі шляхамі дабіралася войска Вялікага княства Літоўскага, каб бараніць усходнія гарады дзяржавы. І наадварот, войскі Маскоўскай дзяржавы, дабраўшыся да Друцка, маглі рухацца на Бела-

русь у трох напрамках, кантралюючы адначасова і шляхі адыходу. Ваколіцы Друцка — «друцкія палі» былі зручнымі для канцэнтрацыі і прывядзення ў належны стан вялікай колькасці войскаў, якія размяшчаліся ля стратэгічна важнага скрыжавання. Яно дазваляла зрабіць патрэбны тактычны манеўр, адкрывала дарогу для аператыўнай прасторы. Усё гэта бачылі і выкарыстоўвалі маскоўскія і беларуска-літоўскія ваяводы. Летапісцы фіксуюць рускія палкі «на друцкіх палях» у 1514 г. колькасцю «осьмдесять тысяч» напярэдадні вядомай Аршанскай бітвы [83]. Яны зафіксаваны ў 1524 г. у дакументах, якія паведамлялі, што «неприятель московитин собирался идти под Витебск, и под Кричев, и Оршу, або под Могилев, або под Дубровну, а тым замки обогнавши, ити бы имели к Друцким полям, делаючи шкоду панству нашому, чого же им Боже не помози» [84].

«Стягнутися на полях Друцких» павінны былі ў разгар Лівонскай вайны ў 1564 г. пасланыя Іванам IV 80 тыс. войску ваяводы П. Сярэбранага з 50 «тысячмя комонников» ваяводы П. Шуйскага. Праз два гады, у 1566 г., на Святую Тройцу тут збіралася войска Вялікага княства Літоўскага для таго, каб прадоўжыць вайну з «Масквою» [85]. Жыць на такім бойкім і багатым на ваеннае ліхалецце месцы было цяжка. Напэўна, не выпадкова назваў гэту мясцовасць С. Герберштэйн, які праязджаў тут у 1517 і 1525 гг., раёнам «найвялікшых пустынь» [86]. Аднак жыццё ў гэтых «пустынях» усё ж цеплілася вакол Друцкага замка. Як і сам Друцк, замак працягваў існаваць. У 1544 г. дакументы зафіксавалі часткі «держанья» князя В. Ю. Талачынскага: «... в замку Одруцку, которые части мне пришли от братьи моей, тых частей моих 1/3 часть в замку Верхнем и в Нижнем городище и на месте (г. зн. у горадзе.— *М. Т.*) у дворищах мещанских, и в огородах, и в землях пашных тых же дворищ мещанских». Звесткі пра Горны і Дольны замкі ёсць за 1545 і 1549 гг. [87] У 1558 г. П. Б. Храптовіч прадаў Рэчыцкаму дзяржаўцу і старасту Любашанскаму, маршалку гаспадарскаму Анікею Гарнастаю «за 200 коп грошей литовских монеты и личбы Дудаковичи и Горы и часть держанья в замку Друцком» [88]. Складзенае, відаць, у канцы XVI ст. «Списанье замку Друцкого» называе яшчэ некалькі князёў і паноў, якія мелі тут свае часткі «держанья» — Багдан Езярэцкі, староста Ашмянскі, князі Любецкія з панам Харлінскім, князі Сакалінскія і паны Падбярэзскія. Дакумент таксама называе навіннасці навакольных сёл Дудаковіч, Сакольні, Талачына, Круглага, Канаплян, Коханава, Сянно, Расчына, Васілевіч, якія выканалі сваю частку «городовой работы» і шукалі ў ваенны час выратавання ў Друцкім замку, дзе ў іх меліся свае гародні. Ясна, што друцкія ўмацаванні будавалі залежныя сяляне, але канкрэтна колькі, чаго і з якіх сёл «Списанье» не называе. Згодна інвентару, яны ўзводзілі Верхні («Горни») замак Друцка, дзе тады стаялі дзве вежы, у тым ліку і вежу-браму, 80 гародняў і між імі два дамы [89].

Апісанне Друцкага замка можна знайсці ў «Хроніцы Еўрапейскай Сармацыі», выдадзенай А. Гваньіні, які ў 1558—1583 гг. быў камендантам віцебскіх земляў. «Одручка-замак на гары высокай, драўляны, калісьці быў княствам, цяпер многа шляхты рускай тытул гэтага княства ўжываюць» [90]. Урэшце, на картах 1562, 1589, 1595 і 1613 гг., выданых у Заходняй Еўропе, пастаянна паказваўся ўмоўным значком замак «Одручк», які існаваў тады рэальна [91].

Заняпад Друцкага замка адбыўся, верагодна, каля сярэдзіны XVI ст. Ва ўсякім выпадку ў дакументах перыяду вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. ён не ўпамінаецца. І. Г. Корб, які быў у Друцку

ў самым канцы XVII ст., пазначыў у сваім дзённіку: «Говорят, что в прошлом столетии этот город имел 7 миль в окружности и славился 200 знаменитых храмов, но во время ожесточенной войны... подвергался такому опустошению, что к нему можно применить то, о чем плачет поэт на развалинах Трои: где стоял Пергам — там теперь колосья» [92]. Гэтыя звесткі пра Друцк XVI ст., вядома, празмерна перабольшаныя, але канец гісторыі яго ўмацаванняў яны ўгадалі.

Шклоў

Раняя гісторыя сучаснага Шклова, які раскінуўся на берагах Дняпра пры ўпадзенні р. Серабранкі (Язоны, Шклоўкі, Шклавянкі), звязана з гарадзішчам «Гарадок» ля в. Стары Шклоў. Усе даследчыкі адзінадушна лічаць, што праўдзівай з'яўляецца народная легенда, якая сцвярджае, што горад узнік у гэтым месцы і знаходзіўся там да тых часоў, пакуль нейкія абставіны не прымусілі перанесці яго на 4 км бліжэй да Дняпра, на сучаснае месца. Некаторыя аўтары лічаць, што гэты акт здзейсніўся хутка пасля пажару 1668 г., які знішчыў горад [93]. Аднак аналіз усяго комплекса гісторыка-археалагічных матэрыялаў малюе іншую гісторыю і іншы лёс гэтага падняпроўскага беларускага горада.

Шклоў пачаў сваё існаванне на высокім і крутым беразе рэчкі Шклоўкі, там, дзе зараз захавалася гарадзішча «Гарадок». Загароджаная з напольнага заходняга боку высокім, да 7 м, земляным валам пляцоўка гарадзішча формы чатырохвугольніка (60×64×30×57) мае невялікі ўхіл з захаду на ўсход. Яна ўзвышаецца над водамі рэчкі, якая працякае ля падэшвы гары, на 15—17 м. З поўначы, усходу і поўдня дастаткова крутыя і высокія схілы пазбаўлялі жыхароў ад лішняй і працаёмкай фартыфікацыйнай работы. Шлях жа на гарадзішча ішоў па самаму краю пляцоўкі, кантраляваўся з верху абарончага вала. Параметры вала (шырыня ў аснаванні да 20 м, на вяршыні — 4,5—5 м) дазвалялі тут размяшчаць як абарончыя сцены, так і вежы. Пазней, у XVI ст., відаць, тут стаяла артылерыя.



План замчышча ў Старым Шклове

Археолагі даўно звярнулі ўвагу на гэта гарадзішча і сінхроннае яму селішча, дзе былі знойдзены як матэрыялы Кіеўскай Русі (XII—XIII стст.), так і больш позняга часу [94]. Можна з упэўненасцю гаварыць толькі пра канец XVI ст. як апошні этап існавання Старога Шклова. Першае ўпамі-

нанне пра яго сустракаецца ў 1535 г., калі войскі рускага ваяводы Шуйскага, спаліўшы ўсё вакол Шклова, спалілі і яго [95]. Да 1542 г. Шклоў належаў роду Гаштольдаў (Гастаўтаў), які хутка згас, а затым перайшоў да роду Хадкевічаў. Адзін з іх — Іеранім насіў тытул графа і называў свае валоданні вакол Шклова «графствам» [96]. З сярэдзіны XVI ст., з моманту пераходa горада да Хадкевічаў, яго лёс раздваіўся. Магнаты Хадкевічы, уладальнікі вельмі вялікіх зямельных латыфундый, людзі адукаваныя, якія добра разбіраліся ў тагачасным палітычным і гаспадарчым жыцці, не маглі не бачыць усіх выгод ад Дняпра, што працякаў праз іх валоданні. Гэтая важнейшая гандлёвая артэрыя, відаць, навяла іх на думку стварыць непасрэдна на беразе магутнай ракі новае паселішча, якое атрымала ў спадчыну добра вядомую ў акрузе і за яе ваколіцамі назву «Шклоў». Абодва паселішчы некаторы час існавалі сінхронна. Каб іх адрозніць, ужываліся назвы «место Шкловское» для новага горада і «Старый Шклов» для ранейшага радаслоўнага і гістарычнага гнязда [97]. Дзесьці ў 70-х гадах XVI ст. амаль адначасова з Магілёвам Шклоў атрымаў магдэбургскае права. «Бурмистр места Шкловского Исай Зенович» называецца ў дакуменце 1577 г. адначасова з войтам, радцамі і лаўнікамі [98]. У той жа час згадваюцца і прадстаўнік адміністрацыі Старога Шклова «подвойский старо-шкловский Ермак Митковичъ», і пушкар Анікей старашклоўскі [99].

Хоць Шклоў і знаходзіўся ў баку ад старой ваеннай дарогі Дуброўна—Орша—Менск—Вільня, аднак войны наведвалі і яго. У 1562 і 1580 гг., у час Лівонскай вайны, яго двойчы спалілі рускія войскі [100]. Калі пасля 1562 г. Стары Шклоў як горад яшчэ згадваецца, то пасля 1580 г. ён знікае са старонак дакументаў. Спачатку жыццё «на два Шкловы», відаць, задавальняла іх уладальнікаў. Пад апекай Старога Шклова новае «место Шкловское» паступова расло і развівалася, ператварыўшыся ў адзін з буйнейшых гарадоў Беларусі. Знішчэнне іх у час Лівонскай вайны ў 1580 г. зняло дылему пра два Шкловы. Хутчэй за ўсё было вырашана Стары Шклоў не аднаўляць, а засярэдзіць усю ўвагу на новым горадзе. З гэтага часу гісторыя ўжо пісалася толькі для сучаснага Шклова, удала размешчанага на ажыўленай сухапутнай і воднай гандлёвай дарозе. Знаходзячыся ў цэнтры густанаселенага рэгіёна, дзе пераважала грашовая рэнта і была слабай фальварачная гаспадарка, Шклоў да таго ж стаў рэдкім прыватнаўладальніцкім горадам, дзе адсутнічала мытная камора. Гэта прываблівала замежных і мясцовых гандляроў і давала вялікія прыбыткі ўладальніку горада і яго магістрату.

Тэрытарыяльнаму, эканамічнаму росту і ваеннай магутнасці горада таксама садзейнічала моцная ўлада гарадскога самакіравання, якое стрымлівала рост у Шклове рознага рода юрыдык — неад'емных атрыбутаў дэцэнтралізацыі. Таксама як і ў Магілёве, тут да юрыдык адносіліся ў першай палове XVII ст. толькі 2% дамоў, праз стагоддзе — толькі 6,5%. У той жа час у Полацку ў першай палове XVII ст. іх было каля 25%, у Віцебску — каля 70%. Сіла магістрата заключалася ў асаблівых, галоўным чынам грашовых, узаемаадносінах паміж Шкловам і ўладальнікамі графства, якім шклавяне служылі грашыма як формай аплаты за арэнду, займаліся арганізацыяй крэдытаў у багатых віленскіх і рускіх купцоў. Своеасаблівы лібералізм да Шклова атрымаў адбітак у асабістых адказах уладальнікаў на суплікі шклавян і ў абароне ад злоўжыванняў адміністратараў. Усё гэта прывяло да таго, што ў першай палове XVII ст. эканоміка Шклова квітнела. Ён займаў сёмае месца

па памерах і колькасці жыхароў пасля Вільні, Магілёва, Бярэсця, Слуцка, Менска і Полацка [101].

Горад развіваўся пад абаронаю магутных умацаванняў, умела былі выкарыстаны штучныя і прыродныя водныя рубяжы. З усходу горад надзейна прыкрываў Дняпро, які і цяпер дасягае шырыні больш за 150 м. З поўдня і захаду, дзе працякала р. Шклоўка, дзякуючы дамбе з плацінаю ўзнікла вялікае возера. Яно прыкрывала Шклоў і яго новы замак, што стаяў на мысе ля зліцця рэк. Згодна інвентару 1643 г., яго абарончы роў запаўняўся вадой р. Шклоўкі, названай у дакументе «ракою Язонаю». Праз раку быў перакінуты мост на «ізбіцах», які падводзіў да брамы з «узводам» — пад'ёмным мостам «на чопах жалезных з рэфамі жалезнымі». Увесь пабудаваны з дрэва замак з аднаго боку ад ракі прыкрываў паркан, з другога боку — вастракол. Горад абкружаў магутны земляны вал, на якім стаяў «паркан из дерева, построеный избицами, с баштами и брамами» [102]. Гэтыя сведчанні дапаўняюцца дадзенымі з падарожных запісак князя Багуслава Радзівіла, які наведаў у 1647 г. Шклоў і адзначыў у Шклоўскім замку наяўнасць дзвюх вежаў. Да гэтага неабходна дадаць і замкавую браму інвентару 1643 г., усе чатыры брамы горада — Капыскую, Магілёўскую, з Галоўчына, Астроўскую [103].

Толькі з аднаго паўночнага боку Шклоў не меў натуральных умацаванняў, таму тут, акрамя землянога вала, быў змайстраваны абарончы роў. За яго межамі знаходзілася прадмесце Заперакопскае. Напярэдадні вайны Расіі з Рэччу Паспалітай у 1654—1667 гг. Шклоў уяўляў сабой вялікі горад, які меў шэраг прадмесцяў — Аршанскае, Шклоўскае, Рышкоўскае, Заперакопскае і самае шматлюднае — Задняпроўскае. У 1650 г. з агульнай колькасці 1220 дамоў жыхароў і агульнай колькасці 8540 чалавек шклоўскага насельніцтва тут жыло ў 405 дамах 2835 жыхароў [104].

Як і ва ўсіх іншых беларускіх гарадах, якія мелі магдэбургскае права, у Шклове ўсё дарослае мужчынскае насельніцтва было ўзброена і згрупіравана ў сотні, якіх па інвентару 1643 г. было 11, у тым ліку чатыры ў Задняпроўскім прадмесці. Сотні дзяліліся на дзесяткі [105].

Са жніўня 1654 г. у ходзе вайны Расіі з Рэччу Паспалітай Шклоў апынуўся ў гушчы ваенных падзей. У пачатку месяца над горадам адбылася бітва паміж войскамі гетмана Януша Радзівіла і рускага ваяводы Я. І. Чаркаскага. Радзівіл прайграў бітву і адступіў да Барысава [106]. Да асады Шклова тады справа не дайшла. Яна пачалася толькі 20 жніўня пасля прыходу сюды войскаў ваяводы А. Н. Трубяцкога. Ён спачатку спрабаваў выкарыстаць капыскага мешчаніна Г. Паўлава, які прысягнуў цару і «спецыялізаваўся» на «размовах» з жыхарамі абложаных гарадоў наконт здачы іх рускім войскам [107]. Г. Паўлаў быў «на разговоре под Шкловом дважды с полковником солдатским с Иваном Морсовым». Двойчы ў іх стралялі з гарадскіх сцен. У чалабітнай цару ён паведамляў, што яго «... твоим государевым счастьем не убили, только за мною убили солдата». Пасля гэтага Г. Паўлаў «привозил, купивши, деготь и смолу, и серу на приступ под Шклов и пеньку» [108].

Пасля няўдалых перамоваў ратным людзям 26 жніўня загадана было браць Шклоў «зажогом и приступом и шкловские... сидельцы выдержали над собою... ратных людей промысел и из крепости не отступили» [109]. У другім данясенні ад 4 верасня А. Н. Трубяцкі піша цару, відаць, яшчэ пра адзін прыступ 27 жніўня: «августа 27 числа приступали они к Шклову. И в те поры шкловцы в осаде отсиделись. После тово



План умацаванняў Шклова сярэдзіны XVII ст. Рэканструкцыя аўтара. Вежы: 1 — Раб коўская, 2 — сяла Дзіўнага, 3 — Глухая, 4, 13, 14 — Падлазныя, 5—12, 19—20 — бастыёны-«вывады», 15 — Тайнічная, 16, 18 — Вы вадныя, 17 — Казлоўская, 21—24 — Шклоўскага замка; а — мерніца, б — двор ксяндза. Брамы: А — Дняпроўская (Копыская), Б — цес ная, В — Магілёўская, Г — Пясочная (Галоў-чынская), Д — замак

приступу велели делать шанцы к городу близко того городу и в город по хоромам из наряду и из ружья велели стрелять беспрестанно и тесноту городским людям учинили большую и к приступу со всем изготовились»[110]. Абстрэл горада працягваўся. Нягледзячы на тое што ўсе жыхары прадмесцяў перайшлі пад абарону ўмацаванняў, шматдзённы абстрэл горада і нават прыступ каштавалі шклоўцам усяго восем чалавек забітых. Пасля дэбатаў магістрат Шклова прыняў рашэнне здаць горад. 31 жніўня «шкловцы не дожидая другова приступу, государю добили челом и город здали и бояре и воевода в город с ратными людьми вошли»[111].

Тады ж умацаванні горада былі ўпершыню агледжаны, падноўлены і апісаны царскімі ваяводамі: «С приходной стороны, с севера выкопали новый ров и поставили надолбы, которые шли от Днепра до Заугольной башни». Агульная даўжыня гарадскіх умацаванняў раўнялася 1050 сажняў. Сярод умацаванняў называецца і тайнік[112].

Паўторна апісанне абарончых збудаванняў Шклова было зроблена даволі падрабязна ў 1657 г. ваяводам І. М. Талачанавым. Згодна з гэтым вопісам, горад абараняўся 26 драўлянымі вежамі розных памераў і рознай канструкцыі. З іх уласна вежаў было 14, у тым ліку тры брамы. Праўда, назва гарадскіх брам адрозніваецца ад назваў 1647 г. Так, брама Капыская названа «Днепровскими проезжими воротами», брама Астроўская — «башней Тесной», Галоўчынская — «Песочной» і толькі Магілёўская брама захавала сваю назву. Астроўская брама наогул не названая, але ёсць праезжая вежа Цесная. Гэта, відаць, адно і тое ж. Дзейнічалі толькі двое варотаў: Дняпроўскія (Копыльскія) і Пясочныя (Галоўчынскія). Магілёўскія вароты былі наглуха засыпаны зямлёй. Найбольшай магутнасцю выдзяляўся ўсходні напольны бок абароны, якая цягнулася ад вусця Шклоўкі ўверх, уздоўж правага берага Дняпра. Тут мелася 8 вялікіх і 8 малых вежаў — «выводов»[113].

Вежа «Угорская Рябковская», якая знаходзілася на мысе пры зліцці рэк, была чатырох'яруснай, з трыма «мостами», рубленая ў «две стены». Аснову вежа мела четырохвугольную, з узроўню другога яруса пераходзіла ў васьміграннік, зроблены «в одну стену». Далей, уверх па Дняпру, ішло прасла сцяны даўжынёй у 55 сажняў (117,3 м.—*М. Т.*), якое падводзіла да «мерницы» (верагодна, «важніца».— *М. Т*), за якой прасла ў 107 сажняў даўжынёй (2228,3 м) упіралася ў вежу «села Дивного». Гэта была пабудова, зрубленая ў восем вуглоў з двума мастамі. Даўжыня аднаго яе боку раўнялася 4,5 сажня (каля 9,6 м), страха была васьміскхільная[114].

Ад гэтай вежы «звено города» у 32 сажні (62,2 м.— *М. Т.*) падходзіла да Дняпроўскай (Капыскай) брамы, якая, безумоўна, выдзялялася сваімі памерамі сярод астатніх вежаў горада. Яна мела страху ў чатыры схілы, чатыры «моста», г. зн. пяціярусная, знізу чатырохвугольная, з другога яруса — васьмівугольная. Даўжыня сцяны ў аснаванні дасягала 6,5 сажня (13,7 м). На другім паверсе брамы размяшчалася палкавая гармата. Калі прыняць сярэднюю вышыню кожнага яруса за 4 м, вышыня яе разам са страхою дасягала не менш за 25 м.

За Дняпроўскімі варотамі ўверх па рацэ ішло прасла сцяны ў 30 сажняў (каля 64 м), якое змыкалася з глухой чатырохвугольнай вежай. Сцяна яе была «мерою 3 сажня без полуаршина» (каля 6,0 м). Яна была «ниская, мосту ни одного нет», вынесена «за город», накрытая чатырохсхільнай страхой. Далей, на адлегласці 67 сажняў (каля 143 м) стаяла над Дняпром шасцівугольная чатырох'ярусная Падлазная вежа.

У ёй меліся «воротечка подлазные», якія пры неабходнасці скрытна выводзілі да берага ракі. Даўжыня адной грані вежы дасягала 3 сажняў (каля 6,4 м) [115].

Далей на ўчастку абароны горада даўжынёй у 242 сажні праз прамежкі ў 25—36—28—24 сажні размяшчалася восем невялікіх чатырохвугольных вежаў — «выводов» у асноўным памерам 2×2 сажні (4,26×4,26 м). Толькі адна мела трохі большыя памеры (5×5 м). Як правіла, яны былі трох'ярусныя, на іх размяшчаліся гарматы. Дакумент адзначае, што яны выступалі за лінію сцен — «за город же, к Днепру», г. зн. вялі фланкіраванне сцен. Два «вывода» былі здвоены і абодва «с ряду рублены тако ж, яко и городовая стена». Яны мелі падэшвенны бой, з боку ракі іх абараняў «прислон стоячий». На адлегласці 69 сажняў (каля 147 м) ад гэтых вывадаў размяшчалася адна Падлазная вежа, за ёй праз 64,5 сажня (137,5 м) — другая. Абедзве вежы мелі аднолькавыя памеры і канструкцыйна былі падобныя: чатырохвугольныя ў аснаванні памерам 3×3 сажні (каля 6,4×6,4 м), трох'ярусныя, з двума «мостамі», мелі падлазныя вароты да Дняпра. На адной з іх стаяла жалезная «гроховница». «Звено города» у 60 сажняў (каля 128 м) заканчвала прыдняпроўскую лінію абароны, змыкалася на павароце вала на захад з вуглавой Тайнічнай вежай. Яе памеры 3,5×3,5 сажня (7,1×7,1 м). Па тайніку можна было спускацца за вадой да Дняпра [116]. Заходні ўчастак абароны Шклова меў працягласць 124 сажні (264,5 м) і ўключаў ў сябе, акрамя вуглавой Тайнічнай вежы, яшчэ тры вежы — Цесную, Выводзячую і Казлоўскую. Цесная вежа была пастаўлена блізка да Тайнічнай, стаяла ад яе ўсяго толькі на 3,5 сажня (7,1 м) і, верагодна, з-за такога размяшчэння атрымала сваю назву. Але гэта была, відаць, прадумана створаная «цесната» з тым, каб агнём з вежы абараняць жыццёва важны ўчастак абароны, які даваў выхад да вады. Да таго ж яна раней была праезжай, але вароты ў 1657 г. наглуха засыпалі зямлёй. Напэўна, і Тайнічная вежа ў сваю чаргу дапамагала ў абароне варотаў горада, фланкіруючы подступы да яе. Цесная вежа была ў плане квадратнай памерам 3,5×3,5 сажня (7,1×7,1 м), але з другога паверха пераходзіла ў васьмігранник. На ёй стаялі тры жалезныя пішчалі — «гроховницы». Наступная вежа заходняга ўчастка абароны горада Вывадная стаяла ад Цеснай на адлегласці 53 сажні (103 м). Яна мела ў аснове чатырохвугольнік памерам 3×3 сажні (6,4×6,4 м), тры ярусы боя, а таксама «бой земляной, спущенный ниже городовой стены». Вежу моцна высунулі за лінію сцен («...и та башня выведена за город»), што, верагодна, і паслужыла повадам для яе назвы. У ёй размяшчалася пішчаль і адна «гроховница». Апошняе звяно горада, якое дасягала даўжыні 51 сажань (108,7 м), падводзіла да вялікай вуглавой Казлоўскай вежы. Знізу да верху вежу зрубілі васьмігранай. Даўжыня аднаго боку 6 сажняў (12,8 м). Вежа мела два «масты», г. зн. была трох'яруснай. Ад Казлоўскай вежы пачынаўся і ішоў у бок Магілёўскіх варотаў тайнік з двайнымі дзвярыма. На вежы «на верхнем мосту» знаходзіліся «пищаль и гроховница» [117].

Ад Казлоўскай вежы лінія гарадскіх умацаванняў паварочвала на поўдзень і ішла ўздоўж «Высокага поля», затым уздоўж вялікай сажалкі на р. Шклоўцы на працягу 23 сажняў (49 м). Вежа стаяла на бастыёне — гарматным вывадзе з трыма гарматамі. Адлегласць ад Казлоўскай вежы да суседняй Магілёўскай (Крывой) брамы (праезжай вежы) займала гарадская сцяна даўжынёй 70 сажняў (149 м). Магілёўская брама, у той час засыпаная зямлёй, была чатырохвугольная ў плане памерам

5×5 сажняў (10,6×10,6 м), двух'ярусная, з двума варотамі. З узбраення тут мелася «пушечка полковая медная».

У інвентары нічога не гаворыцца пра тое, як маглі раней трапляць у Магілёўскую браму, аднак той факт, што перад умацаваннямі размяшчалася сажалка, дазваляе дапусціць, што перад ёй меўся мост.

Амаль побач з Магілёўскай брамай на адлегласці 5,5 сажня каля лініі гарадскіх сцен знаходзіўся «двор ксенжеский». Далей праз 40 сажняў (85,3 м) стаяла вежа Вывадная. Вопіс адзначае, як была ўладкавана абарончая сцяна на гэтым адрэзку: «а рублен тот город от ксенжеского двора не по городовому в одну стену, а в стене бывали избицы ксенжеские» (верагодна, гародні.— *М. Т.*). Вывадная вежа была чатырохвугольная памерам 3,5×3,5 сажня (7,4×7,4 м), моцна выступала за перыметр сцен («выведена за город к пруду»), мела пад сабой «земляной бой» [118].

Далей ішоў адрэзак сцен даўжынёй у 44 сажні (каля 94 м), «вывод» (9,5×9,5 м) з меднай гарадавой гарматаю на ім і зноў адрэзак сцяны ў 40 сажняў (85 м), які прымыкаў да магутнай Пясочнай вежы — праезжых варотаў. Відаць, гэта Галоўчынская брама. Яна была значных памераў, у плане шасцігранная пры даўжыні адной грані ў 6 сажняў (каля 12,8 м). З вышыні ніжняга «моста» вежа пераходзіла ў васьмярык. Усяго ў ёй было чатыры «моста», г. зн. пяць ярусаў. Гэта збліжае яе з Дняпроўскай брамай, аднак ёсць між імі і розніца: вакол Пясочнай брамы былі пароблены «перила» — кругавая баявая галерэя на ўзроўню другога яруса, дзе размяшчаліся гарматы. Вежа мела васьмісхільнае пакрыццё [119]. Подступы да вежы праз сажалку ішлі, верагодна, па мосце.

За Пясочнай вежай ішоў у 80 сажняў (170,5 м) адрэзак сцяны, што падыходзіў да Шклоўскага замка, апісання якога няма. Называецца толькі «звено города от угла до угла» даўжынёю ў 25,5 сажня (54,4 м). Не ясна, сутыкаліся сцены замка са сценамі горада ці іх падзяляў роў, што верагодней за ўсё, але далей зноў працягваліся гарадскія ўмацаванні — 30 сажняў (каля 64 м) сцен і «вывод». Пад ім меўся закрыты наглуха тайнік. Згодна вопісу, дадзены «вывод» уяўляў сабой адрэзак сцяны, магчыма, і бастыён, які размяшчаўся каля Рабкоўскай вежы, працягласцю ў 25 сажняў і 2 аршыны і, відаць, знаходзіўся блізка да вады. Зрублены гэты «вывод» быў «по городовому», г. зн. у дзве сцяны. Ён злучаўся з вуглавой «Угорскай» (Рабкоўскай) вежай «у мельницы по конец пруда» [120].

Як відаць з вопісу 1657 г., Шклоў сапраўды быў буйным горадам, агульная даўжыня ўмацаванняў якога перавышала 2,25 км. Па ўсяму гораду на сценах стаялі «кобылины на вертлюгах» — цяжкія мушкеты, якія стралялі буйным шротам і сечаным жалезам. Мелася таксама 20 палкавых гармат, 20 грахоўніц, 93 пішчалі заціпных, пушкеты і ручніцы з запасам ядраў, куль, волава і свінцу [121]. Зусім відавочна, што акрамя праязных, глухіх і невялікіх вежаў — «выводов», тут меліся і вывады зусім другога тыпу — «выводы пушечные» — бастыёны, якія звычайна прыкрывалі вялікія вежы ля іх падножжа. Асабліва гэта датычыць вуглавых вежаў — Тайнічнай, Казлоўскай і Угорскай (Рабкоўскай).

У час ваенных дзеянняў 1654—1667 гг. Шклоў не раз трапляў у эпіцэнтр вайны. Пасля поспехаў войскаў Рэчы Паспалітай зімой 1654/55 года ён быў адным з нямногіх падняпроўскіх гарадоў Беларусі, якія засталіся ў руках рускіх войскаў, і ператварыўся ў буйную ваенную базу. Сюды перавозілі артылерыю і боепрыпасы з Копысі, пазней поўнасцю спаленай. Між тым у пачатку студзеня 1654 г., у перыяд актыўных дзе-

янняў войскаў Рэчы Паспалітай, ваяводы паведамілі цару, што «шкловцы, государь, по распросным речам... к литовским людям от себя писали же, что они хотят Шклов город здать»[122]. Але справа да гэтага тады не дайшла ў сувязі з поспехамі рускіх войскаў. Летам 1655 г. тут знаходзілася царская стаўка. У кастрычніку 1660 г. войскі Сапегі, Палубенскага і Чарнецкага, не без згоды гараджан, лёгка авалодалі Шкловам, пакінуўшы тут усяго 200 драгунаў на чале з капітанам. Відаць, адной з прычын хуткага захопу Шклова паслужыў вываз адсюль рускімі войскамі амаль усёй артылерыі. 20 чэрвеня 1660 г. тут налічвалася ўсяго «9 пищалей средних, 5 пищалей полковых в станках, пищаль небольшая на вертлуге». З прыходам войска Сапегі артылерыйскі парк павялічыўся.

Князь Ю. Даўгарукі двойчы пісаў лісты да войта, бурмістраў, райцаў, лаўнікаў і мяшчан, «чтоб они, оставя ляцкие прелести, ...город Шклов нам сдали вскоре безо всякого кровопролития». У выпадку адмовы абяцаў, што за гэта «учинится им какое кровопролитие, и то им будет самим от себя»[123]. 11 лістапада 1660 г. да горада падступіла войска П. А. Даўгарукага і М. Рцішчава. У данясенні цару адзін з ваявод пісаў пра свае дзеянні: «... учиня шанцы, велел стрелять из пушек и всякие промыслы чинить опричь приступу, призывая сдаваться». Аднак «шкловские осадные де сидельцы почали слободы жечь и вышли на вылазку по сю сторону реки Днепра многие люди и русские изменники, и с твоими ратными людьми был бой с 2-го часа дня 6 час, ... и твои ратные люди многих шкловцев на той вылазке побили и переранили и в город прогнали, и в слободах многих дворов выжечь не дали, и в шкловской де слободе почали строиться обозами твои ратные люди и делать шанцы»[124]. Пасля сутыкнення на левым беразе Дняпра супраць Шклова войскаў рускіх ваяводаў з войскамі Рэчы Паспалітай на чале з Ліпніцкім і Баброўніцкім апошнія адступілі назад у горад. Наколькі ваяводам стала вядома, што шклоўцы, «жилецкие люди, осаду крепят и хотят сидеть в осаде накрепко», яны адступілі да Магілёва[125]. Дзеянні шклоўцаў прывялі да рашэння караля і сейма Рэчы Паспалітай у 1661 г. даць «...мяшчанам шклоўскім... генеральную амністыю (за здачу горада ў 1654 г.— *М. Т.)* і на 4 гады вызваліць ад падаткаў за выключэннем падатку салянога, чопавага і мыта старога»[126].

У тым жа годзе быў зноў састаўлены пасля працяглага перапынку інвентар замкаў у Шклове. З яго вынікае, што за перыяд вайны ў структуры ўмацаванняў змен амаль не адбылося і апісанне іх у асноўным ідэнтычна інвентару 1643 г.: тут былі кругавы вал з драўлянымі сценамі і вежамі вакол горада і замак з яго ўмацаваннямі. Пасярод замка стаяла высокая драўляная вежа, з якой вёўся абстрэл навакольля. Са зброі названа 12 гармат, тры з якіх пашкоджаныя, адна марціра вялікая і 20 малых, 183 гакаўніцы, 44 гранаты рознага калібру, запас пораху і інш.[127]

У 1666 г., выкарыстаўшы напружаныя палітычныя абставіны ў Рэчы Паспалітай, выкліканыя паўстаннем Е. Любамірскага супраць караля, Расія перапыніла мірныя перамовы і зноў пачала ваенныя дзеянні. Летам 1666 г. рускія войскі пад камандаваннем Я. К. Чаркаскага, І. С. Празароўскага, І. А. Варатынскага занялі Шклоў і Копысь, паспрабавалі ўзяць Магілёў, але былі адбіты. Шклоўскую шляхту па загаду цара саслалі ў Казань[128]. Між тым вайна закончылася Андрусаўскім перамір'ем. Вынік яе для Шклова быў сумным. Інвентар 1661 г. зафіксаваў, што з 1220 дамоў, якія былі ў горадзе ў 1650 г., да 1661 г. захавалася толькі 490, а насельніцтва зменшылася з 8540 да 4375 чалавек. Да 1693 г.

колькасць жыхароў узрасла да 7210 чалавек, але Паўночная вайна, якая затым пачалася, зрабіла сваю справу. У 1715 г. тут налічвалася толькі 6210 жыхароў [129].

Магілёўская хроніка сведчыць, што ў 1690 г. у Шклове адбыўся моцны пажар, які знішчыў «амаль увесь замак і вялікую вежу», а таксама гандлёвыя лаўкі і фарны касцёл [130]. Аднак умацаванні яго былі пазней адноўлены і Шклоў лічыўся ў канцы XVII ст. моцнай парубежнай крэпасцю, губернатарам якой быў І. Модлак, ураджэнец Гданьска [131].

У час пажару 1769 г. у горадзе згарэла 300 дамоў [132]. Пасля гэтага адбылася грандыёзная перапланіроўка горада, якая, відаць, закранула таксама лініі гарадскіх умацаванняў. Сведчанні XVIII ст. паведамляюць, што тады гарадскія ўмацаванні складаліся з вала, пяці драўляных вежаў і сямі рэдутаў. Агульная даўжыня гарадской фартыфікацыйнай лініі складала каля 2750 м [133]. Рэшткі гэтых умацаванняў існавалі да канца XVIII ст., часткова захаваліся і мелі значэнне яшчэ ў пачатку XX ст.[134] Зараз у прыдняпроўскай частцы горада яшчэ відаць сляды бастыённых умацаванняў.

Цяцерын

Паселішча згадваецца ў «Списке русских городов дальних и ближних» [135]. Сярэдневяковы Цяцерын размяшчаўся на высокім правым беразе р. Друці. Мысовая пляцоўка гарадзішча пазней атрымала авальную форму. Яе памеры 65×50 м. Па перыметру яна абкружана кальцавым валам вышынёй да 2—2,5 м і шырынёй у аснове да 10 м. У паўночна-ўсходняй частцы гарадзішча ў разрыве між валамі захаваліся рэшткі



Цяцерынскае замчышча

ўезда, які ішоў, гледзячы па ўсяму, па яго ўсходняму схілу. Тут, у разрыве ўмацаванняў, стаяла варотная вежа (брама).

Ад астатняга плато гарадзішча аддзялялася абарончым ровам і земляным выгнутым валам. Помнік датуецца XI—XIII стст.[136] Ёсць і больш познія матэрыялы.

У XIV—XVII стст. на пляцоўцы замкавага двара і на абарончым вале размяшчаліся збудаванні драўлянага замка Цяцерына. У розныя гады вялікія князі аддавалі яго ў трыманне розных феадалаў. Так, у 1430 г. ён быў аднесены да валодanняў князя Свідрыгайлы. З 1501 па 1513 г. ім пажыццёва валодала вялікая князёўна Алена. Да 1523 г. Цяцерын знаходзіўся ў руках князя М. І. Мсціслаўскага, а затым увайшоў у склад аграмадных валоданняў каралевы Боны [137].

Апісанні ўмацаванняў замка не захаваліся. Аднак агульная планіроўка яго ўмацаванняў дазваляе бачыць у ім радавы замак сярэдневяковуя з традыцыйнымі драўлянымі і навальнымі канструкцыямі, дзе ў лініі гародняў маглі стаяць тры—чатыры вежы разам з варотнай. Сведчанняў пра замак больш позняга часу таксама не захавалася.

Галоўчын

Паселішча Галоўчын размяшчалася ў сярэднія вякі ў 30 км на паўночны захад ад Магілёва на правым беразе р. Бабіч і займала тэрыторыю вакол умацаванага замка. Замак гэты быў узведзены на гары з акруглай верхняй пляцоўкай дыяметрам да 30 м. Час яго ўзнікнення датуецца XIV ст.[138] У 1501 г. Галоўчын быў падараваны вялікім князем Аляксандрам сваёй жонцы Алене і трапіў на старонкі гістарычных дакументаў. У 1585 г. ён дасягнуў статуса «места», якое ўжо было абнесена ўмацаваннямі. Ва ўсякім выпадку «Баркалабаўскі летапіс» пад гэтым годам называе ў ім «брону Остроговую» [139]. Цікава, што ў гэты час тут змайстравана сажалка, верагодна, на р. Вабіч, што значна ўскладняла подступы да замка.

Запіскі князя Б. Радзівіла, складзеныя ў 1647 г., даюць дадатковыя сведчанні пра ўмацаванні Галоўчына, дзе налічвалася тады пяць храмаў, дзве школы, і можна ясна прасачыць дзве лініі абароны: умацаванні «места», дзе выяўляецца яшчэ адна брама —«Быхаўская», і ўмацаванні замка з яго «вежамі замковымі» [140]. Аднак іх колькасць не называецца.

У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай у XVI ст. Галоўчын не-



Галоўчынскае замчышча



Бітва пад Галоўчынам. Гравюра XVIII ст.

калькі разоў разбуралі. У пачатку вайны, калі 12 жніўня 1654 г. рускія войскі А. Н. Трубяцкога выбілі адсюль войскі гетмана Радзівіла, не вытрымаўшы штурму, «Радзивилл со своими людьми побежал к Борисову, бояре и воеводы Головчин повоевали и посады выжгли, и народ поймали, и из Головчина пошли за Радзивиллом к Борисову»[141].

У канцы снежня 1654 г., калі пачалося контрнаступленне войскаў Рэчы Паспалітай, яны выбілі з Галоўчына рускі гарнізон, занялі яго і абрабавалі, пакараўшы за тое, што яго жыхары прысягнулі рускаму цару[142].

У час Паўночнай вайны, у 1708 г., Галоўчын быў заняты шведскімі войскамі. Тут адбылася буйная бітва з рускімі войскамі пад кіраўніцтвам Рэпніна, якія пацярпелі паражэнне. Горад у час бітвы быў спалены[143].

Пасля гэтага ўмацаванні Галоўчына больш не аднаўляліся.

Баркулабава

Да ліку сярэдневяковых гарадоў, якія мелі ўмацаванні, адносіцца і Баркулабава — паселішча, закладзенае каралеўскім ротмістрам, старастам і войтам дзісненскім Баркулабам Іванавічам Корсакам у 1564 г. і названае яго імем. Баркулабаўскі летапіс паведамляе, што спачатку быў закладзены замак «на лесе глухом, на кгрунте лесном, на врочищу, прозываевом Брус». Яго ўзводзілі разам з паселішчам, куды «закликавши на волю и давши слободы год дванадцать людям прихожим»[144].

Аднак, як паказваюць даследаванні, замак і горад заклалі на даўно абжытым чалавекам месцы — на гарадзішчы і селішчы эпохі Кіеўскай Русі. Забудовы замка занялі зручную ў тактычным плане мысавую пляцоўку на высокім беразе ля ўпадзення р. Стругі ў Дняпро. Пляцоўка гэтая памерам 95×57×58 м на 13 м узвышалася над поймай ракі і бы-



Баркулабаўскае замчышча

ла выцягнута ў напрамку поўнач—захад—поўдзень—усход. Па перыметру ўмацавання праходзіў вал з драўлянымі збудаваннямі. Ад астатняга плато гарадзішча аддзяляў роў шырынёй каля 20 м і глыбінёй да 4 м [145].

Новае паселішча было закладзена ў самы разгар Лівонскай вайны, якая закранула і Баркулабава. У 1597 г. яно ўжо дасягнула памераў і статуса «места» — горада. Станоўчае уздзеянне на яго развіццё аказвала блізкае суседства з Магілёвам, на гандлёвай дарозе да якога ён размяшчаўся [146]. У XVII ст. горад меў умацаванні, якія дазвалялі тут у час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай стаяць войску гетманаў Радзівіла і Гансеўскага [147]. Аднак ніякіх апісанняў умацаванняў не захавалася. Без сумнення, існавала і ваенная арганізацыя мяшчан, паколькі ў час гэтай вайны нават падданыя сяляне Баркулабаўскага манастыра колькасцю ў 300 чалавек былі ўзброены пішчалямі, рагацінамі і бердышамі [148].

Стрэшын

Паселішча Стрэшын у пісьмовых крыніцах сустракаецца ўпершыню ў канцы XIV — пачатку XV ст., а іменна ў «Списке русских городов дальних и ближних» [149]. Аднак археалагічныя даследаванні паказалі, што тут жылі людзі ў раннім жалезным веку, а таксама ў эпоху Кіеўскай Русі. Жыццё не спынялася і ў познім сярэдневякоўі.

Старажытнасці Стрэшына прадстаўлены двума помнікамі — мысавым гарадзішчам на высокім правым беразе Дняпра пры ўпадзенні р. Стрэшынкі, вядомым як «Стары замак», і тэрыторыяй сярэдневяковага пасада, так званага «Новага горада». Пляцоўка мысавага гарадзішча выцягнута ўздоўж правага берага Дняпра. Яна мае памеры 75×30 м і аддзелена ад астатняга плато з глыбокім ровам і высокім дугападобным валам. Ужо ў XII ст. тут стаяў невялікі феадальны замак, пад абаронай якога развівалася неўмацаванае паселішча. З канца XIV ст. Стрэшын, як і ўсё Беларускае Падняпроўе, увайшоў у склад Вялікага княства Літоўскага і быў аддадзены на ўтрыманне віленскім канонікам. З 1399 г. Віленская капітула валодала Стрэшынам і воласцю да далучэння гэтых зямель да Расійскай імперыі [150].

Развіццё Стрэшына ў XV—XVIII стст. укладваецца ў схему развіцця невялікіх уладальніцкіх гарадоў Беларусі, якія бачылі ўсю выгаду размяшчэння на вялікай суднаходнай рацэ і тыя праблемы, што прыносіла блізкасць да неспакойнага рускага парубежжа. У пачатку XVI ст. Стрэшын не раз цярпеў ад нападаў крымскіх татар, якія пад горадам панеслі паражэнне [151].

Яго планіровачная структура была традыцыйнай: замак—месца—двор. У канцы XV ст. Стрэшын лічыўся значным гандлёвым горадам Падняпроўя.

Аднак не мінула і яго полымя Лівонскай вайны. Ва ўсякім разе адзін з самых ранніх інвентароў Стрэшына — інвентар 1579 г. дае ўяўленне мястэчка ў 30 дамоў з драўляным замкам, у якім знаходзіўся гарнізон «жолнеров». Пяць двароў жыхароў лічыліся вольнымі, у тым ліку і двор «Кукуля-пушкара» з агародам. Яшчэ тут стаялі карчма і на р. Стрэшынцы «млын». Інвентар паказвае, што ў выніку вайны з-за галечы, рабаўніцтва і разбурэнняў «от жолнеров» Стрэшын разам з воласцю не змог выплаціць капітуле належныя 27 коп 9 грошаў літоўскіх.

Аднак пушкар Стрэшынскага замка атрымаў за сваю службу традыцыйныя 4 капы грошаў [152].

У 1587 г. у Стрэшыне ўжо налічвалася 67 служб, а ў арсенале замка знаходзіліся дзела, гакаўніцы, рушніцы, парахі, кулі [153]. Такія ж агульныя звесткі фіксуюць інвентары і за 1593—1595 гг. Толькі ў інвентары 1597 г. ужо больш падрабязна гаворыцца пра запасы пораху («фунтов 100 на 56 грошей»), салетры («фунтов 50»), серы, волава («каменя 4») ядраў і куль [154].

Паступовы рост Стрэшына і воласці, магчыма, і ўзмацненне эксплуатацыі насельніцтва паказвае сума прыбыткаў капітула, якая ўзрасла. У 1599 г. яна дасягала больш за 317 коп, але сам Стрэшын плаціў крыху болей за 88 коп [155].

Падзеі канца XVI — пачатку XVII ст. (паўстанні, войны) не садзейнічалі развіццю мястэчка. У 1608 г. тут было толькі каля 50 служб. Аднак трывожная абстаноўка ўздзейнічала на павелічэнне замкавага арсенала, дзе тады налічваліся чатыры гарматы, 10 гакаўніц, 35 рушніцаў, запасы пораху, волава, серы, салетры, ядры да гармат і іншая амуніцыя. На ўсё гэта замахваліся (і не без поспеху) «жолнеры», якія праходзілі праз паселішча [156].

Ва ўсякім выпадку ў інвентары за 1615 г. звесткі пра чатыры гарматы адсутнічаюць. У гэтыя гады Стрэшынскі замак перабудоўваюць, папаўняюць яго арсенал. Сярод ручной агнястрэльнай зброі акрамя гакаўніцаў згадваюцца 34 «губчастыя ручніцы». Перад замкам будуецца «двор» з дзвюма «стайнямі, дзвюма піўніцамі», кароўнікам. У арэнду здаецца карчма, мытніца, млын і рудня [157].

Падрабязнае апісанне Стрэшына ўпершыню зафіксавана ў інвентары ад 16 лютага 1628 г. Тут адзначаны замак, які стаяў на «гары над Дняпром» і над Стрэшынкай, якая ўпадала ў Дняпро, і «перакоп ад места, цераз які мост да замку». Праз яго траплялі ў «вежу варотную ў тры помосты з бланкаваннем». Гэта значыць, што замкавая брама была чатырох'яруснай з кругавой галерэяй насценнага бою. Традыцыйны «ўзвод» падымаўся двума ланцугамі над дубовымі апорамі — палямі. Край пад'ёмнага моста сцягвалі дзве жалезныя паласы. Мост у паднятым стане фіксавалі дзве «жалезныя чопы» — асобыя запоры. Двайныя палотнішчы варот з «форткай»-брамкай мелі складаную сістэму жалезных і драўляных запораў. У браме знізу злева размяшчаўся астрог. На другім паверсе была «святліца вялікая», вышэй — «свіран», адкуль па «ўсходу» траплялі наверх «на бланкаванне». Чацвёрты ярус меў чатыры вакны, з іх два былі забраны жалезнымі кратамі [158]. Справа ад варотаў ішлі «трыма радамі адна над другой» сельскія гародні з «бланкаваннем». У адной з гародняў захоўваліся замкавыя «порахі і кулі». У другой, дзе раней размяшчалася замкавая «капліца» — часоўня, падданыя «свае рэчы хаваюць». Гародні мелі дзверы на засовах альбо на «бегунах» і запоры. Сістэму ўмацаванняў дапаўнялі яшчэ чатыры вежы, якія разам з гароднямі былі «па самае бланкаванне глінай аблеплены». У інвентары адзначаецца, што «в року 1626 як замок, так і вежы 4, бланкованье і ўсходы (лесвіцы на гародні.— *М. Т.*) нанова былі драніцамі пабіты». На замкавым дзядзінцы цясніліся жылыя і гаспадарчыя пабудовы, у тым ліку піўніца, пякарня, стаяў дом гарадпічага [159].

Са зброі, якая мелася ў замку, згадваюцца чатыры гарматы. Дзве з іх былі «ў ложах акаваных на колах абадзястых не кованых». Дзве

pawet.net

іншыя без лож ляжалі «на вежы ў вокнах». Верагодна, размова ідзе пра «вежу варотную». З арсенала зніклі рушніцы. Замест іх з'явіўся новы від агнястрэльнай зброі — мушкеты, якіх было 50, а таксама 10 гакаўніц. Пералічваюцца невялікія запасы боепрыпасаў: 88 фунтаў пораху мушкетнага, 24 фунты гарматнага нядробленага, 17 жалезных і 26 алавяных гарматных ядраў, 500 куль гакаўнічных, 600 мушкетных, 24 фунты волава, 62 фунты салетры, 5 фунтаў свінцу, формы гакаўнічныя і мушкетныя. Заведваў усім гэтым замкавы пушкар Марцін, які быў вызвалены ад падаткаў, меў «паўслужбы ў мястэчку», рабіў для замка порах і купляў для гэтага ўсё неабходнае [160]. Усе мяшчане Стрэшына, дзе ў 1628 г. значылася 100 жылых «пляцоў», а таксама ўся воласць без выключэння абавязвалася «будаваць і напраўляць замак і гару, а таксама грэблі і млыны, выходзячы на гвалт». «Двор», які прымыкаў да замка і мястэчка, быў абгароджаны высокім плотам з тоўстых сасновых бярвенняў, ад Дняпра — дубовым вастраколам [161]. Звесткі пра ўмацаванні самога «места» Стрэшына адсутнічаюць.

Наступныя інвентары Стрэшынскага замка (1623, 1635 гг.) фіксуюць стабільнасць яго планіроўкі і канструкцый фартыфікацыйных збудаванняў, а таксама наменклатуру зброі ў цэйхгаўзе [162].

У гады антыфеадальнай барацьбы народных мас (1648—1649) і ў час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай у сярэдзіне XVII ст. Стрэшын знаходзіўся ў гушчы ваенных бітваў. Аднак сведчанні пра яго замак за гэты перыяд адсутнічаюць. Вядома, што ў ліпені 1654 г. казакі І. Залатарэнкі ўзялі горад штурмам, а замак спалілі [163].

Пасля вайны Стрэшынскі замак быў адноўлены, але ранейшай моцы ўжо не меў. У такім стане ён праіснаваў да далучэння Усходняй Беларусі да Расійскай імперыі.

Жлобін

Невялікае паселішча Злобін, папярэднік сучаснага Жлобіна, узнікла ў XV ст. на нізкім правым беразе Дняпра ля ўпадзення ў яго ручая Чорначка. Яго тапаграфія адрозніваласа ад тапаграфіі іншых паселішчаў, якія ўзніклі на Дняпры і, як правіла, займалі ўзвышаныя ўчасткі берага. Тут усё было наадварот: умацаваная частка Злобіна стаяла ад берага Дняпра на 100 м, ля яе падножжа, выходзячы да вады, размяшчаліся жылыя кварталы.

У XV—XVI стст. гэта валоданне належала Хадкевічам і пераносіла ўсе складанасці жыцця парубежнага паселішча [164]. У гэты час і ўзнік на ўзвышэнні берага Жлобінскі замак. Ён складаўся з двух частак — уласна замка і падзамка. Пляцоўка замка памерам 50×60 м узвышалася на 3—4 м над нізінай, занятай жылымі кварталамі. Падзамак, які прымыкаў да яго з поўдня, меў авальную пляцоўку памерам 130×60 м, выцягнутую з поўначы на поўдзень. Яна была ніжэйшая за паверхню замкавага двара на 1,5—2 м, але ўзвышалася на 2—3 м над паселішчам [165]. Відаць, замак і падзамак былі абнесены земляными валамі, якія цяпер цалкам знівеліраваны. На іх стаялі традыцыйныя для таго часу драўляныя абарончыя збудаванні.

У ліпені 1654 г. казакі І. Залатарэнкі ўзялі штурмам і спалілі «замок Злобин», пра які пазней пісьмовых сведчанняў не сустракаецца [166].



Жлобінскае замчышча

Лукомль

Старажытны Лукомль згадваецца ў летапісу пад 1078 г. Ён размяшчаўся ля самага абрыву правага берага р. Лукомкі, якая дала назву гораду [167]. Яго дзяцінец меў плошчу больш за 0,2 га памерам 63×6 м, некалі абкружаную земляным валам вышынёй да 4—5 м і шырынёй у аснове да 15 м. Пляцоўка старажытнага ўмацавання і цяпер узвышаецца над р. Лукомкай на 20 м [168].

У XIV ст. Лукомль лічыўся горадам з магутным, добра ўмацаваным замкам, які згадваецца ў вядомым «Списке русских городов дальних и ближних». У 1386 г. аб'яднаныя войскі прускіх і лівонскіх рыцараў на чале з магістрам Прусіі Конрадам Цольнерам і Андрэем Полацкім аблажылі мясцовы замак. Гарнізон мужна і доўга абараняўся. Многа крыжакоў загінула пад сценамі Лукомля, аднак у ходзе працяглай аблогі і штурму замак быў узяты. Андрэй Полацкі са сваімі войскамі застаўся ў ім, а праз некаторы час з дапамогаю рыцараў узяў і Полацк [169].

Згадваецца Лукомль у 30-я гады XV ст., калі мяцежны Свідрыгайла, кіруючыся ў Кіеў, тут распусціў сваё войска, князёў і баяр [170].

У XVI ст. Лукомль быў цэнтрам валодanняў князёў Лукомскіх. У перыяд Лівонскай вайны, у 1563 г., горад і замак поўнасцю «повоевало» і знішчыла войска Івана Грознага. Замак больш не ўзнаўляўся. Рэшткі вялікіх валоў аглядваў у 1573 г. М. Стрыйкоўскі, які адзначаў, што тут «калісьці быў вялікі замак» [171].

У XVII ст. дакументы згадваюць ужо толькі вёску Лукомль [172].



Лукомскае замчышча (паводле Г. В. Штыхава)

Глыбокае

Паселішча ўзнікла на беразе возера Глыбокага, ад якога і атрымала сваю назву. У пісьмовых крыніцах яно вядома з 1514 г.[173]

Глыбокае здаўна належала двум магнацкім родам — Корсакам і Зяновічам. Рака Беразвеч падзяляла іх валоданні, працякаючы з усходу на захад. Спачатку тут было толькі два «двары», каля якіх групіравалася залежнае «цяглае» насельніцтва. Сярод жыхароў меліся рамеснікі і дробныя гандляры, што атрымалі ад уладальнікаў на пэўны тэрмін «слободы». «Слобода Глубокое» згадваецца ў другой палове XVI ст. У Лівонскую вайну 1563—1579 гг. яна была занята рускімі войскамі [174].

З цягам часу Корсакі перадалі свае глыбоцкія валоданні кармелітам — босым, а валоданне Зяновічаў перайшло да Радзівілаў.

У другой палове XVI ст. у Глыбокім, згодна карты М. Струбіча, мелася невялікае ўмацаванне. У ходзе вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 30 чэрвеня 1654 г. атрад рускіх войскаў на чале з думным дваранінам Ж. В. Кондыравым пад Глыбокім «литовских людей побил и языки и знамена и барабаны и мушкеты поимал» [175]. Па другіх сведчаннях, гэта здарылася 2 жніўня, прычым Глыбокае было спалена ўшчэнт («без остатку»), а кіраўнік абароны полацкі падкаморы Бяганскі трапіў у палон [176].

Праз паўгода рускія пакінулі Глыбокае, але ў жніўні 1658 г. яны зноў былі тут. Ваявода Б. Бешанцаў з 50 драгунамі прыбыў сюды з мэтай пабудаваць астрог. Ён павінен быў «...укрепиться острогом или земляным валом — как лутче, и Глубоковский уезд от литовских людей оберегать, чтоб литовские люди дурна какова не учинили и уезду не повоевали» [177]. Між тым ваколіцы Глыбокага былі разрабаваны і абязлюджаны, таму для «острожной работы» на дапамогу драгунам былі прыцягнуты сяляне Полацкага і Ашмянскага паветаў. «А острог начал ставить



Глыбокае. Сітуацыйны план пачатку XIX ст.: 1 — замак; 2 — ставы

М 1дз : 20 саж

на Глубоком на старом месте, где был двор пана Корсака. А крепость... — з двух сторон вал и вода, пруды копаные глубокие. А з двух... сторон место ровное... А в остроге... ратных людей для осадного времени иметь надобно»,— паведамляў ваявода ў сваёй адпісцы цару [178]. Ва ўмовах, што склаліся пры недахопе людзей, астрог рабіўся «небольшой, наскоро, для поспешанья». Ваенная абстаноўка, дзеянні войскаў шведаў у бліжэйшых паветах патрабавалі асцярожнасці. Цар пісаў Б. Бешанцаву, каб ён «с нашими ратными людьми от приходу литовских людей оберегался, чтоб литовские люди над острогом и ратными людьми и валом земляным в день и ночное время дурна какова не учинили и наших ратных людей не побили и в полон не поймали, а с немецкими ни с какими людьми задоров никаких не делать» [179].

Праз два гады, 7 студзеня 1659 г. (па іншых сведчаннях — у 1660 г.) атрад палкоўніка Вялікага княства Літоўскага В. Валовіча «сжёг острожек в Глубоком», а гарматы, якія былі тут, вывез у Даўгінаў [180].

Як і ў іншых прыватнаўласніцкіх гарадах, у Глыбокім мелася ваенная арганізацыя гараджан. Сілу яе пераацэньваць не варта, але ўсё ж іншы раз узброеныя мяшчане аказвалі сур'ёзнае супрацьдзеянне рэгулярным часцям салдат-прафесіяналаў. Так, 24 ліпеня 1667 г. гараджа-

не кармеліцкай часткі Глыбокага паўсталі супраць рабаўніцтва і гвалту салдат-пехацінцаў угорскай харугвы літоўскага польнага гетмана В. Валовіча. Некалькі сотняў мяшчан, узброеныя халоднай і агнястрэльнай зброяй, нечакана напалі на марадзёраў і пасля кароткай, але жорсткай сутычкі прымусілі роту пайсці з горада. Трох «пахолкаў» яны забілі, а іх трупы скінулі ў возера. Многія салдаты былі параненыя. Мяшчане захапілі нямала шабляў, мушкетаў, грошай і амуніцыю [181].

У перыяд Паўночнай вайны ў 1700 г. горад моцна пацярпеў ад жорсткага пажару, а таксама ад рабаўніцтва саксонскага войску. Магістрат Глыбокага абавязаў у 1704 г. усіх домаўласнікаў для абароны «ад гвалтаў саксонскіх імець кожнаму ў доме сваім бярдыш ці алебарду, ці якую іншую зброю або таксама ружжо, што будзе правярацца на свята св. Міхала» [182]. У мэтах супрацьпажарнай бяспекі мяшчане па чарзе абавязваліся ноччу дзяжурыць і хадзіць па горадзе, заклікаючы ўсіх да асцярожнага абыходжання з агнём. Пад пагрозай штрафу ў 10 коп грошаў домаўласнікі павінны былі мець у доме драбіну і чан, запоўнены вадой. Пячныя трубы прачышчаліся раз у квартал пад наглядам войта і падвойскага. На кожнай вуліцы павінны былі быць дзве пажарных бусакі, яшчэ чатыры бусакі пастаянна знаходзіліся на базары [183].

Замак у Глыбокім існаваў і ў пачатку XVIII ст. Мелася і Замкавая вуліца [184]. Аднак апісанняў замка не захавалася. Толькі план горада канца XVIII — пачатку XIX ст. пацвярджае інфармацыю пра яго 1658 г.

Чашнікі

Уладальніцкае паселішча Чашнікі вядома па пісьмовых крыніцах з XVI ст.[185] Спачатку яно лічылася валоданнем князёў Лукомскіх.

У час Лівонскай вайны на ўзвышэнні правага берага р. Улы па загаду Івана Грознага быў змайстраваны драўляны замак. Пад сценамі гэтага ўмацавання, на «чашніцкіх палях» 23 студзеня 1564 г. армія Н. Радзівіла нечаканым ударам разграміла дваццаціняцітысячнае царскае войска князя П. Шуйскага. Замак быў спалены, аднак хутка па загаду караля Жыгімонта Аўгуста адноўлены [186].

У 1567 г. пад Чашнікамі пацярпеў паражэнне атрад татар — Амурата і войска князя Палецкага, разбітыя гетманам Раманам Сангушкам. У 1580 г. тут стаяў кароль Стэфан Баторый, які прымаў пасла Івана Грознага. Па інвентару 1663 г., Чашнікі былі неўмацаваным мястэчкам са старым замкам. У час Паўночнай вайны, 19 кастрычніка і 2 лістапада 1708 г., пад Чашнікамі адбылося дзве бітвы паміж рускімі і шведскімі войскамі. Мястэчка і замак былі спалены [187].

Пасля Лукомскіх Чашнікамі валодалі Сапегі, А. Казаноўскі, Служкі, Патоцкія, Лапот і Валадковічы.

Старое замчышча занята могільнікам.

Ула

Ула ўзнікла як невялікае паселішча XIV—XV стст. на вузкім клінавідным мысе пры ўпадзенні р. Улы ў Заходнюю Дзвіну. У час Лівонскай вайны, жадаючы абараніць вусце р. Улы і ўзяць пад кантроль ход па Дзвіне, кароль Жыгімонт Аўгуст загадаў у 1563 г. узвесці тут замак. Мыс пляцоўкі быў адрэзаны ад плато ровам, па перыметру ўзвялі

абарончы вал. Схілы замчышча, звернутыя да вады, вымасцілі валуном. Будаўніцтва, якім кіраваў венецыянскі інжынер, было перапынена нападзеннем атрада царскіх войскаў. Будаўнічая каманда ўся была перабіта [188]. У 1567 г. цар Іван Грозны ў сваю чаргу загадвае змайстраваць тут крэпасць у выглядзе драўляных сцен і вежаў. Гародні, нафасованыя зямлёй, добра перанеслі артылерыйскія абстрэлы. У замку мелася восем вежаў, былі вароты і брамкі. У 1568 г., з сярэдзіны лютага



План Ульскага замка. 1568 г.

па 4 сакавіка, умацаванні ў Уле беспаспяхова на працягу трох тыдняў штурмавалі войскі Я. Хадкевіча. Аднак, разбіўшы сваімі гарматамі сцены і вежы, войска адступіла [189].

Толькі 20 верасня 1568 г. гетман Раман Сангушка нечаканым штурмам захапіў умацаванні, гарнізон якога быў п'яны. У палоне апынуліся два ваяводы — браты Вельямінавы, 300 баяраў і 800 стральцоў са зброяй [190].

Замак выгарэў пры штурме, але яго зноў аднавілі. У 1580 г. па загаду Стэфана Баторыя тут насыпалі магутны вал вышынёй у 6 сажаняў (каля 11,5 м.— *М. Т.)*.

Летам 1654 г., у пачатку вайны Расіі з Рэччу Паспалітай, ульскія ўмацаванні былі заняты царскімі войскамі і спалены. Больш яны не аднаўляліся.

Мястэчкам валодалі ў XVI—XVIII стст. Быстрыцкія, Лукомскія, Ржэцкія, князь Меншыкаў, Патоцкія, Рэуты [191].

Вята

Мястэчка Вята з дваром і замкам вядома па крыніцах XVI ст. Яно было заснавана і знаходзілася каля сучаснай вёскі Прудзікі Міёрскага раёна Віцебскай вобласці. Замак стаяў на старым гарадзішчы эпохі ранняга жалезнага веку і XII—XVI стст. Яно размяшчалася на левым беразе р. Вяты, левым прытоку Заходняй Дзвіны. Некалі яго пляцоўка

Замак Вята. Фота Л. Д. Побаля

памерамі 118×65 м была ўмацавана кальцавым валам. Цяпер ён амаль цалкам споўз на схілы і знівеліраваны. Толькі з паўднёвага напольнага боку захаваліся курганападобныя рэшткі вала вышынёй 4,2 м [192].

У 1516 г. Іван Сапега атрымаў прывілей ад караля Жыгімонта на пабудову ў Вяце фартэцыі, закладку тут горада, крамаў і торга. У сярэдзіне стагоддзя Вятай валодалі збеглыя рускія князі Пронскія, затым Сіняўскія. Хаця далей пісьмовыя дадзеныя пра Вяту адсутнічаюць, аднак яго ўмацаваны замак пастаянна адзначаўся на картах XVI—XVII стст.[193] Памежнае становішча замка і мястэчка не садзейнічала іх існаванню. У сярэдзіне XVII ст. яны былі разбураны ў ходзе вайны Расіі з Рэччу Паспалітай.

Дзятлава

Па пісьмовых крыніцах XV—XVIII стст. вядома як Здзецель, Здзенцель, Дзенцел, Здзечаль [194]. Паселішча з воласцю было аддадзена ў 1498 г вялікім князем Літоўскім Аляксандрам князю Канстанціну

Астрожскаму з правам закладкі горада і замка. Драўляны Дзятлаўскі замак К. Астрожскага згадваецца ў актах за 1500 г. Астрожскія валодалі Дзятлавам да канца XVII ст., калі яно перайшло да Сапегаў, а з 1685 г.— да Радзівілаў. Пры іх Дзятлаўскі замак зноўку адбудоўваецца [195]. Ён займаў дзялянку правага берага ракі, падпружанай плацінай. Меў авальную форму 100×80 м, абараняўся ровам і земляным валам са сценамі-гароднямі і вежамі. На замкавым двары быў узведзены двухпавярховы драўляны палац, які ў 1751 г. замянілі на каменны.



Дзятлава. Гандлёвая плошча

З канца XVIII ст. Дзятлавам валодалі Солтаны. Умацаванні замка былі знівеліраваны. Побач з палацам разбілі англійскі сад, пабудавалі шэраг павільёнаў, якія знутры распісаў вядомы мастак Норблін [196].

Каралін

У канцы XVI ст. у прыгарадзе Пінска быў створаны бастыённы замак маршалка Вялікага княства Літоўскага Яна Дольскага. Пазней ім валодалі князі Вішнявецкія [197].

Замак узвялі ў традыцыях новаітальянскай фартыфікацыйнай сістэмы: ён меў у плане від чатырохвугольніка памерам 75,6×37,8×46,2×
×75,6 м з бастыёнамі на вуглах. Куртыны і бастыёны з брустверамі былі абмураваныя каменем. Знутры валоў ішоў падземны зводчаты пераход вышынёй 2 м і шырынёй 90 см. У зводзе праз 4 м меліся невялікія адтуліны шырынёй 20 см для доступа паветра і святла [198]. Гэтым ходам

можна было выйсці на бастыёны. Уязная вежа-брама замка фланкіравалася агнём з двух бастыёнаў.

Перад замкам ішоў дзевяцімятровай шырыні роў з пад'ёмным мостам. Неабходна адзначыць, што бастыёны з напольнага боку былі значна большымі ў параўнанні з тымі, што знаходзіліся з поўдня, дзе замак бараніўся стромым берагам і водамі р. Піны [199].

Замак двойчы разбураўся: у ліпені 1660 г. у час аблогі царскім вой-



Каралінскі замак. План



Мураваны ўнутрывальны ход у Каралінскім замку

скам і ў 1704 г. войскам Карла XII. У пачатку XIX ст. тут яшчэ былі цэлымі два бастыёны і курціна «с ветхими одеждами» [200]. Пазней замак знік пад гарадской забудовай.

Хойнікі

Хойнікі ўпершыню ўпамінаюцца як вёска ў 1512 г. Яна ўваходзіла ў склад Брагінскай воласці Рэчыцкага павета [201], пазней у так званае Брагінскае графства князёў Вішнявецкіх [202]. Потым яно было аддана збеглым рускім князям Шуйскім і Празорам [203]. Гэтае невялікае валоданне знаходзілася на беларуска-ўкраінскім парубежжы, дзе часта палыхала гневам казацкая вольніца. Яно ператварылася ў XVII ст. у мястэчка і цэнтр самастойнай воласці [204]. Зразумела, што існаваць без самастойных умацаванняў паселішча не магло. Цэнтрам абароны Хойнікаў стаў маленькі драўляны замак, узведзены, гледзячы па ўсяму, у пачатку ці сярэдзіне XVII ст. князямі Вішнявецкімі. Ён займаў невялікую пясча-

ную дзюну на краю забалочанай даліны р. Квесі [205]. Пляцоўка замка мела авальную форму памерам 35×25 м і была выцягнута з поўначы на поўдзень. Замак абкружаў вадзяны роў, які дасягаў з боку мястэчка шырыні 28—30 м, з астатніх бакоў — 15—18 м [206]. Дадаткова яго абараняла вялікая забалочаная пойма. Сувязь з берагам ажыццяўлялася па дамбе і драўляным мосце. На зямляным вале стаялі драўляныя сцены. Уваход ішоў праз варотную вежу [207].

Захаваўся інвентар Хойніцкага замка за 1721 г. З яго відаць, што



Хойніцкі замак

пасля князёў Прозараў ім да 1698 г. валодаў пан Служка, ад якога ў 1721 г. ён перайшоў да біскупа Юзэфа Парышэвіча [208]. Замак абкружаў паркан, мелася адна двухпавярховая варотная вежа, зрубленая з брусоў і накрытая дранкай. Першы паверх вежы займаў варотны праезд і два памяшканні, адведзеныя пад турму. На другім ярусе знаходзілася невялікая зала са шкляннымі вокнамі ў драўляных рамах. На ўзроўні другога паверха вакол будынка ішоў балкон-«ганак». Усе замкавыя пабудовы ў момант складання інвентару патрабавалі рамонту [209].

Мяркуючы па нязначнаму культурнаму слою (таўшчынёй 20—40 см) і матэрыялах (кераміка XVII—XVIII стст.), жыццё ў замку было мала інтэнсіўным і замерла ў XVIII ст. Аднак і зараз мясцовае насельніцтва называе гэтае месца «Замкам».

Мсцібава

«Мстибогов городок» вядомы з 1202 г. як адзін са старажытнейшых уладальніцкіх замкаў. Ён належаў тады валынскаму баярыну Мсцібогу [210]. Аснову яго абароны складаў магутны земляны вал вышынёй да 5 м, які абкружаў пляцоўку замчышча правільнай круглай формы дыяметрам больш за 30 м. Уезд на замкавую тэрыторыю праходзіў праз вал з усходу. З поўдня і паўднёвага захаду праходзіў другі дуга-

падобны вал, які стаяў ад замка на адлегласці 120—150 м і ўпіраўся канцамі ў балота. Перад ім захаваліся сляды рова [211].

У якасці сховішча для свайго ўладальніка і мясцовага насельніцтва замак выкарыстоўваўся не толькі ў старажытнарускія часы, але і пазней — у XVI—XVIII стст.[212] На пляцоўцы замка захаваліся сляды старажытнага калодзежа.

Вевярэск (Касцянева)

Горад, упершыню згаданы ў «Спісе рускіх гарадоў дальніх і бліжніх» канца XIV ст., працягваў функцыяніраваць як цэнтр феадальнага валодання і пазней. Раскопкі В. В. Сядова, які мяркуе, што гэтым ён выявіў і ідэнтыфікаваў старажытны Вевярэск, далі матэрыялы XII—XIII стст.[213]

Працяг аўтарам даследаванняў на гарадзішчы летапіснага горада, размешчанага ў в. Касцянева Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці, дазволіў удакладніць, што замчышча выкарыстоўвалася як цэнтр абароны Вевярэска і акругі таксама і ў XIV—XVI стст.[214] Паселішча пад назваю «Ваверка» апошні раз згадваецца ў крыніцы XVI ст.[215] Затым паселішча перайшло ў валоданне Касценя і ад яго, відаць, атрымала назву сучаснай вёска Касцянева. Прарэзка вала паказала, што паселішча, абкружанае валам з дубовымі навальнымі канструкцыямі, узнікла ў XI ст. Да XVI ст. вал неаднаразова рамантаваўся і абліцоўваўся каменем [216].

Холмеч

Прыватнаўладальніцкі Холмеч у XVI—XVII стст. належаў Валовічам — некалі багатаму і знатнаму роду беларускіх феадалаў [217]. Размешчаны на левым беразе Дняпра гарадок быў абкружаны валам з драўлянымі сценамі і вежамі. Уезд і выезд ажыццяўляўся праз двое варотаў, якія адкрывалі дарогу ў Рэчыцу і Лоеў. Хутчэй за ўсё яны называліся Рэчыцкімі і Лоеўскімі. Такой была сярэдневяковая традыцыя.

Умацаванні горада ўпамінаюцца ў сувязі з падзеямі 1649 г. і бітвай войскаў украінскага палкоўніка Крычэўскага супраць атрадаў гетмана Вялікага княства Літоўскага Януша Радзівіла. Холмеч быў заняты атрадам шляхціцаў і наёмнікаў на чале з ротмістрам Сасноўскім. Аднак жыхары горада ўстанавілі сувязь з паўстанцамі і адчынілі вароты. Атрад Сасноўскага быў ліквідаваны [218].

Цяпер сляды старажытных умацаванняў Холмеча растварыліся пад забудовай і рэканструяваць іх цяжка.

Воўпа

Воўпа ўнізкла на мысе ля зліцця Ваўпянкі з Россю ў XI ст. Археалагічныя матэрыялы даюць падставу гаварыць, што жыццё тут не перарывалася і ў пазнейшыя часы, да XVII—XVIII стст.[219] У XV ст. тут размяшчаўся «двор Воўпа» — вялікакняжацкае валоданне, якое князь і кароль польскі Казімір у 1449 г. падарыў свайму пасцельнічаму — «ложничему Алехну Судимонтовичу» [220]. Затым князь Аляксандр у 1492 г. запісаў яго на жонку гальшанскага князя, ад яе двор у 1517 г. зноў перайшоў да Судзімонтавічаў. У пацвярджальнай грамаце 1517 г. гаворыцца ўжо пра «двор Волпа с замком и его местечком». У 1522 г.

замкам Воўпа валодаў Берасцейскі біскуп, а пад 1547 г. дакументы называюць новага гаспадара Воўпы — біскупа Віленскага Паўла [221].

У дакументах XVII ст. звестак пра замак не сустракаецца.

Столін

Як адзначалі даследчыкі, Столін неаднаразова ўпамінаецца ў летапісах пагарынскіх гарадоў XII—XIII стст.[222] Ён узнік на высокім левым беразе р. Гарыні. У сярэднія вякі яна змяніла рэчышча, адышоўшы ў глыб поймы і пакінуўшы старыцу, якую цяпер называюць Копанцам.

У XVI ст. мястэчка Столін з умацаваным драўляным замкам становіцца прыватнаўладальніцкім. Ім валодалі ў свой час феадалы Саламярэцкія, Вішнявецкія, Пацы, Солтаны, Скірмунты, Стахоўскія і інш.[223]

У гады вайны Расіі з Рэччу Паспалітай сярэдзіны XVII ст. глыбінны Столін многа пражыў. У верасні 1655 г. яго ўзялі і спалілі казацкія войскі ўкраінскага палкоўніка Івана Залатарэнкі [224]. Спробы праціўніка вызваліць Пагарынне і Столін прывялі да вялікай бітвы на подступах да мястэчка, у якой войскі Вялікага княства Літоўскага пацярпелі паражэнне [225]. Пасля гэтых падзей Столінскі замак прыйшоў у заняпад.

Рэшткі старажытнага замка выяўлены аўтарам на абрывістым беразе Копанца. Яго пляцоўка знівеліравана пры будаўніцтве мясцовага стадыёна і дзіцячага садка № 3. Захаваўся толькі ўчастак абарончага рова з заходняга боку даўжынёй да 42 м. Яго сучасная шырыня 12—13 м, глыбіня да 3 м. Часткова ацалеў культурны пласт з матэрыяламі XII—XVII стст.

Такім чынам, акрамя ўмацаваных буйных цэнтраў магнацкіх латыфундый, такіх, як Нясвіж, Слуцк, Быхаў, Шклоў і інш., на тэрыторыі Беларусі існавала значная колькасць умацаваных мястэчкаў з уласнай лініяй абароны, якая дапаўнялася замкавай фартыфікацыяй. Іншы раз у іх меліся толькі ўмацаваныя замкі. Усе разам яны складалі ўразлівы малюнак краіны, які дазволіў назваць Беларусь «краінай замкаў». Краіна ж гэтая жыла па законах свайго суровага і няпростага часу.

Заключэнне

Асаблівасцю сярэдневяковай гісторыі Беларусі з'яўляецца наяўнасць вялікай колькасці прыватнаўласніцкіх замкаў, умацаваных гарадоў і мястэчак. Усе яны былі ўключаны ў адзіную абарончую сістэму краіны. Іх ваеннаабарончая структура, асабліва ў цэнтрах латыфундый буйных магнацкіх родаў (Нясвіж, Слуцк, Мір, Быхаў, Заслаўе, Ляхавічы і інш.), падтрымлівалася ў добрым стане да часу далучэння тэрыторыі Беларусі да Расійскай імперыі. Гэта тлумачыцца не толькі прыхільнасцю да традыцый мінулых стагоддзяў і жыццяздольнасцю механізмаў гарадской абароны. Адной з важнейшых прычын было жаданне пануючага класа феадалаў захаваць умацаваныя цэнтры як абарончыя выратавальныя сховішчы ад сацыяльных бунтаў і паўстанняў народных мас, як аплот і цвярдыню сваёй улады і сваволі, як базы магнацка-шляхецкага сепаратызму.

Прыватнаўласніцкія гарады ўжо з сярэдзіны XVI ст. пачалі практыкаваць будаўніцтва бастыённых умацаванняў, ужываючы ўсе вядомыя ў Еўропе таго часу сістэмы фартыфікацыі. Зерні еўрапейскай ваеннай думкі траплялі на Беларусь на падрыхтаваную ўласным ваенным вопытам глебу. Гэта асабліва характэрна для ўласніцкіх паселішчаў, дзе магутнасць умацаванняў залежала не толькі ад знешняга ваенна-стратэгічнага фактару, але і ад фінансавых магчымасцей феадалаў і гараджан. Аднак побач з першакласнымі фартыфікацыямі захавалася многа традыцыйных драўляна-земляных умацаванняў.

У прыватнаўласніцкіх гарадах да XVIII ст. захавалася ваенная арганізацыя гараджан з дзесяцічнасоценным і палкавым дзяленнем. З ёю цесна былі звязаны ваенныя фармаванні сялян замкавых валасцей. Горад і сяло таксама сумесна выконвалі «гарадавую павіннасць». Карані гэтых традыцый заходзяць у часы Кіеўскай Русі.

З увядзеннем магдэбургскага права ва ўласніцкіх гарадах і мястэчках Беларусі яго нормы і ваенныя артыкулы надалі структуры ваеннай арганізацыі гараджан, якая існавала са старажытнасці, большую стройнасць, закончанасць, еўрапеізаваўшы яе і замацаваўшы унутраную аснову цэхавымі ваеннымі фарміраваннямі. З другой паловы XVI ст. уводзіцца практыка ваенных попісаў і ваеннай муштроўкі гараджан.

Вытворчыя сілы гарадоў XIV—XVIII стст. у значнай ступені працавалі на патрэбы абароны. У рамёствах, звязаных з вытворчасцю зброі, існавала выразная спецыялізацыя. На абарону гарадоў працавалі кавалі, кацельшчыкі, ліцейшчыкі, бляхары, платнеры, слесары, замочнікі, мечнікі, салетраннікі, парахоўшчыкі, шабельнікі, пушкары, гадзіннікавых спраў майстры, меднікі, нажоўшчыкі, ліцейшчыкі гармат—людвісары, ювеліры, каменечосы, гравёры, токары, броннікі, ключнікі, рэзчыкі па металу, рудамёты, шахцёры, слесары «англіцкай работы», валмайстры, далакопы і іншыя майстры.

Гарадское і сельскае апалчэнне, васальная шляхта, нягледзячы на выразную розніцу ў якасці зброі, увогуле выступалі на поле бітвы са зброяй і экіпіроўкай, якія ў тэхнічных адносінах адпавядалі сваёй эпосе, агульнаеўрапейскім стандартам. Для мясцовых збройнікаў XIV—XVIII стст. практычна не было сакрэтаў у вобласці вытворчасці любога віду і тыпу ўзбраенняў, у тым ліку і агнястрэльнай зброі. Аднак частка зброі, боепрыпасаў і сыравіны рэгулярна ўвозілася з-за мяжы.

Прававыя нормы, якія існавалі на Беларусі ў эпоху спелага сярэдневякоўя (ваенныя артыкулы статутаў Вялікага княства Літоўскага і магдэбургскага права, «Артыкулы жолнерские» перыяду ваенных дзеянняў) у пытаннях абароны ад непрыяцеля трымалі прыватнаўласніцкіх мяшчан і гараджан у «пракруставым ложы» грамадзянскай і ваеннай прысягі гораду і магнату. Парушальнікі жорстка караліся. Паралізуючае дзеянне прысягі выкарыстоўвалася магнатамі пры падаўленні паўстанняў народных мас, таму што ўсе механізмы кіраўніцтва гарадскім апалчэннем і ваенны патэнцыял гараджан знаходзіліся ў руках уладальнікаў. Па гэтай прычыне стрымліваліся і нават падаўляліся антыфеадальныя выступленні ў беларускіх прыватнаўласніцкіх гарадах, нейтралізаваліся тыя сілы, якія маглі быць і былі аб'ектыўнымі саюзнікамі паўстанцаў-сялян. Асцерагаючыся справядлівага гневу сваіх падданых, феадалы не дарэмна будавалі замкі-рэзідэнцыі воддаль ад населеных пунктаў, аддзяляючыся ад іх водамі рэк і штучных вадасховішчаў, дамбамі і пад'ёмнымі мастамі.

Умацаванні прыватнаўласніцкіх замкаў і гарадоў Беларусі XIV—XVIII стст. былі на ўзроўні ваенных патрабаванняў эпохі. Мясцовае ваеннае дойлідства захавала свае нацыянальныя рысы, мела свой каларыт і вобраз, адлюстроўвала высокі ўзровень культуры беларускага народа.

Бібліяграфія

Уводзіны

[1] Materiały historyczne (przez P. M. Iwanowskiego): Atheneum, Wilno, 1850. T. 3. S. 1—18; Przyczynki do dziejóu Slucka (1654—1660) // Przegląd Bibliograficzno-Archeologiczny. Warszawa, 1881. T. 2. S. 134—148; Baranowski I. T. Epigon feudalizmu na Białej Rusi. // Rocznik Towarzystwa przyjaciól nauk w Wilnie 1909. Wilno, 1910. T. 3. S. 81—82. Ten że. Trzy hrabstwa białoruskie.— Wieś i folwark, Warszawa, 1914. S. 267—268; Грушевский А. С. Повинность городовой работы в Великом княжестве Литовском // Журнал Министерства народного просвещения. Пг., 1914. С. 29—30; Он же. Города Великого княжества Литовского в XIV—XVI вв. Старина и борьба за старину. Киев, 1918. С. 33—81.

[2] Kotłubaj E. Galeria Nieświeżska porterów Radziwillowskich. Wilno, 1855; Ten że. Życie Janusza Radziwiłła — Wilno i Witebsk, 1859; Taurogiński B. Nieśwież. Warszawa, 1937.

[3] Hedemann O. Dzisna i Druja-magdeburgskie miasta. Wilno, 1934; Ten że. Historia powiatu Brasławskiego. Wilno, 1930; Ten że. Głębokie. Wilno, 1935.

[4] Rewieńska W. Miasta i miasteczka w północnowschodniej Polsce. Wilno, 1935.

[5] Alexandrowicz St. Ordynacje miasteczka Lubcza nad Niemnem z 1647 roku. Rocznik Białostocki. Białystok, 1962; Ten że. Opis zabudowy m-ka Lubcza w 1644 roku // Kwartalnik historii kultury materialnej. Warszawa, 1962. S. 3—4.

[6] Markowski F. Zamek Mikolaja Krzysztofa Radziwiłła Sierotki w Nieświeżu. // Kwartalnik architektury i urbanistyki. Warszawa, 1964. T. 9; Gguszecki A. Fortyfikacje zamku w Nieświeżu. KAU. 1965. T. 10.

[7] Hryckewicz A. Milicje miast magnackich na Białorusi i Litwie w 17—18 ww. // Kwartalnik Historyczny. Warszawa, 1970. T. 1; Ten że: Warowne miasta magnackie na Białorusi i Litwie. // Przegląd historyczny. Warszawa, 1970. N 11; Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI—XVIII вв. Мн., 1975. С. 16—19 (Спіс літаратуры); Ён жа. Социально-политическая борьба горожан Белоруссии в XVI—XVIII вв. Мн., 1979.

[8] Ткачоў М. А. Замкі Беларусі. Мн., 1977; Ён жа. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII вв. Мн., 1978.

[9] Акты Виленской археографической комиссии для разбора древних актов. Вильнюс, 1865—1915. Т. 1—39; Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управлении Виленской учебной округи. Вильно, 1867—1904. Т. 1—14.

[10] ПСРЛ. Белорусско-литовские хроники. М., 1975. Т. 32; ПСРЛ. Белорусско-литовские летописи. М., 1980. Т. 35; Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska, Żmódzska i wszystkiej Ruśi. Warszawa, 1846—1848. T. 1—2; Belski M. Kronika Polska. Kraków, 1597.

Глава 1

[1] Taurogiński B. Z dziejów Nieświeza. Warszawa, 1937. S. 1; Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии XVI—XVIII вв. С. 209.

[2] Ткачоў М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. С. 82—86.

[3] ЦДГА БССР, ф. 684, воп. 4, спр. 1338, л. 27—28 об.

[4] ЦДГА БССР, ф. 684, воп. 4, спр. 1338, л. 30 об., 31.

[5] Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии XVI—XVIII вв. С. 236—237; АСД. Т. 7. С. 185—186.

[6] Ткачоў М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. С. 104—105.

[7] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 2, спр. 65, л. 24; спр. 67, л. 4.

[8] ЦДГА БССР, ф. 634, воп. 2, спр. 4963, ч. 2, л. 167, 167 адв.

[9] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 4, спр. 1361, л. 11.

[10] Markowski F. Zamek Mikołaja K. Radziwiłła Sierotki w Nieświeżu // KAU. 1965. T. 9. S. 57; АМГ, Т. 3. С. 95.

[11] Volumina Legum. Petersburg, 1859. T. 4. S. 386.
[12] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 4, спр. 1361, л. 13—14.
[13] Volumina Legum. T. 1. S. 54.
[14] АСД. Т. 7. С. 166.
[15] Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska. T. 3. S. 630; Kotlubaj E. Galapia Nieświeżska portretów Radziwillowskich. S. 409.
[16] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 2, спр. 95, л. 2, 96, 97.
[17] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 1, спр. 410, л. 9.
[18] ЦДА ВМФ СССР, ф. 3/л, воп. 23, спр. 947, л. 7 об.
[19] Лысенко П. Ф. Города Туровской земли. М., 1975. С. 150.
[20] АСД. Вильно, 1867. Т. 1. С. VII.
[21] Грицкевич А. П. Слуцк. М., 1970. С. 6.
[22] ПСРЛ. М., 1975. Т. 32. С. 84, 169.
[23] ПСРЛ. Т. 32. С. 101, 169; Грицкевич А. П. Слуцк. С. 6—7. Хранiст М. Бельскі лічыць, што гэтыя два загоны (шасцітысячны і трохтысячны) дзейнічалі ў 1503 г. (Bielski M. Kronika Polska. Kraków, 1597. S. 495—496).
[24] ПСРЛ. Т. 2. С. 364.
[25] Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska Żmudska i wszystkiej Rusi. Warszawa, 1847. T. 2. S. 337; Gwagninus A. Kronika Sarmaceyo Europskiej. Kraków, 1611. Cz. 1. Ks. 2. S. 70—71; ПСРЛ. Т. 32. С. 101, 169—171.
[26] ПСРЛ. Т. 36. С. 168; ПСРЛ. Т. 2. С. 365; Грицкевич А. П. Слуцк. С. 461.
[27] Второе хождение Трифона Коробейникова // ЧОИДР при Московском университете. М., 1887. Кн. 1. С. 7.
[28] Bielski J. Dalszy ciąg Kroniki polskiej, zawierającej dzieje od 1587 do 1598. Warszawa, 1851. S. 253.
[29] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 3835/2, л. 13 адв.; ф. 694, воп. 2, спр. 7396, л. 23; ф. КПФ-5, воп. 1, спр. 3834, л. 3—13 адв.
[30] ЦДГА БССР, ф. 1825, воп. 1, спр. 5, л. 5, 10, 19; ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 3834/3, л. 3—13 адв.
[31] ЦДГА БССР, ф. 1825, воп. 1, спр. 5, л. 28 адв.; ф. 694, воп. 2, спр. 7396, л. 25 адв.; ЦДВГА СССР, ф. ВУА, спр. 18 840, л. 90.
[32] ЦДГА БССР, ф. 1825, воп. 1, спр. 5, л. 28 адв.; ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 3834/2, л. 22; ЦДВГА СССР, ф. ВУА, спр. 18 840, л. 90.
[33] ЦДВГА СССР, ф. ВУА, спр. 18 840, л. 90, 90 адв.
[34] Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI—XVIII вв. С. 221—224.
[35] Przyczynki do dziejów Slucka (1654—1660) // Przegląd bibliograficzno-archeologiczny. Warszawa, 1881. T. 2. S 137; ЦДГА БССР, ф. 1825, воп. 1, спр. 14, л. 43 адв.
[36] Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI—XVIII вв. С. 227—229.
[37] ЦДГА БССР, ф. 1825, воп. 1, спр. 5, л. 29 адв.; Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI—XVIII вв. С. 228, 232, 236, 238.
[38] Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI—XVIII вв. С. 234—236; ЦГИА БССР, ф. 1825, воп. 1, спр. 14, л. 43 адв.; Грыцкевіч А. П. Беларускія выбранцы // Полымя. 1970. № 11.
[39] Грицкевич А. П. Слуцк. С. 26; ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 7396, л. 30, 30 адв.; РАДПБ. Калекцыя П. І. Дубровскага. Польскія аўтографы. Аўтограф 124. № 56; Ткачоў М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. С. 110—111.
[40] РАБАН Літоўскай ССР, ф. ER-889; Lauda abo uchwały do obrony porądku i osdoby miasta Slucka. S. 24—26.
[41] Ibidem. S. 28, 66, 72.
[42] ЦДГА БССР, ф. 1825, воп. 1, спр. 14, л. 22, 45.
[43] Przyczynki do dziejów miasta Slucka. S. 144.
[44] ЦДГА БССР, ф. 1825, воп. 1, спр. 15, л. 3, 3 адв., 4, 5; РАБАН Літоўскай ССР, ф. ER-889.
[45] ЦДГА БССР, ф. 1825, воп. 1, спр. 14, л. 18 адв., 21 адв., 22 адв., 23, 53.
[46] Там жа, л. 7 адв., 8, 13 адв., 17 адв., 21 адв., 65 адв.
[47] Przyczynki do dziejów miasta Slucka. S. 147.
[48] РАБАН Літоўскай ССР, ф. ER-889.
[49] Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI—XVIII вв. С. 95.
[50] ЦДГА БССР, ф. 1825, оп. 1, д. 14, л. 34, 35, 40, 49, 55, 59 об., 66; ф. 1825, оп. 1, д. 15, л. 4, 4 об., 13 об., 36; РАБАН Літоўскай ССР, ф. ER-889.

[51] РАБАН Літоўскай ССР, ф. ER-889.
[52] Przyczynki do dziejów miasta Slucka. S. 144—145, 147.
[53] Ibidem. S. 137—138.
[54] РАБАН УССР у г. Львове, ф. Асалінскіх 225-П, л. 137 адв., 138, 153.
[55] Biblioteka Czartoryjskich w Krakowie. Rkps., nr. 148. Z dyaryusza miasta Slucka. S. 529—534.
[56] Грицкевич А. П. Слуцк. С. 21, 23—24.
[57] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 1, спр. 410, л. 8.
[58] Грицкевич А. П. Социальная борьба горожан Белоруссии XVI—XVIII вв. С. 76—77.
[59] Volumina Legum, t. III. S. 150. T. 4. S. 194, 232, 317; T. 5. S. 257.
[60] РАДПБ. Калекцыя П. П. Дуброўскага. Польскія аўтографы. Аўт. 65. № 9, 10, 21.
[61] Там жа. Аўт. 125. № 74.
[62] ЦДГА БССР, ф. 1825, воп. 1, спр. 16, л. 18 адв., 19, 28, 28 адв., 32; ф. 684, воп. 2, спр. 7436, л. 3,3 адв.; спр. 7396, л. 30.
[63] ЦДАГА СССР, ф. ВУА, спр. 18 840, л. 90, 90 адв.
[64] РАБАН Літоўскай ССР, ф. 9—3032, л. 29; Syrokomla Wł. Wędrówki po niegdyś moich Okolicach. Wilno, 1853. S. 40.
[65] РАБАН Літоўскай ССР, ф. 9—3032, л. 30.
[66] Ткачоў М. А. Замкі Беларусі. С. 33—43; Ен жа. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. С. 63—70.
[67] Трусов С. А. Исследование средневековых замков Белоруссии // АО 1980 г. М., 1981. С. 345; Ен жа. Археологическое изучение памятников монументального зодчества XI—XVII вв. на территории Белоруссии. Автореф. дис. ... канд. ист. наук. Л., 1971. С. 11.
[68] Литовская Метрика. Т. 1. // РИБ. Т. 20. С. 852.
[69] ПСРЛ. Т. 32. С. 101, 169—170; РАБАН Літоўскай ССР, ф. 9—3032, л. 28.
[70] РАБАН Літоўскай ССР, ф. 9—3032, л. 30.
[71] ЦДГА БССР, ф. 684, воп. 4, спр. 1316, л. 423, 423 адв.
[72] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 4466, л. 365.
[73] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 2443/1, л. 17.
[74] Там жа, л. 8, 9, 10.
[75] ЦДАСА, государственный архив, разряд XXVII, д. 86, ч. 1, с. 382; АЮЗР. Т. XIV. С. 889; ЦДАСА, ф. 210, Московский стол, стб. 274, с. 125.
[76] Ткачоў М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. С. 64, 70.
[77] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 4466, л. 283; спр. 4468, л. 14, 19 адв.
[78] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 2444, л. 23, 27—31; спр. 2445, л. 17, 22, 45; спр. 2447, л. 36, 40, 41, 46, 66; ф. 684, воп. 4, спр. 1305-а, л. 105, 107.
[79] ЦДГА БССР, ф. 684, воп. 2, д. 4466, л. 162.
[80] ЦДГА БССР, л. 107, 108, 109, 122, 143, 162, 165-а, 167.
[81] Россия. Т. 9. С. 428.
[82] ЦДГА БССР, ф. 684, воп. 2, спр. 4486, л. 11.
[83] Jakimowicz R. Dawidgródek. Pińsk, 1939. S. 27; Раппопорт П. А. Военное зодчество западно-русских земель X—XIV вв. Л., 1967. С. 74—75; Лысенко М. Ф. Города Туровской земли. С. 118—142.
[84] Jakimowicz R. Dawidgródek. S. 19—21.
[85] ЦДГА УССР у г. Кіеве, ф. 257, воп. 1, спр. 133, л. 1. Дата перадачы горада Радзівілам (1551 г.), якая называецца ў БелСЭ (Мн., 1971. Т. 4. С. 110), памылковая (Описание документов и бумаг МАМЮ. Кн. 21. С. 411; Пашуто В. Т., Флоря В. П., Хорошкевич А. Л. Древнерусское наследие и исторические судьбы восточного славянства. М., 1982. С. 73).
[86] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 9367, л. 51.
[87] Там жа, л. 51, 51 адв.
[88] Там жа, л. 51 адв.— 53 адв.
[89] Там жа, л. 54 адв.— 55 адв.
[90] ГАСА ў г. Варшаве, АР, аддзел 25, спр. 673, л. 507 адв., 508.
[91] Там жа, л. 508 адв.
[92] Грицкевич А. П. Социальная борьба горожан Белоруссии XVI—XVIII вв. С. 70—73.
[93] ЦДГА БССР, ф. 684, воп. 4, спр. 899, л. 7.
[94] ЦДГА БССР, ф. 684, воп. 2, спр. 1913, л. 16.
[95] Там жа, л. 16, 16 адв.; спр. 1915, л. 14.
[96] Там жа, спр. 1913, л. 19 адв., 35 адв.; спр. 1915, л. 17 адв., 23—33.
[97] Там жа, спр. 1915, л. 34.

[98] ЦДГА БССР, ф. 684, воп. 2, спр. 1915, л. 14; спр. 1913, л. 15 адв., 313.
[99] Раппопорт П. А. Военное зодчество западно-русских земель. Л., 1967. С. 75 (рис. 76).
[100] Мальцев А. Н. Россия и Белоруссия в середине XVII века. М., 1974. С. 104.
[101] ЦДГА БССР, ф. 684, воп. 2, спр. 1913, л. 315 адв.— 319, 325—327 адв.
[102] ЦДГА БССР, ф. 684, воп. 2, спр. 1913, л. 194 адв.; ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 674, л. 643.
[103] ЦДГА БССР, ф. 684, воп. 2, спр. 1913, л. 194; ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 674, л. 643, 643 адв.
[104] ЦДГА БССР, ф. 684, воп. 2, спр. 1913, л. 211, 211 адв., 212; ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 674, л. 658 адв., 659.
[105] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 1913, л. 194 адв.; ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 674, л. 643 адв.
[106] Падлікі аўтара паводле інвентароў 1670 і 1675 гг. // ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 1913, л. 194 адв., 211, 220—249; ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 674, л. 643, 643 адв., 658 адв., 659, 674, 675 адв.
[107] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 1913, л. 64.
[108] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 12, спр. 1914, л. 2.
[109] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 674, л. 643.
[110] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 674, л. 658 адв., 659; спр. 675, л. 711 адв.; спр. 678, л. 765; ф. 691, воп. 2, спр. 1913, л. 64 адв., ф. КМФ-5.
[111] ЦДГА БССР, ф. 684, воп. 2, спр. 1701, л. 2; спр. 1702, л. 1; спр. 1703, л. 1 адв.; ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 684/1, л. 1 адв.
[112] ПСРЛ. Т. 32. Л. 23—24, 131.
[113] Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska. Warszawa, 1846. T. 3. S. 825.
[114] Штыхов Г. В. Археологическая карта Белоруссии. Мн., 1971. С. 173; Поболь Л. Д. Славянские древности Белоруссии. Мн., 1974. С. 337.
[115] ПСРЛ. Т. 32. С. 159; Валаханавіч А. І. Дзяржынск // БелСЭ. Мн., 1971. Т. 4. С. 235—236.
[116] Валаханавіч А. І. Дзяржынск. Мн., 1977. С. 7; Карамзин Н. М. История государства Российского. СПб., 1892. Т. 7. С. 11; Т. 8. С. 15.
[117] Ткачоў М. А. Замкі Беларусі. С. 76—77.
[118] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 1700, л. 4, 6, 9, 9 адв.; Валаханавіч А. І. Дзяржынск. С. 9.
[119] Описание документов и бумаг МАМЮ. Кн. 21. С. 411; Россия. Т. 9. С. 545; БА. Т. 1. С. 3; ПСРЛ. Т. 32. С. 159; ЦДГА УССР у г. Кіеве, ф. 257, воп. 1, спр. 133, л. 1; Пашуто В. И., Флоря Б. Н., Хорошкевич А. Л. Древнерусское наследие и исторические судьбы восточного славянства. С. 73; Ткачев М. А. Работы экспедиции Гродненского университета // АО 1981 г. М., 1983. С. 360—362.
[120] ПСРЛ. Т. 32. С. 101, 169.
[121] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 1687, л. 7, 37; РОБМГУ, книга справ замку Клецкого (1594—1598 гг.), $\frac{5gn}{130}$, л. 32, 33.
[122] Лысенко П. Ф. Города Туровской земли. С. 162.
[123] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 1687, л. 7.
[124] Дневник Новгородского подсудка Федора Евлашевского (1564—1604 гг.) // Мемуары, относящиеся к истории Южной Руси. Киев, 1896. Вып. 2. С. 32.
[125] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 3135, л. 4, 4 адв., 5.
[126] Там жа, л. 4; РОБМГУ, книга справ замку Клецкого, л. 51.
[127] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 3135, л. 24, 38—48, 80; спр. 3136, л. 17 адв., 18. воп. 4; спр. 899, л. 13—14 адв.
[128] ЦДАСА, ф. 210, Московский стол, стб. 274, л. 121, 128.
[129] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 2, спр. 1913, л. 90, 94 адв., 95.
[130] БелСЭ. Т. 6. С. 19; ЦГИА БССР, ф. 684, оп. 2, д. 3138, л. 1, 13, 13 адв., 332, 345 об. 346, 377, 380, 414, 428.
[131] Jankowski Cz. Powiat Oszmiański. Petersburg, 1898, Cz. 3. S. 98; SGKP. T. 5. S. 393; Alexandrowicz St. Ordynacja m-ka Lubcza nad Niemnem z roku 1647.// Rocznik Białostocki. Białystok, 1962. S. 439—440.
[132] Syrokomla Wł. Niemen od źródła do ujscia. Wilno, 1861. S. 32.
[133] Черняевский И. М. Архитектурно-археологические исследования в Гродненской и Гомельской областях // АО 1983 г. М., 1985. С. 411.
[134] ЦДАСА СССР, ф. 389, Литовская Метрика, спр. 284, л. 59—60.
[135] Цітоў А. К. Гербы беларускіх гарадоў. Мн., 1983. С. 25, 33; Alexandrowicz St. Ordynacja miasteczka Lubcza nad Niemnem z 1647 roku. S. 442.
[136] Квитницкая Е. Д. Белоруссия. Архитектура XVII века // Всеобщая архитектура. М., 1966. С. 478.

[137] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 1, спр. 1958, л. 56 адв.— 57.
[138] Там жа, л. 57—58.
[139] Ткачоў М. А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. С. 72, 102.
[140] Рукапісны аддзел бібліятэкі Вільнюскага дзяржуніверсітэта, ф. 4, спр. А-966, с. 2.
[141] Любавский М. К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства. М., 1892. С. 130; АВАК. Т. 9. С. 14; Жучкевич В. А. Краткий топонимический словарь Белоруссии. Мн., 1974. С. 335.
[142] Ткачоў М. А. Справаздача аб палявых даследаваннях за 1982 г. // Архіў Інстытута гісторыі АН БССР.
[143] ЦДГА БССР, ф. 694, воп. 3, спр. 1, л. 82.
[144] Там жа, л. 11, 82—84.
[145] Ткачоў М. А. Справаздача аб палявых даследаваннях за 1982 г. // Архіў Інстытута гісторыі АН БССР; Копысский З. Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. Мн., 1975. С. 12.
[146] Штыхов Г. В. Города Полоцкой земли. Мн., 1978. С. 93—95.
[147] Загорульский Э. М. Раскопки в Копыси // АО 1972 г. М., 1973. С. 359; Ен ж а. Открытия в Копыси // Неман. 1973. № 1.
[148] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 1772, л. 3.
[149] Карамзин Н. М. История Государства Российского. СПб., 1892. Т. 8, С. 19.
[150] ПСРЛ. Т. 32. С. 109, 175.
[151] БелСЭ. Т. 6. С. 73.
[152] Gwagninus A. Kronika Sarmaceye Europskiej. Ks. 3. S. 24.
[153] ЦГИА БССР, ф. 694, воп. 4, спр. 1207, л. 6, 9, 9 адв.
[154] Там жа, л. 9 адв.
[155] Там жа.
[156] Там жа, л. 5, 7 адв., 8 адв.— 14.
[157] Там жа, л. 14 адв.
[158] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 1766/1, л. 1—9, 10 адв., 14—49, 60, 61, 79.
[159] АМГ. Т. 2. С. 414.
[160] ЦГАСА, ф. 210, Разрядный приказ, Новогородский стол, стб. 212, л. 115-б
[161] АМГ. Т. 2. С. 468—469.
[162] ЦДАСА, ф. 210, Разрядный приказ, Московский стол, стб. 263, л. 234, 296.
[163] АМГ. Т. 3. С. 448—450.
[164] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 1768, л. 5, 19, 21, 23, 24, 28, 42.
[165] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 1768, л. 48.
[166] Путешествие в Московию барона Августина Майерберга // ОИДР при Московском университете. М., 1874. Л. 201.
[167] Мальцев А. Н. Россия и Белоруссия в середине XVII века. М., 1974. С. 131.
[168] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 1772, л. 3, 4, 26, 35.
[169] Там жа, спр. 1773, л. 3, 5, 29, 32, 36; спр. 1774/1, л. 6; спр. 1775, л. 55.
[170] Там жа, спр. 1774/2, л. 3—4; ИЮМ. Т. 7. С. 127.
[171] Там жа, спр. 1775, л. 14; спр. 1777, л. 1—17, 58, 61.
[172] Там жа, спр. 1777, л. 17, 19, 30, 34, 38; спр. 1778/1, л. 3, 7; ПСРЛ. Т. 35. С. 264.
[173] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 1778/1, л. 66—67; спр. 1779, л. 3, 6, 19, 20, 52, 54.
[174] Там жа, спр. 1781/1, л. 3; спр. 1790/1, л. 1; спр. 1792, л. 3.
[175] Там жа, спр. 1782/1, л. 23, 33, 37, 40; спр. 1785, л. 10, 16, 17, 23, 24; спр. 1786, л. 11, 16, 18; спр. 1787, л. 16, 17, 18; спр. 1789, л. 9, 13, 14, 15, 33; спр. 1791, л. 14, 19, 21.
[176] ПСРЛ. Т. 32. С. 120; Дневник второго похода Стефана Батория на Россию (1580 г.) Яна Зборовского и Луки Дзялынского // ЧОИДР. 1894. Кн. 1. М., 1897. С. 57; Гейденштейн Р. Записки о Московской войне; Брэжго В. Замкі Віцебшчыны. Вільня, 1933. С. 24.
[177] ПСРЛ. Т. 32. С. 125; Книга посольская Метрики Великого княжества Литовского. М., 1843. Т. 2. С. 244.
[178] ГАСА г. Варшавы, АР, аддзел XXV, спр. 2612, л. 37—38.
[179] ЦДГА Літоўскай ССР, ф. ДА-37, л. 451 адв., 452, 452 адв.; ГАСА г. Варшавы, АР, аддзел XXV, спр. 2613, л. 1—5.
[180] АМГ. Т. 1. С. 521, 533; Брэжго В. Замкі Віцебшчыны. С. 24.
[181] ГАСА г. Варшавы, АР, аддзел XXV, спр. 2613, л. 1—6, 12, 13.
[182] РАДПБ. Калекцыя П. П. Дубровскага. Польскія аўтографы. Арт. 152. № 42.
[183] Мальцев А. Н. Россия и Белоруссия в середине XVII века. М., 1974. С. 51; ЦДАСА, ф. 210, Разрядный приказ, Севский стол, стб. 157, л. 238; Разрядный приказ, Новгородский стол, стб. 162, л. 403; стб. 212, л. 73.

[184] ЦДАСА, ф. 210, Разрядный приказ, Московский стол, стб. 276, л. 249.
[185] Там жа, л. 151, 249.
[186] ЦДАСА, ф. 210, Разрядный приказ, Новгородский стол, стб. 162, л. 498, 499.
[187] ЦДАСА, ф. 210, Разрядный приказ, Московский стол, стб. 276, л. 249.
[188] АМГ. Т. 3. С. 269.
[189] Там жа. С. 231.
[190] Там жа. С. 431—432.
[191] ЦДАСА, ф. 210, Разрядный приказ, Московский стол, стб. 317, л. 127, 313, 315.
[192] БелСЭ. Мн., 1973. Т. 9. С. 27.
[193] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 2515/1, л. 2.
[194] Там жа, л. 3, 8—19.
[195] Там жа, л. 27—28.
[196] Там жа, л. 41, 46, 47.
[197] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 2616, л. 1—5, 15, 16.
[198] Там жа, л. 5, 17, 18, 52, 59, 60, 108, 170—175, 176.
[199] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 2617, л. 1—4.
[200] Там жа, спр. 2618/1, л. 1—30; спр. 2619, л. 2—35; Россия. Т. 9. С. 449.
[201] ЦДГА БССР, ф. КМФ-5, воп. 1, спр. 2620, л. 5—15, 4, 35, 37.
[202] Там жа, спр. 2621, л. 3—49; спр. 2622, л. 3—50.
[203] Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI—XVIII вв. С. 49.
[204] ЦДГА БССР, ф. 684, воп. 2, спр. 5939, л. 15.
[205] ПСРЛ. М., 1975. Т. 32. С. 79—80; Малиновский И. Сборник материалов, относящихся к истории панов-рады Великого княжества Литовского. Томск, 1901. С. 216, 221.
[206] Московский архив Министерства юстиции. М., 1913. Т. 5. С. 418—441; Подъяпольский С. С. Архитектор Петрок Малой // Памятники русской архитектуры и монументального искусства. М., 1983.
